Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

Факультэт дашкольнай адукацыі
Кафедра методык дашкольнай адукацыі
(рег. № УМ 29-3-184/2024)

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедрай методык
дашкольнай адукацыі
_____ М.С.Мельнікава
23.05 2024 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
дашкольнай адукацыі
_____ О.Н.Анцыпірович
2024 г.

ЭЛЕКТРОННЫ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту

для спецыяльности

6-05-0112-01 Дашкольная адукацыя

Складальнікі:
Н.С. Старжынская, доктар педагагічных навук, прафесар;
Д.М. Дубініна, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета БДПУ 26.06.2024 г., пратакол № 10

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ОГЛАВЛЕНИЕ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 3
ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЕЛ 6
ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 117
РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 145
ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 180

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Электронны вучэбны метадычны комплекс (ЭВМК) вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» накіраваны на авалоданне будучымі педагагічнымі работнікамі ўстаноў дашкольнай адукацыі методыкай развіцця беларускага маўлення дзяцей у сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму.

Актуальнасць зместу ЭВМК «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» вызначаецца тым, што ў ім адлюстраваны комплексны падыход да вырашэння задач развіцця маўлення і беларускамоўных зносін ва ўстанове дашкольнай адукацыі ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму.

Мэта вучэбна-метадычнага комплексу: фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці будучага педагагічнага работніка ўстановы дашкольнай адукацыі ў галіне сучаснай тэорыі і методыкі развіцця маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму; падрыхтоўка студэнтаў да арганізацыйна-кіраўніцкай, навукова-метадычнай дзейнасці ў галіне беларускамоўнага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму.

ЭВМК складаецца з тэарэтычнага і практычнага раздзелаў, раздзелу кантроля ведаў і дапаможнага разделу. У тэарэтычным раздзеле прадстаўлены кароткі змест лекцый, які раскрывае тэарэтычныя асновы развіцця беларускага маўлення і навучання беларускай мове рускамоўных дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму. У гэтай сувязі разглядаюцца механізмы і ўмовы авалодання дзецьмі беларускай і рускай мовамі. Асаблівая ўвага надаецца канцэптуальным асновам беларускамоўнага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання.

У практычны раздзел уключаны планы семінарскіх, практычных і лабараторных заняткаў, заданні па выкананні самастойнай работы студэнтаў, заданни па выканании самастойнай кіруемай работы студэнтаў. Раздзел кантролю ведаў уключае пытанні для экзамена і заліку, змест кантрольных мерапрыемстваў, тэставыя заданні. У дапаможны раздзел уваходзіць вучэбная праграма дысцыпліны, гласарый.

Выкарыстанне вучэбнага метадычнага комплексу па вучэбнай дысцыпліне «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» забяспечвае фарміраванне ў студэнтаў спецыяльнай кампетэнцыі СК-11, якая накіравана на іх авалоданне .уменнем здзяйсняць працэс маўленчага развіцця дзяцей на беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» студэнт павінен

ведаць:

заканамернасці засваення дзецьмі беларускай мовы як другой роднай мовы ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мэту, задачы і змест развіцця вуснага беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўстановах дашкольнай адукацыі, якія рэалізуюць вучэбную праграму дашкольнай адукацыі на рускай мове навучання;

метадычныя і спецыфічныя прынцыпы пабудовы адукацыйнага працэсу навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове ў сітуацыі руска-беларускага білінгвізму;

канкрэтныя спосабы (метады і прыёмы) беларускамоўнага развіцця дзяцей, азнаямлення іх з беларускай нацыянальнай культурай;

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» студэнт павінен

умець:

выбіраць найбольш эфектыўныя метады і прыёмы навучання дзяцей беларускай мове ва ўстанове дашкольнай адукацыі, якая рэалізуе вучэбную праграму дашкольнай адукацыі на рускай мове навучання;

мадэліраваць, арганізоўваць і кіраваць працэсам дыдактычных беларускамоўных зносін дзяцей дашкольнага ўзросту;

састаўляць план-канспект мерапрыемстваў па развіцці беларускага маўлення, планаваць асобны камунікатыўны акт, аналізаваць яго эфектыўнасць;

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» студэнт павінен

валодаць:

метадамі развіцця і ўдасканалення маўлення дзяцей на беларускай мове і далучэння іх да нацыянальнай і сусветнай культур сродкамі гэтай мовы;

навыкамі беларускамоўных зносін з дзецьмі, бацькамі, педагагічнымі работнікамі ўстановы дашкольнай адукацыі;

спосабамі арганізацыі работы па павышэнні культуры маўлення і ўзроўню лінгвакультурнай і народазнаўчай кампэтэнцый педагагічных работнікаў ўстановы дашкольнай адукацыі і бацькоў.

Асноўнымі метадамі (тэхналогіямі) навучання, што адэкватна адказваюць мэтам вывучэння дадзенай вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца: праблемнае навучанне; камунікатыўныя тэхналогіі, якія заснаваны, на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, прэс-канферэнцыя і інш.); гульнёвыя тэхналогіі (дзелавыя, ролевыя, імітацыйныя гульні).

Выкладанне дысцыпліны ажыццяўляецца ў розных формах адукацыйнай дзейнасці: праз лекцыі, семінарскія, практычныя і лабараторныя заняткі. Шырока выкарыстоўваюцца тэхнічныя, мульцімедыйныя сродкі навучання.

Самастойная праца студэнтаў па вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» прадугледжвае мэтанакіраваную сукупнасць суб’ектных дзеянняў студэнта, якая ажыццяўляецца пад кіраўніцтвам выкладчыка на аснове выкарыстання сродкаў суправаджэння адукацыйнага працэсу. Гэтаму спрыяюць метады работы, якія пабудаваны на тэарэтычным аналізе навукова-метадычнай літаратуры і адукацыйных крыніц; творчым падыходзе, звязаным з уменнем ужываць веды ў розных сітуацыях, якія мадэлююць практычную дзейнасць педагагічнага работніка ўстановы дашкольнай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» адведзена :

для дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі адводзіцца 108 гадзін, з іх 52 аўдыторныя гадзіны. Размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі –14 гадзін, практычныя заняткі – 20 гадзін, семінарскія заняткі – 4 гадзіны, лабараторныя заняткі – 6 гадзін, кіруемая самастойная работа – 8 гадзін (8 гадзін – лекцыі);

для завочнай формы атрымання вышэйшай адукацыі (поўны тэрмін навучання) адводзіцца 12 аўдыторных гадзін, з іх лекцыі – 6 гадзін, практычныя заняткі– 6 гадзін;

для завочнай формы атрымання вышэйшай адукацыі (скарочаны тэрмін навучання) адводзіцца 12 аўдыторных гадзін, з іх лекцыі – 6 гадзін, практычныя заняткі– 6 гадзін.

Працаемкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

Прамежкавая атэстацыя праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам па спецыяльнасці ў форме экзамена ў 6 семестры (дзенная форма атрымання адукацыі) і ў 5 (завочная форма атрымання адукацыі, скарочаны тэрмін) і 7 (завочная форма атрымання адукацыі, поўны тэрмін) семестрах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЕЛ

Кароткі змест лекцый

Тэма 1.1 Білінгвізм як сацыяльна-культурны і псіхолага-педагагічны феномен (лекцыя ксрс – 2 гадзіны)

Пытанні для вывучэння

1. Білінгвальная кампетэнтнасць і камунікатыўная актыўнасць як асноўныя крытэрыі для вызначэння сутнасці білінгвізму.

2. З'явы інтэрферэнцыі і транспазіцыі ў маўленні білінгва.

3. Псіхолага-лінгвістычная характарыстыка білінгвізму: рэцэптыўны, рэпрадуктыўны і прадуктыўны білінгвізм; каардынацыйны і субардынацыйны білінгвізм; натуральны і штучны білінгвізм.

4. Класіфікацыя білінгваў ў кантэксце антагенезу: паралельны (адначасовы) і паслядоўны білінгвізм.

5. Сацыялінгвістычны крытэрый ступені роднасці дзвюх моў: білінгвізм блізкароднасны і неблізкароднасны.

1. ***Білінгвальная кампетэнтнасць і камунікатыўная актыўнасць як асноўныя крытэрыі для вызначэння сутнасці білінгвізму***

Згодна са слоўнікам замежных слоў, ***білінгвізм*** (bilinguis = двухмоўны – *валоданне і папераменнае карыстанне асобай або калектывам дзвюма мовамі; двухмоўе* (А.М. Булыка).

Білінгвізм – з'ява складаная, шматбаковая. Гэты феномен актыўна абмяркоўваецца з пазіцый многіх навук: лінгвістыкі, псіхалогіі, псіхалінгвістыкі, сацыялогіі, лінгвадыдактыкі і інш. З улікам сказанага, білінгваў сістэматызуюць па ўзроставым аспекце, сінхроннасці засваення моўных навыкаў, ступені валодання абедзвюма мовамі і інш.

Псіхалагічны аспект двухмоўя звязаны з асаблівасцямі псіхалагічнага складу індывіда, з яго разумовымі здольнасцямі, эмацыянальнай прыстасаванасцю, з праблемай пераключэння з аднаго моўнага кода на другі.

Лінгвадыдактыка закранае розныя аспекты навучання другой мове, у тым ліку і ўплыў адной мовы на працэс засваення другой.

Сацыялінгвістычны аспект двухмоўя ахоплівае кола пытанняў, звязаных з вывучэннем адносін «білінгвізм – грамадства», такіх як: сфера выкарыстання першай і другой мовы; ступень авалодвання мовамі; размеркаванне камунікатыўных функцый паміж мовамі; кантынгент ахопленых двухмоўем членаў соцыуму і шырыня выкарыстання другой мовы, свядомае ўключэнне грамадства ў моўныя працэсы і інш.

У лінгвістычным аспекце білінгвізм разглядаецца як дасканалае валоданне вуснай і пісьмовай формамі абедзвюх літаратурных моў.

У сацыялагічным аспекце пад двухмоўем разумеецца веданне дзвюх моў у вядомых формах і існаванне яго ў той меры, якая дапамагае індывідам выражаць свае думкі даступна, а таксама ўменне ўспрымаць чужое маўленне з поўным разуменнем (В.І. Свірыдзенка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Існуюць розныя класіфікацыі двухмоўя ў залежнасці ад крытэрыяў, якія пакладзены ў іх аснову.

Адным з важных крытэраў з'яўляецца *білінгвальная кампетэнтнасць* – узровень валодання другой мовай. Большасць даследчыкаў (Н.В. Імедадзе, І.А. Зімняя, А.Я. Супрун) разглядваюць білінгвальную кампетэнцыю ў дынаміцы.

У ідэальным выпадку білінгвізму індывід аднолькава добра валодае абедзвюма мовамі і можа карыстацца імі ва ўсіх жыццёвых сітуацыях. Гэтыя выпадкі называюць *абсалютна поўным (збалансаваным) двухмоўем*. Аднак ідэальныя выпадкі сярод білінгваў дастаткова нешматлікія. У цэлым канцэпцыя збалансаванага білінгвізму, па меркаванні даследчыкаў, даволі ідэалізавана і фактычна існуе ў рэальнасці вельмі рэдка.

Большасць білінгваў у рознай ступені набліжаюцца да ідэальнага ўзроўню валодання дзвюма мовамі, яны не валодаюць рознай кампетэнцыяй ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці на кожнай з дзвюх моў. Такое двухмоўе называюць *частковым (незбалансаваным).*

Вылучаюць таксама *паўбілінгваў* – індывідаў, якія дэманструюць дэфіцыт маўленчых уменняў у розных аспектах (недастатковы слоўнікавы запас, недасканалае валоданне граматычным ладам, вобразнымі сродкамі, невысокая здольнасць ствараць інавацыі і інш.) на дзвюх мовах. *Паўмоўе* (паўбілінгвізм). – найбольш адмоўны спосаб збалансаванага двухмоўя. Паўмоўе – гэта сінонім паняцця "абмежаванае валоданне дзвюма мовамі".

Другім важным крытэрыям размежаванасці розных тыпаў білінгвізму з'яўляецца *камунікатыўная актыўнасць*. Яна ацэньваецца па ступені рэгулярнасці карыстання мовай у зносінах і сферы прымянення кожнай мовы ў маўленчай дзейнасці індывіда (у побыце, на вытворчасці, у школе і г.д.)

Па гэтым крытэрыі прынята вылучаць *актыўны і пасіўны білінгвізм*. Актыўны білінгвізм праяўляецца у тым выпадку, калі індывід актыўна ўключаны ў зносіны на другой мове. Пры гэтым актыўны білінгвізм можна назіраца і ў людзей з недастаткова высокім ўзроўнем кампетэнцыі ў адной або нават дзвюх мовах. Пасіўны білінгвізм, як правіла, не з'яўляецца пастаяннай характерыстыкай. Калі індывід здольны ўступаць ў зносіны на другой мове, то ён знаходзіць магчымасці для таго, каб выкарыстаць яе ў камунікацыі (А.А. Залеўская).

2. З'явы інтэрферэнцыі і транспазіцыі ў маўленні білінгва

Маўленне чалавека пры пераходзе на другую мову не пазбаўленае ад *інтэрферэнцыі – неадвольнага змешвання сродкаў дзвюх моў* у вонкавым маўленні, пранікненні элементаў адной мовы (слоў, марфем, сінтаксічных схем, спецыфічных гукаў) ў другую мову. *Інтэрферэнцыя праяўляецца пры змешаным білінгвізме.*

Інтэрферэнцыі садзейнічаюць два фактары: аб'ектыўны, *лінгвістычны,* які вызначае ступень падабенства паміж роднай і другой мовамі; і *суб'ектыўны* – ступень аўтанамізацыі дзвюх моўных сістэм у свядомасці чалавека.

Паміж сістэмамі дзвюх моў можа узнікнуць і такая дадатная з'ява, як станоўчы перанос *(транспазіцыя*) уменняў і навыкаў у маўленне на другой мове. Гэта ужыванне асобных слоў, граматычных форм, вымаўлення гукаў у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

абедзьвюх мовах. Роля транспазіцыі ўзрастае ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму (А.Я. Супрун, А.М. Богуш).

3. ***Псіхолага-лінгвістычная характарыстыка білінгвізму: рэцэптыўны, рэпрадуктыўны і прадуктыўны білінгвізм; каардынацыйны і субардынацыйны білінгвізм; натуральны і штучны білінгвізм***

Вылучаюць розныя тыпы білінгвізму ў залежнасці ад крытэрыяў, якія ляжаць у аснове іх класіфікацыі.

З псіхалагічнага пункту гледжання выдзяляюцца тры тыпы білінгвізму (паводле А.М. Верашчагіна). Адрозніваюць *білінгвізм рэцэптыўны*, калі чалавек разумее маўленне на другой мове, але на ёй не гаворыць (па сутнасці, гэта разгледжаны вышэй пасіўны білінгвізм, які прынята разглядваць як мінімальнае патрабаванне для двухмоўя); *рэпрадуктыўны*, калі білінгв здольны ўзнавіць асобныя фрагменты або ўвесь тэкст на другой мове; і *прадуктыўны* – чалавек і разумее, і гаворыць на другой мове. Толькі ў апошнім выпадку другая мова можа выкарыстоўвацца як зродак зносін, дасягнення ўзаемаразумення. (Хаця выказванні, што будуюцца на другой мове, могуць не адпавядаць поўнасцю граматычным нормам гэтай мовы.)

Яшчэ адным відам білінгвізу з’яўляецца *дамінуючы білінгвізм***.** Дамінуючы білінгвізм азначае, што дзеці-білінгвы аказваюцца болей дасведчанымі ў адной з дзвюх моў.

Беларускі даследчык Т.М. Мікуліч прапануе яшчэ адну класіфікацыю білінгвізму, у *аснове якой таксама ляжыць якасць засваення і ўжывання моў*. Яна выдзяляе *нарматыўнае, аднабакова-нарматыўнае і ненарматыўнае двухмоўе.*

Нарматыўнае двухмоўе прадугледжвае паслядоўна-правільнае выкарыстанне дзвюх моўных сістэм. Такі тып білінгвізму з’яўляецца ідэальнай канструкцыяй, вышэйшай ступенню валодання дзвюма мовамі.

Пры *аднабакова-нарматыўным двухмоўі* асоба дасканала валодае літаратурнымі нормамі адной мовы, але недастаткова захоўвае нормы другой мовы альбо валодае ёй толькі на ўзроўні ўспрымання і разумення.

Ненарматыўнае двухмоўе, найбольш распаўсюджанае ў Беларусі, характарызуецца тым, што асоба практычна не валодае літаратурнымі нормамі ніводнай мовы.

Па спосабе сувязі маўлення з мысленнем білінгвізм падзяляецца на *каардынацыйны і субардынацыйны*.

Пры *каардынацыйным* (альбо каардынаваным) двухмоўі ўсе ўнутраныя разумовыя працэсы праходзяць на другой мове без прымянення перакладу, г.зн. кожная моўная сістэма функцыянуе незалежна і самастойна. Для каардынацыйнага двухмоўя характэрна аўтаномная мадэль стварэння тэксту на кожнай з моў і ўласціва поўнае адрозніванне дзвюх моўных сістэм пры дыферэнцыраванні ўстаноўкі на іх выкарыстанне. Такі тып білінгвізму з’яўляецца найбольш высокай ступенню валодання другой мовай. Білінгв выразна дыферэнцыруе моўныя сістэмы, на якіх гаворыць. Пераход ад стварэння тэкста на адной мове да стварэння на другой адбываецца шляхам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пераключэння з механізма адной мовы на другі. Гэта па сутнасці збалансаваны білінгвізм, які, як ужо адзначалася, сустракаецца вельмі рэдка.

Пры *субардынацыйным* (альбо няпоўным, апасродкаваным, залежным, неўраўнаважаным) білінгвізме ўсе мысліцельныя аперацыі праходзяць на першай засвоенай і асноўнай мове, а пераход на акустычны альбо графічны код другой мовы адбываецца пры прымяненні перакладчыцкага метаду. Білінгв недакладна проціпастаўляе сістэмы абедзвюх моў. Першая засвоеная мова выступае як дамінантная. Пры такім тыпе білінгвізму дзве моўныя сістэмы з'яўляюцца ўзаемапранікальнымі, што параджае змешаны білінгвізм (інтэрферэнцыю), які найбольш характэрны на ранніх этапах засвойвання другой мовы. Затым, на больш позніх этапах развіцця білінгвізму, на змену змешанаму маўленню на дзвюх мовах прыходзіць дыферэнцыяцыя маўленчай установкі (Н.В. Імедадзе). Аднак, як заўважаў вядомы беларускі псіхалінгвіст А.Я. Супрун, пры авалоданні дзвюма блізкароднаснымі мовамі ёсць вялікая небяспека, што этап змешанага двухмоўя можа зацягнуцца на ўсё жыццё.

Па ўмовах засваення адрозніваюць білінгвізм *натуральны (што засвойваецца ў натуральных сітуацыях зносін з носьбітамі другой мовы) і штучны (як вынік спецыяльнага навучання).* У апошнім выпадку мова можа не выступаць сродкам зносін. Калі ж натуральныя і штучныя ўмовы навучання аб'ядноўваюцца, білінгвізм набывае рысы сінтэзаванага, другая мова выкарыстоўваецца з мэтай зносін.

4. ***Класіфікацыя білінгваў ў кантэксце антагенезу: паралельны (адначасовы) і паслядоўны білінгвізм***

*Па ўзросце***,** у якім адбываецца засваенне другой мовы, вылучаюць 4 тыпы білінгвізму: ад 0 да 1 года; ад 1 да 12 гадоў (дзіцячы), ад 12 да 17 гадоў (падлеткавы): пасля 17-18 гадоў - дарослы (Э. Хаўген). Пры гэтым адрозніваюць *білінгвізм ранні і позні*.

У айчыннай псіхалінгвістыцы раннім білінгвізмам прынята называць засваенне дзецьмі другой мовы ў дашкольным узросце. Толькі ў дзяцей ва ўзросце да 5-8 гадоў захоўваецца здольнасць засвойваць другую мову тым жа спосабам (і пры актывізацыі тых жа частак галаўнога мозгу), што і першую.

Ва ўзросце 7 – 11 гадоў другая мова ўсё больш пачынае засвойвацца іншым спосабам, чым першая, мяняецца псіхалагічны фундамент для авалодання мовай.

У перыяд з 12 да 18 гадоў здольнасці да авалодання другой мовай паступова затухаюць. Шанцы авалодаць другой мовай пасля 18 гадоў захоўваюцца толькі ў невялікага працэнта людзей (К.Ю. Пратасава).

У раннім білінгвізме вылучаецца так званы *паралельны, або сінхронны, адначасовы білінгвізм*, калі дзіця з нараджэння чуе і паступова засвойвае адразу дзве мовы. У тым выпадку, калі дзіця засвойвае другую мову пасля засваення роднай – з 3 гадоў і пазней, гавораць пра *паслядоўны білінгвізм***.** Выпадкі, калі дзеці авалодваюць дзвюма мовамі з затрымкай у часе спецыялісты называць "засваеннем другой мовы" (second language acquisition), напрыклад, у сем'ях, дзе дзіця гаворыць на адной мове, а з паступленнем у дзіцячы сад пачынае засвойваць другую мову (мову асяроддзя).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Сацыялінгвістычны крытэрый ступені роднасці дзвюх моў

На аснове сацыялінгвістычнага *крытэрыю ступені роднасці дзвюх моў* размяжоўваюць *блізкароднасны* і *неблізкароднасны білінгвізм*. Да блізкароднаснага адносіцца руска-беларускі білінгвізм. Блізкасць рускай и беларускай моў назіраецца ў лексічным складзе і структуры слова, у агульнасці каранёў, граматычных форм, сінтаксічных канструкцый. Амаль аднолькава гучаць у дзвюх блізкароднасных мовах старажытныя словы, звязаныя з сямейнымі і вытворчымі адносінамі, з раслінным і жывёльным светам, назвы пор года, частак чалавечага цела і г.д.

Сітуацыя функцыянавання *блізкароднаснага двухмоўя*, абумоўленага падабенствам фанетычнага, лексічнага і граматычнага ладу моў, з аднаго боку, садзейнічае агульнаму разуменню другой мовы, а з другога – патрабуе ад носьбіта мовы размежавання моўных сродкаў, агульнага культуралагічнага сэнсу выказвання. У дадзеным выпадку варта сказаць пра ролю другой блізкароднаснай мовы як стымулюючага фактару ў пошуках новых значэнняў у розных культурамоўных сітуацыях.

Ступень роднасці дзвюх моў, як было паказана вышэй, уплывае на ступень праяўлення інтэрферэнцыі ў маўленні білінгва і ў той жа час дазваляе выкарыстоўваць з’яву транспазіцыі.

Тэма 1.2 Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму як навука (лекцыя – 2 гадзіны).

Пытанні для вывучэння

1. Катэгорыі, міждысцыплінарныя сувязі методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.
2. Прадмет, аб’ект, мэты і задачы курса вучэбнай дысцыпліны «Развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту».
3. Сутнасць пацяццяў «білінгвальная адукацыя», «білінгвальнае навучанне», «білінгвальнае выхаванне».
4. Метады навуковага даследавання.

1. Катэгорыі, міждысцыплінарныя сувязі методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту

Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя належыць да педагагічных навук, а іменна - прыватнай лінгвадыдактыцы. Яна вызначае мэту, змест, задачы, прынцыпы, метады і прыёмы навучання беларускай мове як другой, вывучае заканамернасці засваення дзецьмі другой блізкароднаснай мовы, раскрывае тэарэтычныя і практычныя пытанні выкладання беларускай мовы, даследуе ўмовы і шляхі фарміравання маўленчых уменняў у дзяцей, культуры беларускага маўлення.

Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя ўзбройвае педагагічных работнікаў установ дашкольнай адукацыі сістэмай навукова-метадычных ідэй, знаёміць з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

апошнімі навуковымі лінгвадыдактычнымі даследаваннямі, педагагічным вопытам. Кіруючыся імі, выхавальнік дашкольнай адукацыі мае магчымасць выбіраць найбольш эфектыўныя метады і прыёмы навучання, перадбачыць вынікі навучання, дасягаючы высокага ўзроўню развіцця маўленчых уменняў дзяцей.

Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту, навучання іх нацыянальнай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання – новая галіна лінгвадыдактычнай навукі. Спецыфікай яе, у адрозненне ад школьнай методыкі, з'яўляецца накіраванасць на развіццё вуснага гутарковага маўлення на беларускай мове з арыентацыяй на гульнявыя метады і прыёмы навучання.

Крыніцамі стварэння методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту з'яўляюцца тэорыя пазнання, навуковыя даныя мовазнаўства, псіхалінгвістыкі, псіхалогіі, лінгвадыдактыкі, айчынны і замежны перадавы педагагічны вопыт навучання дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту другой мове, крытычнае выкарыстанне педагагічнай і метадычнай спадчыны мінулага (прац Я.А. Каменскага, К.Дз. Ушынскага, Л.І. Ціхеевай і інш.). Крыніцай распрацоўкі і высвятлення асобных раздзелаў методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей ва ўстановах дашкольнай адукацыі сталі працы вядомых вучоных і метадыстаў: Е.Г. Андрэевай, Д.М. Дубінінай, А.А. Каляды, А.Ю. Лозкі, Ул.Ф. Луцэвіч, А.І. Негнявіцкай, К.Ю. Пратасавай, Ф.А. Сахіна, Н.С. Старжынскай, А.Я. Супруна, Якуба Коласа і інш.

Сучасная методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту цесна звязана з філасофіяй, гісторыяй Беларусі, беларусазнаўствам, псіхалогіяй, псіхалінгвістыкай, мовазнаўствам, педагогікай і інш. навукамі.

Паколькі методыка арыентавана на навучанне дзяцей беларускай мове, развіццё беларускага маўлення, становіцца зразумелай яе цесная сувязь з мовазнаўствам – лексікалогіяй, фанетыкай, граматыкай беларускай мовы. Улічваючы тое, што ажыццяўляецца развіццё беларускага маўлення рускамоўных дзяцей, у методыцы выкарыстоўваюцца веды і з курса рускай мовы, якія прымяняюць для параўнання моўных з'яў абедзьвюх моў.

Педагогіка ўзбройвае выхавальнікаў дашкольнай адукацыі агульнымі педагагічнымі прынцыпамі, метадамі, прыёмамі, сродкамі і формамі навучання дзяцей дашкольнага ўзросту, раскрывае сутнасць навучання. Гэта дае магчымасць метадычнай тэорыі вызначыць спецыфічныя прынцыпы, метады і прыёмы навучання дзяцей беларускай мове, развіцця іх беларускага маўлення.

Вывучэнне такіх раздзелаў, як «Азнаямленне дзяцей з малымі формамі беларускага фальклору» , «Методыка работы з беларускай народнай казкай», «Методыка азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа» патрабуе ведаў з курсу беларускай дзіцячай літаратуры, а таксама развіцця культуры беларускага народа ў розныя гістарычныя перыяды.

Выкарыстанне міжпрадметных сувязей у выкладанні методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дапамагае сфарміраваць у будучых спецыялістаў дашкольнай адукацыі сістэмныя веды, узброіць іх метадычнымі прыёмамі развіцця беларускага маўлення дзяцей, самім авалодаць навыкамі ліратурнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беларускага маўлення, дасягнуць культуры маўленчых зносін у двухмоўным асяроддзі.

2. Прадмет, аб'ект, мэты і задачы курса "Развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту"

Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту змяшчае сістэматызаваныя навуковыя веды пра развіццё маўлення і беларускамоўных зносін дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.

Прадметам методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей як навукі з'яўляецца працэс авалодання беларускім маўленнем і культурай зносін у спецыяльна арганізаваных умовах навучання дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўстановах дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання.

Аб'ектам даследавання выступае маўленчая дзейнасць дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўнага асяроддзя.

Мэта вучэбнай дысцыпліны «Развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту»**:** фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці будучага педагагічнага работніка ўстановы дашкольнай адукацыі ў галіне сучасных тэорый і тэхналогій развіцця маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму; падрыхтаванасці студэнтаў да арганізацыйна-кіраўніцкай, навукова-метадычнай дзейнасці ў галіне маўленчага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага блілінгвізму.

Задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны накіраваны на набыццё студэнтамі кампетэнцый, аснову якіх складае здольнасць да самастойнага пошуку вучэбна-інфармацыйных рэсурсаў, авалодванне метадамі набыцця і асэнсавання ведаў і заключаюцца ў тым, каб:

- фарміраваць навуковыя веды пра працэс развіцця маўлення і маўленчых зносін дзяцей ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білілінгвізму;
- садзейнічаць асэнсаванню ролі беларускай мовы як аднаго з фундаментальных і ўніверсальных аспектаў нацыянальнай культуры;
- фарміраваць глыбокае разуменне ролі нацыянальнай мовы ў псіхічным развіцці дзіцяці;
- садзейнічаць асэнсаванню сутнасці паняццяў «білінгвальная адукацыя», «білінгвальнае навучанне», «білінгвальнае выхаванне» і асаблівасцей білінгвальнай дашкольнай адукацыі ў Беларусі,
- спрыяць авалодванню працэсам беларускамоўнага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту як сродку інкультурацыі;
- садзейнічаць разуменню і асэнсаванню таго, што навукова абгрунтаваная методыка навучання беларускай мове і развіцця беларускага маўлення павінна абапірацца на разуменне сутнасці механізмаў авалодання роднай і другой мовамі, асаблівасці руска-беларускага двухмоўя дзяцей дашкольнага ўзросту;
- фарміраваць цэласныя педагагічныя веды пра сутнасць сучасных канцэпцый і тэхналогій навучання другой мове, развіцця беларускага маўлення

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і навучання нацыянальнай роднай мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму;

‣ фарміраваць ўменне дыягнаставаць, праектаваць і канструяваць працэс развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя;

‣ садзейнічаць авалоданню студэнтамі эфектыўнымі метадамі і прыёмамі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту, улічваць спецыфіку зместу і метадаў дашкольнай дыдактыкі;

‣ развіваць метадычнае мысленне, уменне ўжываць тэарэтычныя веды ў розных педагагічных сітуацыях.

3. Сутнасць пацяццяў «білінгвальная адукацыя», «білінгвальнае навучанне», «білінгвальнае выхаванне»

З улікам спецыфічнасці арганізацыі адукацыі на Беларусі (наяўнасці дзвюх блізкароднасных моў) Т.Ул. Паліева ўдакладніла сутнасць асноўных паняццяў: «білінгвальная адукацыя», «білінгвальнае навучанне», «білінгвальнае выхаванне».

Білінгвальная адукацыя, як працэс і вынік, -- гэта засваенне асобай культурна-гістарычнага і сацыяльнага вопыту розных краін і народаў, каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры сродкамі беларускай і рускай моў.

Як шырокі працэс білінгвальная адукацыя ўключае ў сябе *«білінгвальнае навучанне», «білінгвальнае выхаванне».*

Білінгвальнае навучанне -- спецыяльна арганізаваны мэтанакіраваны працэс развіцця і ўдасканалення маўлення дзяцей на дзвюх мовах і далучэнне іх да нацыянальнай і сусветнай культуры сродкамі гэтых моў. Білінгвальнае навучанне трактуецца як сродак білінгвальнага выхавання.

Паняцце «білінгвальнае выхаванне» уключае ў сябе моўнае і полікультурнае выхаванне. Выдатны беларускі лінгвіст і педагог А.Я. Супрун выкарыстоўваў тэрмін «лінгвістычнае выхаванне», пад якім разумеў «фарміраванне пэўных этычных норм моўных паводзін у розных выпадках нашага жыцця».

Таму *білінгвальнае выхаванне* – гэта мэтанакіраваны свядома арганізаваны педагагічны працэс, які садзейнічае фарміраванню і развіццю асобы дзіцяці сродкамі беларускай і рускай моў і прадстаўленых імі культур.

Такім чынам, *мэтай білінгвальнай адукацыі* з’яўляецца забеспячэнне станаўлення цэласнай асобы дзіцяці, яго паўнацэннае развіццё шляхам інтэграцыі ў дзве роднасныя культуры сродкамі беларускай і рускай моў.

Умовамі эфектыўнасці білінгвальнай адукацыі выступаюць кадравае, праграмнае і навукова-метадычнае забеспячэнне двухмоўнага навучання і выхавання дзяцей.

4. Метады навуковага даследавання

Любое даследаванне пачынаецца з вызначэння тэмы і праблемы даследавання. Яно ажыццяўляецца на аснове вывучэння стану пытанняў развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання. Для гэтага неабходна ведаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тэорыю і практыку прадмета свайго даследавання, ступень распрацаванасці выбранай праблемы.

Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту выкарыстоўвае як агульнапедагагічныя метады даследавання, так і спецыфічныя, што даюць магчымасць высветліць заканамернасці засваення дзецьмі беларускай мовы ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

Да агульнапедагагічных метадаў даследавання належаць:

Тэарэтычныя: вывучэнне і аналіз тэарэтычнай літаратуры па праблеме даследавання; мадэляванне; аналіз і абагульненне матэрыялу, што быў атрыманы ў час назіранняў, гутарак, эксперымента; метады статыстычнай апрацоўкі фактычнага матерыялу.

Эмпірычныя: назіранне, гутарка, псіхолага-педагагічны эксперымент, анкетнае апытанне, вывучэнне, аналіз і абагульненне вопыту работы выхавальніка дашкольнай адукацыі.

Найпрасцейшая форма даследавання – назіранне за працэсам засваення беларускай мовы дзецьмі на занятках і ў нерэгламентаванай дзейнасці. Мэта назіранняў можа быць рознай: назіранне за тым, як дзеці вымаўляюць асобныя спецыфічныя беларускія гукі; праверка ўзроўню развіцця дыялагічнага маўлення на беларускай мове; выяўленне слоўнікавага запасу па пэўнай тэме і да т.п.

Сярод спецыфічных методык даследавання можна вылучыць, напрыклад, методыку абследавання ўзроўню развіцця тэматычнага слоўніка дзяцей. Для гэтага трэба падрыхтаваць па 10 малюнкаў да кожнай тэмы («Хатнія жывёлы і птушкі», «Ветлівыя словы» і да т.п.). Выхавальнік дашкольнай адукацыі называе слова і прапануе дзіцяці паказаць адпаведны малюнак. Так высвятляецца пасіўны слоўнік -- разуменне дзіцем беларускіх слоў тыпу *качка, певень, цяля*. Актыўны слоўнік можна праверыць, прапануючы дзіцяці самому назваць адлюстраваны прадмет або сітуацыю: «Як ты думаеш, што сказала дзяўчынка, калі атрымала падарунак?» (Дзякуй.)

Для таго, каб даведацца, ці разумеюць дзеці інструкцыі на беларускай мове, ім можна прапанаваць выканаць некалькі дзеянняў. Напрыклад: «Вазьмі, калі ласка, ляльку і пасадзі яе на дыванчык». Пасля выканання спытаць: «Што ты зрабіла?».

Пры неабходнасці даследчык праводзіць індывідуальную гутарку з дзіцем для праверкі засваення ім асобных маўленчых уменняў: граматычных, лексічных, дыялагічных. Гутарка ўключае 3-4 пытанні на беларускай мове. Напрыклад, па тэме «Сям’я» выхавальнік дашкольнай адукацыі пытаецца: «Як завуць тваю маму, твайго тату? Дзе яны працуюць? Ці ёсць у цябе брацік (сятрычка), бабуля, дзядуля? Як іх зваць?».

Вывучэнне, аналіз і абагульненне педагагічнага вопыту выхавальнікаў па развіцці беларускага маўлення дзяцей ажыццяўляюць загадчык установы дашкольнай адукацыі, намеснік па асноўнай дзейнасці. Пазітыўны і перадавы педагагічны вопыт навучання дзяцей беларускай мове мае быць укаранёным у масавую педагагічную практыку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Метад псіхолага-педагагічнага эксперыменту патрабуе доўгага часу, паколькі складаецца з некалькіх этапаў: пашуковага, канстатуючага, фарміруючага і кантрольнага этапаў эксперымента. Гэты метад выкарыстоўваецца студэнтамі пад час напісання курсавых і дыпломных работ, магістэрскіх дысертацый, а таксама навукоўцамі.

Пры навучанні блізкароднаснай мове можна выкарыстоўваць дыягнастычныя методыкі вызначэння ўзроўню развіцця рускага маўлення, распрацаваныя расійскімі даследчыкамі (А.С. Ушаковай, Л.М. Струнінай, А.Г. Арушанавай, В.І. Яшынай і інш.).

Апошнім часам распрацаваны плённыя *інструменты вымярэння моўных навыкаў у дзяцей-білінгваў*, якія прайшлі апрабацыю ў розных культурных кантэкстах.

Да іх адносіцца тэст пад назвай *аўдзіраванне*, які накіраваны на праверку ўмення адначасовага ўспрымання моўнай формы і разумення зместу выказвання. Дзіцяці чытаюць урывак з тэкста, а затым задаюць пытанні на разуменне матэрыялу, раскрытага ў тэксце, або інфармацыі, якую дзіця павінна было зразумець з пачутага. У працэсе даследавання вядзецца аўдыязапіс, які пасля ацэньваецца. Агульны бал раўняецца колькасці правільных адказаў на пытанні па тэкстах.

Методыка свабоднага асацыіравання прызначана для вывучэння суб'ектыўных семантычных палей слоў у свядомасці білінгваў, характару семантычных сувязей паміж адзінкамі ментальнага лексікона дзіцяці (В М. Абвінцава). Методыку можна выкарыстоўваць, пачынаючы са старшага дашкольнага ўзросту. Дзецям прапануецца выдаць на кожны стымул па адной рэакцыі, якая фіксуецца. Аўтар прапануе выкарыстоўваць у якасці слоў-стымулаў наступныя словы: *школа, море, быстрый, ярко, арбуз, лыжи, ловить, больной, думает, высоко*. На заданне даецца не больш за 30 секунд для выдачы рэакцыі на стымул. Заданне прад'яўляецца як на першай, так і на другой мове дзіцяці-білінгва (*школа, мора, хуткі, ярка, кавун, лыжы, лавіць, хворы, думае, высока)*. Даследаванне на другой мове праводзіцца з інтэрвалам ў тыдзень. Методыка дазваляе вызначыць адэкватнасць рэакцыі, а таксама тып семантычнай сувязі (парадыгматычны, сінтагматычны, тэматычны). Дададзім, што з дзецьмі дашкольнага ўзросту гэтую методыку лепш выкарыстоўваць у гульнявой форме, напрыклад, «Я табе кіну мячык і скажу слова, а ты хуценька кінь мячык назад і таксама кажы слова».

Наступны тэст – *на вызначэнне наратыўных навыкаў шматмоўных дзяцей* (Gagarina N. I інш.). Наратыў – гэта тэкст, пабудаваны па прынцыпе разгортвання апавядання. Тэст распрацаваны для ацэнкі апавядальных навыкаў у дзяцей, якія авалодваюць адной або некалькімі мовамі з нараджэння або з ранняга дашкольнага ўзросту. На думку даследчыкаў, дзіцячы наратыў з'яўляецца натуральнай і чыстай крыніцай як для даследавання моўных, так і кагнітыўных здольнасцей дзіцяці.

Методыка ўключае тры заданні для вызначэння наратыўных навыкаў дзяцей: 1) складанне апавядання па серыі малюнкаў; 2) пераказ праслуханай гісторыі з апорай на адпаведную серыю малюнкаў; 3) складанне апавядання па

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўзоры. Стымульны матэрыял уключае серыі сюжэтных малюнкаў (з 6 карцінак). Дзіцяці паслядоўна прад'яўляюць выяву з новым разгортваннем сюжэта, што дапамагае разумець і расказваць звязную гісторыю. Пасля выканання кожнага задання дзіцяці задаюць 10 стандартрных пытанняў для ацэнкі разумення гісторыі.

Тэсціраванне можна пачынаць на любой з моў, якімі валодае дзіця. Вывучэнне валодання першай і другой мовамі ў дзяцей-білінгваў неабходна праводзіць з інтэрвалам у 4-7 дзён з мэтай памяншэння ўплыву міжмоўнай інтэрферэнцыі і эфекта «навучання» і «пераносу», што непазбежна пры выкананні аднаго і таго ж задання. Цікавасць да даследавання апавядання звязана з тым, што наратыўныя навыкі з'яўляюцца важным сведчаннем развіцця моўный сістэмы дзіцяці.

На вымярэнне ўзроўню маўленчай кампетэнтнасці дзяцей у галіне двухмоўя накіраваны інструмент, які выкарыстоўвае прыём «*кніга з малюнкамі – апавяданне – пераказ*» (Perez-Leroux інш.). Дзецям прапануецца пераказаць добра вядомую казку або гісторыю (напрыклад, «Тры парасяці » на дзвюх мовах). Кніга, якую выкарыстоўваюць, павінна быць ілюстравана малюнкамі, змяшчаць мінімум тэкста, які трэба закрыць. Дзецям даецца столькі часу, колькі ім патрэбна, каб разглядзець малюнкі. Маўленне дзіцяці фіксуецца на дыктафон.

Нарэшце, яшчэ адным метадам атрымання інфармацыі аб развіцці дзіцячага маўлення з'яўляецца *анкетаванне бацькоў*. Адным з найбольш вядомых апытальнікаў для бацькоў з'яўляецца МакАртураўскі тэст камунікатыўнага развіцця дзяцей ранняга ўзросту. Тэст дазваляе ацаніць моўныя кампетэнцыі дзіцяці ў абедзьвюх мовах (з улікам размеркавання часу і сфер зносін на кожнай мове), часу пачатку засваення кожнай з моў, спосабе і стратэгіях фарміравання білінгвізму дзіцяці, удакладніць звесткі, якія могуць дапамагчы ацаніць ступень асэнсаванасці дзіцем свайго двухмоўя, даныя аб засвоеных дзіцем формах мовы. Бацькоўскія апытальнікі маюць шэраг пераваг перад іншымі сродкамі ацэньвання маўлення маленькіх дзяцей. Яны могуць даць больш паўнацэнныя звесткі аб маўленні дзяцей ранняга ўзросту, чым тэсціраванне, паколькі бацькі маюць зносіны з дзіцем і назіраюць за ім у шырокім спектры спантанных сітуацый на працягу доўгага часу.

Анкетнае апытанне выкарыстоўваецца таксама ў рабоце з бацькамі з мэтай высвятлення іх стаўлення да вывучэння дзецьмі беларускай мовы і заахвочвання да сумеснай працы.

Анкетныя даныя падлягаюць колькаснай апрацоўцы. Вынікі аналізу анкет дапамагаюць выхавальніку праводзіць дыферэнцыраванае навучанне дзяцей беларускай мове.

Даследчыкі адзначаюць, што *адзінай універсальнай методыкі вымярэння моўных навыкаў у дзяцей-білінгваў не існуе.* Навукоўцу неабходна вызначыцца з методыкай выяўлення ўзроўню развіцця маўлення дзяцей на роднай і другой мовах, зыходзячы з мэтаў свайго даледавання, наяўнасці гатовых дыягнастычных методык, ацаніць іх і пры неабходнасці адапціраваць для дасягнення найбольш адэкватных для даследвання вынікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У даследаванні заўсёды выкарыстоўваецца *сукупнасць* розных тэарэтычных і практычных метадаў, што дыктуецца аб'ектам, прадметам, задачамі даследавання, навуковай абгрунтаванасцю, логікай даследавання.

Тэма 1.3 Канцэптуальныя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму (матэрыял для самастойнага вывучэння)

Пытанні для вывучэння

1. Мова як галоўная каштоўнасць народа. Мова і культура народа.
2. Сутнасць паняццяў «родная мова», «другая мова», «нацыянальная мова», «замежная мова».
3. Сацыялінгвістычная сітуацыя ў Беларусі, яе ўплыў на сферу дашкольнай адукацыі.
4. Статус беларускай мовы для рускамоўных дзяцей у Беларусі.
5. Асаблівасці руска-беларускага двухмоўя ў дзяцей дашкольнага ўзросту
6. Праблемы ранняга двухмоўя:

А) Узрост, спрыяльны для пачатку авалодання другой мовай.

Б) Суадносіны роднай і другой моў у адукацыйным працэсе.

В) Уплыў двухмоўя на разумовае развіццё дзяцей дашкольнага ўзросту.

Г) Праблема засваення другой мовы як сродку камунікацыі.

7. Лінгвакультуралагічны аспект ў навучанні дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове.
8. Мэтавыя арыентацыі навучання беларускай мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму.

1. Мова як галоўная каштоўнасць народа. Мова і культура народа

Метадалагічнымі асновамі методыкі развіцця маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту, у тым ліку беларускага ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму, з'яўляецца тэорыя пазнання, гнасеалогія. А іменна такія яе палажэнні: мова – гэта грамадская з'ява; мова – сродак зносін і ўзаемапаразумення паміж людзьмі; узаемасувязь мовы, свядомасці і мыслення; мова і паняцці; сувязь мовы і гісторыі; практыка – крытэрый ісціны.

Вядучымі *метадалагічнымі пазіцыямі* развіцця маўлення і навучання дашкольнікаў беларускай мове ў адпаведнасці з культуралагічным і асобасна арыентаваным падыходамі з'яўляюцца наступныя.

Мова – базісны элемент культуры чалавека. У жыцці чалавека мова, перш за ўсё, выступае як ўніверсальны сродак зносін, мысліцельнай дзейнасці, спосаб пазнання навакольнай рэчаіснасці, у шырокім сэнсе слова – грамадска-гістарычнага вопыту чалавецтва. У гэтым заключаюцца першасныя сацыяльныя функцыі мовы. Яна з'яўляецца тым культурна-гістарычным асяроддзем, якое фарміруе асобу чалавека.

Другаснай сацыяльнай функцыяй мовы выступае яе праяўленне як этнамовы. Разам з агульнымі элементамі грамадска-гістарычнага вопыту ў мове праяўляюцца і нацыянальна-культурныя элементы, якія фіксуюцца ў яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

структуры (лексіка-граматычных формах, фразеялагізмах, формах маўленчага этыкету і г.д.). Таму навукоўцы сцвярджаюць, што мова – гэта люстэрка жыцця і працы народа. Так, у беларускай мове больш за 20 назваў *балота*, якое з'яўляецца прыкметнай адзнакай беларускага ландшафту (*багна, бездань, дрыгва, імшара* і інш.).

Такім чынам, у роднай мове выражаюцца і замацоўваюцца змест культуры народа, уласцівыя яму ідэалы і каштоўнасці, спосабы мыслення і ўзаемадзеяння, маральныя нормы і гістарычны вопыт. Па словах рускага педагога К.Дз.Ушынскага, «увесь след свайго духоўнага жыцця народ клапатліва захоўвае ў родным слове», менавіта таму родная мова – гэта вялікі настаўнік для дзіцяці. Тую ж думку праводзіў беларускі народны паэт і педагог Якуб Колас, які неаднаразова падкрэсліваў, што «родная мова – гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет».

Гэта значыць, нацыянальна-культурная функцыя моўных сродкаў дазваляе далучацца да нацыянальных каштоўнасцей, спасцігаць іх асаблівасці ў значнай меры ўласна мовай народа. Таму мова аказвае моцны ўплыў на духоўнае развіццё дзіцяці, дапамагае яму глыбей увайсці ў разуменне прыроды і жыцця.

Паколькі мова з'яўляецца формай існавання духоўнай культуры народа (фальклору, літаратуры, рэлігіі, філасофіі і т.д.), паўнацэннае вывучэнне мовы – гэта, перш за ўсё, далучэнне да духоўных каштоўнасцей сваёй нацыі. У той жа час навучанне мове ў кантэксце культуры мае на ўвазе і фарміраванне ў дзяцей каштоўнасных адносін да яе як першаэлемента культуры.

Таму сучасны падыход да развіцця маўлення і маўленчых зносін дзяцей ажыццяўляецца згодна з формулай расійскага даследчыка Я.І. Пасава «*культура праз мову і мова праз культуру*».

2. Сутнасць паняццяў «родная мова», «нацыянальная мова», «другая мова», «замежная мова»

Для ўстанаўлення змястоўнай характарыстыкі паняцця «родная мова» існуе некалькі крытэрыяў. Так, расійскі сацыялінгвіст М.В. Дз'ячэнка прапануе тры крытэрыі: паходжанне мовы; кампетэнцыі і функцыянальнасць; ідэнтыфікацыя.

Родная мова, згодна з вызначэннем А.А. Лявонцьева, – гэта мова, якую чалавек спасцігае адначасова з узнікненнем і развіццём здольнасці мысліць. Да роднай мовы далучаюцца з маленства, яе засвойваюць у сітуацыі натуральных зносін дзіцяці з дарослымі.

Паводле. Л.С. Выготскага, дзіця паступова нібы «ўрастае само па сабе» ў роднае маўленне. У аснове гэтага працэсу ляжыць спачатку імітацыя маўлення дарослага, а затым (прыкладна пасля 1 г. 6-8 м.) – актыўнае творчае авалоданне мовай шляхам неўсвядомленага абагульнення і элементарнага ўсведамлення моўных з'яў (Ф.А. Сахін, А.Г. Тамбоўцава, Т.М. Ушакова, К.І. Чукоўскі, А.М. Шахнаровіч і інш.).

Беларуская даследчыца Т.М. Мікуліч вызначае родную мову, як мову, на якой індывід найбольш часта і свабодна гаворыць. У дадзеным вызначэнні на першы план выходзяць *крытэрыі кампетэнтнасці і функцыянальнасці.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Народная мова, паводле класіфікацыі А.А. Лявонцьева, можа быць двух відаў – другая, што ўжываецца ў той супольнасці, у якой развіваецца дзіця, і замежная.

Другая мова можа быць мовай нацыянальна-моўнай меншасці, дзяржаўная або афіцыйная мова (для тых, для каго яна не з'яўляецца роднай), а таксама мова міжэтнічных зносін.

Што да вызначэння *замежнай мовы*, то, калі носьбітаў дадзенай мовы ў моўным асяроддзі асобы няма або практычна няма, то гэта – *замежная мова.*

Разам з паняццем *«родная мова»* можна пачуць паняцце *«нацыянальная мова»*. Паводле вызначэння Т.М. Мікуліч**,** *нацыянальная (этнічная) мова* – гэта мова, характэрная для дадзенага этнасу, якая з'яўляецца яго прыкметай. У дадзеным вызначэнні на першы план выходзіць *крытэрый ідэнтыфікацыі.*

3. Сацыялінгвістычная сітуацыя ў Беларусі, яе ўплыў на сферу дашкольнай адукацыі

Распрацоўка тэарэтыка-метадалагічных асноў развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту патрабуе ўліку сацыяльных умоў, у якіх адбываецца авалоданне мовай.

Станаўленне білінгвальнай дашкольнай адукацыі ў рэспубліцы, распачатае з другой паловы 80-х гг., працягвалася і далей.

У 1991 г. быў прыняты Закон «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», у якім рэгламентаваліся прававыя нормы дзейнасці вучэбных і выхаваўчых устаноў усіх ступеняў нацыянальнай адукацыйнай сістэмы. Дадзены закон, абапіраючыся на Закон «Аб мовах у Беларускай ССР», вызначаў беларускую мову асноўнай мовай усіх тыпаў і відаў адукацыйных устаноў рэспублікі.

У канцы 1996 г., ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь былі ўнесены кардынальныя змяненні, у тым ліку і ў арт. 17, згодна з якім разам з беларускай рускай мове надаваўся статус дзяржаўнай. А ў 1998 г. быў прыняты Закон «Аб змяненнях і дапаўненнях у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь», які быў накіраваны на дасягненне аднолькавага юрыдычнага статуса дзвюх моў.

Такія чынам, сучасная моўная сітуацыя ў Беларусі характарызуецца суіснаваннем і выкарыстаннем рускай і беларускай моў і можа быць вызначана як руска-беларускае двухмоўе.

Руска-беларускае двухмоўе ў нашай краіне прадстаўлена:

- індывідуальным беларуска-рускім двухмоўем, калі побач з беларускай мовай двухмоўны індывід выкарыстоўвае і рускую мову;
- руска-беларускім двухмоўем, калі побач з рускай мовай двухмоўны індывід выкарыстоўвае беларускую мову;
- індывідуальным беларускім ці рускім аднамоўем.

Наяўнасць у Рэспубліцы Беларусь дзвюх дзяржаўных моў, спецыфіка руска-беларускага двухмоўя абумоўліваюць асаблівасці функцыянавання сістэмы дашкольнай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Статус беларускай мовы для рускамоўных дзяцей у Беларусі.

Маўленчае развіццё дзяцей у Рэспубліцы Беларусь адбываецца ў спецыфічнай сацыялінгвістычнай сітуацыі руска-беларускага блізкароднаснага двухмоўя.

Для большасці дзяцей першай мовай, на якой яны вучацца гаварыць і думаць, мець зносіны з акружаючымі іх людзьмі, з'яўляецца руская мова. Беларуская мова выступае для іх па чарговасці засваення як другая. У той жа час беларуская мова для беларускіх дзяцей асэнсоўваецца ў грамадстве як родная мова (па крытэрыі прыналежнасці да пэўнага этнасу), на аснове якой ажыццяўляецца іх нацыянальна-культурная сацыялізацыя (інкультурацыя).

Можна сцвярджаць, што для дзяцей, якія з маленства авалодваюць маўленнем на рускай мове, роднымі з'яўляюцца дзве мовы – руская і беларуская. Руская – паводле крытэрыяў першачарговасці засваення, кампетэнтнасці і функцыянальнасці, а беларуская – паводле крытэрыя прыналежнасці да пэўнага этнасу.

Для меншай часткі дзяцей, якія з маленства авалодваюць беларускай мовай, таксама роднымі выступаюць дзве мовы. Беларуская – паводле крытэрыяў першачарговасці засваення, прыналежнасці да пэўнага этнасу, кампетэнтнасці і руская мова – паводле крытэрыя функцыянальнасці, паколькі ў моўным асяроддзі пераважае руская мова. (Нярэдка абедзьве мовы ў такіх дзяцей безкантрольна змешваюцца.)

Такім чынам, мова выступае не толькі як спосаб захавання духоўнасці і культуры, але і ў пэўнай ступені як сродак іх фарміравання.

Што да ўстановы дашкольнай адукацыі, у якой забяспечваецца этнізацыя асобы, г.зн. натуральнае ўваходжанне дзіцяці ў духоўны свет і традыцыйнае жыццё роднага народа, у культуру нацыі як састаўную частку агульначалавечай культуры, то яна выступае ў якасці ***нацыянальнай ўстановы дашкольнай адукацыі.***

1. Асаблівасці руска-беларускага двухмоўя ў дзяцей дашкольнага ўзросту

Калі дзве мовы ўжываюцца ізалявана адна ад другой (напрыклад, на працы – адна мова, дома – другая), то гаворка ідзе пра чысты білінгвізм, калі ж дзве мовы ўжываюцца ўперамешку (залежыць ад камунікатыўнай сітуацыі), то гэта змешаны білінгвізм. Змешаны білінгвізм, ў сваю чаргу, падзяляецца ў залежнасці ад ступені разумення носьбітам народнай мовы на рэцэптыўны, рэпрадуктыўны і прадуктыўны. (Гл. Псіхолага-лінгвістычную характарыстыку білінгвізму.)

Стыхійнае маўленчае развіццё дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі характарызуецца рэцэптыўным і ў пэўнай ступені рэпрадуктыўным двухмоўем. З дапамогай метадаў назірання, гутарак, аўдзіравання і інш. было выяўлена, што нават дзеці малодшага дашкольнага ўзросту здольныя успрымаць і разумець беларускае маўленне (напрыклад, казкі, асабліва калі іх расказванне суправаджаецца паказам малюнкаў або інсцэніроўкай), ўзнаўляць некаторыя яго элементы (забаўлянкі, вершы, асобныя словы і выразы). Гэта адбываецца дзякуючы блізкасці рускай и беларускай моўных сістэм. Нават калі нейкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

элемент паведамлення невядомы, агульны сэнс выказвання ўсё ж аказваецца зразумелым.

У двухмоўным асяроддзі дзеці ў дашкольным узросце пачынаюць усведамляць існаванне беларускай мовы і тое, что яна адрозніваецца ад рускай. Даволі выразнае ўсведамленне дзвюх моўных сістэм выступае ў дзяцей сярэдняга дашкольнага ўзросту, у старэйшым яно набывае яшчэ большую выяўленасць.

Але з-за адсутнасці паўнацэннага беларускамоўнага асяроддзя ў рускамоўных дзяцей няма сапраўднай жыццёвай неабходнасці карыстацца беларускай мовай у штодзённым жыцці. Планаваць, арганізоўваць сваю дзейнасць, ажыццяўляць зносіны ім прасцей на рускай мове.

З другога боку, неарганізаванае засваенне беларускай мовы ў штодзённым жыцці прыводзіць да інтэрферэнцыі – “засмечанасці” адной і другой мовы: пранікненню ў рускае маўленне дзяцей беларусізмаў і ў беларускае – русізмаў. Напрыклад, гаворачы па-руску, некаторыя дзеці ўжываюць беларускія словы (*сварила* ***бурак***), граматычныя формы, уласцівыя беларускай мове (*гулять с папам*), дапускаюць арфаэпічныя і фанетычныя памылкі (*рЕмень, дзевачка*). Часта дзеці паралельна ўжываюць агульныя па значэнні словы абедзвюх моў (*кукла* і *лялька*, *сапожки* і *боцікі*, *картинка* і *малюнак*, *играть* і *гуляць* і інш.).

Такім чынам, пры стыхійным засваенні дзвюх блізкароднасных моў у дзяцей развіваецца сумешчаны механізм стварэння тэкстаў на гэтых мовах. Дзеці не заўважаюць сваіх памылак, у іх не фарміруецца – чуццё адной і другой мовы.

Памылкі інтэрферэнцыі ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму абумоўліваюцца ўплывам не заўсёды правільнага маўлення дарослых, часам адсутнасцю кантролю з боку дарослых за маўленнем дзяцей, а таксама неасэнсаваным характарам дзіцячага двухмоўя, несфарміраванасцю дыферэнцыраваных установак на карыстанне адной і другой мовамі.

Сказанае сведчыць пра тое, што авалодаць правільным беларускім маўленнем рускамоўныя дашкольнікі могуць толькі ў ходзе спецыяльна арганізаванага мэтанакіраванага навучання нацыянальнай мове.

2. Праблемы ранняга двухмоўя

Пытанні засваення дзецьмі дзвюх і болей моў з‘яўляюцца аб‘ектам пільнай увагі педагогаў, псіхолагаў, лінгвістаў. У *кола асноўных тэарэтычных праблем* даследчыкі ўключаюць наступныя:

- *узрост, з якога трэба пачынаць навучанне другой мове, узроставы псіхалагічны фактар, які выступае зыходным пунктам такога навучання;*
- *суадносіны роднай і другой моў у навучальным працэсе;*
- *уплыў двухмоўя на разумовае развіццё дзяцей;*
- *праблема засваення другой мовы як сродку камунікац****ыі.***

7. Лінгвакультуралагічны аспект ў навучанні дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове.

Нацыянальна-культурная функцыя моўных сродкаў дазваляе далучацца да нацыянальных каштоўнасцей, спасцігаць іх асаблівасці ў значнай меры

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўласна мовай народа. Менавіта веданнем значэнняў слоў нацыянальнай мовы, па сцвярджэнні вучоных, фарміруецца моўная свядомасць. Этнамова як кампанент этнасвядомасці накладвае пэўныя карэктывы на ўспрыманне і інтэрпрэтацыю чалавекам навакольля.

Ва ўстанове дашкольнай адукацыі, асабліва ў адносінах да дзяцей старшага дашкольнага ўзросту, размова павінна ісці не проста аб навучанні мове, але аб моўнай адукацыі, якая, па сцвярджэнні даследчыкаў, з'яўляецца залогам авалодання культурай. Моўная адукацыя арыентавана не толькі на навучанне дзіцяці асноўным відам вуснага маўлення, але і на фарміраванне ў яго асобасна значнага, станоўчага эмацыянальнага і творчага стаўлення да працэсу пазнання нацыянальнай культуры сродкамі роднай мовы – згодна з формулай "культура праз мову і мова праз культуру". Мэтай моўнай адукацыі з'яўляецца само дзіця як чалавек культуры.

У адносінах да моўнай адукацыі на беларускай мове можна гаварыць аб паняцці *нацыянальна-моўнай адукацыі*, у працэсе якой дзіця ўваходзіць у родную нацыянальную моўную культуру, у яе прастору, якая складаецца падчас змястоўнага суразмоўніцтва на беларускай мове.

На нацыянальна-культурнай функцыі мовы заснаваны *лінгвакультуралагічны падыход да навучання мове*, які забяспечвае, з аднаго боку, уваходжанне ў нацыянальную і сусветную культуру ў працэсе авалодання маўленнем на беларускай мове, а з другога – авалоданне беларускай мовай на аснове спасціжэння нацыянальнай культуры.

Менавіта таму узнікае задача як мага больш ранняга – з моманту наведвання дзіцем установы дашкольнай адукацыі – далучэння дашкольнікаў да роднага слова шляхам увядзення ў нацыянальна-культурны фон беларускай мовы, пра што ўжо ўзгадвалася раней.

Можна вылучыць наступныя *метадычныя напрамкі рэалізацыі лінгвакультуралагічнага падыходу* да развіцця беларускага маўлення ў рускамоўных дзяцей дашкольнага ўзросту: 1) спасціжэнне каштоўнасцей і рэалій нацыянальнай культуры; 2) засваенне дзецьмі нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы; 3) навучанне беларускай мове ў дыялозе культур.

8. Мэтавыя арыентацыі навучання беларускай мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму.

Навучанне будуецца ў адпаведнасці з дыдактычнымі, выхаваўчымі, развіццёвымі і сацыялізуючымі мэтавымі арыентацыямі.

- *Дыдактычныя:* фарміраванне ўважлівых адносінаў да моўных норм беларускай мовы, развіццё звязнасці беларускага маўлення, культуры маўленчых зносін.
- *Выхаваўчыя:* развіццё асобы, узбагачэнне ўнутранага духоўнага свету, выхаванне станоўчых адносін і любасці да роднай мовы, фарміраванне духоўнасці, нацыянальнага светапогляду.
- *Развіццёвыя:* развіццё моўнай здольнасці, інтэлектуальных аперацый аналізу, параўнання, абагульнення, творчых здольнасцей.
- *Сацыялізуючыя:* далучэнне да нацыянальнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура асноўная

1. Куфтяк, Е.В. Билингвизм у детей: влияние на когнитивно-коммуникативное развитие и инструменты измерения / Е.В. Куфтяк, А.М. Ханукова, Е.В. Пойманова // Современное дошкольное образование. – 2019. – № 2. – С. 30 – 39.

2. Свірыдзенка, В.І. Фарміраванне маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў : тэорыя і практыка / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : БДПУ, 2019. – С 8 -23.

3. Старжынская, Н.С. Сучасныя падыходы да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту / Н.С. Старжынская // Пралеска. – 2016. - № 10. – С. 3 – 8.

Літаратура дадатковая

4. Старжынская, Н.С. Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў / Н.С. Старжынская. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 223 с.

Тэма 2. 1 Этапы станаўлення двухмоўнага выхавання і навучання дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі (лекцыя – 2 гадзіны ксрс)

Пытанні для вывучэння

1. Грамадска-палітычныя перадумовы навучання дзяцей беларускай мове ў XIX стагоддзі.
2. Першыя вучэбныя дапаможнікі на беларускай мове ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX стагоддзя.
3. Грамадска-палітычныя перадумовы станаўлення білінгвальнага выхавання дзяцей у Беларусі.
4. Перыядызацыя білінгвальнай дашкольнай адукацыі ў другой палове XX стагоддзя, пачаткуXXI стагоддзя (паводле Т.У. Паліевай).

1. Грамадска-палітычныя перадумовы навучання дзяцей беларускай мове ў XIX стагоддзі

У працэсе станаўлення і развіцця дашкольнай лінгвадыдактыкі ў Беларусі даследчыкі (Т.У. Паліева, Н.С. Старжынская) ўмоўна вылучаюць некалькі перыядаў.

І перыяд: другая палова XIX ст. - пачатак XX ст. – абгрунтаванне значэння роднай мовы для выхавання асобы.

Ідэя аб закладцы нацыянальнай школы была досыць папулярнай сярод беларускага народа ў канцы XIX - на пачатку XX ст. Рашуча і паслядоўна выступалі за адраджэнне беларускай літаратуры і мовы, стварэнне беларускай нацыянальнай школы такія вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага адраджэння канца XIX - пачатку XX ст., як Э. Пашкевіч (Цётка), Якуб Колас, Янка Купала, С. Палуян, М. Багдановіч і інш. Асабліва вялікі ўклад у абарону беларускай мовы як «яркаму выяўленню народнасці» ўнёс народны паэт Беларусі і педагог Якуб Колас.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Народны паэт Янка Купала ў многіх сваіх працах таксама падкрэсліваў неабходнасць арганізацыі народных школ з навучаннем на роднай мове, сцвярджаючы, што свабода і годнасць народа непарыўна звязаны з яго нацыянальнай культурай, душой якой з'яўляецца мова.

Асаблівую цікавасць з пункту гледжання сучаснай сацыялінгвістычнай сітуацыі ў Беларусі выклікаюць погляды вядомага беларускага паэта і літаратуразнаўцы М.А. Багдановіча. Выступаючы за авалоданне дзецьмі роднай беларускай мовай з першага дня навучання, М. Багдановіч звяртаў увагу і на ўзаемасувязь у выкладанні дзвюх роднасных моў – беларускай і рускай.

Дзейнасць беларускіх асветнікаў не прайшла дарэмна. У 1914 г. царскі ўрад нарэшце дазволіў адкрыць беларускія школы. Але з'явіліся нацыянальныя школы толькі пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.

2. Першыя вучэбныя дапаможнікі на беларускай мове ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX стагоддзя

II перыяд развіцця айчыннай лінгвадыдактыкі: пачатак XX ст - 20-я гг. XX ст. – стварэнне першых падручнікаў для дзяцей на беларускай мове, пошукі зместу моўнай адукацыі.

Сярод першых аўтараў беларускіх падручнікаў – паэтка Цётка. Ёю былі падрыхтаваны такія вучэбныя кнігі, як «Гасцінец для малых дзяцей» (на лацініцы) і *«Першае чытанне для дзяцей-беларусаў»* (абодва ў 1906 г.). Дзейнасць Цёткі па выданні чытанак для дзяцей першага года навучання паклала пачатак развіццю навучання на роднай мове. Якуб Колас таксама стварыў кнігу для чытання, па якой маглі вучыцца дзеці ў беларускай школе. Гэта было *«Другое чытанне для дзяцей-беларусаў»,* выдадзенае ў 1909 г. «Другое чытанне» справядліва лічыцца вызначальным этапам на шляху станаўлення нацыянальнай літаратуры для дзяцей.

Адзначым у справе выдання вучэбных кніг для дзяцей і В. Ластоўскага. Ім у 1915 г. быў выдадзены падручнік «Першая чытанка, кніжыца для беларускіх дзетак дзеля навукі чытання». Асаблівасць гэтай вучэбнай кнігі ў тым, што на яе старонках ўпершыню для вучняў пачатковай школы даваліся матэрыялы аб гістарычным мінулым Беларусі.

3. Грамадска-палітычныя перадумовы станаўлення білінгвальнага выхавання дзяцей у Беларусі

*III перыяд***:** станаўленне непасрэдна дашкольнай лінгвадыдактыкі – 20-40-я гг. XX ст. – першапачатковая распрацоўка пытанняў зместу і метадаў навучання дзяцей мове, сцвярджэнне методыкі развіцця маўлення дашкольнікаў як асобнай галіны.

У пачатку 20-х гг. XX ст. школы Беларусі пераходзілі на навучанне на роднай мове. Таму з'яўленне ў 1926 г. метадычнага дапаможніка Якуба Коласа «Методыка роднае мовы» было вельмі своечасовым. Заслуга аўтара ў тым, што ён сістэматызаваў усё тое каштоўнае, што выказвалася ў педагагічнай літаратуры ў галіне методыкі першапачатковага навучання, абгрунтаваўшы гэта з улікам спецыфікі выкладання беларускай мовы.

Заснавальніцай дашкольнай лінгвадыдактыкі ў Беларусі з'яўляецца Уладзіслава Францаўна Луцэвіч, жонка і паплечніца Янкі Купалы. Галоўным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

напрамкам работы Уладзіславы Францаўны як педагога (а яна працавала выхавальніцай і загадчыцай дзіцячага сада № 8 г. Мінска, які меў статус апорнага) было развіццё асобы дзіцяці сродкамі роднага слова, знаўцай і выдатным прапагандыстам якога яна з'яўлялася.

Яна збірала і сама апрацоўвала для дзяцей беларускія казкі, якія выйшлі асобнымі выданнямі. Уладзіслава Францаўна выдала і некалькі зборнікаў вершаў і казак для дзяцей.

У гэты ж перыяд выйшлі працы паплечніц Ул.Ф. Луцэвіч: М.І. Савёнак («Расказванне ў дашкольных установах») і Н.І. Каржовай («Грамата ў дашкольных установах і «0» групах школ»), якія працавалі пад яе кіраўніцтвам. Разам яны здолелі стварыць цэласную сістэму выхавання і навучання роднай мове сродкамі мастацкай літаратуры, што адпавядала патрабаванням таго часу.

4. Перыядызацыя білінгвальнай дашкольнай адукацыі ў другой палове XX стагоддзя, пачаткуXXI стагоддзя (паводле Т.У. Паліевай)

IV *перыяд***:** 40-80-я гг. XX ст. – далейшая распрацоўка пытанняў зместу і метадаў навучання дзяцей мове, стварэнне метадычнага забеспячэння працэсу развіцця маўлення дзяцей, пастаноўка праблемы руска-беларускага двухмоўя ў дашкольнікаў.

Асноўны акцэнт у вырашэнні праблемы беларускамоўнага развіцця дзяцей па-ранейшаму рабіўся на азнаямленні іх з беларускай мастацкай літаратурай (В. В. Рэгель, Д. П. Шышонак і інш.). У рэспубліцы дзейнічала распрацаваная ў АПН СССР «Программа воспитания в детском саду», у якую былі ўнесены нязначныя дапаўненні па азнаямленні дзяцей з беларускай прыродай, фальклорам, літаратурай і музыкай. Так, у праграму былі ўключаны толькі 14 беларускіх вершаў і казак. Методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў ў тыя гады не распрацоўвалася. Выхавальнікі дашкольных устаноў працавалі па метадычных дапаможніках, выдадзеных у Расіі, праводзячы заняткі па развіцці маўлення на рускай мове.

Але з канца з 70-х гг. у Беларусі пачалі паступова з'яўляцца першыя метадычныя распрацоўкі па навучанні дашкольнікаў беларускай грамаце і азнаямленні з беларускай мастацкай літаратурай (Л.А. Талер, А.А. Каляда, Н.С. Старжынская, Н.І. Маскаленка), прызначаныя для навучання дзяцей, для якіх беларуская мова была роднай (першай засвоенай).

У тыя часы з'явілася даследаванне, праведзенае на пачатку 70-х гг. Е. Г. Андрэевай, у якім раскрываліся некаторыя асаблівасці руска-беларускага маўлення дашкольнікаў. Даследчыца абазначыла неабходнасць арганізацыі паслядоўнага і грунтоўнага навучання беларускай мове дашкольнікаў шляхам уключэння ва ўсе віды дзейнасці ў дзіцячым садзе і правядзеннем спецыяльных заняткаў.

*V перыяд***:** канец 80-х гг. XX ст. - пачатак XXI ст. – распрацоўка тэарэтычных асноў дашкольнай лінгвадыдактыкі па асноўных напрамках развіцця маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя, стварэнне адпаведных метадычных дапаможнікаў.

З 1988 г. ва ўсіх дашкольных установах Беларусі былі ўведзены абавязковыя заняткі па азнаямленні дзяцей з беларускай мовай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рэкамендавалася праводзіць па-беларуску заняткі па азнаямленні з навакольлем і з'явамі грамадскага жыцця. (Гэта было падмацавана і прынятым у 1990 г. законам "Аб мовах у БССР"). Як аказалася, у сістэме дашкольнага выхавання шмат шчырых прыхільнікаў адраджэння роднага слова.

У гэты час з друку выйшлі метадычныя дапаможнікі па развіцці беларускага маўлення дашкольнікаў, падрыхтаваныя В. Ляшук (1997 г.), В. Кукса (1998 г.), Н.С. Старжынскай (1993 г., 1995 г.) і інш. Па ранейшаму шмат матэрыялу па развіцці беларускага маўлення друкавалася ў часопісу "Пралеска".

Цэласная тэхналогія маўленчага і лінгвістычнага развіцця дашкольнікаў у сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя была прадстаўлена Н.С. Старжынскай у канцы 90-х гг. Значны ўклад у распрацоўку гэтай праблемы ўнесла Дз. М. Дубініна.

Такім чынам, у перыяд з другой паловы 80-х гг. да цяперашняга часу забеспячэнне дыдактычнымі рэсурсамі дашкольнай адукацыі, што функцыяніруе ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму ажыццяўляецца на трох напрамках:

- метадычнае забеспячэнне працэсу навучання беларускай мове дзяцей, для якіх яна з'яўляецца першай засвоенай і асноўнай функцыянальнай мовай;
- стварэнне методыкі навучання рускамоўных дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове як другой роднай мове, развіцця іх беларускамоўных зносін;
- распрацоўка метадычных дапаможнікаў, у якіх прадугледжваецца выкарыстанне беларускай і рускай моў ва ўсіх відах дзейнасці дзяцей ва ўстанове дашкольнай адукацыі.

У сукупнасці рэалізацыя ўсіх трох напрамкаў садзейнічае развіццю білінгвальнай дашкольнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Літаратура асноўная

1. Палиева, Т.В. Развитие дошкольного образования Беларуси в условиях билингвизма во второй половине XX века: пособие / Палиева, Т. В. – Мозырь : УО МГПУ имени И. П. Шамякина, 2008. – 89 с.

Літаратура дадатковая

2. Андрэева, Е.Г. Адукацыя і педагагічная думка Беларусі: старонкі гісторыі: перыяд беларусізацыі / Е.Г. Андрэева, Л.М. Лыч. // Пач. школа. – 2001. – № 8.

3. Концепция дошкольного образования РБ // Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства адукацыі РБ. – Мінск : Нар. асвета, 2000. – № 10.

4. Луйгас, Т. Роль журнала "Лучынка" на этапе формирования белоруской детской журналистики / Т. Луйгас // Матэрыялы 7-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Журналістыка – 2005": Надзённыя праблемы. Перспектывы / рэдкал.: С.В. Дубовік [і інш.]. – Мінск : ААТ "Чырвоная зорка", 2007. – Вып. 7. – С. 424.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Паліева, Т.У. Праблемы дзіцячага беларуска-рускага білінгвізму / Т.У. Паліева // Пач. навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. – 2005. – № 3. – С. 8–16.

6. Пралеска. Выхаванне і навучанне дзяцей у дашкольнай установе. Базісная праграма і метадычныя рэкамендацыі / пад агул. рэд. Л.А. Панько. – 2-е выд. – Мінск : НМЦэнтр, 2000. – 448 с.

7. Старжынская, Н.С. Гісторык дашкольнай педагогікі / Н.С. Старжынская, Т.У. Паліева // Пралеска. – 2006. – № 12. – С. 31.

Тэма 3.1. Мэта, задачы і змест развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя
(лекцыя – 2 гадзіны)

Пытанні для вывучэння

1. Стратэгія навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

2. Мэта навучання беларускай мове. Задачы навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

3. Сістэматызацыя зместу развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі, адукацыйная галіна "Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін".

1. Стратэгія навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя

Агульная стратэгія развіцця беларускага маўлення і навучання дашкольнікаў беларускай мове як роднай *вызначае суадносіны стыхійнай і арганізаванай форм авалодання дашкольнікамі беларускай мовай* і ступень кіруемасці кожнай з іх.

Псіхалагічна правільным шляхам навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове як другой па чарговасці засваення, але роднай па прыналежнасці да пэўнага этнасу, развіцця ў іх беларускага маўлення з'яўляецца той шлях, які спалучае, з аднаго боку, неўсвядомленае засваенне беларускай мовы ў штодзённых зносінах (нерэгламентаванай дзейнасці), развіццё "беларускамоўнага чуцця", а з другога – спецыяльна арганізаванае навучанне. Іншымі словамі, развіццё беларускага маўлення трэба весці і "знізу ўверх", і "зверху ўніз" (гл. мал. 1).

Такім чынам, працэс навучання будуецца, па-першае як адносна стыхійнае і ў пэўнай ступені ўпарадкаванае авалоданне дзецьмі маўленчымі навыкамі ў працэсе штодзённых зносін на беларускай мове; а па-другое, арганізаванае навучанне метадычна нармаваным моўным сродкам на занятках. У выніку *ў працэс навучання ўключаюцца спантанная маўленчая дзейнасць у штодзённых зносінах, мастацка-маўленчая дзейнасць як у нерэгламентаванай дзейнасці, так і на занятках, а таксама вучэбна-маўленчая і моўная пазнавальная дзейнасці* на занятках па развіцці беларускага маўлення і навучанні грамаце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Мэта і задачы навучання дзяцей беларускай мове ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання

Мэтай моўнай адукацыі з'яўляецца само дзіця як чалавек культуры.

Зыходзячы са сказанага, *галоўная мэта* развіцця беларускага маўлення рускамоўных дзяцей дашкольнага ўзросту і навучання беларускай мове як роднай (па крытэрыі прыналежнасці да пэўнага этнасу) вызначаецца як развіццё асобы кожнага дзіцяці, узбагачэнне яго ўнутранага духоўнага свету, выхаванне ў дзяцей любові і павагі да роднага слова (улічваючы наяўнасць дзвюх родных моў, любоў і павага выхоўваюцца да рускай і беларускай моў).

Выкананне галоўнай мэты цесна звязана з другой мэтай, якая звязана з практычнымі маўленчымі навыкамі дзіцяці, і заключаецца ў фарміраванні ў выхаванцаў чуйнасці да моўных норм і сродкаў выразнасці абедзьвюх моў; умення карыстацца беларускай мовай у вусных відах маўленчай дзейнасці: разумець пачутае і ствараць нескладаныя самастойныя выказванні ў залежнасці ад мэты і задач камунікацыі.

Выхавальнік дашкольнай адукацыі імкнецца сфарміраваць у дзяцей маўленчую дзейнасць на беларускай мове, стварыць перадумовы для выхавання двухмоўнай асобы.

Задачы навучання дзяцей беларускай мове ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання:

- далучэнне дзяцей да нацыянальнай мовы як феномена культуры, у якім знайшлі адбітак яе праяўленні, выпрацоўка ўменняў карыстацца даступнымі культуразнаўчымі звесткамі з мэтай забеспячэння камунікацыі (лінгвакультуралагічная кампетэнцыя);
- фарміраванне камунікатыўных уменняў на беларускай мове, уменняў ствараць самастойныя вусныя выказванні (камунікаўная кампетэнцыя);
- засваенне практычных маўленчых уменняў: тэматычнага слоўніка беларускай мовы; сінтаксічных уменняў, уменняў змяняць словы па формах і ўтвараць словы; правільна вымаўляць спецыфічна беларускія гукі і словы з імі (моўная кампетэнцыя);
- развіццё сродкамі мовы інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўнай, маральнай культуры выхаванцаў.

3. Сістэматызацыя зместу развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі, алукацыйная галіна "Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін"

Вырашэнне праблемы беларускамоўнага развіцця дзяцей ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму патрабуе арганізацыі зместу навучання дашкольнікаў роднай мове ў пэўную сістему.

Працэс развіцця маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту і навучання іх роднай мове ўключае «камунікатыўнае развіццё», «маўленчае развіццё» і звязанае з двума першымі «кагнітыўнае развіццё». Такім чынам, *сістэма развіцця беларускага маўлення і навучання беларускай мове дзяцей у сітуацыі руска-беларускага двухмоўя складваецца з асноўных узаемазвязаных паміж сабой накірункаў развіцця маўлення дашкольнікаў: функцыянальнага, структурнага і кагнітыўнага* (Ф.А.Сахін). Гэтыя накірункі былі вызначаны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

навукоўцам у дачыненні да развіцця рускага маўлення выхаванцаў. Але яны маюць не меншую значнасць і для развіцця маўлення дзяцей і на другой блізкароднаснай (беларускай) мове. Кожны з накірункаў уключае розныя раздзелы маўленчай работы, рэалізацыя якіх, у сваю чаргу, патрабуе сістэматызацыі зместу навучання, а таксама ўліку асаблівасцей станаўлення ў дзяцей рускага (першага) маўлення, апоры на яго дасягненні, з аднаго боку, і пераадолення адмоўнага ўздзеяння адной мовы на другую, з другога.

Функцыянальны напрамак арыентаваны на развіццё і ўдасканаленне ў дзяцей камунікатыўных формаў і функцый маўлення.

Структурны напрамак развіцця маўлення прадугледжвае фарміраванне ў дзяцей практычных маўленчых навыкаў: узбагачэнне, замацаванне і актывізацыю беларускага слоўніка дзяцей, фарміраванне граматычнага ладу беларускага маўлення, выхаванне гукавой культуры беларускага маўлення.

Нарэшце, *кагнітыўны напрамак* ставіць на мэце развіццё ў дзяцей элементарнага асэнсавання маўленчай рэчаіснасці, якое можа быць названа лінгвістычным развіццём дзіцяці.

Цэласнасць рабоце па названых напрамках развіцця маўлення дзяцей надае сінхранічная і дыяхранічная ўзаемасувязь усіх раздзелаў маўленчай работы ў розных узроставых групах.

Згодна з вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі ўжо ў другой палове першага года жыцця дзіцяці неабходна ствараць умовы для выканання гульнявых дзеянняў па просьбе дарослага (ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання прадугледжваецца прапаноўваць малым выконваць не толькі «ладушки», але і «ладачкі» і інш.). У рабоце з дзецьмі ад 9 да 12 месяцаў працягваць развіваць разуменне маўлення: выкарыстоўваць у зносінах з дзецьмі назвы навакольных прадметаў; стымуляваць рэакцыі на прапановы, якія заахвочваюць да актыўнага дзеяння з прадметамі (Зноў разам з прапановай “Покажи, как сорока-ворона деток кормила” папрасіць і па-беларуску: Зрабі кую-кую ножку.).

У групе ранняга ўзросту (ад 1 да 2 гадоў) малым з самага пачатку прапануюцца для ўспрымання простыя творы як на рускай, так і на беларускай мове, дзеці вучацца ўзнаўляць гукаперайманьныя словы з іх.

У першай малодшай групе (ад 2 да 3 год) у дзяцей фарміруецца ўменне ўспрымаць і ўзнаўляць элементы простых твораў на белорускай и рускай мовах (гукапераймання, асобыя словы); пры садзейнічанні дарослага расказваць невялікія пацешкі.

У другой малодшай групе (ад 3 да 4 год) ўжо ставіцца на мэце фарміраванне ў выхаванцаў устойлівай цікавасці і станоўчых адносін да беларускай мовы, жаданне авалодаць ёй; станаўленне рэпрадуктыўнага маўлення дзяцей на беларускай мове. Пастаўленая мэта дасягаецца праз вырашанне шэрагу задач: развіваць элементарныя навыкі зносін на беларускай мове; фарміраваць уменне адрозніваць беларускае і рускае маўленне; навыкі ўзнаўлення кароткіх літаратурных твораў на беларускай мове; выхоўваць асновы нацыянальнага светапогляду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У сярэдняй групе (ад 4 да 5 год) ставіцца аналагічная мэта – фарміраванне ўстойлівай цікавасці і станоўчых адносін да беларускай мовы, жаданне авалодаць ёй; станаўленне рэпрадуктыўнага маўлення дзяцей на беларускай мове. Задачы: развіваць элементарныя навыкі зносін на беларускай мове; фарміраваць уменне адрозніваць беларускае і рускае маўленне; навыкі ўзнаўлення кароткіх літаратурных твораў на беларускай мове; выхоўваць асновы нацыянальнага светапогляду.

Але дзеці сярэдняга дашкольнага ўзросту вучацца не толькі разумець і ўзнаўляць размову на беларускай мове, але і авалодваюць элементарным прадуктыўным маўленнем.

Яны авалодваюць уменнем адказваць на пытанні па змесце мастацкіх твораў, карцін і пры апісанні цацак. К канцу вучэбнага года ствараюць асобныя выказванні, самастойныя па задуме і моўным афармленні.

Нарэшце, у старшай групе (ад 5 да 7 гадоў) ставіцца тая ж агульная мэта развіцця беларускага маўлення дзяцей: фарміраваць устойлівую цікавасць і станоўчыя адносіны да беларускай мовы, жаданне авалодаць ёю. Але задачы, накіраваныя на рэалізацыю пастаўленай мэты ўскладняюцца:

развіваць пазнавальныя і моўныя здольнасці, назіральнасць адносна моўных з’яў, моўных асаблівасцей беларускай мовы ў параўнанні з рускай, навыкі маўленчага самакантролю;

фарміраваць зносіны і сродкі зносін на беларускай мове, навыкі разумення беларускай мовы, уменне адказваць на пытанні дарослага, заахвочваць дзяцей да самастойных выказванняў на беларускай мове;

выхоўваць каштоўнасныя адносіны да багацця беларускай мовы.

Працягваецца развіццё прадуктыўнага маўлення: дзеці вучацца апісваць сітуацыю, вырашаць пэўную камунікатыўную задачу – просьбу, расказванне, тлумачэнне.

Зразумела, развіццё рэпрадуктыўнага, а затым і прадуктыўнага маўлення ва ўсіх узроставых групах ажыццяўляецца ва ўзаемасувязі з развіццём практычных маўленчых навыкаў (развіцця слоўніка, выхавання правільнага гукавымаўлення, фарміравання граматычна правільнага маўлення).

Тэма 3.2 Метадычныя прынцыпы і сродкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму (лекцыя – 2 гадзіны)

Пытанні для вывучэння

1**.** Псіхолага-педагагічныя і лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

2. Матывацыя маўленчых дзеянняў дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове.

3. Гульня як крыніца матыву маўленчай дзейнасці дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове.

3. Сродкі навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Псіхолага-педагагічныя і лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

Прынцыпы – гэта асноўныя правілы, вопыт адносна арганізацыі адукацыйнага працэсу, які ўплывае на заканамернасці працэсу навучання.

Сучасная лінгвадыдактыка кіруецца двума групамі прынцыпаў – агульнадыдактычнымі і метадычнымі.

Разам з тым існуюць і *спецыфічныя метадычныя прынцыпы арганізацыі педагагічнага працэсу па развіцці маўлення на другой мове (у нашым выпадку – на беларускай мове, якая па чарговасці засваення дзецьмі выступае як другая мова)* .

Гэта прынцыпы: адна асоба ў адной сітуацыі зносін – адна мова; фарміраванне моўных абагульненняў; уліку дасягненняў дзяцей у маўленні на рускай мове; апраксімацыі.

Прынцып «*адна асоба ў адной сітуацыі зносін – адна мова*».

Псіхолага-педагагічнай асновай навучання дашкольнікаў другой (у нашым выпадку – беларускай) мове ва ўмовах руска-беларускай білінгвальнай сітуацыі з’яўляецца тэорыя асаблівай успрымальнасці і цікавасці дзіцяці да засваення мовы ў дашкольным узросце.

Навучанне дзвюм мовам найбольш эфектыўна ажыццяўляецца ў сітуацыі «адна асоба – адна мова» (прынцып Грамонта).

Ва ўмовах грамадскага выхавання гэты прынцып атрымлівае некалькі іншае гучанне: *кожная мова павінна выкарыстоўвацца ў залежнасці ад умоў або акалічнасцей*. Такі падыход найбольш прыдатны для Беларусі, калі рускамоўныя дзеці авалодваюць беларускай мовай ва ўстанове дашкольнай адукацыі. Ранняе засваенне беларускай мовы рускамоўнымі дзецьмі дасць станоўчыя вынікі пры строгім захаванні ў зносінах з дзіцем прынцыпу «*адна асоба ў адной сітуацыі зносін – адна мова*». Гэта значыць, што адзін і той жа выхавальнік дашкольнай адукацыі можа выкарыстоўваць ў зносінах з дзіцем і рускую і беларускую мовы, але строга прытрымлівацца адной з іх на пэўных занятках, у гульнях і да т.п. або ў пэўныя дні.

На занятках па развіцці беларускага маўлення павінна гучаць толькі беларуская мова. На карысць такога падыходу гаворыць факт рэцэптыўнага двухмоўя ў дзяцей дашкольнага ўзросту. Нават калі які-небудзь элемент маўлення выхавальніка будзе незразумелым дзецям, яны будуць арыентавацца на агульны змест выказвання. Акрамя таго, выхавальнік дашкольнай адукацыі павінен шырока выкарыстоўваць нагляднасць, паказ дзеянняў і да т.п.

Зразумела, у так званыя беларускія дні, што час ад часу наладжваюцца ва ўстанове дашкольнай адукацыі, павінна гучаць выключна беларуская мова.

Важную ролю ў засваенні дзецьмі мовы адыгрывае фарміраванне *дыферэнцаванай маўленчай устаноўкі* на выкарыстанне беларускай або рускай мовы ў адпаведных сітуацыях зносін. Маўленчая ўстановка дапамагае пазбегнуць змешвання дзвюх моў у маўленчай практыцы, выступае перадумовай для пазбаўлення ад памылак інтэрферэнцыі.

Акрамя ўказанняў, на якой мове трэба размаўляць на дадзеных занятках або ў пэўны дзень, вельмі важна ствараць і знешнія ўмовы для ўзнікнення

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дыферэнцаванай установкі на беларускую мову. Напрыклад, праводзіць заняткі ў спецыяльным памяшканні, змяняць знешнія абставіны ў групавым пакоі ў так званы “беларускі дзень” і да т.п.

Падкрэслім, той факт, што дзеці пазнаюць навакольную рэчаіснасць сродкамі дзвюх моў, выклікае попыт на інтэграваны падыход да развіцця рускага і беларускага маўлення. Тут маецца на ўвазе азнаямленне дзяцей з тымі або іншымі з’явамі рэчаіснасці, абапіраючыся і на рускую, і на беларускую мову. Гэта дапамагае стварыць у дзіцяці адзіную карціну свету. У такім выпадку на занятках, якія праводзяцца на рускай мове, педагог абавязкова папярэджвае, што зараз ён назаве прадмет, з’яву па-беларуску. Напрыклад, на занятках па азнаямленні з прыродай дзеці знаёмяцца з вожыкам, яго паводзінамі. Выхавальнік у ходзе работы прапануе дзецям паслухать верш ці загадку пра вожыка. Пасля гаворыць, што зараз ён прачытае верш (загадку) на беларускай мове. Гэта таксама маўленчая установка на дыферэнцаванае ўжыванне адной з моў.

Прынцып фарміравання моўных абагульненняў – асноўны прынцып навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове

У аснове фарміравання моўнага механізму дзіцяці ляжаць змястоўныя абагульненні, якія ўзнікаюць у працэсе зносін з дарослымі і ўласнай практычнай дзейнасці і прыводзяць да вычлянення моўных элементаў, фарміравання іх значэнняў і правілаў аперыравання імі.

Алгарытм асэнсавання роднай (у нашым выпадку – рускай) мовы ляжыць у аснове пазнавальнай дзейнасці і пры засваенні другой (у нашым выпадку – беларускай) мовы (А.А.Лявонцьеў, А.М.Шахнаравіч, В.Пенфілд, Л.Робертс і інш.). Па даных псіхафізіялогіі, механізм, які развіваецца ў мозгу – той жа, незалежна ад таго, вывучае чалавек адну мову, дзве або болей (Пенфілд). *У аснове абагульнення пры засваенні другой(беларускай) мовы,* як і пры авалоданні роднай (рускай) мовы, *ляжыць механізм аналогіі*.

Сказанае сведчыць пра тое, што ў аснове навучання беларускай мове ляжыць фарміраванне ў дашкольнікаў здольнасці арыентавацца ў моўнай рэчаіснасці, моўных адносінах і сузалежнасцях. Толькі такое лінгвістычнае развіццё стварае ў дзяцей цікавасць да беларускай мовы, вядзе да сапраўднага авалодання яе багаццямі, забяспечвае творчы характар маўлення, тэндэнцыю да яго самаразвіцця (Ф.А.Сахін).

Як ужо зазначалася, *курс беларускай мовы для дашкольнікаў* у сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя павінен будавацца, з аднаго боку, *як спантанны, неадвольны* – праз стыхійнае і ў пэўнай меры ўпарадкаванае засваенне дзецьмі моўных сродкаў у маўленчай дзейнасці, а з другога – *як навучальны і ў вядомай ступені сістэматызуючы, абагульняльны* – праз авалоданне метадычна нармаванымі моўнымі сродкамі на занятках.

Адрозненне працэсаў засваення роднай (рускай) і другой (беларускай) моў заключаецца ў шчыльнасці зносін, г.зн. колькасці часу, якое выдаткоўваецца на авалоданне рускай мовы ў параўнанні з беларускай, што вымяраецца колькацю камунікатыўных кантактаў і аб’ёмам выказванняў у кожным з іх. Зразумела, шчыльнасць зносін на рускай мове непараўнальна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вышэйшая, чым на беларускай мове. Таму дзеці маюць магчымасць практыкавацца ў рускай мове, неўсвядомлена аналізаваць так званую лінгвістычную інфармацыю, што атрымліваюць ад дарослых, рабіць моўныя абагульненні

У дзіцячым садзе з рускім моўным рэжымам працяглую ў часе шчыльнасць зносін на беларускай мове забяспечыць амаль немагчыма. Выхаванцы ўстановы дашкольнай адукацыі не атрымліваюць якаснага і дастатковага ўзору беларускага маўлення, не чуюць нацыянальнай мовы ў тым аб'ёме, што неабходны для спантаннага развіцця здольнасці ствараць правільныя выказванні.

Таму фарміраванне ў дзяцей элементарных абагульненняў у працэсе засваення беларускай мовы адбываецца галоўным чынам у рэгламентаванай вучэбна-маўленчай дзейнаці, калі выхавальнік дашкольнай адукацыі накіроўвае ўвагу дзяцей на асаблівасці вымаўлення, граматычных формаў, наяўнасць падобных слоў рускай і беларускай моў і г.д. Педагог прапануе выхаванцам заданні, якія дапамагаюць ім неўсвядомлена абагульніць пэўныя моўныя з'явы шляхам аналогіі. Напрыклад, дзеці знаёмяцца з некаторымі назвамі дзіцянят жывёл (*кацяня, казляня*), а затым у гульнявой сітуацыі самастойна ўтвараюць такія назвы па аналогіі з вядомымі (*качаня, зубраня, сланяня*). Гэтак жа фарміруюцца абагульненні ў дачыненні змянення некаторых слоў па формах, вымаўлення спецыфічна беларускіх гукаў і інш.

Прынцып уліку роднай (рускай) мовы

Асаблівасць методікі навучання беларускай мове вызначаецца пры адказе на пытанне: ці можна не ўлічваць першай мовы (рускай) пры навучанні другой (беларускай) мове?

Методыка выкладання беларускай мовы характарызуецца барацьбой двух асноўных падыходаў.

Першы ўяўляе сабой так званы прамы метад навучання, прыхільнікі якога адмаўляюцца ад выкарыстання роднай (у нашым выпадку — рускай) мовы ў якасці апоры пры засваенні другой (у нашым выпадку—беларускай) мовы.

Другі падыход – свядома супастаўляльны метад, у якім прадугледжваецца шырокае выкарыстанне роднай (рускай) мовы як апоры пры авалоданні другой (беларускай) мовы.

Прынцып апоры на родную мову прадугледжвае, што дзіцяці ўвесь час неабходна параўноўваць формы дзвюх моў, аналізаваць іх падабенства і рознасць. Прычым гэта накіравана на тэарэтычнае асэнсаванне.

Прамежкавым прынцыпам выступае *прынцып уліку роднай мовы* (Я.І. Пасаў). Прынцып уліку роднай (рускай) мовы накіраваны на практычнае авалоданне маўленнем на другой (беларускай) мове. Гэтаму служыць такая арганізацыя маўленчага матэрыялу, якая садзейнічае прадухіленню інтэрферэнцыі з боку роднай (рускай) мовы.

Пры арганізацыі вучэбнага матэрыялу ўлічваюцца цяжкасці, якія звязаны з асаблівасцямі роднай (рускай) мовы дзяцей, таму асаблівая ўвага павінна надавацца з'явам, якія адсутнічаюць у рускай мове (напрыклад група спецыфічных беларускіх гукаў), а таксама тым, якія маюць адрозненні і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

падабенства (гэта тычыцца, напрыклад значэння блізкіх па гучанні слоў тыпа *неделя – нядзеля*; некаторых асаблівасцей граматыкі).

Пры развіцці беларускага маўлення рускамоўных дзяцей дашкольнага ўзросту падыход, згодна з якім выкарыстанне роднай (рускай) мовы поўнасцю выключаецца з працэсу навучання, зусім непрымальны. Спецыфіка методыкі навучання бізкароднаснай мове выцякае і з факту *няпоўнага двухмоўя* дзяцей дашкольнага ўзросту, г.зн. няздольнасці іх «адключыцца» ад роднай (рускай) мовы. Па трапным выразе Л.У. Шчэрбы, мы не можам выключыць родную мову з галоў дзяцей: не можам забараніць выхаванцам праводзіць супастаўленне адной і другой моў, што яны так ці інакш робяць. Таму лепш узяць гэты працэс пад кантроль, садзейнічаць узнікненню правільных супастаўленняў і перашкаджаць памылковым (А.Я. Супрун).

Гэта тым больш важна, што толькі шляхам фарміравання элементарнага ўсведамлення з’яў беларускай і рускай моў і параўнання іх паміж сабой можна пазбегнуць інтэрферэнцыі або пераадолець яе. Пры гэтым размова ідзе менавіта пра ўлік рускай мовы пры навучанні беларускай. Супастаўленні носяць не тэарэтычны, а выключна практычны характар. Пры гэтым рэалізацыя зместу праграмы па развіцці рускага маўлення павінна апярэджваць рэалізацыю адпаведнага зместу па развіцці беларускага маўлення дзяцей.

Такім чынам, неабходнай умовай навучання блізкароднаснай беларускай мове з’яўляецца ўлік рускай мовы, апора на маўленчыя навыкі дзяцей, набытыя пры засваенні рускага маўлення.

Г) Прынцып апраксімацыі.

Прынцып апраксімацыі быў раскрыты В.Л. Скалкіным. Гэты прынцып дае права педагогу на пачатковых этапах навучання ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя ігнараваць некаторыя памылкі дзяцей пры пабудове выказвання, калі яны не парушаюць камунікатыўны акт, не перашкаджаюць разуменню беларускага маўлення, не скажаюць змест выказвання.

Рэалізацыя прынцыпу апраксімацыі дапамагае пазбавіць дзіця страху дапусціць памылку, павышае яго маўленчую актыўнасць.

2. Матывацыя маўленчых дзеянняў дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове

Матыў – гэта намер, жаданне сказаць нешта чалавеку, з якім маеш зносіны. Ён узнікае на фоне неабходнасці ў зносінах, патрэбы звярнуцца ў гэты момант да пэўнага суразмоўцы.

Рускамоўныя дзеці не разумеюць, навошта ім ведаць іншую мову, матывацыя маўленчых дзеянняў на беларускай мове для іх занадта далёкая і абстрактная. Таму вызначальнай праблемай навучання дзяцей блізкароднаснай мове выступае забеспячэнне іх станоўчай матывацыяй зносін на нацыянальнай мове.

За матывам (матывацыяй) заўсёды стаіць патрэба (А.М. Лявонцьеў). У аснове маўленчай дзейнасці дзіцяці ляжыць патрэба ў зносінах. Працэс навучання неабходна арганізаваць па прынцыпе задавальнення асобасных, пазнавальных, гульнёвых патрэб дзіцяці ў зносінах з дарослымі і іншымі дзецьмі. Акрамя таго, псіхалагічныя даследаванні паказваюць, што матывацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

маўленчых паводзін неаддзельная ад эмацыянальных фактараў. Часта менавіта эмацыянальны фактар аказваецца вядучым у адносінах да ўсіх астатніх у акце зносін дзяцяці з дарослым, аказвае ўплыў на маўленчую дзейнасць (М.І. Лісіна, А.М. Шахнаровіч).

Матывацыйная сфера дзейнасці, паводле П.Я. Гальперына, утварае *тры класы (тыпы) матываў:* вонкавыя (падтрымка і пакаранне), "спаборніцкія" (поспех у параўнанні з іншымі або з самім сабой) і ўнутраныя. Неабходна ствараць матывы ўсіх трох тыпаў, але, на думку аўтара, асаблівае значэнне належыць выхаванню ўнутраных матываў, пад уплывам якіх утвараецца трывалая цікавасць да навучання.

3. Гульня як крыніца матыву маўленчай дзейнасці ў дзяцей дашкольнага ўзросту

Найбольшую ўнутраную актыўнасць выклікае вядучая для дашкольнага ўзросту дзейнасць – гульня. Калі матывы і мэты маўленчай дзейнасці заўсёды ляжаць па-за самім маўленнем, то матывы гульнявой дзейнасці заключаюцца ў самім працэсе гульні, а таксама ў разнастайных перажываннях, што суправаждаюць гульню.

Гульні, якія выкарыстоўваюцца з мэтай развіцця беларускага маўлення, павінны адрознівацца ад тых, у якія дзеці гуляюць на рускай мове.

У дачыненні да гульні можна сфармуляваць свой прынцып: "*адна гульня – адна мова*". Толькі такая гульня можа служыць псіхалагічным «апраўданнем» пераходу на беларускую мову.

Псіхалагічнай устаноўкай на беларускую мову пры правядзенні беларускамоўных гульняў могуць паслужыць заклічкі, лічылкі, жараб'ёўкі, загадкі, прыказкі, прымаўкі. Гэты матэрыял таксама павінен быць на беларускай мове. Вядома, было б памылкай, калі педагог праводзіў бы гульню на беларускай мове, а тлумачэнне правілаў гульні ішло на рускай мове. Усё, што тычыцца перыяду «да гульні» і перыяду «адразу пасля гульні», павінна адбывацца на беларускай мове.

Таму і дарослы, і дзеці пастаўлены ва ўмовы размаўляць у гэтай канкрэтнай сітуацыі на беларускай мове, што натуральна ж спрыяе пашырэнню беларускага актыўнага слоўніка. З часам такія зносіны становяцца больш вольнымі. Па сутнасці, незразумелымі ці малазнаёмымі будуць толькі словы новай гульні, а слоўнік па «арганізацыйных момантах» застанецца ранейшым (*гульня, лічылка, вядучы, самы спрытны, гурт дзяцей, кола, падлічым, пляцоўка, па чарзе, хутчэй* і шмат іншых слоў і словазлучэнняў).

У методыцы развіцця беларускага маўлення выкарыстоўваюцца беларускія народные гульні, рухомыя і карагодныя гульні с мастацкім словам, сюжэтна-ролевыя гульні, кампутарныя гульні, комплекс іерархічна арганізаваных камунікатыўных дыдактычных гульняў і практыкаванняў.

4. Сродкі навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя

Да сродкаў навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму адносяцца: натуральная беларускамоўная атмасфера ва ўстанове дашкольнай адукацыі; спантанная, вучэбна-маўленчая,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мастацка-маўленчая і моўна-пазнавальная дзейнасці дзяцей дашкольнага ўзросту ў працэсе авалодання беларускай мовай; навучанне беларускай мове на занятках; розныя віды мастацтва.

Тэма 3.3 Метады і прыёмы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя (лекцыя – 2 гадзіны)

Пытанні для вывучэння

1. Сучасныя тэндэнцыі навучання другой мове.
2. Асноўныя метады навучання другой мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя.
3. Спецыфіка методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

1. Сучасныя тэндэнцыі навучання другой мове

У аснове методыкі навучання другой мове дзяцей дашкольнага ўзросту ляжаць два асноўных фактары: псіхалінгвістычныя асаблівасці маўлення і псіхалагічная спецыфіка дашкольнага ўзросту. Адной з галоўных праблем з'яўляюцца суадносіны першай засвоенай і другой мовы ў працэсе навучання. На дадзеных суадносінах будуецца асноўная мадэль білінгвальнага навучання.

У практыцы навучання другой мове выкарыстоўваюцца як агульнадыдактычныя, так і спецыяльныя метады і прыёмы навучання другой мове. Спецыяльныя метады ў залежнасці ад суадносін першай засвоенай і другой мовы падзяляюцца на тры асноўныя: прамы, супастаўляльны і камбінаваны.

Навучанне на аснове прамога метаду арганізуецца шляхам "паглыблення" ў моўнае асяроддзе, пры ўнясенні ў штучнае фарміраванне білінгвізму натуральнай сітуацыі моўных зносін. У такім выпадку навучанне другой мове адбываецца без апоры на першую мову. Дадзены метад пры арганізацыі ўсяго вучэбна-выхаваўчага працэсу ў адукацыйнай установе на другой мове (беларускай), пры выключэнні або нязначным выкарыстанні першай (рускай) асвоенай мовы дзіцяці, атрымаў назву *метаду імерсіі*. Яго сутнасць заключаецца ў тым, што з першых дзён навучання ў адукацыйнай установе другая мова выкарыстоўваецца ў якасці асноўнай і адзінай мовы (*татальная імерсія*). Распрацоўшчыкі гэтага метаду (Ламбер, Такер, 1972 г.) зыходзілі са шматлікіх дадзеных, якія даказвалі, што засваенне другой мовы немагчыма на працягу ўсяго некалькіх гадзін заняткаў. Па іх меркаванні, імерсія -- найлепшы спосаб для якаснага засваення другой мовы.

Аднак М. Сігуан і У.Ф. Макі заўважаюць, што метад татальнай імерсіі не заўсёды магчымы, і яго выкарыстанне без уліку сацыяльнага кантэксту, базавых умоў і іншых фактараў можа мець адмоўныя вынікі альбо садзейнічаць выцясненню адной мовы другой. Найбольш прымальным, на іх думку, з'яўляецца метад *мяккай імерсіі*, пры якім практыкуецца паступовае ўвядзенне другой мовы ў працэс навучання.

Таксама шырока выкарыстоўваецца ў практыцы білінгвальнага навучання *частковая імерсія*, якая прадугледжвае арганізацыю працэса навучання сродкамі дзвюх моў.

Супастаўляльны метад навучання другой мове прадугледжвае апору на першую мову дзіцяці. Засваенне другой мовы адбываецца шляхам аналізу, супастаўлення і абагульнення дзвюх моўных сістэм. Тады на аснове параўнання роднай і другой моў ажыццяўляецца выдзяленне падобных з'яў для станоўчага пераносу – транспазіцыі; вызначэнне адрозненняў для пераадолення адмоўнага пераносу – інтэрферэнцыі. Пры блізкароднасным білінгвізме, як ўжо адзначалася, памылкі інтэрферэнцыі больш распаўсюджаныя і ўстойлівыя, таму патрабуецца спецыяльная работа па іх прадухіленню і карэкцыі.

Пры выкарыстанні супастаўляльнага метаду ва ўстановах дашкольнай адукацыі ў Беларусі трэба адрозніваць паняцці «выкарыстанне роднай мовы як апоры пры авалоданні другой» і «ўліку роднай мовы».

У першым выпадку, нагадаем, неабходна супастаўленне і аналіз падабенстваў і адрозненняў ладу вывучаемых моў, заснаваныя на тэарэтычным асэнсаванні, што магчыма толькі ў больш позні ўзроставы перыяд. У выпадку рэалізацыі прынцыпу ўліку роднай мовы пры навучанні другой супастаўляльны метад накіроўваецца на практычнае авалоданне маўленнем на другой мове. Выкарыстанне дадзенага метаду дазваляе размежаваць у свядомасці дзіцяці асаблівасці рускай і беларускай моў, тым самым можна пазбегнуць альбо пераадолець інтэрферэнцыю дзвюх моўных сістэм.

Пры *камбінаваным метадзе* выкарыстоўваюцца прыёмы двух першых метадаў, што забяспечвае найбольшую эфектыўнасць навучання другой мове.

Тады *мадэлі суадносін роднай і другой мовы выглядаюць як дубліруючая (суправаджальная) і адытыўная (дапаўняльная).*

Пры дубліруючай мадэлі білінгвальнага навучання адны і тыя ж адзінкі зместу прад'яўляюцца сродкамі дзвюх моў.

Пры адытыўнай – на другой мове даецца дадатковая інфармацыя, якая часткова альбо істотна ўзбагачае змест, які быў атрыманы на роднай мове.

На больш позніх этапах навучання мовам таксама могуць мець прымяненне *парытэтная* (раўнапраўе ў выкарыстанні роднай і другой мовы) *і выцясняльная* (другая мова дамінуе ў прад'яўленні інфармацыі) *мадэлі навучання мове* (па класіфікацыі расійскага даследчыка А.Г. Шырына).

2. Асноўныя метады навучання другой мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя

У сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя *метадамі навучання дзяцей беларускай мове выступаюць ўсе тры названыя вышэй: прамы, супастаўляльны і камбінаваны метады.*

Найбольш прымальным у практыцы работы ўстаноў дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання з'яўляецца метад мяккай імерсіі, які прадугледжвае паступовае ўвядзенне беларускай мовы ў працэс навучання. Таксама шырока выкарыстоўваецца ў практыцы білінгвальнага навучання частковая імерсія, якая прадугледжвае арганізацыю працэсу навучання сродкамі дзвюх моў.

Навучанне выхаванцаў беларускай мове на аснове прамога метаду арганізуецца шляхам «паглыблення» ў моўнае асяроддзе. Гэта адбываецца, напрыклад. падчас знаёмства дзяцей з фальклорнымі творамі і дзіцячай мастацкай літаратурай. Калі такое знаёмства адбываецца з дапамогай разнастайнай нагляднасці, імітацыі рухаў і да т.п., дзеці разумеюць сэнс твора.

Супастаўляльны метад навучання дзяцей беларускай мове прадугледжвае ўлік рускай мовы і засвоеных дзецьмі маўленчых уменняў на першай мове. Засваенне беларускай мовы адбываецца на аснове папярэдняга аналізу, супастаўлення і абагульнення дзвюх моўных сістэм, які праводзіцца педагогам (не дзецьмі!). На гэтай падставе ён вызначае моўныя з'явы (вымаўленне агульных для абедзьвюх моў гукаў, назваў прадметаў, сінтаксічныя канструкцыі і г.д.), наяўнасць якіх дазваляе ажыццяўляць навучанне дзяцей беларускай мове шляхам пераносу моўных навыкаў з рускай мовы на беларускую.

Пры камбінаваным метадзе выкарыстоўваюцца прыёмы дзвюх першых метадаў. У гэтым выпадку найбольш аптымальным шляхам развіцця ў дзяцей дашкольнага ўзросту беларускага маўлення з'яўляецца узгаданы раней шлях, які спалучае з аднаго боку развіццё «пачуцця беларускай мовы» ў выніку паступовага «паглыблення» ў адпаведнае камунікатыўнае асяроддзе, а з другога – спецыяльна арганізаванае навучанне, арыентаванае на фарміраванне ў выхаванцаў элементарных моўных абагульненняў.

На больш позніх этапах навучання мовам ужываецца парытэтная мадэль навучання (раўнапраўе ў выкарыстанні рускай і беларускай моў). Адносна парытэтнай мадэлі варта адзначыць, што раўнапраўе ў выкарыстанні рускай і беларускай моў тычыцца, перш за ўсё, арганізацыі ўсяго адукацыйнага працэсу ва ўстанове дашкольнай адукацыі. З мэтай паспяховага фарміравання двухмоўя неабходна стварыць ва ўстанове дашкольнай адукацыі спецыяльнае камунікатыўнае асяроддзе, якое прадугледжвае прысутнасць дзвюх моў ва ўсіх відах дзіцячай дзейнасці і арганізацыю спецыяльных заняткаў па развіцці маўлення дзяцей на кожнай з моў.

3. Спецыфіка методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту

У сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя агульнапрынятыя задачы развіцця маўлення набываюць некаторыя спецыфічныя рысы. Гэта, перш за ўсё, *фарміраванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту ўласна нацыянальнага бачання свету*, азнаямленне са спецыфічнымі рысамі кожнага з структурных узроўняў беларускай і рускай моў, прадухіленне інтэрферэнцыі.

Методыка навучання выхаванцаў беларускай мове *спалучае рысы методыкі роднай мовы і другой мовы.* З дапамогай першай уводзяцца моўныя з'явы, што супадаюць ў беларускай і рускай мовах. Гэта асабліва тычыцца развіцця лексічнага запасу на другой мове і вымаўленчых навыкаў. Чым больш адрозніваюцца беларуская і руская тэматычная лексіка, фанетыка, граматыка, тым з большай падставай выкарыстоўваецца методыка навучання дзяцей другой мове. Але і ў гэтым выпадку шырокае выкарыстанне такога беларускамоўнага займальнага матэрыялу, як вершы, загадкі, прыказкі і

прымаўкі і да т.п., элементаў народных гульняў, гутаркі па змесце заняткаў выключна на беларускай мове, набліжаюць прыёмы навучання другой мове да прыёмаў навучання рускай мове. Займальны моўны і маўленчы матэрыял садзейнічае замацаванню граматычных і лексічных навыкаў, развіццю маўленчага і фанематычнага слыху, фарміраванню ў дзяцей правільнага гукавымаўлення.

4. Паэтапнасць развіцця беларускага маўлення і навучання роднай мове дзяцей дашкольнага ўзросту

Развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ажыццяўляецца паэтапна:

- паступовае ўвядзенне беларускай мовы ў розныя віды дзейнасці дзяцей ранняга ўзросту з мэтай развіцця рэцэптыўнага і рэпрадуктўнага двухмоўя і яго пачуццёвай асновы. Такім чынам ажыццяўляецца паступовае развіццё элементарных уласцівасцей беларускага маўлення, «моўнага чуцця» з ранняга ўзросту, калі ў асноўным дзейнічае механізм імітацыі і толькі пачынае складвацца механізм аналогіі. Гэтая работа праводзіцца і далей, усё пашыраючыся на працягу ўсяго дашкольнага дзяцінства.

- навучанне дзяцей малодшага і сярэдняга дашкольнага ўзросту элементарнаму прадуктыўнаму маўленню. Адбываецца фарміраванне ў дзяцей элементарнага ўсведамлення спосабаў пабудовы выказвання на беларускай мове ў момант найбольш вострага «моўнага чуцця», што з'яўляецца найбольш эффектыўным сродкам для авалодання моўнай рэчаіснасцю. Такім момантам з'яўляецца сярэдні дашкольны ўзрост.

- фарміраванне элементарнага тэарэтычнага стаўлення да мовы ў дзяцей старшага дашкольнага ўзросту.

Навучанне на кожным наступным этапе ажыццяўляецца на фоне далейшага развіцця і ўдасканалення маўленчых навыкаў дзяцей, набытых на папярэдніх этапах.

Пры такім падыходзе да навучання спалучаюцца рысы адначасовага ранняга спантаннага засваення рускай і беларускай моў і паслядоўнага авалодання другой (беларускай) мовай, якое абапіраецца на здольнасць усвядомленага падыходу да моўных фактаў. Падобнае спалучэнне дазваляе сфарміраваць у выхаванцаў дзіцячага сада пэўныя навыкі зносін на беларускай мове і ў той жа час -- асэнсаваныя адносіны да яе.

Пры гэтым ў адукацыйным працэсе неабходна: а) забяспечыць станоўчую матывацыю маўлення на беларускай мове; б) спалучаць стыхійную форму навучання, у якой забяспечваць так званае "ўтоенае" засваенне моўных нормаў, з арганізаванай; в) спалучаць у працэсе навучання розныя віды маўленчай дзейнасці (спантанную, вучэбна-маўленчую, мастацка-маўленчую, моўна-пазнавальную); г) абапіраццца на фарміраванне ў дзяцей элементарнага асэнсавання моўных з'яў; д) абапіраццца на маўленчыя навыкі дзяцей, набытыя пры засваенні рускага маўлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура асноўная

1. Свірыдзенка, В. І. Фарміраванне маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў : тэорыя і практыка / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Беларус. дзярж. пед.ун-т, 2019. – 280 с.

2. Современные педагогические технологии в образовательном процессе учреждения дошкольного образования : учеб.-метод. пособие / под общ. ред. В. Н. Шашок ; сост. В. Н. Шашок [и др.]. – Минск : Акад. последиплом. образования, 2019. – 123 с.

Літаратура дадатковая

3. Старжынская, Н.С. Тэарэтычныя асновы развіцця беларускага маўлення і навучання роднай мове дашкольнікаў / Н.С. Старжынская. – Мінск : Нар. асвета, 1997. – 105 с.

4. Старжынская, Н.С. Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў / Н.С. Старжынская. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 223 с.

5. Старжынская, Н.С. Маўленчае і лінгвістычнае развіццѐ дашкольнікаў / Н.С. Старжынская. – Мінск, 2007.

6. Старжынская, Н.С. Беларуская мова ў дзіцячым садзе / Н.С. Старжынская. – Мінск : Нар. асвета, 1995. – 159 с.

7. Старжынская, Н.С. Методыка развіцця роднага маўлення / Н.С. Старжынская. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 287 с.

8. Старжынская, Н.С. Методыка развіцця роднай мовы : вучэб. дапаможнік / Н.С. Старжынская, Дз.М. Дубініна. – Мінск : Выш. шк., 2008. – 301 с.

Тэма 4. 1 Камунікатыўная накіраванасць развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту (матэрыял для самастойнага вывучэння)

Пытанні для вывучэння

1. Развіццё ў дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту “чуцця” беларускай мовы.
2. Народныя гульні, іх роля ў развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.
3. Роля дыдактычнай лялькі ў развіцці беларускага маўлення дзяцей.
4. Нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту.
5. Арганізацыя пазасітуацыйна-пазнавальных і пазасітуацыйна-асобасных беларускамоўных зносін дзяцей дашкольнага ўзросту.

1. Развіццё ў дзяцей “чуцця” беларускай мовы

Адной з заканамернасцей засваення дзецьмі мовы з’яўляецца наяўнасць у іх моўнага чуцця – неўсвядомленага, набытага ў працэсе штодзённых зносін з дарослымі ведання моўнай нормы, традыцыі ўжывання слоў іх формаў і спалучэнняў. Пачуццё мовы (моўнае чуццё) – сукупнасць адчуванняў, якія непасрэдна адлюстроўваюць сувязі і дачыненні, характэрныя для мовы як

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

складанай аб’ектыўнай сістэмы сродкаў ўзаемаадносін людзей. *Усе значэнні роднай мовы дзіця адчувае задоўга да таго, як набывае здольнасць асэнсоўваць іх*. Ступень авалодання маўленнем у дзіцячым узросце шмат у чым залежыць ад таго, наколькі поўна і правільна дзіця засвоіла яго на чуццёвым узроўні.

Пры навучанні другой мове ў дзіцяці фарміруецца і “чуццё” другой мовы, якое, на думку даследчыкаў, з’яўляецца важнай умовай і паскаральнікам яе паспяховага засваення (А.М. Богуш). Пры гэтым “чуццё” другой мовы ўзнікае тым хутчэй і лягчэй,чым большая ступень роднасці паміж мовамі (Б.У. Беляеў).

Значыць, у дзяцей з рускамоўных семъяў неабходна выхоўваць чуццё беларускай мовы, ствараючы для гэтага адпадведныя маўленчыя ўмовы, у якіх пад кіраўніцтвам выхавальніка дашкольнай адукацыі дзіця можа: засвойваць «народны дух» беларускай мовы; далучацца да яе паэзіі; вучыцца вырашаць з дапамогай роднай мовы камунікатыўныя, пазнавальныя і інш. задачы.

Такім чынам, у першыя тры гады жыцця павінны пераважаць тыя формы работы, якія спрыяюць развіццю чуцця беларускага маўлення ў дзяцей з рускамоўных сем’яў шляхам азнаямлення іх з лепшымі ўзорамі жывога беларускага слова, а таксама фарміравання першапачатковых навыкаў маўлення на другой роднай мове ў працэсе дзелавых зносін з выхавальнікам, які падчас гэтай размовы ўжываў беларускую мову.

Па меры пашырэння маўленчых і інтэлектуальных магчымасцей *дзяцей дашкольнага ўзросту* ўводзіцца навучанне беларускай мове на спецыяльных занятках, але работа па развіцці ў іх пачуццёвай асновы беларускай мовы працягваецца і далей. Педагог выкарыстоўвае ўсе натуральныя сітуацыі для далучэння дашкольнікаў да роднага слова, выхавання ў дзяцей патрэбы і прывычкі ўжываць беларускую мову ў розных абставінах жыцця.

Як і раней, вядучую ролю ў далучэнні дзяцей да беларускай мовы, развіцця беларускага маўлення адыгрывае мастацкая літаратура. Каб маўленне дзіцяці было жывым і вобразным, педагогам устаноў дашкольнай адукацыі трэба клапаціцца пра тое, каб дзеці штодзённа чулі ад іх блізкія і даступныя вобразныя выразы з казак, песень, прыказак (*коцік-варкоцік, каточак-галубочак, рагуля-малакуля, птушачка-шчабятушачка* і інш.), фразеалагізмы (*акінуць вокам, прытуліць галаву, паспех – людзям на смех* і інш.). Выхавальнік дашкольнай адукацыі павінен ведаць шмат беларускіх загадак, прыгаворак, прыказак, прымавак, фразеалагізмаў, каб у натуральных абставінах ужываць іх. Тады дзіця паступова засвоіць сэнс таго ці іншага выразу.

Але ад дзяцей ні ў якім разе нельна патрабаваць, каб яны карысталіся гэтымі выразамі або, яшчэ горш, завучвалі іх, папярэджвала А.П. Вусава. Мы павінны быць задаволены ўжо тым, сцвярджала вядомы педагог, што дзіця ўлаўлівае сувязь прыказкі са сваім дзеяннем. Калі ў мове дзіцяці мільгане зрэдку прыказка, вобразны выраз, то гэта будзе вялікай узнагародай выхавальніку за яго працу. Але знарок выклікаць дзіця на гэта не трэба. Падкрэслім, што А.П. Вусава пісала пра родную (першую засвоеную) мову. Тым больш асцярожнымі трэба быць пры развіцці маўлення дзяцей на другой – беларускай мове.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Народныя гульні, іх роля ў развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту

Асаблівае месца ў штодзённым жыцці дзяцей дашкольнага ўзросту займаюць беларускія народныя гульні. У народных гульнях адлюстроўваюцца нацыянальныя традыцыі, характар народа, яны цесна звязаны з роднай прыродай, побытам і працоўнай дзейнасцю людзей. Змест многіх гульняў, якія прыйшлі да нас з глыбінь стагоддзяў, задавальняе інтарэсы сучасных дзяцей, адпавядае іх жыццёвым запатрабаванням. Вобразы і сюжэты народных гульняў блізкія дзіцячай фантазіі. Таму яны вельмі захопліваюць выхаванцаў. Адсутнасць назойлівага маралізатарства, павучальнасці робіць гэтыя гульні прываблівымі, ненадакучлівымі для дзяцей як малодшага, так і старшага дашкольнага ўзросту.

Многія народныя гульні для дзяцей змяшчаюць слоўныя прыгаворы, песні, прыпеўкі, цесна звязаныя з рухамі, дзеяннем. Многія з іх пачынаюцца з гульнявога зачыну – лічылкі або жараб'ёўкі, у якой пары дзяцей прыдумваюць сабе рыфмаваныя назвы, часцей за ўсё запазычаныя з іншых фальклорных твораў (*траўка-мураўка* і *залатая булаўка*, *стары рак* і *чорны грак*).

Ужо з маленькімі дзеткамі, акрамя гульняў тыпу "Знаёмства", можна праводзіць іншыя даступныя ім народныя гульні, у першую чаргу карагодныя.

Гульні-карагоды, заснаваныя на спалучэнні песні і руху ("Заінька", "Верабей", "Грушка" і інш.), адносяцца да любімых дзецьмі У карагодных гульнях дзеці драматызуюць тое, пра што пяецца ў песні, тут дзеянне ажыццяўляецца ў рытме, словах, мелодыі. Слоўныя прыгаворы, песенькі выконвае выхавальнік, заахвочваючы дзяцей да ўдзелу ў гульні, да выканання пэўных гульнёвых дзеянняў. Потым малыя пачынаюць узнаўляць асобныя словы, выразы і песенькі цалкам.

Нагадаем, што ў дачыненні да гульні павінна спрацоўваць правіла "адна гульня – адна мова". У рускай і беларускай культурах шмат агульнага, у тым ліку і народных гульняў. Калі ў тую ці іншую гульню дзеці гуляюць на рускай мове, немэтазгодна выкарыстоўваць яе для далучэння іх да беларускай мовы.

Значную частку народных гульняў складаюць гульні-драматызацыі, якія праводзяцца з дзецьмі сярэдняга і старэйшага дашкольнага ўзросту. Але дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту можна далучаць да пасільнага ўдзелу ў народных гульнях, што праводзяцца са старэйшымі дзецьмі. Гэта таксама добры падмурак у развіцці пачуцця беларускай мовы.

Гульні-драматызацыі адрозніваюцца строгім размеркаваннем роляў і адпаведнымі ім слоўнымі прыгаворамі *("Пастух і статак", "Воўк і авечкі", "Гарлачыкі"* і інш.). Мастацкая аснова народных гульняў, іх нязмушанасць прываблівають дзяцей, садзейнічаюць развіццю ў іх паэтычнага слыху, густу, засваенню дасканалых формаў роднай мовы. Так, гуляючы ў "*Агародніка*", дзеці запамінаюць такія азначэнні, як іголка "тонкая ды доўгая, аднавухая ды вострая", "носік стальны, хвосцік ільняны"; рэпа "доўгая, к канцу вострая".

Роля такіх гульняў двайная. Па-першае, яны наладжваюцца спантанна ("Давайце пагуляем у "Фарбы", -- прапануе хто-небудзь з дзяцей або падказвае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выхавальнік). У гэтым выпадку проста ствараецца натуральная сітуацыя для далучэння дзяцей да роднага слова, развіцця ў іх «чуцця» беларускай мовы.

Па-другое, беларускія народныя гульні выкарыстоўваюцца і для арганізацыі «ўтоенага» навучання – развіцця ў дзяцей тых або іншых якасцей маўлення. Напрыклад, для азнаямленая дзяцей са спецыфічна беларускай фармулёўкай пытання з дапамогай часціцы ***ці*** выкарыстоўваецца гульня *"Макі-маковачкі"*, у ходзе якой неаднаразова задаюцца пытанні тыпу "Ці зацвіў мак? Ці паспеў мак?".

Шмат магчымасцей даюць народныя гульні для замацоўвання правільнага вымаўлення тых або іншых гукаў беларускай мовы. Напрыклад, вымаўленне гука [ч] можна замацоўваць у гульні "Маўчанка" прыгаворка якой "Пярвенчыкі, чарвенчыкі…" насычана гэтым гукам. Гульні-драматызацыі, якія змячаюць дыялогі, выкарыстоўваюцца для развіцця інтанацыйных сродкаў беларускага маўлення.

Хаця гульні-драматызацыі адрозніваюцца даволі ўстойлівымі слоўнымі прыгаворамі, неабходна заахвочваць дзяцей да імправізацыі, прыдумвання новых дыялогаў. Гэтыя гульні асабліва каштоўныя для развіцця беларускага маўлення дзяцей, паколькі дазваляюць пераходзіць ад завучаных слоў і фраз да сапраўды маўленчай дзейнасці на беларускай мове.

3. Роля дыдактычнай лялькі ў развіцці беларускага маўлення дзяцей

Сярод стымулаў для праяўлення маўленчай актыўнасці дзяцей выключнае значэнне маюць *цацкі-жывёлы і лялькі*, да якіх дзеці ставяцца як да жывых істот. Асабліва значная роля належыць ляльцы. Л. І. Ціхеева з гэтай нагоды пісала, што лялька – чалавек, член калектыву маленькіх людзей, якія жывуць сваім жыццём і адлюстроўваюць жыццё-гульню ў слове. Яна асабліва падкрэслівала, што гэтае жыццё патрабуе ўсё ж такі педагагічнага кіраўніцтва. Аўтар першай методыкі развіцця маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту прапанавала ўвесці ў адукацыйны працэс ляльку, якая не даецца ў свабоднае карыстанне дзецям, а фігуруе толькі ў час заняткаў па азнаямленні з навакольным светам і развіцці маўлення, арганізаваных гульняў.

Аналагічным чынам з мэтай паступовага ўвядзення беларускай мовы ў розныя віды дзейнасці дзяцей, пачынаючы з ранняга ўзросту, прапануецца выкарыстанне лялек-«беларусаў», напрыклад, дзяўчынкі Паўлінкі і хлопчыка Янкі. Яны па адным або разам «прыходзяць» да дзяцей, "знаёмяцца" з імі і цікавяцца іх заняткамі, гульнямі, размаўляючы толькі па-беларуску: задаюць пытанні, называюць асобныя прадметы, што знаходзяцца ў дзяцей, выконваюць з імі розныя дзеянні, расказваюць нескладаныя гісторыі. Такім чынам наладжваюцца сітуацыйна-дзелавыя зносіны на беларускай мове.

3. ***Нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту***

Маўленчая культура з'яўляецца састаўнай часткай агульнай культуры чалавека, адным з важнейшых паказчыкаў цывілізаванасці грамадства. У змест культуры маўленчых зносін уваходзяць такія кампаненты, як правільнасць маўлення, камунікатыўная мэтазгоднасць, камунікатыўныя якасці маўлення, невербальныя спосабы зносін, маўленчы этыкет.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пад правільнасцю маўлення разумеецца адпаведнасць нормам літаратурнай мовы.

Маўленчы этыкет, які ўяўляе сукупнасць слоўных формаў ветлівасці і пачцівасці, вылучаецца як асабліва значная характарыстыка маўленчых зносін.

Ён вызначае правілы маўленчых паводзін у стандартызаваных (тыповых) сітуацыях маўленчых зносін. Адзінкі маўленчага этыкету уяўляюць сабой асобныя словы, словазлучэнні або сказы, што складаюць або частку выказвання, або самастойную, лагічна завершаную рэпліку, якая можа мець рознае інтанацыйнае афармленне. Формулы маўленчага этыкету з'яўляюцца ў рознай ступені ўстойлівымі. Адна і тая ж этыкетная адзінка набывае рознае моўнае афармленне ў залежнасці ад умоў камунікатыўнай сітуацыі. Стылістычная характарыстыка формул маўленчага этыкету вызначаецца сітуацыйна і кантэкстуальна. Танальнасць зносін, ступень ветлівасці выказвання, што змяшчае этыкетную адзінку, змяняецца пад уплывам эмацыянальна-экспрэсіўных сродкаў, што яе суправаджаюць.

Асноўнымі функцыямі маўленчага этыкету з'яўляюцца функцыя ўстанаўлення кантакту і функцыя ветлівасці. Абедзьве функцыі з'яўляюцца ўтворанымі ад сацыякультурнай і нацыянальна-культурнай функцый маўленчага этыкету, таму правілы маўленчага этыкету разглядаюцца як сацыяльна абумоўленыя і нацыянальна-спецыфічныя.

Засваенне правіл маўленчага этыкету з'яўляецца перадумовай сацыялізацыі дзіцяці ў пэўным культурным асяроддзі. Вядома, што кожная мова адлюстроўвае канцэптуальную карціну свету ў моўных формах, да якіх адносяцца і формулы маўленчага этыкету. Пры ўсёй блізкасці лексічнага і граматычнага ладу беларускай і рускаў моў кожная з іх характарызуецца сваёй спецыфікай і самабытнасцю, што знаходзіць адлюстраванне ў мікрасістэме маўленчага этыкету як часткі агульнай сістэмы мовы. Авалоданне нормамі маўленчага этыкету, у якім адлюстроўваюцца асаблівасці беларускага нацыянальнага характару, спецыфічныя асаблівасці мыслення і нацыянальнай спецыфікі культуры і самой сістэмы беларускай мовы, уяўляецца адной з важнейшых задач фарміравання ў дзяцей дашкольнага ўзросту культуры маўленчых зносін.

Працэс фарміравання культуры маўленчых зносін дзяцей уключае наступныя этапы: а) узбагачэнне маўлення дзяцей пэўным запасам разнастайных формул і выразаў маўленчага этыкету ў стандартызаваных сітуацыях зносін (прывітанне, развітанне, просьба, падзяка, прабачэнне, знаёмства, камплімент і інш.); б) знаёмства дзяцей са спосабамі "разгортвання" формул маўленчага этыкету зваротамі і матывіроўкамі; в) навучанне выхаванцаў уменню праяўляць добразычлівасць у інтанацыі, міміцы, жэстах.

Унутры кожнага этапу паслядоўнасць работы вызначаецца логікай засваення дзецьмі маўленчага матэрыялу: спачатку арганізуецца ўспрыманне і яго неаднаразовае ўзнаўленне, а затым – самастойнае выкарыстанне засвоенага матэрыялу ў гульнявых і штодзённых сітуацыях.

Выхавальнік уласным прыкладам заахвочвае дзяцей самастойна выкарыстоўваць прыдатныя формулы маўленчага этыкету, запазычаныя з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беларускіх народных казак (Шчыра дзякую, Бывай здароў, Добрае здароўе, добры вечар добрым людзям і да т.п.), у сітуацыях стандартызаваных зносін.

4. ***Арганізацыя пазасітуацыйна-пазнавальных і пазасітуацыйна-асобасных беларускамоўных зносін дзяцей дашкольнага ўзросту***

Зносіны – найважнейшы сродак развіцця маўлення. У айчыннай псіхалогіі зносіны разглядваюцца як частка які-небудзь дзейнасці і як самастойная камунікатыўная дзейнасць. Маўленчыя зносіны ў дашкольным узросце ажыццяўляюцца ў розных відах дзейнасці: у гульні, працы, бытавой, пачатковай вучэбнай дзейнасці – і выступаюць як адзін з бакоў кожнага віда. Таму вельмі важна ўмець выкарыстоўваць для развіцця беларускага маўлення дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту любую дзейнасць, перш за ўсё вядучую – прадметную і гульнявую адпаведна.

У тэхналогіі беларускамоўнага развіцця дзяцей распрацаваны заняткі па фарміраванні ў дзяцей пазасітуацыйна-пазнавальных і пазасітуацыйна-асобасных зносін на беларускай мове.

У выніку назіранняў за дзецьмі выхавальнік вызначае той узровень зносін, якога тыя дасягнулі (сітуацыйна-дзелавой формы, пазасітуацыйна-пазнавальнай, пазасітуацыйна-асобаснай). Адбірае групу дзяцей, форма зносін якіх не адпавядае ўзроставым магчымасцям. Напрыклад, пазасітуацыйна-пазнавальнай формай зносін звычайна валодаюць дзеці сярэдняга дашкольнага ўзросту, а пазасітуацыйна-асобаснай – старшыя. На спецыяльных індывідуальных (або падгрупавых) занятках, якія праводзяцца ў ранішнія і вячэрнія гадзіны, педагог вучыць дзяцей, якія адстаюць у развіцці зносін, па-новаму ўзаемадзейнічаць з дарослым. Выхавальнік дашкольнай адукацыі дае дзіцяці ўзоры тых зносін, якімі той яшчэ не валодае, не проста дэманструе больш дасканалыя формы ўзаемадзеяння, а вядзе яго за сабой, уключае ў гэтыя зносіны, робіць іх прываблівымі і неабходнымі для самога дзіцяці. Методыка такіх заняткаў з псіхалагічнага пункту гледжання распрацавана А. Смірновай. З рускамоўнымі дзецьмі падобныя заняткі праводзяцца на рускай мове.

Але, карыстаючыся тым, што рускамоўныя дзеці разумеюць беларускае маўленне (тым больш што гэтае разуменне ў выніку развіцця беларускамоўнага чуцця даволі хутка ўдасканальваецца), выхавальнік можа праводзіць заняткі і на беларускай мове. Тым самым ён робіць прываблівай (праз прываблівыя зносіны) для дзіцяці і нацыянальную мову, стварае ўмовы для фарміравання ў яго сапраўднай маўленчай дзейнасці на беларускай мове.

Заняткі па фарміраванні пазасітуацыйных форм зносін на беларускай мове праводзяцца ў форме індывідуальнай або калектыўнай размовы з падгрупай дзяцей, якія не валодаюць адпаведнымі формамі зносін.

Ва ўмовах, калі любая задача зносін можа быць вырашана дзіцем на рускай мове, штучнасць зносін на беларускай мове часта перашкаджае яму ўключыцца ў камунікацыю з той жа псіхалагічнай нагрузкай, што і на першай засвоенай мове. Псіхалагічныя ўмовы для размовы на беларускай мове, цікавасць да тэмы гутаркі ствараюцца з дапамогай літаратурных твораў на гэтай мове. Так, многія народныя казкі носяць у пэўнай ступені пазнавальны характар *(«Лёгкі хлеб», «Пшанічны каласок», «Чаму барсук і лісіца ў норах*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

жывуць» і інш). Гэта дае падставы для выкарыстання іх з мэтай фарміравання пазасітуацыйна-пазнавальных зносін дзяцей на беларускай мове. Дзецям рассказваецца казка, а затым праводзіцца гутарка, пры чым не па змесце твора, а менавіта пазнавальнага характару, звязаная з тэмай твора (такія заняткі доўжацца ад 5 да 15 хвілін). Беларуская мова гутаркі з'яўляецца для дзяцей як бы працягам твора на беларускай мове, таму ўспрымаецца зусім натуральна.

Напрыклад, на занятках, што праводзіліся на аснове беларускай народнай казкі "Пчала і муха" адбылася размова па наступных пытаннях: "Пра каго расказваецца ў казцы? (Пра пчалу… Пра пчалу і муху.) Муха і пчала – гэта птушкі, звяры або насякомыя? А можа птушкі? Што ядуць пчолы? … Пчолку часта можна ўбачыць на кветцы. Што яна там робіць? А для чаго пчолка збірае нектар і робіць мёд? І г.д.

З дзецьмі старэйшага дашкольнага ўзросту, акрамя таго, праводзяцца заняткі, накіраваныя на фарміраванне пазасітуацыйна-асобасных маўленчых зносін. Задача педагога – стварыць умовы, якія прымусяць дзіця ўсвядоміць і ацаніць уласныя дзеянні і ўчынкі.

Заняткі з падгрупамі дзяцей па фарміраванні пазасітуацыйна-асобаснай формы зносін праводяцца ў форме непрымушанай гутаркі па матэрыялах беларускамоўных твораў маральна-этычнага плану пра падзеі з жыцця дзяцей (апавяданні А. Буцэня "Дзяжурная Настуся", В.А. Сухамлінскага "Як Андрэйка перавёз Ніну", "Чаму заплакаў Петрык", В.Хомчанка "Яблык" і інш.).

Пад час гутарак на пазасітуацыйна-асобасную тэму важна паказаць выхаванцам, што такія ж падзеі, якія апісваюцца ў творы, адбываюцца і ў дзіцячым жыцці. Дарослы не толькі задае пытанні, ён актыўны ўдзельнік гутаркі: выказвае свае думкі аб канфліктах і падзеях, якія адбываюцца ў групе, расказвае пра сябе пра сваіх знаёмых.

Беларуская мова гутаркі пасля праслухоўвання твора на беларускай мове для дзяцей як бы сама собой разумеецца. Як і раней, найбольшы стымул для актывізацыі маўлення дзяцей на беларускай мове ствараецца з дапамогай «беларускамоўнай» лялькі, якая «ўдзельнічае» ў гутарцы, «задаючы» пытанні або цалкам яе «праводзячы».

Тэма 4.2 Мастацка-маўленчая дзейнасць як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту (матэрыял для самастойнага вывучэння)

Пытанні для вывучэння

1. Азнаямленне дзяцей з малымі формамі беларускага фальклору.
2. Методыка работы з беларускай народнай казкай.
3. Методыка выкарыстання твораў беларускіх пісьменнікаў ва ўстанове дашкольнай адукацыі
4. Рухомыя гульні з мастацкім словам, іх роля ў развіцці маўлення.
5. Методыка правядзення літаратурных забаў і ранішнікаў.

1. Азнаямленне дзяцей з малымі формамі беларускага фальклору

Паўнацэннае маўленчае выхаванне дзіцяці не можа ажыццяўляцца без апоры на жывое слова фальклору.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як ужо ўзгадвалася, у раннім узросце прадугледжваецца праслухоўванне децьмі беларускіх народных калыханак, песенак, забаўлянак, заклічак, што суправаджаецца адпаведнымі зместу дзеяннямі (закалыхванне лялек, пляскання ў далоні і да т.п.), паўтарэннем гукаперайманняў, асобных слоў, выразаў.

Паступовасць увядзення беларускай мовы праяўляецца ў тым, што ўступная гутарка, разглядванне цацкі, тлумачэнні, звароты да дзяцей спачатку вядуцца на рускай мове. Сам фальклорны твор чытаецца або расказваецца на беларускай мове. У час расказвання выхавальніку дашкольнай адукацыі неабходна зацікавіць дзіця, стварыць такія ўмовы, каб у малога ўзнікла патрэба маўленчага ўзаемадзеяння з дарослым. Адны і тыя ж забаўлянкі чытаюцца дзецям некалькі разоў у розных сітуацыях: у адукацыйным працэсе, падчас рэжымных момантаў, гульні, на прагулцы і г.д. Выхавальнік дашкольнай адукацыі сам падбірае зручны момант для ўвядзення і паўтарэння таго ці інага твора.

У дашкольным узросце працягваецца работа па азнаямленні дзяцей з малымі формамі фальклору на новым узроўні. Дасканалымі ўзорамі вуснай народнай творчасці для дзяцей гэтага ўзросту з’яўляюцца забаўлянкі, песенькі, лічылкі, загадкі, скорагаворкі, прыказкі, прымаўкі, а таксама небыліцы. З дапамогай забаўлянак навучанне дзяцей дашкольнага ўзросту выразнасці і вобразнасці маўлення вядзецца на даступных для разумення ўзорах паэтычнай мовы.

Шмат вобразных слоў і выразаў і ў *народных песнях.* Разам з тым народныя песні вызначаюцца сваім лірызмам і пяшчотай. Іх мастацкая мова ўяўляе сабою сапраўдны шэдэўр славеснага мастацтва.

Зварот выхавальніка дашкольнай адукацыі да азнаямлення дзяцей з гэтымі творамі народнага мастацтва станоўча адаб’ецца на развіцці іх паэтычнага слыху і вобразнага маўлення.

Небыліцы – асаблівы від прыгаворак, у якіх, каб выклікаць смех, знарок зрушваюцца ўсе рэальныя сувязі і адносіны, пераблытваецца верагоднае і неверагоднае.

Працягваюць традыцыю народных небыліц аўтарскія пераблытанкі. Многія дзіцячыя паэты звярталіся да любімага дзецьмі жанру. Гэта, напрыклад, творы, беларускіх паэтаў Е. Лось, Д. Бічэль-Загнетавай, Р. Барадуліна, У. Паўлава і многіх іншых.

Заклічкі – любімыя вершаваныя вусна-паэтычныя творы дзяцей дашкольнага ўзросту.

Матэрыялам для эстэтычна-вобразных і гульнявых зносін выхавальніка з дзецьмі выступаюць ***загадкі.***

Скорагаворкі служаць асноўным матэрыялам для ажыццяўлення любімай дзецьмі вясёлай гульні – гульні ў хуткае паўтарэнне радкоў і вершаў, якія цяжка вымаўляюцца.

Прыказкі і прымаўкі ўяўляюць сабой каштоўны скарб мастацкага маўлення чалавека. Іх уключенне ў агульны змест выказвання робіць апошняе больш выразным і вобразным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З беларускімі прыказкамі і прымаўкамі дзеці знаёмяцца падчас зносін з дарослым, які ўжывае тую ці іншую прыказку або прымаўку, зыходзячы з сітуацыі, кантэксту зносін. У дачыненні да прыказак і прымавак можна перафармуляваць прынцып Грамонта: “адна мова – адна прыказка (прымаўка)”.

2. Методыка работы з беларускай народнай казкай

Асаблівае месца ў дзяцей дашкольнага ўзросту займае ўспрыманне казкі. А. Ул. Запарожац сцвярджаў, што ў час успрымання казкі ў дзіцяці фарміруюцца «пэўныя рэалістычныя тэндэнцыі». Слухаючы казку, дзіця падыходзіць да яе ацэнкі з рэалістычных пазіцый. Першая сустрэча выхаванцаў з казачнай творчасцю адбываецца з дапамогай казак пра жывёл.

Дзецям ранняга ўзросту даступны невялікія па аб’ёму казкі на беларускай мове. Напрыклад, такія як “Коцік Петрык і мышка”, “Пра што кукуе зязюля” і інш. Расказванне казак трэба суправаджаць інсцэніроўкамі, што аблегчыць малым іх успрыманне і разуменне, заахвоціць да паўтарэння слоў, выразаў, песенек асобных персанажаў.

Сацыяльна-бытавыя казкі таксама з’яўляюцца даступнымі для ўспрымання дзецьмі дашкольнага ўзросту. Героі гэтых казак – простыя людзі, якія не валодаюць звышнатуральнай сілай, але здольныя перамагчы сваіх ворагаў дзякуючы кемлівасці, розуму, дасціпнасці, знаходлівасці (“Не сілай, а розумам”, “Лёгкі хлеб”, “Жаронцы” і інш.). Дзейнічаюць героі гэтых казак ва ўмовах штодзённага сялянскага жыцця. Раскрываецца змест бытавых казак часцей за ўсё не шляхам разгорнутага эпічнага апісання, а праз кароткія малюнкі, сцэнкі, эпізоды, у якіх, аднак, даволі выразна малююцца мастацкія вобразы.

Чарадзейныя казкі вабяць слухача прыгодамі сваіх герояў, дасканаласцю сваёй мастацкай формы. Незвычайныя істоты і цудоўныя чарадзейныя рэчы, як і неверагодныя подзвігі герояў, захапляюць слухача, пераносяць яго ў нейкі незнаёмы, нават крышачку страшны, але вельмі цікавы свет (“Гарошак”, “Піліпка-сынок” і інш.)

Пэўнаму ўспрыманню казак садзейнічаюць характэрныя для іх эпізоды пераўтварэння чалавека ў розных жывёл, птушак, што надае творам яшчэ больш таямнічасці і чароўнай прыгажосці. Успрыманне гэтых казак прымушае дзяцей спачуваць пазітыўным героям. Яны нават стараюцца дапамагчы ім сваімі падказкамі.

Такім чынам, беларуская народная казка, з яе жывой, выразнай, маляўнічай мовай, з'яўляецца эфектыўным сродкам развіцця вобразнасці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

3. Методыка азнамлення дзяцей дашкольнага ўзросту з творамі мастацкай літаратуры і фальклору

Ва ўстанове дашкольнай адукацыі наладжваецца спецыяльна арганізаваная адукацыйная мастацка-маўленчая дзейнасць выхавальніка дашкольнай адукацыі і дзяцей, сумесная нерэгламентаваная мастацка-маўленчая дзейнасць выхавальніка дашкольнай адукацыі і дзяцей, ствараюцца ўмовы для самастойнай мастацка-маўленчай дзейнасці дзяцей.

Спецыяльна арганізаваная сумесная мастацка-маўленчая дзейнасць выхавальніка дашкольнай адукацыі і дзяцей ўключае такія формы работы, як заняткі па азнаямленні дзяцей з творамі мастацкай літаратуры і фальклору, сеансы актывізуючых зносін, літаратурныя ранішнікі.

Сумесная мастацка-маўленчая дзейнасць выхавальніка разам з дзецьмі, можа ўключаць пад час нерэгламентаванай дзейнасці такія формы работы з дзецьмі, як адукацыйныя сітуацыі, сітуацыі зносін, пад час якіх ладзяцця размовы на тэмы мастацкіх твораў; гульні-драматызацыі, разглядванне ілюстрацый і рэпрадукцый; праслухоўванне лепшых узораў славеснага мастацтва ў грамзапісу, прагляд відэяфільмаў, літаратурных перадач па тэлебачанні, правядзенне літаратурных віктарын.

Самастойная мастацка-маўленчая дзейнасць дзяцей у асноўным накіравана на развіццё творчых здольнасцей. Тут вызначальнымі формамі работы з'яўляюцца літаратурны тэатр, тэатр лялек, тэатр ценяў, розныя віды настольнага тэатра, беларуская батлейка, гульня–драматызацыя, самастойнае састаўленне цікавых кніжак, маляванне альбомаў у адпаведнасці са зместам мастацкага твора і інш.

Для авалодвання дзецьмі мастацтвам успрымання літаратурных твораў і больш глыбокага спаціжэння іх зместу існуе цэлы шэраг спосабаў узаемазвязанай дзейнасці дарослага і выхаванцаў, пры гэтым абавязкова ўлічваецца узрост дзяцей, іх жыццёвы вопыт, жанр твора.

Азнаямленне з мастацкім творам пачынаецца з падрыхтоўкі дзяцей дашкольнага ўзросту да больш усвядомленага ўспрымання слоўнага мастацтва.

Падрыхтоўку дзяцей да ўспрымання твора можна вырашыць з дапамогай такіх метадаў, як *уступная гутарка, стварэнне гульнявых сітуацый, назіранні за прадметамі і з'явамі рэчаіснасці, выкарыстанне нагляднасці, якая мае разнастайныя формы: маўленчая (выразнае чытанне ці расказванне выхавальніка), прадметная (аб'екты рэчаіснасці, макеты, муляжы цацкі), выяўленчая (карціны, ілюстрацыі, фотаздымкі), дзейсная (дзеянні дзяцей, якія адпавядаюць вобразу, выяўленаму ў слове), аудыёвізуальныя віды мастацтва.*

Выбар спосабу падрыхтоўкі дзяцей да ўспрымання мастацкага твора залежыць ад наяўнасці ў дзяцей пэўнага вопыту, ўзроўня іх літаратурнай падрыхтоўкі, характара мастацкага твора.

Падрыхтоўка дарослага да чытання мастацкага твора ўголас складаецца са звычайнай рабочай разбіўкі тэксту, вызначэння інтанацыйнай выразнасці. Для больш выразнага чытання яму неабходна прадумаць, элементы артыстычнасці – міміку, жэсты; вызначыць тыя месцы тэксту, якія неабходна будзе праскандзіраваць і нават праспяваць. Расказваючы літаратурны твор, неабходна ўмела выкарыстоўваць магчымасці свайго голасу, пазбягаць раўнамерных націскаў. Расказванне казкі можа ўвогуле насіць свабодны характар, але яно не выключае добрых ведаў на памяць і абавязковага выкарыстання тыповых казачных форм: зачыну, паўтораў, канцоўкі.

Чытаць ці расказваць літаратурны твор трэба павольна, не спяшаючыся, каб дзеці мелі магчымасць найбольш дасканала асэнсаваць яго змест, адчуць харство мовы, якою ён напісаны.

На аснове арыенціроўкі дзяцей ў змесце літаратурных твораў выхавальнік дашкольнай адукацыі скіроўвае ўвагу выхаванцаў на цэласны і дыферэнцыраваны падыход да іх зместу. Сумесная мастацка-маўленчая дзейнасць выхавальніка і дзяцей арганізуецца так, каб *успрыманне мастацкага твора адбывалася ў адзінстве яго зместу і мастацкай формы.* Пры гэтым дзеці дашкольнага ўзросту авалодваюць навыкамі і уменнямі рабіць элементарны эмацыянальна-вобразны аналіз твора, выказваць свае эстэтычныя адносіны да яго, вызначаюць галоўных герояў, характарызуюць літаратурнага героя і матывуюць да яго свае адносіны , заўважаюць вобразныя сродкі мовы.

Н.А. Старадубава адзначае, што здольнасць дзяцей да вобразнага аналізу мастацкага тэкста сама сабою не фарміруецца. А калі яна адсутнічае, то дашкольнікі ўспрымаюць толькі ўчынкі герояў, сочаць за ходам сюжэта і прапускаюць у творы ўсё тое, што ім нецікава. Менавіта таму, на яе думку, неабходна вучыць дзяцей асэнсаванаму ўспрыманню, уменню пранікаць ў сэнс кнігі.

Актыўнаму ўспрыманню дзецьмі літаратурнага твора садзейнічаюць такія метады, як: *гутарка пасля чытання, паўторнае чытанне, імітацыя, мадэліраванне і інш.*

Значнае месца ў мастацка-маўленчай дзейнасці дзяцей дашкольнага ўзросту займае *самастойны пошук выразных прыёмаў выканання мастацкіх твораў.* Дарослы садзейнічае развіццю гэтай дзейнасці: *сочыць за якасцю выказвання, заахвочвае выкарыстанне дзецьмі засвоеных вобразных выразаў, азначэнняў, параўнанняў, сродкаў інтанацыйнай выразнасці.*

Развіццю навыкаў арыентацыі выхаванцаў у эмацыянальным настроі твора, разуменні яго зместу і запамінанні паслядоўнасці эпізодаў, а таксама вызначэнні асноўных сродкаў эмацыйнай выразнасці спрыяюць такія метады**,** як *пераказ, імітацыя, драматызацыя***.** Тую ж функцыю выконваюць наступныя метадычныя прыёмы: *слоўнае маляванне, слоўная гульня, складанне псіхалагічнай літаратурнай характарыстыкі героя* і інш.

У кожнай узроставай групе наладжваецца *цэнтр маўленчай актыўнасці*. Асноўнае месца ў центры маўленчай актыўнасці займае кніжны куток, прызначэннем якога з'яўляецца выхаванне цікавасці і дбайнага стаўлення дашкольнікаў да кнігі, замацавання навыкаў карыстання ёю. Кнігі ў кутку могуць знаходзіцца на спецыяльных кніжных палічках ці ў шафе. Разглядваць іх лепш за ўсё за невялікімі кніжнымі столікамі. У кніжным кутку дзеці могуць пацікавіцца і дзіцячымі часопісамі, ілюстрацыямі мастакоў да літаратурных твораў. Аздабленнем кніжнага кутка могуць стаць карціны ці рэпрадукцыі да любімага мастацкага твора, партрэт пісьменніка, якога дзеці добра ведаюць.

Разам з тым кніжны куток становіцца месцам для размяшчэння розных тэматычных выстаў.

Арганізацыя кніжнага кутка у кожнай групе мае свае асаблівасці.

У цэнтры маўленчай актыўнасці групавога пакою неабходна вызначыць прастору, дзе можна было б распачаць розныя літаратурныя гульні, літаратурныя віктарыны, прэзентацыі-паказы новай кнігі, сюжэтна-дыдактычныя гульні па матывах даіцячай паэзіі і прозы, сюжэтна-ролевыя

гульні: «Бібліятэка», «Кніжная крама», «Тэатр», «Канцэрт», рэжысёрскія гульні па матывах літаратурных беларускамоўных твораў і г. д.

4. Рухомыя гульні з мастацкім словам, іх роля ў развіцці маўлення

Рухомая гульня – гэта эмацыянальна афарбаваная, свядомая, актыўная дзейнасць дзяцей, якая характарызуецца вырашэннем рухомых задач і выкананнем гульнявых правілаў.

Беларускі вучоны ў галіне фізічнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту В.А. Шышкіна канстатуе, што праз гульні дзеці знаёмяцца з разнастайнасцю рухаў, іх прызначэннем; вучацца дыферэнцыраваць рухі па відах і спосабах выканання; суадносіць, параўноўваць выкананае рухомае дзеянне з існуючымі меркамі – рухальнымі эталонамі; практыкуюцца ва ўжыванні рухаў у новай незвычайнай абстаноўцы. З дапамогай гульні арганізуецца дадатковае ўспрыманне, распазнаванне, называнне рухаў не толькі па дакладных дзеяннях, але і па славесным апісанні. Такім чынам, дзеці вучацца рабіць першыя абагульненні, групаваць рухі па пэўных уласцівасцях. Унясенне гульнявога кампанента ў навучанне дае дзіцяці магчымасць паглядзець на рух з практычнай, г. зн. гульнявой, пазіцыі; вучыць яго трансфармаваць рухальныя ўменні ў сваю непасрэдную дзейнасць.

Усе рухомыя гульні разлічаны на высокую актыўнасць дзяцей – рухальную, інтэлектуальную, маўленчую, сенсорную.

Як было паказана ў папярэднім раздзеле, яскравым узорам рухомых гульняў з выкарыстаннем прыгавораў, прыпевак, лічылак з’яўляюцца беларускія народныя гульні. Яны захоўваюць сваё мастацкае хараство, эстэтычнае значэнне і складаюць найкаштоўнейшы, непаўторны гульнявы фальклор. Народная педагогіка цесна звязала ў адно цэлае мастацкае слова і пэўныя дзеянні, якія адпавядаюць зместу твора.

Такім чынам, выхаванне ў дашкольнікаў любові і павагі да роднага слова, фарміраванне чуласці да маўленчых норм беларускай мовы і сродкаў выразнасці дасягаецца і праз рухомыя гульні.

Дыяпазон выкарыстання мастацкага слова ў працы з дзецьмі дашкольнага ўзросту можна значна пашырыць, калі *зместам рухомых гульняў стануць забаўлянкі, лічылкі, вершы або ўрыўкі з вершаваных тэкстаў беларускіх паэтаў*. Гарманічнае спалучэнне паэтычнага слова, рытму, інтанацыйнай выразнасці, музыкі і рухаў дае магчымасць задаволіць эмацыянальныя патрэбы дзіцяці. Рухомыя гульні пашыраюць агульны кругагляд, папаўняюць слоўнікавы запас, удасканальваюць псіхічныя працэсы.

5. Методыка правядзення літаратурных забаў і ранішнікаў

Цікавай формай азнаямлення дзяцей з літаратурным мастацтвам з'яўляецца правядзенне кніжкінага тыдня, у якім могуць прымаць удзел дзеці ўсіх узроставых груп. Правядзенне гэтага тыдня мяркуе штодзённае азнаямленне выхаванцаў з новымі кнігамі і іх героямі. Ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання ажыццяўляецца азнаямленне як з рускімі, так і беларускімі кніжкамі. Да дзяцей запрашаюцца пісьменнікі і паэты, праводзяцца літаратурныя святы, ранішнікі, віктарыны, тэатральныя спектаклі, кніжныя выставы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма 4.3 Развіццё беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту (лекцыя – 2 гадзіны)

Пытанні для вывучэння

1. Асаблівасці лексікі беларускай мовы (у параўнанні з рускай). Слоўнік роднай мовы як адлюстраванне нацыянальнага светапогляду.
2. Крытэрыі адбору лексікі для заняткаў.
3. Методыка ўвядзення новых слоў беларускай мовы.
4. Методыка замацавання слоўніка.
5. Работа над сэнсавым зместам слова.

1. Асаблівасці лексікі беларускай мовы (у параўнанні з рускай). Слоўнік роднай мовы як адлюстраванне нацыянальнага светапогляду

Лексіка-семантычныя, а таксама фанетычныя сістэмы беларускай і рускай моў маюць многа агульнага. Большая частка слоў у беларускай і рускай мовах супадаюць па значэнні і вымаўленні (*сад, школа, стол*) або адрозніваюцца ў вымаўленні асобных гукаў (*звер, дзеці, гусь*). Па дадзеных А.Я. Супруна, толькі 10-20% слоў у беларускім тэксце поўнасцю адрозніваюцца ад слоў рускай мовы. Гэта такія ўласнабеларускія або запазычаныя з іншых моў, акрамя рускай, словы, як *столь, працаваць, вандроўка, прыгоды, шкарпэткі, хутка*.

Пэўную групу слоў (паводле П.П.Шубы, гэта каля 500 лексічных адзінак) складаюць міжмоўныя амонімы – словы беларускай і рускай моў, якія маюць рознае значэнне: *дыван – диван, качка – качка, нядзеля- неделя, зорка – зорька, рэч – речь* і інш.

Аднак, адзначаюць даследчыкі, агульнасць значнай часткі слоўнікавага фонду беларускай і рускай моў не азначае поўнай тоеснасці паняццяў, абазначаных аднолькавымі словамі. Спецыфіка рускай і беларускай агульнай лексікі тычыцца адценняў значэнняў, спецыфічных з’яў словаўтваральнага афармлення слоў у кожнай з моў, стылістычнай афарбоўкі адзінак слоўніка.

Лексіка роднай мовы ствараецца, развіваецца і ўдасканальваецца народам з пакалення ў пакаленне. Адсюль выразнасць, самабытнасць кожнай мовы. Беларускі народ у роднай мове адлюстраваў сусвет такім, якім яго бачыў. Кожнае слова нясе ў сабе код разумення рэчаіснасці, інфармацыю пра тое, як чалавеку ставіцца да той або іншай з’явы, разумець тую ці іншую падзею.

Беларуская мова па свайму духу непадобная на іншыя мовы і адпавядае менавіта беларускаму народу, які яе стварыў. Таму навучанне беларускай мове, узбагачэнне слоўніка дзяцей дашкольнага ўзросту ў шырокім сэнсе – гэта перш за ўсё фарміраванне ў іх нацыянальнага светапогляду.

Тое, што рускамоўнае дзіця дашкольнага ўзросту ў адноўным разумее беларускую мову, часта стварае ўражане ведання ім беларускага слоўніка. Але падобнасць рускіх і беларускіх слоў дазваляе зразумець беларускія словы толькі прыблізна правільна. Разуменне тэксту сведчыць пра пасіўны бок валодання мовай, а не пра актыўны. Разуменне слова не прадвызначае яго правільнага выкарыстання.

Сказанае патрабуе спецыяльнай работы над беларускай лексікай нават у тых выпадках, калі словы дзвюх блізкароднасных моў на першы погляд

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

супадаюць. Тым больш гэта неабходна ў дачыненні да ўласнабеларускай лексікі і слоў, запазычаных з іншых, акрамя рускай, моў.

Таким чынам, у сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя агульнапрынятыя задачы развіцця слоўніка дзяцей – узбагачэнне слоўніка, яго замацаванне, удакладненне і актывізацыя – набываюць некаторыя спецыфічныя рысы. Гэта, па-першае, фарміраванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту ўласна-нацыянальнага светапогляду. Па-другое, гэта навучанне дзяцей правільнаму разуменню зместу слоў, блізкіх у рускай і беларускай мовах па значэнні і гучанні, прадухіленне або пераадоленне моўнай інтэрферэнцыі – сумешчанага механізма адбору слоў пры пабудове выказвання.

2. Крытэрыі адбору лексікі для заняткаў

Змест слоўнікавай работы вызначаецца праграмай азнаямлення дашкольнікаў з навакольнай рэчаіснасцю. Асноўным крытэрыям для адбору слоў з'яўляецца іх *ужывальнасць, практычная неабходнасць для зносін, а таксама адпаведнасць нацыянальным моўным традыцыям*. Зыходнымі павінны быць тыя паняцці, прадметы і з'явы, якія акружаюць дзіця, з'яўляюцца спецыфічнымі для субкультуры ўстановы дошкольнай адукацыі, для дадзенай мясцовасці і беларускай культуры ўвогуле.

Той факт што большая частка слоў у рускай і беларускай мовах супадаюць па значэнні і вымаўленні або адрозніваюцца ў вымаўленні толькі асобных гукаў, стварае ўражанне, што ў сітуацыі руска-беларускага двухмоўя дзеці лёгка могуць засвоіць беларускі слоўнік, набліжаны па колькасці да слоўніка рускай (першай засвоенай) мовы. Аднак гэтая лёгкасць уяўная. Вышэй ужо адзначалася неабходнасць спецыяльнай работы над семантыкай суадносных слоў беларускай і рускай моў. Акрамя таго, трэба ўлічваць, што работа над словам вядзецца ў комплексе "значэнне – вымаўленне – граматычныя формы". Калі словы не супадаюць фанетычна, гэта адразу патрабуе дадатковых намаганняў для яго засваення. Аднак нават тады, калі поўнасцю супадаюць пачатковыя формы слоў, напрыклад, *лета*, *нага*, яны могуць не супадаць граматычна: *летом – летам*, *улетку*; *на ноге – на назе*. Звычайна руска-беларускія адпаведнікі аказваюцца частковымі.

Штодзённыя зносіны на беларускай мове з выхавальнікам і іншымі беларускамоўнымі суразмоўнікамі садзейнічаюць пашырэнню, у першую чаргу, пасіўнага слоўніка, які можа паступова актывізавацца па меры ўзнікнення патрэбы ў тых або іншых словах для пабудовы выказвання.

Праграмным зместам заняткаў заўсёды выступае ўвядзенне пэўных слоў і іх наступная актывізацыя або актывізацыя слоў, засвоеных па-за заняткамі. *Для заняткаў неабходна падабраць метадычна абгрунтаваны аб'ём і тэматыку слоўнікавай работы.*

Адбор слоўніка для кожных заняткаў цесна звязаны с арганізацыяй лексічнага запасу ў свядомасці чалавека. П*ры ўзбагачэнні слоўніка дзяцей трэба даваць ім не асобныя ізаляваныя словы, а сістэматызаваныя лексіка-семантычныя групы слоў*, што масімальна аблягчае дзецям пошук патрэбнага слова для выказвання сваёй думкі ў працэсе маўленчай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Заняткі па развіцці беларускага маўлення ва ўстанове з рускай мовай навучання будуюцца па пэўных тэмах, што дазваляе ўводзіць у слоўнік дзяцей гупы слоў, звязаных паміж сабой па сэнсе. Тэмамі заняткаў могуць быць такія: «Гульні і цацкі», «Сям'я», «Знешні выгляд чалавека», «У пакоі», «Дзіцячы сад», «Свойскія жывёлы», «Дзікія жывёлы», «Адзенне і абутак», «Садавіна і агародніна», «Прадукты харчавання», «Посуд», «Прафесія і праца», «Поры года», «Наш край» (горад, вёска), «Абазначэнне часу», «Лічэнне», «Геаметрычныя паняцці», «Хутка ў школу» і інш.

Парадак азнаямлення з групамі слоў абумоўліваецца запатрабаваннямі, інтарэсамі дзіцяці-дашкольніка, што адлюстроўваецца ў зносінах з дарослымі і аднагодкамі, а таксама лёгкасцю выкарыстання слоў для камунікацыі.

Асноўная лінія, па якой ідзе работа над тэмамі, -- не назапашванне ізаляваных слоў, а паступовае пашырэнне магчымасцей дзіцяці самастойна выражаць свае думкі на беларускай мове. Інакш кажучы, слова павінна паступова «абрастаць» семантычнымі сувязямі. Выбар тэм вызначаецца не толькі тым, наколькі лёгка могуць быць выкарыстаны новыя словы для зносін. а і спалучальнасцю іх з вядомымі словамі.

У той жа час спецыфіка руска-беларускага білінгвізму абумоўлівае *неабходнасць уліку адрознення і падабенства рускіх і беларускіх слоў унутры лексіка-семантычнай групы.*

У той ці іншай лексіка-семантычнай групе ўдзельная вага беларускіх слоў, якія адрозніваюцца ад рускіх, і тых, што з'яўляюцца падобнымі або супадаюць з рускімі, розная. Параўнаем, напрыклад, групы слоў, якія аб'ядноўваюцца тэмамі «Дзікія жывёлы» і «Адзенне і абутак».

Першая група ўключае словы: ліса, заяц, мядзведзь, воўк, вожык, бабёр, вавёрка, дзік, дзікія жывёлы; лес, дупло, нара, бярлога; лапы, хвост, галава, вусы, поўсць; шэры, рыжая, карычневы, калючы; скача, бяжыць, ідзе. (Пар. рус.: лиса, заяц, медведь, волк, ежик, бобр, белка, дикий кабан, дикие животные; лес, дупло, нора, берлога; лапы, хвост, голова, усы, шерсть; серый, рыжый, коричневый, колючий; прыгает, бежит, идет.)

Другая група ўключае такія словы: сукенка, кашуля, спадніца, кішэнь, хустка, шалік, капялюш, паліто, гузікі, каўнер, футравы, шкарпэткі, калготкі, адзенне; боцікі, чаравікі, туфлікі, абутак; адзявацца, раздзявацца, апранацца, распранацца, прыбірацца, здымаць, вешаць у шафу. (Пар. рус.:платье, рубашка, юбка, карман, платок, шарф, шляпа, пальто, пуговицы, воротник, меховой, носки, колготки, одежда; сапожки, ботинки, туфли, обувь; одеваться, раздеваться, наряжаться, снимать, вешать в шкаф).

Як відаць, у першай лексіка-семантычнай групе колькасць беларускіх слоў, не падобных на словы рускай мовы, значна меншая, чым у другой. Калі беларуская мова вывучаецца пры апераджальным характары курса рускай мовы, семантычныя групы, аналагічныя першай, трэба даваць дзецям раней.

Даследаванні паказваюць, што пры навучанні выхаванцаў другой мове на адных занятках можа быць уведзена ад 3 да 8-10 новых слоў (Ф.А.Сахін, А.І.Негнявіцкая). Колькасць залежыць ад методыкі арганізацыі запамінання

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

слоў, ад таго, наколькі новыя словы могуць быць аб’яднаны ў адну сэнсавую групу, ці могуць яны займаць адно і тое ж месца ў структуры выказвання.

Лепш засвойваюцца выхаванцамі ловы з прадметным значэннем, увядзенне якіх можна звязаць з нагляднасцю. Словы з абстрактным значэннем (*прыгожы, здзіўлены*) патрабуюць для свайго засваення большай колькасці гульняў, значыць, такіх слоў у час заняткаў яны запомняць значна менш, чым першых.

Нарэшце, не трэба забывацца на тое, што размова ідзе пра адбор слоўніка другой роднай мовы. Гэта вымагае ўвядзення не асобных “голых” абазначэнняў тых або іншых прадметаў і з’яў, а нацыянальна-культурных комплексаў слоў для іх абазначэння. Так, напрыклад, хатняя жывёла, добра вядомая дзецям, -- гэта не проста *кот* (*кошка*), а *коцік, каток, коцінька, коця* і г.д. У названы комплекс уключаюцца словы, якія сустракаюцца дзецям у фальклорных і іншых творах для дзяцей, у дадзеным прыкладзе гэта: *каток-залаты лабок, каточак-галубочак, кот Мартын, коцік-варкоцік* і г.д. Такім чынам ствараецца падмурак таго “літаратурнага мінімуму”, пра які ўзгадвалася раней.

У далейшым актывізацыя слоўніка павіна ажыццяўляцца па розных напрамках, што дазволіць дзецям неўсвядомлена ўстанавіць новыя сувязі паміж словамі, істотныя для іх практычнага выкарыстання: па гукавым абліччы, па граматычных прыметах і г.д.

Чым больш развітае маўленне дзяцей, тым лягчэй і больш трывала засвойваецца слоўнік. Гэта тлумачыцца тым, што па меры развіцця формаў маўленчых зносін на беларускай мове ў выхаванцаў узнікае патрэба ў новых беларускіх словах. Станоўчую ролю для развіцця беларускага слоўніка дзяцей адыгрывае магчымасць набыцця некаторага вопыту зносін на беларускай мове за межамі ўстановы дашкольнай адукацыі.

Аблягчае дзецям працэс засваення новых слоў тое, што беларуская і руская мовы па сваіх фанетычных сістэмах адрозніваюцца мала. Гэта пазбаўляе малых ад боязі няправільна вымавіць новае слова, што часта сустракаецца пры вывучэнні народнай мовы.

3. Методыка ўвядзення новых слоў беларускай мовы

У методыцы навучання мове вылучаецца некалькі этапаў работы над новымі словамі: увядзенне новых слоў і тлумачэнне значэння кожнага з іх; замацаванне і актывізацыя як ізаляваных слоў, так і ў складзе сказа або звязнага маўлення. Развіццё беларускага слоўніка рускамоўных дзяцей абапіраецца на агульнапрынятыя метадычныя прыёмы (*паказ і называнне, неаднаразовае паўтарэнне, тлумачэнне і інш.*) і спецыфічныя, пры якіх улічваецца, з аднаго боку, тое, што дзеці разумеюць беларускае маўленне, а з другога – тое, што ўвядзенне новага слова не заўсёды азначае азнаямленне з новым паняццем (яно можа быць вядомым малым на рускай мове). Асаблівасць методыкі складаецца таксама з таго, што слоўнікавая работа звязана з фарміраваннем у дзяцей асноў нацыянальнага асэнсавання навакольля.

Цікавасць да новых слоў можна выклікаць з дапамогай традыцыйных *сюрпрызных момантаў* (пакласці прадметы, якія будуць служыць наглядай апорай для ўвядзення слоў, у “цудоўны мяшэчак” або абыграць нечаканы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыход паштальёна і да т.п.). Важна па магчымасці ствараць праблемныя сітуацыі, каб выклікаць у дзяцей асэнсаванае жаданне даведацца, “як гэта называецца па-беларуску”. Напрыклад, у цацачным магазіне працуе лялька Паўлінка, якая прадае цацкі толькі таму, хто правільна называе іх па-беларуску.

Тлумачэнне значэння новых слоў адбываецца галоўным чынам *на падставе нагляднасці* (паказу прадмета, цацкі, малюнка, дзеяння). *Да нагляднасці прад’яўляюцца пэўныя патрабаванні*: прадмет, малюнак павінны адлюстроўваць перш за ўсё тое, для тлумачэння чаго яны выкарыстоўваюцца.

Важным патрабаваннем да нагляднасці з’яўляецца і яе займальнасць, што дасягаецца спалучэннем незвычайных прадметаў, іх якасцей, дзеянняў.

Пры ўвядзенні новага беларускага слова неабходна пазбягаць перакладу з рускай мовы, а называць прадмет, дзеянне і г.д. адразу па-беларуску. У патрэбных выпадках выкарыстоўваецца параўнанне лексічных адзінак рускай і беларускай моў.

Так, калі новае беларускае слова адрозніваецца ад адпаведнага рускага, зусім няма патрэбы параўноўваць іх. Але бывае, што хто-небудзь з дзяцей апярэджвае педагога, заяўляючы, напрыклад:”А я знаю, это белочка”. У такіх выпадках выхавальнік падкрэслівае:”Ты назваў звярка па-руску. А па-беларуску трэба гаварыць *вавёрка*. Гэта – вавёрка”.

У многіх выпадках паралельна са слоўнікавай работай трэба весці мэтанакіраваную арфаэпічную работу, каб папярэдзіць змешванне слоў, падобных у рускай і беларускай мовах. Асноўным прыёмам у дадзеным выпадку выступае параўнанне вымаўлення беларускіх і рускіх слоў. Такое параўнанне садзейнічае свядомаму размежаванню дзецьмі рускай і беларускай лексікі.

Нарэшце, калі словы рускай і беларускай моў супадаюць, выхавальнік можа сказаць:”Як і ў рускай мове, гэтая цацка называецца і вымаўляецца па-беларуску “*кубік*”.

Новыя словы, як правіла, уводзяцца ў складзе сказа, у якім астатнія словы зразумелыя дзецям.

Улічваючы блізкасць беларускай і рускай моў, можна, абапіраючыся на пэўны слоўнікавы запас выхаванцаў, уводзіць новыя словы з дапамогай *тлумачэння без паказу адпаведнага прадмета або малюнка*. Гэта асабліва тычыцца тых прадметаў, з’яў, якія дзецям ужо знаёмы, але ім невядома беларуская назва прадмета (з’явы). Дзеці, зразумеўшы тлумачэнне, самі знаходзяць прадмет (малюнак) сярод іншых. Напрыклад, на занятках уводзіцца група слоў па тэме “Адзенне”. Наглядным матэрыялам служыць абсталяванне для адпаведнага магазіна.

Для тлумачэння могуць быць выкарыстаны вершы, загадкі. Напрыклад, па тэме “Чайны посуд” дзеці знаёмяцца са словамі *кубак, сподак, лыжачка, цукарніца, чайнік, або імбрык.* Калі першыя пяць слоў дзецям вядомы, бо яны карыстаюцца імі ў штодзённым жыцці, то апошнюю лексему яны не ведаюць. Выхавальнік ставіць на стале прадметы і прапануе паслухаць верш пра адзін з іх: “Здагадайцеся, пра які прадмет ідзе гаворка ў вершы”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Каб знаёміць выхаванцаў з нацыянальнымі моўнымі традыцыямі, неабходна *кожнае слова ўводзіць* не ізалявана як назву асобнага прадмета, з'явы, якасці, дзеяння і г.д., а *ў кантэксце, у спалучэнні з іншымі словамі* (эпітэтамі, параўнаннямі, уласцівымі менавіта беларускай мове) і ў розных граматычных формах. Так, да слова *зіма* паступова падбіраюцца эпітэты *белая, лютая, марозная, мяккая*, *позняя, серабрыстая, сівая, снежная, сцюдзёная, сярдзітая, халодная.*

Беларуская мова надзвычай багатая на так званыя «гаваркія» словы. Каб лексіка, якую засвойвае дзіця, не заставалася для яго чужой, вельмі важна *паказаць матываванасць* некаторых слоў, дапамагчы яму ўстанавіць словаўтваральныя сувязі. Дзеці з дапамогай выхавальніка шукаюць адказы на пытанні тыпу: «Чаму гэтая птушка называецца певень?», «Як называецца чалавек, які працуе на кухні?» (Кухар.), «Якая з гэтых кветак называецца дзьмухавец? Чаму?» Такая практыка садзейнічае і лепшаму засваенню новых слоў, і фарміраванню граматычнага адчування беларускай мовы.

З дапамогай слоўных сродкаў тлумачацца вобразныя выразы ў мастацкіх творах. Напрыклад. незнаёмыя словы і выразы ў вершы Я.Купалы «Вясна»: «Зеленню вабнаю абдаравала зямельку вясна» – значыць, зямля пакрылася зялёнай травой, распусцілася лісце на дрэвах; «рыбкі шмыглістыя» – вельмі хуткія, шпаркія, хутка плаваюць; «лісці зашасталі» – закалыхаліся ад ветру; «птушкі зачыркалі» – зашчабяталі, запелі; «падпасвіч» – чалавек, які пасе свойскую жывёлу; «жалейка» – беларускі музычны інструмент – дудачка.

У выключных выпадках, калі значэнне слова пазбаўлена прадметнасці і яго цяжка растлумачыць дзецям на беларускай мове, выкарыстоўваецца пераклад з беларускай мовы на рускую: «Не ў камадзіроўку я кірунак маю! Проста – у вандроўку. Па родным краі» (Г.Іванова.) У вандроўку – значыць «в путешествие». А па-беларуску – *у вандроўку*, яшчэ можна сказаць *у падарожжа*.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на размежаванне у свядомасці дашкольнікаў лексічнага значэння міжмоўных амонімаў, каб папярэдзіць семантычныя памылкі ў іх ужыванні. Асноўным прыёмам тут выступае параўнанне значэнняў гэтых слоў.

Параўнанне можна правозіць пры дапамозе тлумачэння значэння новага слова.

Для замацавання значэння слоў-амонімаў можна прапанаваць дзецям выканаць пэўныя заданні на рускай і беларускай мовах: "Послушай задание по-русски: посади куклу на диван. А зараз паслухай па-беларуску: пасадзі ляльку на дыван». Як заўсёды вельмі карысна прыцягваць фальклорныя або мастацкія творы. Напрыклад, скорагаворку "У маленькіх трусікаў маленькія вусікі", якая заўсёды выклікае станоўчыя эмоцыі, смех. Зразумела, пасля яе выкарыстання дзеці запамінаюць значэнне беларускага слова *трусікі*.

4. Методыка замацавання слоўніка

Пасля азнаямлення дзяцей з новай лексікай наладжваецца замацаванне слоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Педагог стварае спецыяльныя гульнявыя сітуацыі, у якіх дзеянні выхаванцаў са словам падобныя на тыя, што адбываюцца ў рэальнасці. У выніку дзіця не проста механічна запамінае тое ці іншае слова, а вучыцца карыстацца ім як прыладай маўленчай дзейнасці. Пры гэтым ужыванне слоў практыкуецца не ізалявана адно ад аднаго, а ў складзе групы семантычна блізкіх слоў, што аблягчае пошук кожнага слова, аперыравання ім.

Замацаванне лексікі блізкароднаснай мовы адбываецца ў пэўнай паслядоўнасці, аналагічнай той, што распрацавала А.І.Негнявіцкая для замацавання лексікі замежнай мовы: пасіўнае распазнаванне слова, актыўнае распазнаванне, узнаўленне слова з наглядной падказкай, узнаўленне без наглядной падказкі, самастойнае называнне слова спачатку з выбарам, а потым без выбару. Першыя дзве групы практыкаванняў – пасіўнае і актыўнае распазнаванне – адпавядаюць рэцэптыўнаму двухмоўю. Практыкаванні на ўзнаўленне слоў – з наглядной падказкай і без яе – садзейнічаюць развіццю рэпрадуктыўнага маўлення. Нарэшце самастойнае называнне слова з выбарам або без выбару – прадуктыўнаму маўленню.

Разуменне дзецьмі беларускай мовы дазваляе выкарыстоўваць у гэтым працэсе займальны матэрыял накшталт вершаў, чыстагаворак, рыфмовак і да т.п. У гэтым, нагадваем, заключаецца спецыфіка развіцця беларускага маўлення рускамоўных выхаванцаў. Замацаванне можна і трэба праводзіць і па групах слоў, падобных па гучанні.

Выхавальнік паказвае прадмет (малюнак) і адначасова вымаўляе некалькі слоў з новай лексіка-семантычнай групы, сярод якіх і назва паказанага прадмета. Адказы дзяцей будуць простыя: патрэбна пасля кожнага слова, сказанага педагогам, пацвердзіць або адхіліць яго (“Так” або “Не”). Гэтая сітуацыя тады наблізіцца да рэальнай, калі дзеці бачаць прадмет, а выхавальнік нібы не бачыць і спрабуе адгадаць, што гэта.

Шмат гульняў гэтага тыпу пабудаваны такім чынам, каб гульнявыя дзеянні выконваліся дзецьмі. Вядучы прымае, хавае цацкі, паказвае іх так, каб бачылі ўсе дзеці, але не бачыў выхавальнік. Педагог увесь час адгадвае. Напрыклад. Выхаванцы па чарзе выконваюць ролю мышкі, якая прыбягае ноччу на кухню і што-небудзь з’ядае (тэма “Прадукты харчавання”). Выхавальнік адгадвае, што з’ела мышка.

Пасіўнае распазнаванне слоў адбываецца і пры дагаворванні дзецьмі рыфмовак, якія змяшчаюць новыя словы. Прагаворванне суправаджаецца паказам наглядзнасці (прадметаў, малюнкаў, дзеянняў). Напрыклад, чыстагаворкі на тэму “Мэбля” пра Янку:

Іў – іў – іў – канапу ..(купіў),
аў – аў - аў – у ложку …(спаў),
еў – еў – еў – на крэсле … (сядзеў),
іў – іў – іў – шафу… (адчыніў).

Дагаворваючы такія рыфмоўкі, дзеці адначасова вучацца спалучаць словы.

Актыўнае распазнаванне слоў адбываецца ў сітуацыі, калі выхавальнік называе слова, а дзеці знаходзяць патрэбны прадмет сярод шэрагу іншых.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Напрыклад, гульня “Пачастуем лялек чаем” (тэма “Посуд”).

Далей праводзяцца гульні на ***ўзнаўленне слоў з*** *нагляднай падказкай*. Іх сутнасць заключаецца ў тым, што выхавальнік называе некалькі прадметаў (дзеянняў, якасцей і г.д.) і прапануе дзецям паўтарыць адно са слоў. Але патрэбна, каб дзеці не механічна паўтаралі, а матывавана выбіралі, як у рэальнай жыццёвай сітуацыі. Таму папярэдне выхавальнік прапануе ім гульнявую сітуацыю выбару і матыву.

Больш складанымі з’яўляюцца гульні, у якіх выхаванцам прыходзіцца *ўзнаўляць словы без нагляднай падказкі*. Адпаведны прадмет паказваецца пасля таго, як дзіця скажа яго назву.

Напрыклад, гульня “Якая фарба ў мяне ў руцэ?” .

Дадзены этап слоўнікавай работы вельмі важны, паколькі тут слова ў свядомасці дзіцяці пачынае як бы аддзяляцца ад прадмета, які яно абазначае, дзіця вучыцца “даставаць” словы з памяці.

Без малюнкаў, ва ўяўнай сітуацыі такія гульні праводзяцца, калі вывучаецца непрадметная лексіка. Напрыклад, звяртаючыся да “звяроў”, выхавальнік пытаецца: “Калі вы выходзіце на паляванне, ноччу ці ўдзень?”

Далей выхаванцам прапануюцца заданні, якія яны выконваюць *самастойна*, без папярэдняй падказкі выхавальніка, *успамінаюць словы* той або іншай семантычнай групы. Да гэтых гульняў адносяцца такія, як “Што надзенем ляльцы на прагулку?”, “Хто назаве, той атрымае малюнак”, “Чым пакормім звяроў?”, “Каму што?” і інш.

У ходзе названых гульняў дзеці спачатку называюць прадмет, а потым знаходзяць яго або пазнаюць. Можна правесці гульню і без нагляднасці.

Сутнасць падобных гульняў у тым, што дзеці маюць магчымасць выбару: кожны называе тое слова, якое яно помніць. Гэта аблягчае дзеянні выхаванцаў са словамі. Калі адзін з выхаванцаў вымаўляе чарговае слова, астатнія перабіраюць у памяці іншыя словы з гэтай групы, каб, назваць свае. Таму гэтыя гульні з’яўляюцца вельмі эфектыўным метадычным прыёмам замацавання новай лексікі.

На апошнім этапе работы над замацаваннем слоўніка дзецям дашкольнага ўзросту прапануюцца такія ***заданні, якія не даюць магчымасці выбіраць любое слова*** з шэрагу семантычна звязаных, а патрабуюць называння пэўнага прадмета (малюнка, дзеяння, якасці і г.д.).

Для замацавання асобных слоў можна выкарыстоўваць загадкі, у якіх апошняе слова дагаворваюць дзеці. Загадкі-дабаўлянкі прывучаюць іх уважліва слухаць верш, падбіраць падобныя па гучанні і прыдатныя па сэнсе словы. Змест верша і рыфма падказваюць дзецям слова. У выпадку неабходнасці выхавальнік паказвае малюнак.

Замест вершаў, якія не заўсёды можна падабраць, выхавальнік можа скласці рыфмоўкі.

Прагаворваючы чыстагаворку, выхавальнік паказвае рукой на адпаведныя дэталі пакоя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Праводзяцца *гульні і без нагляднасці*. У гэтым выпадку малым трэба назваць нешта ў адпаведнасці з роляю (ежу, месца жыхарства, посуд, мэблю і г.д.).

Напрыклад, гульня “Які твой голас?” Дзеці ў адпаведнасці з роляю вымаўляюць гукаперайманні (мяў, цяў, у-у-у, кар-кар і г.д.) і кожны раз зазначаюць: “*Я мяўкаю, я цяўкаю, я выю, я каркаю*” і г.д.

Праз вучэбна-маўленчыя практыкаванні трэба “правесці” кожную семантычную групу слоў. *(Але калі словы выхаванцам у асноўным знаёмыя, напрыклад. назвы свойскіх жывёл, можна прапусціць ступені пасіўнага і актыўнага распазнавання*.) Гэта дазволіць дзіцяці даволі хутка і трывала авалодаць словам як сродкам ажыццяўлення маўленчага дзеяння.

Засваенню асобных слоў садзейнічае завучванне невялікіх вершыкаў, якія змяшчаюць новыя словы і могуць служыць займальным матэрыялам да заняткаў.

Замацаванне значэнняў беларускіх слоў адбываецца і пры тлумачэнні дзецьмі небыліц.

Калі дзеці ўжо авалодаюць пэўным пачатковым лексічным запасам, далейшае ўзбагачэнне беларускага слоўніка ідзе больш хутка, актыўна. Блізкароднаснасць беларускай і рускай моў дазваляе выкарыстоўваць тыя гульні і практыкаванні, якія ўжываюцца пры навучанні роднай мове (*падбор азначэнняў да назоўнікаў, назоўнікаў да дзеясловаў і да т.п*.). Але, нагадаем, гульня праводзіцца або толькі на рускай мове, або толькі на беларускай (“адна гульня – адна мова”).

Слоўныя практыкаванні праводзяцца як падрыхтоўка дзяцей да расказвання, каб яны ўяўлялі прадмет апісання ва ўсёй паўнаце. Гэта практыкаванні на назіральнасць («Адгадай, што змянілася», «Што аднолькавае, а што рознае?», «Хто больш пабачыць і назаве?»).

5. Работа над сэнсавым зместам слова

Пашырэнне і замацаванне слоўніка – важная задача маўленчага развіцця і разумовага выхавання дзіцяці. Аднак гэта не адзіны накірунак слоўнікавай работы.

У практыцы маўленчых зносін дзеці дашкольнага ўзросту сутыкаюцца з рознымі па семантыцы словамі, рознымі значэннямі аднаго слова (*носік*), аманімічнымі значэннямі (*каса*), з сінонімамі (*ідзе, крочыць*) і антонімамі (*высокі – нізкі, смелы – баязлівы*).

Але разуменне і выкарыстанне гэтых слоў у маўленні падпарадкавана канкрэтным умовам камунікацыі, і адпаведныя словы выступаюць для дзіцяці як малазвязаныя паміж сабой семантычныя адзінкі мовы. Дзеці, напрыклад, асобна ўспрымаюць такія словы і выразы, як *храбры, смелы, мужны; баязлівы, нясмелы, пужлівы; грабянец* пеўніка і *грабянец* для расчэсвання валасоў, часта не заўважаючы паміж імі ўласна моўных сувязей.

Каб узбагаціць як маўленчае, так і разумовае развіццё дзяцей, трэба праводзіць спецыяльна арганізаваную *работу над словам як структурнай адзінкай мовы*, вызначальнай уласцівасцю якой з’яўляецца значэнне.

Прынцыпы работы над сэнсавым зместам слова ў дашкольнай установе распрацаваны Л.М. Струнінай.

Выхаванцы сярэдняй групы знаёмяцца з тэрмінам “слова”, з яго функцыяй абазначэння прадметаў, з’яў, іх якасцей, уласцівасцей, дзеянняў і г.д., з гукавым бокам слова. Гэта дапамагае ім “развесці” слова і прадмет, які гэтым словам абазначаецца. У дзіцячым садзе з рускай мовай выхавання гэтая работа праводзіцца на занятках па развіцці як рускага, так і беларускага маўлення.

Пазней, на занятках па развіцці як рускага, так і беларускага маўлення, у слоўнік дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту ўводзяцца спецыяльныя тэрміны “значэнне”, “сэнс слова”, “азначае”, “значыць”. Дзеці ўсведамляюць, што кожнае слова мае сваё значэнне, вучацца адказваць на пытанні: “Што азначае слова?” Дзеці падводзяцца да разумення таго, што слова трэба ўжываць дакладна па сэнсе, інакш атрымліваецца незразумела, нават смешна (выказванні тыпу: «Мамачка, патушы сонца”, «Тата, ідзі шэптам» і да т. п.). Дзеці адказваюць на пытанні: «Ці можна так сказаць?” “Як правільна сказаць?». У якасці займальнага матэрыялу выкарыстоўваюцца розныя небыліцы, прачытаўшы якія, выхавальнік пытаецца, ці заўважыцў хто ў вершы недарэчнасць, тое, чаго не бывае. Просіць не толькі назваць недарэчнасць, але і растлумачыць яе.

Далей выхаванцы падводзяцца да разумення таго, што слова можа мець не адно, а некалькі значэнняў. З гэтай мэтай выхавальнік прапануе дзецям заданні на падбор сінонімаў, напрыклад, замяніць слова *свежы*, (падабраць блізкае па сэнсе) у такіх словазлучэннях, як *свежы хлеб, свежы вецер*, *свежая кашуля*.Да словазлучэння *свежы хлеб* дзеці падбіраюць словы *цёплы, смачны*, тлумачаць, што замест *свежы вецер* можна сказаць *халодны вецер*, а *свежая кашуля—чыстая*.

Затым дзецям прапануюцца маўленчыя сітуацыі, у якіх яны падбіраюць сітуацыйныя (у рамках пэўнай сітуацыі) сінонімы і антонімы да слоў. Адначасова дзецям прапануюцца заданні на складанне сказаў са словамі-сінонімамі, антонімамі, мнагазначнымі словамі.

Напрыклад, з кожным словам сінанімічнага рада: *смелы, мужны, храбры, адважны, гераічны* і з антанімічнымі парамі: *цяжкі* і *лёгкі*, *складаны* і *просты* скласці сказы з заменай адных слоў іншымі (*цяжкая задача* і *лёгкая задача, складаная задача і простая задача, цяжкі чамадан і лёгкі чамадан*, але нельга сказаць складаны або просты чамадан). Такія заданні фарміруюць у дзяцей уменне сэнсава, дакладна злучаць словы, дыферэнцыраваць значэнні сінонімаў і мнагазначных слоў.

Значэнне слоў-амонімаў у рускай і беларускай мовах можна параўнаць шляхам падбору сінанімічных радоў і антанімічных пар да кожнага з іх, падбору да іх азначэнняў, складання сказаў з гэтымі словамі на рускай і беларускай мовах.

Напрыклад, міжмоўнымі амонімамі з’яўляюцца рускае слова «манит» і беларускае «маніць». З рускім словам выхаванцы знаёмяцца ў кантэксце сказа «Лес манит прохладой», з дапамогай выхавальніка падбіраюць да яго

РЕПОЗИТОРИЙ

сітуацыйныя сінонімы: *зовет, привлекает*. Выконваюць практыкаванне «Дапоўні сказ»: Летом лес манит… (ягодами, грибами), а осенью … (грибами, орехами) г.д.

З беларускім словам «маніць» малыя сустракаюцца пры абмеркаванні казкі «Каза-манюка»: «Казу назвалі манюкай, таму што яна маніла дзеду». Да слова *маніць* падбіраюць сінонімы: *хлусіць, ашуквае, кажа няпраўду*; складаюць сказы з гэтым словам пра лісу: *Ліса маніць ваўку, Ліса маніць пеўніку* і г.д.

Такім чынам, супастаўляючы значэнні слоў – міжмоўных амонімаў, авалодваючы моўнымі сістэмнымі аб'яднаннямі (семантычнымі групамі слоў, сінанімічнымі радамі і антанімічнымі парамі), дзеці засвойваюць значэнне гэтых слоў у абедзвюх мовах і асэнсавана размяжоўваюць іх.

Пералічаныя заданні, якія дзеці выконваюць на занятках па развіцці беларускага і рускага маўлення мэтанакіранава «ўводзяць» выхаванцаў у маўленчую рэчаіснасць, выхоўваюць чуласць да сэнсавых адценняў рускага і беларускага слова, паказваюць агульнасць моўных заканамернасцей у абедзвюх мовах. Работа над сэнсам слова садзейнічае ўдасканаленню звязнага маўлення дзяцей, развівае ўменне адбіраць словы дакладна, у адпаведнасці са зместам сваёй думкі.

Тэма 4.4 Методыка фарміравання граматычнага ладу маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту(лекцыя – 2 гадзіны)

Пытанні для вывучэння

1. Асаблівасці граматыкі беларускай мовы ў параўнанні з рускай.
2. Крытэрыі адбору граматычнага матэрыялу для развіцця беларускага маўлення выхаванцаў. Паслядоўнасць увядзення граматычных форм беларускай мовы.
3. Этапы авалодання дзецьмі граматычнымі элементамі маўлення (паводле А.І. Негнявіцкай, А.М. Шахнаровіча).
4. Фарміраванне ў дзяцей навыкаў пабудовы сказаў на беларускай мове, змянення слоў па формах, утварэння новых слоў.

1. Асаблівасці граматыкі беларускай мовы ў параўнанні з рускай

Маўленне на кожнай мове немагчыма без валодання граматыкай, пад якой разумеецца “сукупнасць ведаў, што патрэбна чалавеку, каб ствараць выказванні самому і разумець выказванні іншых” (А.І. Негневицкая, А.М. Шахнарович). Для разумення і выражэння самай простай думкі, намеру неабходна валодаць не толькі пэўным запасам слоў, але і наборам неасэнсаваных правілаў, па якіх словы змяняюцца і злучаюцца ў тыповыя сказы.

Такім чынам, *задачамі навучання дзяцей дашкольнага ўзросту граматыцы беларускай мовы* з’яўляюцца: вучыць разумець маўленчыя выказванні рознай граматычнай структуры, знаёміць з граматычнымі з’явамі беларускай мовы ў адпаведным аб’ёме, развіваць уменне правільна

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

выкарыстоўваць іх для вырашэння розных камунікатыўных задач (просьба, каманда, апісанне сітуацыі, тлумачэнне, планаванне і інш.). выхоўваць у дзяцей чуласць да граматычнай правільнасці свайго маўлення і маўлення сваіх аднагодкаў.

Граматычны лад беларускай і рускай моў мае шмат агульнага як у марфалогіі, так і ў сінтаксісе. У абедзвюх мовах ў асноўным аднолькавая сістэма словазмянення і словаўтварэння. Разам з тым у граматычных формах кожнай з моў, у граматычных значэннях гэтых моў *існуюць і прыкметныя адрозненні*. Амаль кожная граматычная форма беларускай мовы мае як супадзенні, так і разыходжанні з адпаведнай формай рускай мовы.

Названая асаблівасць беларускай граматыкі -– падабенства і адрозненне кожнай формы з адпаведнай рускай –- і выклікае цяжкасць ў рускамоўных дзяцей пры засваенні граматычнага ладу беларускай мовы.

Пазбегнуць ці пераадолець інтэрферэнцыю можна толькі шляхам фарміравання ў выхаванцаў элементарнага ўсведамлення марфалагічных і сінтаксічных асаблівацей рускай і беларускай моў. Пры гэтым трэба звяртаць увагу дзяцей не толькі на факты адрознення ў граматыках абедзвюх моў, але і на факты супадзення. Фарміраванне асэнсавання гэтых фактаў дае магчымасць ажыццяўляць станоўчы перанос граматычных навыкаў рускага маўлення ў беларускае, пераадолець або прадухіліць ужыванне граматычных формаў адной мовы ў другой.

Каб распрацаваць курс граматыкі беларускай мовы для рускамоўных дзяцей, навукоўцамі былі вызначаны тыя граматычныя з’явы, якія неабходны для элементарных маўленчых зносін.

Паўнацэнныя зносіны на беларускай мове патрабуюць ад дзяцей валодання і яе *сінтаксічнымі асаблівасцямі*, спосабамі пабудовы апавядальных, пытальных сказаў. Структура гэтых сказаў у рускай і беларускай мовах аднолькавая. Таму іх засваенне не выклікае цяжкасці ў выхаванцаў. Тут ажыццяўляецца станоўчы перанос (транспазіцыя) з рускай мовы ў беларускую. Адрозненне ў сінтаксісу складае пабудова пытальнага сказа з часціцай *ці* : *Ці ведаеш ты вершык? Ці любіць коцік малачко?*

У той жа час у беларускай мове існуе шэраг *марфолага-сінтаксічных адрозненняў,* уласцівы ёй “ўласны кірунак сказаў” (К. Чорны), што, сцвярджаюць навукоўцы, складае нацыянальны дух беларускай мовы. Гэта такія канструкцыі, якія ўяўляюць сабой адзінкавыя выпадкі і не падлягаюць абагульненню. Дзеці знаёмяцца з некаторымі спецыфічнымі беларускімі зваротамі (пар.: рус. *минуты три*, *своими глазами*, *болеть ангиной, в другой раз, у меня болит* – бел. *хвіліны са тры, на свае вочы, хварэць на ангіну, іншым разам, мне баліць* і інш.).

Пабудова сказа патрабуе валодання навыкамі *словазмянення*: утварэнне назоўнікаў множнага ліку, дапасаванне да назоўнікаў прыметнікаў, а таксама лічэбнікаў у родзе і ліку; змяненне дзеясловаў па асобах і ліках, абазначэнне часу дзеяслова, утварэнне яго загаднага ладу; элементы склонавай сістэмы назоўнікаў, прыметнікаў, займеннікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, работа па фарміраванні граматычнага ладу беларускага маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту ахоплівае вырашэнне задач у галіне марфалогіі (словазмянення і словаўтварэння) і сінтаксісу. Граматычны лад маўлення дзеці засвойваюць практычна, на аснове ўспрымання маўленчых узораў, якія выхаванцы неўсвядомлена аналізуюць, і ў працэсе спецыяльна арганізаванага навучання.

Канкрэтныя патрабаванні да фарміравання граматычнага ладу беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту выкладаюцца ў вучэбнай праграме дашкольнай адукацыі для дзіцячых садоў з рускай мовай навучання.

2. Крытэрыі адбору граматычнага матэрыялу для развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Паслядоўнасць увядзення граматычных форм беларускай мовы

Дзеці ранняга і дашкольнага ўзросту засвойваюць граматычныя формы роднай мовы ў пэўнай паслядоўнасці, якая дыктуецца патрабаваннямі зносін з дарослымі і аднагодкамі, а таксама лёгкасцю ці цяжкасцю іх засваення. Пры гэтым дзеці ідуць ад менш абстрактных, канкрэтных форм да больш абстрактных, ад простай фармальнай перадачы вонкавых асаблівасцей прадметаў (множны лік, памяншальнасць) да складанай, якая суадносіцца з прадметнай сітуацыяй (напрыклад, склонавыя формы, якія дапамагаюць выказваць веды аб арыентаванасці прадметаў у прасторы). У такой жа паслядоўнасці адпрацоўваюцца граматычныя з'явы, неабходныя для маўленчых зносін, ва ўстанове дашкольнай адукацыі: спачатку для сітуацыйна-дзелавых, затым для пазасітуацыйных форм зносін.

Падыход да граматычнай работы ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання заключается ў тым, что тут вытрымліваецца строгі парадак увядзення граматычных з'яў беларускай мовы, які залежыць ад часу засваення дзецьмі тых або іншых граматычных заканамернасцей рускай мовы. *Работа па развіцці рускага маўлення носіць апераджальны характар*.

Паслядоўнасць увядзення граматычных формаў беларускй мовы суадносная і з паслядоўнасцю спантаннага засваення граматычных формаў рускай мовы.

Што тычыцца спецыфічных марфолага-сінтаксічных канструкцый, то засваенне іх не падпарадкоўваецца логіцы работы над звязным маўленнем. Знаёмства з такімі канструкцыямі залежыць ад тэмы заняткаў, на якіх у камунікатыўных гульнявых сітуацыях замацоўваецца тая ці іншая група лексікі.

Не ўплываюць непасрэдна на ўменне ажыццяўляць камунікатыўна-сінтаксічныя сувязі паміж словамі ўменні дзяцей утвараць матываваныя словы (*кошка – кацяня, хлеб – хлебніца, лыжы – лыжнік* і да т.п.). Фарміраванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту элементарнага ўсведамлення спосабаў словаўтварэння – гэта развіццё моватворчасці дзіцяці, што выступае неабходнай умовай авалодання багатым слоўнікам. Сэнс матываваных слоў не будзе да канца зразумелым, калі не ўстанавіць іх роднасныя (*лес – ляснік, лясны, лесавік*) і структурныя (*ляснік, будаўнік, настаўнік; хлебніца, цукерніца, мыльніца*) сувязі з іншымі словамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Згодна з вучэбнай праграмай па развіцці рускага маўлення, у малодшай групе дзецям даецца магчымасць у ходзе гульняў інтуітыўна заўважаць словаўтваральныя сувязі паміж назвамі жывёл і іх дзіцянят (мама котенка — кошка, мама лисенка — лиса). У сярэднім дашкольным узросце дзеці вучацца самастойна ўтвараць на рускай мове назвы дзіцянят жывёл па аналогіі з вядомымі (у кошки — котенок, у козы — козленок. А кто у аиста? Оленя?). Значыць, знаёміць дзяцей са спосабам утварэння назваў дзіцянят жывёл у беларускай мове лепш з другой паловы сярэдняй групы.

3. Этапы авалодання дзецьмі граматычнымі элементамі маўлення (паводле А.І. Негнявіцкай, А.М. Шахнаровіча).

Дзеці дашкольнага ўзросту, якія засвойваюць беларускую мову як другую, не маюць пастаяннага беларускамоўнага асяроддзя. Таму самастойнае засваенне граматычных асаблівасцей беларускай мовы ідзе вельмі марудна, нераўнамерна. Пры стыхійным маўленчым развіцці, тым больш у сітуацыі паралельнага засваення блізкіх моў, моўныя абагульненні дзяцей далёка не заўсёды правільныя, адчуваецца ўплыў рускай мовы. Выпраўленне памылак патрабуе вялікіх намаганняў. Таму працэс авалодання значэннем беларускіх граматычных формаў неабходна перавесці на ўзровень арганізаванага навучання.

Фарміраванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту граматычных навыкаў беларускага маўлення патрабуе стварэння такіх гульнявых вучэбна-маўленчых сітуацый, у якіх устанаўленне марфалагічных і сінтаксічных правілаў *адбываецца спецыяльна і мэтанакіравана ў адпаведнасці з пералічанымі вышэй этапамі авалодання граматычнымі з'явамі.*

Гэта значыць, спачатку трэба звярнуць увагу дзяцей на гукавую форму слова і зрабіць для іх відавочнай яе сувязь са змяненнем у прадметнай рэчаіснасці. Для гэтага неабходна стварыць праблемную сітуацыю, у якой у дзіцяці ўзнікла б неабходнасць у разуменні і выкарыстанні дадзенай формы слова, і даць малым як мага болей узораў гэтай граматычнай формы.

Затым неабходна дапамагчы дзецям сфарміраваць моўнае абагульненне, г.зн. неўсвядомлена ўстанавіць той элемент слова, часціцу або прыназоўнік, які ў беларускай мове выкарыстоўваецца для перадачы таго ці іншага факта рэчаіснасці. Напрыклад, на канцы слоў, якія абазначаюць дзіцянят адпаведных жывёл, трэба вымаўляць –**ня** (*лісяня*, *бусляня, ласяня*); у словах тыпу *кніга*, *бераг*, калі яны перадаюць месца дзеяння або знаходжання, **г** змяняецца на **з** (*у кнізе, на беразе*); пытанне часта пачынаецца з **ці** (*Ці пойдзеш…? Ці ведаеш*…?). Моўнае абагульненне фарміруецца ў дзяцей у час выканання гульнёвых практыкаванняў на ўтварэнне патрэбнай граматычнай формы па аналогіі з узорам, які дае выхавальнік. Важным момантам з'яўляецца параўнанне беларускай граматычнай формы з эквівалентнай рускай.

Наступны этап – замацаванне засвоенай асаблівасці ў дыдактычных гульнях і практыкаваннях.

Нарэшце, роля выхавальніка заключаецца ў выпраўленні памылак у спантанным маўленні дзяцей, нагадванні вылучанай імі заканамернасці шляхам падказкі, пытання, прывядзення аналагічнай формы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прыведзеныя этапы фарміравання ў выхаванцаў уменння правільна ўтвараць і ўжываць граматычныя формы з'яўляюцца агульнымі для ўсіх напрамкаў граматычнай работы: навучанне дзяцей словазмяненню па формах, утварэнню слоў і пабудове сказаў розных тыпаў. У той жа час работа па кожным з названых напрамкаў мае і свае асаблівасці.

4. Фарміраванне ў дзяцей навыкаў пабудовы сказаў на беларускай мове, змянення слоў па формах, утварэння новых слоў

Фарміраванне сінтаксічнага ладу. Пад фарміраваннем сінтаксічнага ладу маўлення разумеецца засваенне дзецьмі спосабаў пабудовы словазлучэнняў і сказаў. Своечасовае засваенне сінтаксічнага ладу роднай мовы – важная ўмова паўнацэннага маўленчага развіцця дзіцяці.

Авалоданне сінтаксічным ладам роднай (першай) мовы адбываецца ў працэсе маўленчай дзейнасці, калі ў ходзе маўленчых зносін дзіця стыхійна, неўсвядомлена засвойвае структуру сказа і формы сувязі. Паколькі сінтаксіс рускай і беларускай моў у значнай ступені супадае і можна абапірацца на транспазіцыю (перанос навыкаў маўлення з рускай мовы ў беларускую), у фарміраванні сінкаксічнага ладу дзяцей ёсць магчымасць ужываць тыя метадычныя прыёмы, што выкарыстоўваюцца пры развіцці рускага маўлення (пры апераджальным засваенні апошняга).

Адным з вядучых метадаў навучання сінтаксісу выступаюць *назіранні і гутаркі ў іх спалучэнні*. У працэсе назіранняў з'яў прыроды і грамадскага жыцця выхавальнік клапоціцца пра тое, каб дзеці ўмелі ўстанаўліваць істотныя сувязі паміж з'явамі і выяўляць іх у маўленні. У кожным зручным выпадку неабходна ўдакладняць з выхаванцамі час, месца дзеяння, яго прычыны, умовы, абставіны, падказваць ім адпаведныя словы і фразы, якія характарызуюць дадзеныя адносіны. Асноўны метадычны прыём – пошукавыя пытанні. Яны патрабуюць ад дзіцяці разгорнутага выказвання. Ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання такія гутаркі праводзяцца на рускай мове.

Вялікія магчымасці для фарміравання сінтаксічнага ладу маўлення дае разглядванне прадметаў, цацак, карцін. Работа па іх разглядванні і абмеркаванні вядзецца гэтак жа.

Для развіцця маўлення і асваення сінтаксічнай структуры выказвання важную ролю адыгрывае ўласна маўленчая дзейнасць дзіцяці, у працэсе якой увага яго засяроджваецца на сродках і спосабах арганізацыі маўлення.

Адным са шляхоў удасканалення структуры выказвання з'яўляецца вырашэнне дзецьмі розных праблемных сітуацый — *загадванне і разгадванне загадак, тлумачэнне прыказак і прымавак*. Знаёмячы дзяцей з загадкамі, прыказкамі, прымаўкамі, выхавальнік ужывае "лепшы сродак прывесці дзіця да жывой крыніцы народнай мовы і пасяліць у душы дзіцяці неасэнсавана такт гэтай мовы" (К.Д. Ушынскі). Фальклорныя формы надзвычай багатыя сінтаксічнымі канструкцыямі.

Важным сродкам фарміравання ў дзяцей навыку будаваць сказы розных тыпаў з'яўляюцца спецыяльныя практыкаванні і гульні, якія дазваляюць мэтанакіравана знаёміць іх з пэўнымі сінтаксічнымі канструкцыямі, фарміраваць уменне адвольна выкарыстоўваць ва ўласным маўленні

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сінтаксічныя сродкі мовы. Пры мэтанакіраваным практычным азнаямленні са структурай сказа дзеці пачынаюць асэнсоўваць не толькі змест маўлення, але і яго форму. У сінтаксічных практыкаваннях пачынае дзейнічаць кантроль свядомасці дзіцяці над слоўным выражэннем думкі, над афармленнем яе ў сказе. Павышаецца адвольнасць, ці асэнсаванасць, пры канструяванні словазлучэнняў і сказаў у час выканання вучэбных маўленчых заданняў. Гэта значна аптымізуе маўленчыя зносіны і творчае перайманне маўленчых сінтаксічных узораў.

Да сінтаксічных практыкаванняў адносіцца *дагаворванне дзецьмі сказаў,* якія прапануе выхавальнік. Для практыкаванняў з дзецьмі малодшага і сярэдняга дашкольнага ўзросту падбіраюцца сказы са знаёмых ім мастацкіх твораў. Дзеці дагаворваюць сказы або ўзнаўляюць іх цалкам. Гэта могуць быць сказы з простай мовай, з аднароднымі членамі, складаназлучаныя і складаназалежныя сказы са злучнікамі *каб, як, таму што* і інш.

Дзеці сярэдняга дашкольнага ўзросту з дапамогай практыкавання “Дапоўні сказ” вучацца складаць складаназлучаныя сказы са злучнікам **а**: “Морква салодкая, а рэдзька … (горкая)”, “Памідор чырвоны, а капуста … (белая)”.

Больш складаным з’яўляецца практыкаванне, у якім трэба дапоўніць складаназалежны сказ. Гэтае практыкаванне выкарыстоўваецца для навучання дзяцей будаваць складаназалежныя сказы прычыны, мэты: *На вуліцы холадна, таму што …, Зіна пайшла ў магазін, каб …, Зараз восень, таму… .*

З дзецьмі старшага дашкольнага ўзросту прыём дагаворвання сказаў можа выкарыстоўвацца ў больш ускладнёным варыянце: незакончаныя сказы ўключаюцца ў звязны тэкст. Тут дзецям трэба памятаць прачытаны тэкст, думаць пра сэнс дадзенага сказа ў кантэксце, арыентавацца на інтанацыю незакончанага сказа. Тэксты прад’яўляюцца выхавальнікам у гульнявой сітуацыі пад назвай “Размыты ліст” (аўтары прыёму Ф.А. Сахін, М.С. Лаўрык). Дзецям гавораць, што ліст зайчыка (коціка, Лунціка) сваім сябрам трапіў пад дождж і сапсаваўся – некаторыя словы расплыліся, і просяць дапамагчы зайку прачытаць ліст. Гэты прыём распаўсюджаны ў методыцы развіцця першага (рускага) маўлення. Яго ж можна выкарыстоўваць і пры фарміраванні граматычнага ладу беларускага маўлення. У гэтым выпадку ліст павінны быць напісаны знаёмым беларускамоўным персанажам (напрыклад. мядзведзям, які сядзеў на калодзе і граў на скрыпачцы: ён можа расказваць, што нечакана адбылося ў гэты момант; курачкай, якая знайшла пшанічны каласок і да т.п.).

В.В. Гербава лічыць, што, пачынаючы з малодшай групы, трэба вучыць дзяцей *змяняць парадак слоў у сказе*: *Жаба рагатала з кураняці, Жаба з кураняці рагатала* і г.д.

У старшым узросце дашкольнікі, пазнаёміўшыся са слоўным складам сказа, могуць у працэсе гульні “Жывыя словы” “чытаць” сказы на беларускай мове з розным парадкам слоў. Дзеці-“словы” мяняюцца месцамі (складаюць сказы), такія сказы затым чытаюцца.

Развіццю сінтаксічнага ладу маўлення спрыяюць *сюжэтна-дыдактычныя гульні* з выкарыстаннем нагляднага матэрыялу. Напрыклад,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гульня для выхаванцаў малодшай і сярэдняй груп “Каго пакатаем на машыне?” (аўтар Э.П. Караткова).

Сярод метадаў уласна маўленчай работы асноўны акцэнт пры навучанні сінтаксісу надаецца *пераказу і расказванню па карціне, апісанню прадметаў. цацак.* У працэсе пераказу дзеці запазычваюць сінтаксічныя канструкцыі з аўтарскага тэксту. А пры расказванні самастойна будуюць сказы розных канструкцый. Пытанні развіця звязнага маўлення будуць разгледжаны ў асобным раздзеле.

Адной з асаблівасцей беларускага сінтаксісу, як ужо адзначалася, з’яўляецца ўжыванне часціцы **ці** ў пачатку пытальных сказаў: *Ці ідзе дождж*? (Пар. з рус.: *Идет ли дождь*?) Уменне ставіць такія пытанні трэба фарміраваць у дзяцей у спецыяльна арганізаванай гульнявой вучэбна-маўленчай сітуацыі.

Знаёмяцца дзеці і з некаторымі спецыфічна беларускімі марфолага-сінтаксічнымі канструкцыямі, такімі, як: *баліць каму (мне, табе), хварэць на што (на грып), дзякаваць каму (бацьку), дараваць каму (дзяўчынцы), смяяцца з каго (з хлопчыка), большы (меншы, даўжэйшы, вузейшы) за што (за вавёрку, за слана, за стужку, за ручаёк*) і інш. Для замацавання правільнага іх ужывання наладжваюцца гульні, звязаныя з агульнай тэмай заняткаў.

Навучанне словазмяненню. На фарміраванне граматычнага ўмення змяняць словы па формах адводзіцца ад 1-2 да 5-6 заняткаў, што залежыць ад складанасці таго ці іншага граматычнага правіла: колькасці варыянтаў для выражэння аднаго і таго ж значэння, іх супадзення і адметнасці ад граматычных формаў рускай мовы, якія выкарыстоўваюцца для выражэння гэтага ж значэння. Фарміраванне навыку ўжывання ў маўленні кожнай граматычнай формы адбываецца ў адпаведнасці з разглежанымі вышэй этапамі засваення граматычных формаў: 1) арыенціроўка на гукавую формы граматычнай з’явы і злучэнне яе са з’явай рэчаіснасці, якую яна адлюстроўвае (слова *слон* азначае адну жывёліну, а *слан**ы*** – многа, *цукерка* адна, а *цукерк**і*** – многа; ужыванне назоўнікаў з асновай на [г] – *дарога, бераг* адлюстроўвае месца дзеяння: *на дарозе, на беразе*); 2) фарміраванне моўнага абагульнення – утварэння формы слова па аналогіі з вядомай формай (адзін *слон* – а калі многа, скажам … *сланы*, адзін *дом* – а многа?); 3) практыкаванні і гульні ва ўжыванні засвоенай формы.

Фарміруючы ў дзяцей моўныя абагульненні, не трэба забывацца на такія адрозненні ў граматычных формах у беларускай і рускай мовах, якія не падлягаюць абагульненням. Гэта асаблівасці такіх граматычных формаў, як род назоўнікаў, лік назоўнікаў, што адрозніваюцца ў рускай і беларускай мовах, запамінаюцца дзецьмі ў выпадку спецыяльна арганізаванай работы.

Засваенню адрозненняў ў родзе і ліку назоўнікаў у рускай і беларускай мовах служыць параўнанне складзеных словазлучэнняў з адпаведнымі рускімі.

Навучанне словаўтварэнню. Пры фарміраванні ў выхаванцаў спосабаў словаўтварэння важнейшай задачай з’яўляецца выхаванне цікавасці да слова, чуласці да яго семантыкі і формы, стварэнне шырокай арыенціроўкі ў фармальна-семантычных адносінах паміж аднаструктурнымі і аднакарэннымі найменнямі, выпрацоўка вопыту творчага прымянення ведаў і ўменняў. Без

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гэтай асновы, як лічаць даследчыкі, немагчыма сфарміраваць граматычна правільныя спосабы словаўтварэння (А.Г. Тамбовцева).

Спецыяльныя маўленчыя гульні і практыкаванні з граматычным зместам прынясуць карысць толькі ў тым выпадку, калі будуць абапірацца на вопыт дзяцей, іх уяўленні пра наваколле. Штодзённыя сітуацыі часта ставяць перад дзецьмі розныя маўленчыя задачы – як называецца чалавек, які рамантуе гадзіннікі, хто дзіцяня вавёркі, чаму зайку называюць пабегайкай і да т.п. Са зносін з дарослымі, з мастацкай літаратуры малыя чэрпаюць веды, якія складаюць падмурак маўленчага развіцця.

У сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя, калі дзеці паралельна ўспрымаюць і рускія, і беларускія прыклады словаўтварэння, ім вельмі цяжка зрабіць правільнае абагульненне. У маўленні выхаванцаў назіраюцца памылкі, звязаныя з моўнай інтэрферэнцыяй: *цыпляня* замест *кураня*, *дзвер* замест *дзверы*, *слухацель* замест *слухач* і да т.п.

Раней ужо адзначалася неабходнасць і важнасць работы над матываванасцю так званых “гаваркіх” слоў, што садзейнічае развіццю граматычнага пачуцця беларускай мовы. З гэтай жа мэтай выхавальнік заахвочвае дзяцей да ўжывання розных суфіксаў для ўтварэння назваў чалавека, жывёл: “Як называюць маленькага ката? (*Коцік, коця*.) Ласкава? (*Каток, каточак*.) У казках? (*Каток- залаты лабок, Катафей*.)”

Разам з тым вельмі важна слова, яго сэнсавыя і фармальныя сувязі зрабіць прадметам разгляду на спецыяльных маўленчых занятках. Засваенне словаўтваральных мадэляў, асабліва тых, што адрозніваюцца ад мадэляў рускай мовы, патрабуе даволі працяглага часу. Гэта спосабы ўтварэння назваў маладых істот (рус *котенок, лосенок*, бел. *кацяня, ласяня*); назваў асоб па роду іх заняткаў, схільнасці (рус. *строитель, учитель, читатель*,бел. *будаўнік, настаўнік,чытач*); назваў некаторых прадметаў, напрыклад, посуду (рус. *солонка, масленка*, бел *сальніца, масленіца*), памяшканняў (рус. *спальня, раздевалка, гостинная*, бел. *спальня, радзявальня, гасцёўня*) і інш.

У сілу блізкароднаснасці беларускай і рускай моў методыка фарміравання ў выхаванцаў словаўтваральных аднаструктурных абагульненняў у асноўным тая ж, што і пры развіцці рускага маўлення як роднага. У рэчышчы гэтай методыкі расправаны спецыяльныя гульні і гульнявыя практыкаванні, у якіх дзеці маюць магчымасць услухоўвацца ў словаўтваральныя суфіксы і прэфіксы беларускіх слоў у “чыстым” выглядзе, паўтараць іх і аперыраваць імі. *Асаблівасцю методыкі з’яўляецца параўнанне спосабаў утварэння слоў у беларускай і рускай мовах*.

У працэсе работы над спосабамі словаўтварэння ў беларускай мове неабходна прапанаваць выхаванцам заданні ацэначнага і пазнавальнага характару: ці можна так сказаць? Чаму так называецца? Як правільна сказаць?

Устанаўленне словаўтваральных сувязей, авалоданне спосабамі ўтварэння слоў садзейнічаюць лепшаму засваенню дзецьмі слоўніка, у іх фарміруецца назіральнасць, чуласць да выразнасці сродкаў мовы. Гэта робіць іх маўленне больш дакладным, трапным, вобразным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма 4.5 Методыка выхавання гукавой культуры беларускага маўлення (лекцыя – 2 гадзіны)

Пытанні для вывучэння

1. Параўнальная характарыстыка фанемных сістэм рускай і беларускай моў. Задачы навучання беларускаму вымаўленню.

2. Крытэрыі адбору фанемных адзінак і паслядоўнасць іх увядзення.

3. Методыка фарміравання правільнага вымаўлення спецыфічных гукаў беларускай мовы.

4. Знаёмства дзяцей з арфаэпічнымі асаблівасцямі беларускага маўлення.

1. Параўнальная характарыстыка фанемных сістэм рускай і беларускай моў. Задачы навучання беларускаму вымаўленню

Фанетычную і арфаэпічную сістэму кожнай мовы адлюстроўвае артыкуляцыйная база – сукупнасць вымаўленчых асаблівасцей той ці іншай мовы.

Сенсорнай асновай маўлення з'яўляецца фанематычны слых – здольнасць успрымаць на слых маўленчыя гукі, дыферэнцыраваць і абагульняць іх у словах як распазнавальныя адзінкі.

Авалоданне артыкуляцыйнай базай маўлення роднай мовы пачынаецца ў канцы першага года жыцця дзіцяці. Фанематычны слых, па даных М.Х.Швачкіна, аказваецца сфарміраваным ужо ў дзяцей аднаго года сямі месяцаў. К пяці гадам у дзяцей у асноўным заканчваецца развіццё моўна-рухальнага і моўна-слыхавога апарату.

Артыкуляцыйны аппарат і фанематычны слых дзіцяці да 5 год даволі чуйны да новага, таму фарміраванне беларускага вымаўлення ў гэтым узросце працякае лягчэй і хутчэй, чым у далейшым. Аднак не трэба спадзявацца на тое, што спецыфіку беларускага вымаўлення дзеці засвояць толькі на слых, без спецыяльных практыкаванняў. З аднаго боку, у дашкольнікаў адсутнічае паўнацэннае беларускамоўнае асяроддзе, з другога – значны ўплыў на станаўленне іх вымаўленчых уменняў аказвае фанетычная сістэма рускай мовы, якой дзеці авалодваюць у сям'і або ў дзіцячыім садзе з рускамоўным рэжымам. Можа здарыцца так, што вымаўленне беларускіх гукаў адмоўна адаб'ецца на якасці рускіх гукаў, і наадварот. Таму выхавальніку трэба вельмі адказна аднесціся да гукавымаўленчай работы на занятках па развіцці як беларускага, так і рускага маўлення, адразу папярэджваць памылкі інтэрферэнцыі – ужывання беларускіх гукаў у рускім маўленні і рускіх – у беларускім. Гэта дасягаецца шляхам асэнсаванага параўнання асаблівацей рускай і беларускай фанетычных сістэм, высвятлення іх падабенства і адрозненняў. У залежнасці ад ступені падабенства з фанемамі рускай мовы фанемы беларускай мовы можна падзяліць на **тры групы**.

Да першай групы адносяцца *фанемы, якія супадаюць у беларускай і рускай мовах*. Гэта ўсе галосныя і пераважная большасць зычных фанем (м, м', б, б', в, в', ж, ш і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Другую групу складаюць *фанемы, падобныя ў рускай і беларускай мовах.* Яны адрозніваюцца паміж сабой тымі ці іншымі акустыка-артыкуляцыйнымі характарыстыкамі. Блізкімі руска-беларускімі эквівалентамі з'яўляюцца: [ч'] – [ч], [г, г'] (выбухныя)– [γ, γ'] (фрыкатыўныя), [д'] – [дз'], [т'] – [ц'] , [р'] – [р]. (Параўнайце словы: черный -- чорны, гриб – грыб, гимн – гімн, дети – дзеці, река – рака.) Гэта тыя выпадкі, калі найбольш верагодныя памылкі фанетычнай інтэрферэнцыі.

Трэцяя група – гэта *фанемы, аналагаў якіх няма ў рускай мове*. Такіх фанем у беларускай мове дзве: [дж], [ў]. Аднак гэтыя фанемы маюць эквіваленты ў рускай мове. У гука [дж] эквівалентам выступаюць [ж] (бел. *ураджай* - рус. *урожай*) і [жд] (бел. *адраджэнне* - рус. *возрождение*). Эквівалентамі гука [ў] у рускай мове з'яўляюцца [в], [ф], [л] (бел. *праўда*, *траўка*, *воўк* - рус. *правда*, *травка*, *волк*). Гэтыя гукі таксама могуць змешвацца з рускімі.

У рускай мове існуе таксама гук [щ], які адсутнічае ў беларускай фанетычнай сістэме. Эквівалентным гуку [щ] выступае ў беларускай мове гукаспалучэнне [шч].

Навучанне выхаванцаў правільнаму беларускаму вымаўленню з'яўляецца важнай часткай заняткаў па беларускай мове, фарміраванне асноў артыкуляцыі беларускага маўлення забяспечыць паўнацэнныя вусныя зносіны на мове. Каб дасягнуць пастаўленай мэты, трэба вырашыць шэраг задач:

1.Фарміраванне правільнага вымаўлення спецыфічных беларускіх гукаў ізалявана, у складах і словах, сказах, а затым і ў спантанным маўленні.

2.Фарміраванне фанематычнага слыху дзяцей, г.зн. уменння адрозніваць беларускія гукі ва ўласным маўленні і ў маўленні іншых людзей.

3.Азнаямленне з некаторымі асаблівасцямі беларускай арфаэпіі, выпрацоўка навыкаў адвольнага выкарыстання арфаэпічных нормаў у спантанным маўленні.

2. Крытэрыі адбору фанемных адзінак і паслядоўнасць іх увядзення

Вельмі важна высветліць паслядоўнасць увядзення спецыфічных фанем беларускай мовы ў пачатковы перыяд навучання.

У псіхалогіі навучання другой мове існуе думка, што пры выпрацоўцы ў вучняў адэкватнага вымаўлення ні ў якім разе нельга пачынаць з гукаў, блізкіх да гукаў роднай мовы, бо «найбольш цяжкімі для засваення з'яўляюцца не найбольш далёкія, а найбольш блізкія адзінкі гукавой сістэмы мовы» (У.А. Арцёмаў).

Значыць, неабходна супаставіць акустыка-артыкуляцыйныя характарыстыкі руска-беларускіх гукавых эквівалентаў і прааналізаваць іх з пункту гледжання магчымасці выдзялення прыкметных момантаў у артыкуляцыі. У той жа час трэба ўлічваць паслядоўнасць засваення выхаванцамі гукаў рускай мовы (часцей за ўсё агульных з беларускімі) і суадносіць тэрміны ўвядзення спецыфічных беларускіх гукаў з тымі гукамі рускай мовы, якія з'яўляюцца блізкімі да іх па спосабе ўтварэння, каб абапірацца на раней атрыманае вымаўленчае ўменне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як сведчыць аналіз артыкуляцыйных характарыстык гукаў рускай і беларускай моў, самым цяжкім з’яўляецца выпадак распазнавання зычных [д’] – [дз’] і [т’] – [ц’], а самым лёгкім - адрозненне рускіх [г], [г’] і беларускіх [γ], [γ’]. Кантрастнасць моманту імгненнасці ва ўтварэнні выбухнога [г] і фрыкатыўнага [γ], як адзначае М.Б. Анціпава, лёгка ўлаўліваецца дзецьмі ва ўласных артыкуляцыях.

Пасля гукаў [γ], [γ’] мэтазгодна ўвесці гукі [ў], [дж], якія не маюць адпаведнікаў у рускай мове. Пастаноўка гука [ў] можа абапірацца на ўменне вымаўляць галосны [у]. Гук [дж] трэба ўводзіць пасля таго, як дзеці на занятках па развіцці рускага маўлення адпрацуюць вымаўленне гукаў [ж], [ш].

Пасля засваення дзецьмі вымаўлення рускага [ч’] і авалодання ўменнем адрозніваць на слых цвёрдыя і мяккія зычныя гукі можна ўводзіць беларускі гук [ч]. У гэтым выпадку можна абапірацца і на вымаўленне [ж], [ш] і на асэнсаванае адрозненне цвёрдага [ч] і мяккага [ч’].

На ўсвядомленым адрозненні рукаў [р] і [р’] трэба грунтаваць і ўвядзенне ў фанетычную сістэму дзіцячага маўлення беларускага [р], у якога няма пары па карэляцыі – па дзіцячай тэрміналогіі, няма “малодшага браціка” – мяккай пары.

Лагічным уяўляецца ўвядзенне спалучэння [шч] пасля замацавання правільнага вымаўлення кожнага з гэтых гукаў паасобку.

Ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання на занятках па беларускай мове ёсць сэнс працаваць толькі над гукамі другой і трэцяй груп. Такім чынам, прапаноўваецца наступны *парадак увядзення фанемных адзінак беларускай мовы* па ўзроставых групах у такой установе:

Сярэдняя група -- γ, γ‘, ў, дж, ч, р.

Старшая група – шч, ц’, дз’.

Як спалучаецца прапанаваны парадак увядзення спецыфічных беларускіх гукаў з тым, што з першых заняткаў у слоўнік дзяцей уключаюцца словы, якія змяшчаюць усе гэтыя гукі? У вымаўленні кожнага слова, якое ўпершыню ўводзіцца, асабліва падобнага па гучанні на рускае слова, дзеці абавязкова практыкуюцца. Такім чынам яны засвойваюць вымаўленне асобных беларускіх слоў. Спачатку гэтага дастаткова. Работа ж над правільным вымаўленнем пералічаных гукаў, гукаспалучэнняў і слоў з імі – пастаянны і паслядоўны працэс, у якім кожная вучэбная мэта выцякае з папярэдняй. Выхаванцы паступова авалодваюць абагульненым гукавымаўленчым уменнем. Спасылка пры гэтым на ўжо засвоенае правільнае вымаўленне якога-небудзь гука ў асобным слове спрыяльна адбіваецца на ўжыванні дадзенага гука і ў іншых словах.

3. Методыка фарміравання правільнага вымаўлення спецыфічных гукаў беларускай мовы

Метадычныя прынцыпы работы над беларускім вымаўленнем служаць вырашэнню агульных праграмных задач навучання фанетыцы, якія цесна звязаны з усімі аспектамі фарміравання беларускага маўлення.

Пры азнаямленні выхаванцаў з беларускімі гукамі, перш за ўсё, неабходны матывуючы прыём, каб засваенне правільнага вымаўлення стала для

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

іх асэнсаваным. Згодна з праграмай, дзеці сярэдняга дашкольнага ўзросту знаёмяцца з тэрмінам “звук” (а па-беларуску “гук”), атрымліваюць уяўленне пра тое, што словы складаюцца з гукаў. Далей фарміруецца ўяўленне аб гукавой сістэме, як аб наборы, “скрынцы” з гукамі, з якіх бярэцца матэрыял для будаўніцтва слоў; у кожнай мове свая “скрынка” з гукамі. Перш чым будаваць беларускія словы, трэба паглядзець, якія гукі ляжаць у “скрынцы” беларускай мовы.

Агульнавядомым недахопам фанетычных практыкаванняў з’яўляецца такі: калі яны выконваюцца ізалявана, і ўся ўвага дзіцяці накіроўваецца на правільнае вымаўленне гука, дзеці яго вымаўляюць правільна. Як толькі дзеці пераходзяць да спантаннага маўлення, навык губляецца. Між тым, задача фарміравання правільнага літаратурнага беларускага вымаўлення – навучыць дзяцей выконваць нязвыклыя артыкуляцыйныя рухі так, “каб яны сталі як бы рэфлектыўнымі, г.зн. прывычнымі, каб яны выконваліся пры мінімуме кантролю свядомасці” (Л.У. Шчэрба).

Навык выкарыстання гука ва ўласным маўленні не фарміруецца зусім або фарміруецца вельмі марудна і не ва ўсіх дзяцей тады, калі яны не мабілізуюць для выканання задання свае магчымасці, ім нецікава выконваць патрабуемае маўленчае дзеянне. Трэба каб кожнае вымаўленчае дзеянне, кожная аперацыя былі матываваныя, мелі для дзіцяці сэнс і інтарэс, толькі тады яны змогуць карыстацца сфарміраванымі навыкамі ў самастойным маўленні. Матыў вымаўленчага навыку для дзяцей ствараецца ў гульні.

Неабходна, каб дзеці ў гульні вымаўлялі і пазнавалі патрэбныя гукі аўтаматычна, не думаючы пра гэта спецыяльна. Для авалодання новымі гукамі дзіцяці патрэбна мець крытэрый правільнага пазнавання і вымаўлення. Адзіны выпадак, у якім дзеянне вымаўлення і пазнавання гука асэнсаванае, -- гэта калі гук уключаны ў склад слова, якое трэба вымавіць. Значыць, *фанетычныя гульні будуюцца так, каб дзеці матывавана, г.зн. з якой-небудзь гульнявой мэтай, вымаўлялі і пазнавалі новыя гукі ў гукапераймальных і іншых словах*.

Пры фарміраванні навыкаў вымаўлення таго ці іншага гука ў гульні важна прытрымлівацца пэўнай паслядоўнасці дзеянняў. Фанетычныя гульні будуюцца з ўлікам наступных этапаў работы (прапанаваны К.Ю. Пратасавай):

1. Этап слыхавога ўспрымання, які ўключае знаёмства з новым гукам у слове і абстрагаванне гука ад слова. У гульнявой сітуацыі трэба засяродзіць увагу дзяцей на патрэбным гуку, а затым увесці яго ізалявана.

2. Пастаноўка ізаляванага беларускага гука шляхам тлумачэння і па меры магчымасці дэманстрацыя яго артыкуляцыі. (Тут можна выкарыстоўваць гульню «Вясёлы язычок», распрацаваную М.Г. Генінг і Н.А. Герман.). Паўтарэнне дзеяння ў адпаведнасці з гульнявым момантам.

3. Слыхавыя практыкаванні на распазнаванне новага гука. Дзеці вучацца распазнаваць новыя беларускія гукі, якія змешваюцца ў вымаўленні з рускімі (дз' – д', г – γ) або падобныя на гукі беларускай мовы (дж – ж). На кожны гук яны рэагуюць адпаведнымі гульнявымі дзеяннямі.

4. Імітацыя дзецьмі гукавых адрозненняў у гульні.

5. Самастойнае вымаўленне новага гука ў гульні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. Уключэнне патрэбнага гука ў словы і сказы беларускага вуснага маўлення ў працэсе гульнявых дзенняў.

Пры распрацоўцы фанетычных гульняў трэба абапірацца на існуючыя ў беларускай і рускай мовах гукаперайманні. Параўноўваць іх, каб прадэманстраваць розніцу ў вымаўленні. Можна «прыпісаць» той або іншы гук якой-небудзь фантастычнай жывёле, даўшы ёй адпаведную назву. Напрыклад, можна намаляваць незвычайнага жука (з вялікімі вушамі або з ільвінай грывай і да т.п.) і сказаць, што гэта казачны джук, песенька якога *дж-дж-дж*.

Кожная фанетычная гульня і гульнявое практыкаванне маюць зусім канкрэтную мэту. Разам яны складаюць пэўную сістэму, і практыкаванне кожнага гука патрабуе выкарыстання гульняў у строгай паслядоўнасці, якая пабудавана па прынцыпе ўскладнення артыкуляцыі. Сістэма фанетычных гульняў па фарміраванні ў дзяцей правільнага вымаўлення ўсіх спецыфічна беларускіх гукаў распрацавана Н.С. Старжынскай .

4. Знаёмства дзяцей з арфаэпічнымі асаблівасцямі беларускага маўлення

Ва ўстанове дашкольнай адукацыі неабходна ствараць спрыяльныя ўмовы для фарміравання літаратурнага вымаўлення. Асаблівае значэнне набывае гэтая задача ў сітуацыі руска-беларускага двухмоўя.

Адметнай асаблівасйцю беларускага вымаўлення выступае так званае *аканне і яканне*.

Прыметай правільнага беларускага маўлення з’яўляецца *змякчэнне ў большасці выпадкаў парных па карэляцыі цвёрдых зычных перад мяккімі зычнымі.*

Характэрнай асаблівасцю беларускай фанетыкі з’яўляецца наяўнасць *падоўжаных зычных* у словах пэўных тэматычных груп лексікі.

Выхавальніку неабходна ведаць асаблівасці вымаўленя галосных і зычных гукаў, іх спалучэнняў у розных пазіцыях слоў і валодаць імі. Да іх адносяцца, напрыклад, вымаўленне спалучэнняў **дц**, **тц** у якасці падоўжанай афрыкаты *цц*, *ц’ц’*: *сіццо* (сітцо), *ац’ц’енне* (адценне), спалучэння **чц** як падоўжанага зацвярдзелага *цц*: *у* хустаццы (у хустачцы), *на кладаццы* (на кладачцы), вымаўленне звонкіх зычных на канцы слоў: *дошч* (дождж), *мядзвець* (мядзведзь) і інш. Вымаўленне спалучэнняў зычных, а таксама зычных на канцы слоў патрабуе большай ўвагі, крапатлівай працы над засваеннем арфаэпічных нормаў.

З названымі асаблівасцямі вымаўлення беларускіх слоў дзеці спачатку знаёмяцца на асобных прыкладах – словах, з якімі яны сустракаюцца ў штодзённым жыцці, або якія ўваходзяць у слоўнік тых або іншых заняткаў.. Выхавальнік звяртае ўвагу на вымаўленне такіх слоў, пры неабходнасці параўноўвае іх з рускімі.

Распаўсюджаным прыёмам фарміравання арфаэпічных уменняў дзяцей выступае *ўзор вымаўлення выхавальніка*, які дзеці паўтараюць. Каб паўтарэнне было не механічным, гэтаму дзеянню папярэднічае гульнявая матывацыя. Так, матываваным з’яўляецца паўтарэнне асобных слоў ці іх формаў у гульні “Рэха”:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выхавальнік вымаўляе слова гучна, а дзеці па аднаму – цішэй. Такую гульню можна правесці ўжо з выхаванцамі малодшага дашкольнага ўзросту.

Дзецям сярэдняга і старшага дашкольнага ўзросту можна прапанаваць такія гульні, у якіх яны не паўтараюць, а самастойна называюць словы з той або іншай арфаэпічнай асаблівасцю. Так, для замацавання вымаўлення слоў з ненаціскным [а] дзеці хорам вымаўляюць той ці іншы склад на [а], потым хто-небудзь з дзяцей па ўказанні выхавальніка павінен хутка назваць сваё слова з гэтым складам: *ля-ля-ля – лясы, ля-ля-ля – лячыць, ля-ля-ля – лянок, ля-ля-ля - ляпіць* і г.д.; *ба-ба-ба – бальніца, ба-ба-ба – бабёр, ба-ба-ба – баран, ба-ба-ба - Барыс* і г.д. Папярэдняе вымаўленне склада на [а] стварае ў малых установку на аканне ці яканне. Пры гэтым дзецям не паведамляецца правіла аб ненаціскным складзе, таму яны зусім слушна, на іх погляд, называюць словы, якія проста пачынаюцца на прапанаваны склад: тыпу *лялька* (на *ля*), *байка* (на *ба*) і да т.п. Такія адказы лічацца правільнымі, за іх таксама выхавальнік хваліць, дае ўзнагароду (фішку), якія затым падлічваюцца.

Калі дзеці сярэдняга дашкольнага ўзросту пазнаёмяцца з тэрмінам “гук”, выхавальнік звяртае іх ўвагу на асаблівасць вымаўлення слоў з падоўжанымі зычнымі. Напрыклад, пасля расказвання беларускай народнай казкі “Коцік, пеўнік і лісіца” дзеці завучваюць словы пеўніка, з якімі той звяртаецца да коціка: “… *Нясе мяне ліса па карчах, па каменні, па ўсякім зеллі*…” Выхавальнік гаворыць: “Паслухайце, як я вымаўляю гук **н’** у слове *каменні* (вымаўляе слова, інтанацыйна падкрэсліваючы патрэбны гук) – працягла, падоўжана. Гэтаксама вымаўляецца гук **л’** у слове *зеллі*.” Прапануе малым паўтарыць названыя словы.

Даволі ўдалым гульнявым практыкаваннем на засваенне правільнага вымаўлення слоў з падоўжанымі зычнымі з’яўляецца наступнае. Дзеці ўспамінаюць тую ці іншую “песеньку” (жука, вадзічкі, ветрыка і г.д.), а затым “спяваюць” з гэтай песенькай адпаведныя словы. Напрыклад, песенька струменьчыка вадзічкі *сь-сь-сь*. Выхавальнік прапануе малым разам з вадзічкай праспяваць слова “калоссе”: “*Калос-с-се*”.

Па гэтым жа прынцыпе можна пабудаваць практыкаванні на правільнае вымаўленне слоў з асімілятыўным змякчэннем зычных. Напрыклад, дзеці ўспамінаюць, як зумкае маленькі камарык (*зь*), а потым вымаўляюць слова з гэтай кароценькай песенькай (*змяя, козлік*).

У старшым узросце веды дзяцей замацоўваюцца і абагульняюцца. На занятках па навучанні грамаце выхаванцы авалодваюць уменнем вылучаць слоўны націск.

Выхавальнік паведамляе дзецям, што ў некаторых беларускіх словах асобныя зычныя вымаўляюцца не так, як астатнія, а больш працягла: *калоссе, падарожжа, снеданне*. Дарослы кожны раз пытаецца, які зычны ў слове вымаўляецца працягла, падоўжана. Потым паведамляе, што гэтыя зычныя гукі называюцца падоўжанымі.

Карысна параўнаць з дзецьмі вымаўленне беларускіх і рускіх слоў, пачатковая форма якіх супадае: *ноч –- ночью – ноччу, гразь – грязью – граззю, колас – колосья – калоссе* і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Праводзіцца параўнанне значэння і вымаўлення слоў тыпу *сук – сучча, каласы – калоссе, збажына – збожжа.* Работу над падобнымі парамі слоў можна праводзіць у выглядзе гульні “Хто ўважлівы?” (дзеці вызначаюць словы з падоўжанымі зычнымі ў названых выхавальнікам парах) або “Як сказаць інакш?” (дзеці ў адказ на зыходнае слова самастойна ўтвараюць слова з падоўжанымі зычнымі).

Набыўшы дастатковы слоўнікавы запас, дзеці могуць выконваць такое заданне, як падбор падобных па гучанні слоў: *насенне, варэнне, пытанне, пячэнне, здарэнне.* Выхавальнік падкрэслівае, што ва ўсіх гэтых словах ёсць падоўжаныя зычныя, дзеці іх вызначаюць.

З мэтай развіцця фанематычнага слыху дзяцей выхавальнік праводзіць з імі практыкаванні на распазнаванне слоў з падоўжанымі зычнымі або з выразным ненаціскным галосным [а]. Так, калі дзеці адгадаюць загадку “*І дзень ішоў, і ноч ішоў, а з месца нават не сышоў*”, выхавальнік можа прапанаваць ім знайсці словы, процілеглыя па значэнні (*дзень – ноч*) і пытаецца, у чым асаблівасць вымаўлення слова-адгадкі *гадзіннік.*

Можна прапанаваць знайсці словы з падоўжанымі зычнымі ў вершы.

Выхавальнік вымаўляе словы, падкрэсліваючы голасам патрэбныя гукі.

У працэсе работы над сэнсавым зместам слова можна прапанаваць выхаванцам “загадкі”, або так званыя “тлумачалкі” – тлумачэнне значэнняў слоў, якія адрозніваюцца тымі або іншымі асаблівасцямі вымаўлення: “Тое, што мы ядзім кожную раніцу”. (Снеданне.) “Хаткі для пчол” (Вуллі.).

Кожны раз выхавальнік падкрэслівае асаблівасць вымаўлення слоў-адгадак. Для практыкавання можна падабраць словы, якія падпарадкоўваюцца адной арфаэпічнай норме.

У работу над правільным вымаўленнем беларускіх слоў уваходзіць і практыкаванне выхаванцаў у правільнай пастаноўцы націску ў тых словах, якія падобныя на рускія: *каршун* (ко́ршун), *крапівá* (крапива), *оо́пух* (лопух), *зямлю* (зе́млю), *нéсці* (нести), *нікога* (никого) і г.д.

Гэта тыя выпадкі, дзе вельмі верагодна ўзнікненне арфаэпічнай інтэрферэнцыі ў маўленні. Каб папярэдзіць гэтыя памылкі ў дзяцей, засваенне націску ў падобных словах і іх формах павінна быць не механічным, а ў пэўнай меры асэнсаваным. Гэта значыць, што такія словы трэба параўноўваць з рускімі.

Замацаванне правільнага вымаўлення слоў ажыццяўляецца і шляхам такіх практыкаванняў, як прыдумванне сказаў з зададзеным словам, дагаворванне сказаў, асабліва вершаваных, дзе правільны націск абумоўліваецца рыфмай.

Выхаванцам старшай групы можна прапанаваць гульню “Скажы па-беларуску”, у якой замацоўваюцца і актывізуюцца вымаўленчыя навыкі дзяцей.

Асноўным жа паказчыкам засваення беларускага гукавымаўлення і правіл арфаэпіі з’яўляецца дакладнае вымаўленне ўсіх гукаў і засвоеных слоў у спантанных маўленчых сітуацыях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма 4.6 Методыка развіцця прадуктыўнага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту (матэрыял для самастойнага вывучэння)

Пытанні для вывучэння

1. Асаблівасці выбару тэм для заняткаў па развіцці прадуктыўнага беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

2. Асноўныя прынцыпы фарміравання звязнага (дыялагічнага і маналагічнага) беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

3. Развіццё выразнасці і вобразнасці маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту.

1. Асаблівасці выбару тэм для заняткаў па развіцці прадуктыўнага беларускага маўлення дзяцей лашкольнага ўзросту

Важнейшым, як бы завяршаючым звяном у цэласнай сістэме навучання дзяцей дашкольнага ўзросту роднай мове з'яўляецца развіццё прадуктыўнага маўлення.

Вуснае маўленне, як вядома, выступае ў дзвюх асноўных формах: дыялогу і маналогу. Істотнай характарыстыкай дыялогу з'яўляецца, перш за ўсё, яго рэактыўны характар, а маналогу – разгорнутасць маўлення (А.А.Лявонцьеў).

І дыялог, і маналог уяўляюць сабой звязнае маўленне, якое складаецца з лагічна звязаных фраз, сказаў, што забяспечвае зносіны і ўзаемаразуменне людзей. Л.С. Рубінштэйн, раскрываючы асаблівасці звязнага маўлення, акрамя лагічнай звязнасці, падкрэсліваў і значэнне такога яе кампанента, як вобразнасць.

Працэс стварэння любога выказвання, як вядома, падзяляецца на ўнутранае праграміраванне і вонкавую маўленчую дзейнасць, якая прадстаўлена тэкстам. Пераход ад унутранага маўлення да вонкавага пачынаецца з выбару агульнай структурнай схемы сказа, або сінтаксічнай мадэлі (і ў цэлым выказвання), якая затым запаўняецца прыдатнымі па сэнсе і граматычнай форме словамі, у выніку чаго і ствараецца выказванне. Такім чынам, *асноўнай адзінкай звязнага маўлення з'яўляецца сінтаксічная мадэль*, якая выступае ў якасці ўзору для пабудовы бязмежнай колькасці выказванняў. (Напрыклад, па мадэлі "дзейнік – выказнік – дапаўненне": Хлопчык чытае кнігу. Мама смажыць катлеты. Кошка ловіць мышку. Маляр фарбуе сцены. І г.д.) .

Аднак звязнае выказванне – гэта не набор сказаў. Фразы ў тэксце ўступаюць у разнастайныя міжфразавыя сувязі -- пераход ад сказа да сказа, для раскрыцця змястоўных думак, якія выказваюцца.

Тэкст як тэматычнае, стылёвае і сэнсавае адзінства дзеліцца на лагічныя, кампазіцыйна завершаныя блокі. У розных па тыпу тэкстах структура мае свае асаблівасці. Фундаментальнымі тыпамі тэкстаў з'яўляюцца апісанне (адлюстраванне нейкага моманта рэчаіснасці, вобраза прадмета), апавяданне (сюжэт, які разгортваецца ў часе) і разважанне. Для выхаванцаў уласцівы першыя два тыпы. У дзяцей старшага дашкольнага ўзросту можна назіраць узнікненне элементарнай формы лагічна правільнага разважання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паколькі сродкі міжфразавай сувязі і структура звязнага тэксту ў рускай і беларускай мовах аднолькавыя, то задачы развіцця беларускага маўлення выхаванцаў з'яўляюцца агульнымі.

Неабходна вучыць дзяцей адбіраць змест, які павінен быць перададзены ў маўленні, падбіраць найбольш дакладныя словы для выказвання думкі, будаваць сказы розных тыпаў. Не менш важна вучыць выкарыстоўваць неабходныя для звязнага маўлення моўныя сродкі: інтанацыю, лагічны націск, розныя віды сувязі сказаў і структурных частак тэксту паміж сабой. Істотнай характарыстыкай звязнага выказвання з'яўляецца яго выразнасць.

Важнай задачай методыкі выступае абгрунтаваны выбар тэм для абмеркавання з выхаванцамі рознага ўзросту ў працэсе зносін або расказвання дзецьмі. Выбар тэм залежыць ад узроўню развіцця беларускага маўлення, інтарэсаў дзяцей. Тут неабходна ўлічваць і форму зносін, якой валодаюць дзеці таго ці іншага ўзросту.

2. Асноўныя прынцыпы фарміравання звязнага (дыялагічнага і маналагічнага) беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту

Методыка навучання дзяцей дашкольнага ўзросту звязнаму маўленню павінна асноўвацца на прынцыпе маўленчага дзеяння. Фразы, якія вымаўляе дзіця на беларускай мове, будуць вынікам маўленчага дзеяння толькі пры наяўнасці ў яго ўнутранага матыву дзейнасці (чаму яму трэба гэта сказаць), мэты (дзеля чаго трэба гэта сказаць, што атрымаецца ў выніку), думкі (які змест трэба перадаць). Дзіця павінна самастойна адабраць словы для перадачы думкі, змяніць іх у адпаведнасці з правіламі беларускай граматыкі, пабудаваць сказ, звязаць сказы паміж сабой у звязны тэкст. Такім чынам, адукацыйны працэс трэба будаваць так, каб дзеянні дзяцей у кожны момант навучання былі сапраўды маўленчымі.

Штуршком да стварэння выказвання заўжды з'яўляецца патрэба чалавека ўступіць ў маўленчыя зносіны для вырашэння пэўных камунікатыўных задач.

Засваенне дзецьмі слоўніка, граматычных форм беларускага маўлення адбываецца ў камунікатыўна-гульнявых сітуацыях, якія былі апісаны ў адпаведных раздзелах. Гэта, па-сутнасці, і ёсць узровень сітуацыйна-дыялагічнага маўлення, дзе ў якасці адказу дзецьмі часта выкарыстоўваецца сказ з аднаго слова (напрыклад, пры пасіўным распазнаванні слова дзеці адказваюць словамі "так" ці "не", пры узнаўленні слова з выбарам або без выбару ў адказ на пытанне называюць адно слова).

Гульні, мэта якіх – непасрэднае развіццё звязнага прадуктыўнага беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту, паступова "вырастаюць" з лексічных, граматычных і фанетычных гульняў.

Пад час развіцця беларускага маўлення ўжо ў сярэдняй групе можна вучыць дзяцей *будаваць рознага тыпу дыялогі* ў межах тэмы заняткаў. З гэтай мэтай выхавальнік сам складае дыялогі з неабходнымі маўленчымі штампамі, прагаворвае спачатку сам (дае ўзор, маўленчую мадэль), а потым стымулюе дзяцей да дыялагічнай размовы.

З мэтай развіцця дыялагічнага маўлення выкарыстоўваюць *дыдактычныя гульні* накшталт "Магазін" (адзення, абутку, цацак, прадуктовы, хлебны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зоомагазін і інш.), “Тэлефон” (запрашэнне ў госці, прывітанне, размова з бацькамі, сябрамі). Спачатку суразмоўцай дзіцяці выступае выхавальнік, а з цягам часу дзеці самастояна будуюць патрэбны дыялог.

Развіццю дыялагічнага маўлення садзейнічаюць і *беларускія народныя гульні* – карагодныя, гульні-драматызацыі. Гэтае пытанне было разгледжана ў раздзеле “Камунікатыўная накіраванасць развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту”

Амаль адначасова з развіццём дыялагічнага маўлення дзяцей стымулюць да складання невялікіх апавяданняў, г.зн. развіваюць *маналагічнае маўленне.*

Вельмі плённымі ў плане пераходу ад дыялагічнага да маналагічнага маўлення з’яўляюцца *гульні-інсцэніроўкі*, у якіх разыгрываецца прыдуманыя разам з выхавальнікам працягі знаёмых твораў.

Важнае месца займаюць *гульні-драматызацыі па сюжэтах вершаў, беларускіх народных казак, твораў беларускіх пісьменнікаў*. Гэтыя гульні асабліва дапамагаюць у замацаванні новай лексікі, дапамагаюць будаваць дыялог і звязныя выказванні.

Раней ужо ўзгадвалася пра распрацаваныя А.І. Негнявіцкай і К.Ю. Пратасавай *гульнявыя камунікатыўныя сітуацыі*, у аснове якіх выкарыстаны казачныя сюжэты фальклору і дзіцячай літаратуры.

Уяўляльныя сітуацыі фальклорных твораў, удзельнікамі якіх з'яўляюцца дзеці, аказваюць вялікі ўплыў на ўзнікненне ў іх эмацыянальных вобразаў. Працэс стварэння такіх вобразаў выражаецца вонкава ў выказваннях дзяцей, у іх ацэнцы ўчынкаў герояў (А.У. Запарожац, Я.З Невяровіч).

Найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца такія сітуацыі, як «Чарадзейны магазін», у якім незвычайныя тавары, прадавец, грошы (усё гэта прыдумваюць самі дзеці ў залежнасці ад таго, якая тэма вывучаецца); «Казачныя госці», калі прыдумваюцца і ежа, і посуд, і мэта прыходу гасцей, і персанажы, і касцюмы, і падарункі; «Чарадзейны горад», у якім усё можа стаць або толькі аднаго (як пры разглядванні праз каляровае шкло), або «не свайго» колеру, можа быць пабудавана з незвычайных матэрыялаў, выконваць незвычайныя функцыі (на вуліцы спяць, у школе мыюцца і да т.п.).

Дзецям прапануюцца казачныя матывы і падзеі для адпрацоўкі камунікатыўна-маўленчых навыкаў па ўсіх раздзелах праграмы, што дазваляе ім замацаваць у гульнявой форме набытыя навыкі зносін. У выхаванцаў выхоўваецца цікавасць да вывучэння беларускай мовы, знікае страх перад зносінамі на ёй.

Напрыклад. для адпрацоўкі навыкаў звязнага маналагічнага маўлення (апісання) можна выкарыстаць гульнявую сітуацыю «Адгадай, хто я».

Выкарыстанне падобных сітуацый з'яўляецца вельмі эфектыўным метадычным прыёмам у навучанні дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове і дазваляе вырашыць важныя задачы. Па-першае, выпрацаваць у дзяцей устойлівую цікавасць і станоўныя эмацыянальныя адносіны да маўленчага дзеяння, якое імі выконваецца. Па-другое, значна павысіць маўленчую актыўнасць дзяцей на занятках і лёгка дамагчыся ад іх ужывання максімальнай колькасці новых моўных канструкцый і адзінак. Па-трэцяе, навучыць дзіця не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

проста паўтараць тыповую канструкцыю, але будаваць яе самастойна для выражэння ўласнай думкі або жадання, г.зн. закласці аснову прадуктыўнага маўлення на беларускай мове.

Шмат увагі неабходна надаваць заданням, якія накіраваны на *развіццё фантазіі*. Гэта слоўныя замалёўкі незавершаных карцін, якія даюцца дзецям у схематычным выглядзе, прыдумванне казак, гісторый з жыцця дзяцей і інш.

Узорам стварэння цікавых уяўляльных сітуацый, творчых маўленчых гульняў для дзяцей з'яўляецца «Граматыка фантазіі» Джані Радары.

Вельмі плённай з'яўляецца методыка развіцця звязнага творчага маўлення *на падставе мадэлявання* (В.М. Дьячэнка). Каштоўнасць такіх заданняў у тым, што пры іх выкананні прадугледжваецца выкарыстанне ўяўляльных, у тым ліку казачных, сітуацый, што забяспечвае самастойнасць у выбары моўных сродкаў для выказвання, цікавасць да заняткаў і творчую атмасферу.

Заняткі па развіцці маўлення, на якіх вырашаюцца традыцыйныя задачы (навучанне пераказу, апісанням прадметаў, цацак, складанню апавяданняў і г.д.) таксама грунтуюцца на гульнявых вучэбна-маўленчых сітуацыях. Матывацыяй для стварэння апавяданняў на такіх занятках можа служыць прысутнасць персанажа-«беларуса», які хоча навучыцца складаць апавяданне па карціне і просіць дзяцей дапамагчы яму, просіць пераказаць казку, паколькі не чуў яе і г.д.

Поспех навучання дзяцей маналагічнаму маўленню на другой мове, па сцвярджэнні А.М. Богуш, залежыць ад таго, ці будзе выхавальнік пратрымлівацца пэўных прынцыпаў, а іменна: а) навучанне дзяцей маналагічнаму маўленню па ўзоры выхавальніка; б) самастойнасць пабудовы тэксту дзіцем; в) узаемасувязь развіцця звязнага маўлення з лексічным, граматычным аспектам навучання; г) паслядоўнасць у навучанні тэм, шматразовае паўтарэнне тыповых канструкцый.

Пераказ – аднаўленне літаратурнага ўзору ў вусным выразным маўленні – уяўляе сабой складаны разумовы навык, які фарміруецца паступова ў працэсе навучання. У форме пераказу выяўляецца мастацка-маўленчая дзейнасць дзяцей дашкольнага ўзросту на пачатковым этапе яе развіцця.

Навучанне пераказу літаратурных твораў мэтазгодна праводзіць, пачынаючы з другой паловы вучэбнага года ў сярэдняй групе з паступовым ускладненнем прыёмаў пераказу.

Для пераказвання падбіраюцца празаічныя творы з простым дынамічным сюжэтам, невялікага аб'ёму – казкі, апавяданні, якія маюць выхаваўчае значэнне, уяўляюць сабой узоры дзіцячай мастацкай літаратуры. Пераказ маленькіх твораў, блізкі да тэксту або амаль даслоўны, з'яўляецца асновай для больш складаных форм пераказу. Самы маленькі тэкст з некалькіх сказаў можа быць прачытаны выхавальнікам некалькі разоў, не стамляючы дзяцей, а закончаны пераказ найбольш задавальняе дзіця.

Дзецям старшага ўзросту для пераказаў можна падабраць больш складаныя па структуры і аб'ёмныя творы – казкі (пажадана з паўторамі) і апавяданні (напрыклад народныя казкі «Муха-пяюха», апавяданні «Яшава рукавічка» В. Хомчанкі і інш.). Дзецям старшага дашкольнага ўзросту

даступны апавяданні з маральнай накіраванасцю (напрыклад, «Страшная казка» В. Віткі), пазнавальнага зместу (беларуская народная казка «Лёгкі хлеб»).

Падабраўшы літаратурны твор, выхавальнік рыхтуецца да падачы яго дзецям, прадумвае структуру заняткаў, прыёмы кіраўніцтва дзецьмі. Уважліва знаёміцца са зместам твора, выяўляе незразумелыя дзецям словы, практыкуецца ў выразным чытанні.

Незнаёмыя дзецям словы выхавальнік паясняе перад чытаннем або ў ходзе яго. Напрыклад, слова «янот» лепш растлумачыць дзецям да чытання, паказаўшы малюнак, расказаўшы пра гэтую жывёлу. Такое слова, як «куртаты» (хвост), выхавальнік можа паясніць па ходу чытання сінонімам «кароткі».

Падбор твораў для пераказвання, прыёмы навучання залежаць ад вопыту дзяцей, іх узроставых асаблівасцей, ад складанасці твора.

Часам перад чытаннем твора трэба правесці ўступную гутарку — паставіць адно-два пытанні для актывізацыі вопыту дзяцей, для падвядзення іх да асэнсаванага ўспрымання Аднак гутарка не абавязковы этап заняткаў, тым больш, што для пераказаў выкарыстоўваюцца кароткія творы, якія поўнасцю адпавядаюць вопыту дзяцей.

Методыка правядзення заняткаў па пераказе беларускамоўных твораў ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання па сутнасці не адрозніваецца ад аналагічных заняткаў, што праводзяцца на рускай мове. Каб падрыхтаваць дзяцей да пераказу, выхавальнік адзін-два разы выразна чытае твор, ставіць дзецям некалькі пытанняў па яго змесце, паказвае ілюстрацыі, робіць тлумачэнні, а потым чытае яшчэ раз, перад тым папярэдзіўшы, каб дзеці ўважліва слухалі і каб запаміналі апавяданне (казку), бо затым яны самі будуць яго пераказваць. Устаноўка на запамінанне актывізуе работу памяці, увагу дзяцей, але даецца яна толькі перад паўторным чытаннем.

Такім чынам, спачатку выхавальнік вучыць дзяцей сачыць за развіццём дзеяння ў казцы, апавяданні і паступова падводзіць іх да ўзнаўлення тэксту. Дзеці пераказваюць праслуханы твор, адказваючы на пытанні выхавальніка. Правільна пастаўленыя пытанні вызначаюць паўнату і паслядоўнасць перадачы дзецьмі прачытанага. Пры паўторным расказванні казкі выхавальнікам дзяцей можна далучаць да сумеснага пераказу, заахвочваючы да вымаўлення асобных слоў або сказаў.

Далей выхавальнік выклікае дзяцей для пераказвання. Ён дапамагае ім пытаннямі, падказваннямі. Калі дзіця не можа самастойна пераказваць, выхавальнік прапануе распавядаць разам. Ён пачынае фразу, дзіця працягвае яе. Акрамя *сумеснага пераказу* выкарыстоўваецца прыём *адлюстраванага пераказу,* калі дзіця паўтарае за выхавальнікам фразу з пачатку.

Такі прыём выкарыстоўваецца на пачатковых этапах навучання беларускамоўнаму пераказу, а таксама ў рабоце з дзецьмі, якія адчуваюць цяжкасці ў выкананні задання.

Такім чынам выхавальнік рыхтуе дзяцей да самастойнага пераказу.

У працэсе кіраўніцтва пераказваннем выхавальнік выкарыстоўвае разнастайныя метадычныя прыёмы. Калі дзіця няўдала ўжыла тое ці іншае слова, выхавальнік выкарыстоўвае падказку. Калі дзіця робіць доўгую паўзу,

выхавальнік уступае ў пераказ і працягвае яго. Педагог ацэньвае паўнату пераказу, адзначае самастойнасць, выкарыстанне розных інтанацый, ужыванне «прыгожых» слоў і выразаў.

Эфектыўным прыёмам практыкавання дзяцей у выразнасці пераказу выступае гульня-драматызацыя, якая не патрабуе дэкарацый, касцюмаў і папярэдняй падрыхтоўкі. Яна праводзіцца ў канцы заняткаў.

Апісанне прадметаў, цацак або прадметных малюнкаў вучыць дзяцей выдзяляць іх найбольш характэрныя прыкметы, знаходзіць для апісання дакладныя словы і выразы, вызначаць адметнае і падобнае ў прадметах у працэсе іх параўнання.

Навучанне апісанню прадметаў, цацак ажыццяўляецца ў сярэдняй і старшай групах. Спачатку элементы расказвання ўводзяцца ў заняткі па разглядванні цацак, прадметаў у сярэдняй групе. Пры разглядванні вытрымліваецца прынцып паэтапнага абследавання прадмета -- ад успрымання аб'екта ў цэлым да выдзялення яго асноўных істотных прыкмет, устанаўлення паміж імі адносін. Выхавальнік задае пытанні тыпу: «Што гэта? Як ты даведаўся, што гэта грузавік? Што ў яго ёсць? Дзе ў яго колы, кузаў, кабіна?»

Прадуктыўным з’яўляецца разглядванне цацак аднаго найменння, але розных па знешнім выглядзе. Такі падбор забяспечвае актывізацыю слоўніка дзяцей і развіццё звязнага маўлення на аснове выкарыстання прыёма параўнання. Напрыклад, выхавальнік паказвае двух медзведзянят. Пытаецца: «Хто гэта? Паглядзіце на гэтае медзведзяня. Якія ў яго вочы? Якія ў медзведзяня вушы? А якія ў яго лапы? Скажыце, якое гэта медзведзяня? Як можна назваць медзведзяня ласкава? А што яно ўмее рабіць? У нашага мішкі ёсць сябар. Паглядзіце на яго. Якія ў яго вочы? Лапы? Які гэта мішка?»

Разглядваючы цацкі, дзеці ў адказ на пытанні выхавальніка выказваюць толькі асобныя сказы. Выхавальнік аб'ядноўвае выказванні дзяцей у адзін кароткі — з 2-3 сказаў расказ, які і з'яўляецца для дзіцяці ўзорам для паўтарэння. Напрыклад: «Медзведзяня маленькае і тоўстае. Яго пашылі з сіняга футра. У яго прыгожыя лапкі, падобныя на чорныя шарыкі».

Выхавальнік паўтарае ўзор апісання пры актыўным удзеле дзяцей, якія дагаворваюць словы, фразы, а часам (к канцу года) паўтараюць апісанне цалкам. Для навучання расказванню выкарыстоўваецца сумесны пераказ у гульнявой форме «Скажы, як Вася Вясёлкін».

У старшай групе працягваецца работа па развіцці назіральнасці дзяцей, фарміраванні ў іх уменняў выдзяляць істотныя прыкметы прадмета або цацкі, абазначаць іх словам беларускай мовы. Важны напрамак работы – удасканаленне сінтаксічнага ладу беларускага маўлення дзяцей, развіццё ў іх умення складаць сказы апісальнага характару, выкарыстоўваць розныя віды іх сувязі.

Заняткі па навучанні дзяцей расказванню складаюцца з некалькіх частак: уводнай, разглядвання цацкі або прадмета, расказаў дзяцей.

Ва *ўводнай* частцы дзяцей падрыхтоўваюць да ўспрымання матэрыялу заняткаў, ствараюць цікавасць да іх. Для гэтага практыкуецца папярэдняе самастойнае разглядванне цацкі дзецьмі (цацка выстаўляецца на 5 – 7 мінут,

дзеці могуць пагладзіць яе, патрымаць, памацаць). Карысна чытаць мастацкія творы (загадкі, песенькі, забаўлянкі). Напрыклад, перад разглядваннем цацачнага ката: “Памяркуйце, дзеці, самі: хто ёсць дома ў вас з вусамі? Малады яшчэ, дарэчы, а ляжыць усё на печы” (В. Жуковіч). Прываблівающь дзяцей сюрпрызныя моманты: атрыманне пасылкі, у якой знаходзяцца цацкі, пра іх трэба расказаць; нечаканае знікненне прадмета і яго пошук дзецьмі і да т. п.

Каб стварыць матывацыю расказвання, дзецям, напрыклад, прапануецца па тэлефоне павіншаваць Несцерку са святам і апісаць падарункі, якія для яго падрыхтавалі.

Другая частка заняткаў – разглядванне прадмета. Дзецям прапануюцца для разглядвання прадметы чайнага посуду, пакаевыя расліны, кветкі сада, лісцікі дрэва і да т. п.

Спачатку можна прапанаваць дзецям два аднолькавыя па назве прадметы (ліст кляновы і дубовы; восеньскія кветкі – залатыя шары і наготкі). Яны разглядваюцца па чарзе. Змена аб'екта менш стамляе дзяцей. На гэтых занятках удасканальваюцца ўменні дзяцей выдзяляць прыкметы прадметаў, бачыць іх часткі, прызначэнне і інш. Дзеці, паўтараючы ўзор расказу выхавальніка, адказваючы на пытанні, рыхтуюцца да самастойнага апісання аднаго аб'екта.

Затым выхаванцам прапануюцца цацкі для разглядвання. Пажадана выбраць цацкі, якія прываблівающь дзяцей незвычайнасцю. Яны павінны быць вялікімі па памеры, з яскрава выражанай індывідуальнасцю (парася, якое ўтыкнулася носам у зямлю; немаўля, што працягвае ручкі).

Выхавальнік задае дзецям пытанні, якія тычацца знешняга выгляду цацкі, дзеянняў з ёй, пабуджаюць дзяцей расказаць, як яны ставяцца да цацкі, што кожны з іх ведае пра яе. («Хто гэта? Якія ў кошкі вочы? Якая поўсць? Якімі словамі можна сказаць пра кошку, якая яна? Як называюцца дзіцяняты кошкі? Кошка вялікая, а кацяня ...? Як яе званць? ПІто яна ўмее рабіць?») Пытанні павінны пабуджаць дзіця думаць. («Чаму малы працягвае рукі? Што ён хоча?»; «Чаму гэтыя кветкі называюць залатымі шарамі?»)

Можна выкарыстаць невялікую гульню-інсцэніроўку, напрыклад схаваць качаня, прапанаваць дзецям паклікаць яго. Выхавальнік дапамагае малым: «Качаня, выходзь! Жоўценькае, пушыстае, Крак, выходзь!» Крак з'яўляецца і просіць дзяцей адгадаць, на што падобныя яго вочы. Пытаецца, ці праўда, што яно вельмі прыгожае. Выхавальнік адказвае: «Ты смешнае, нязграбнае, як усе малыя: галава вялікая, а крыльцы маленькія. Давай спытаем у дзяцей, якое ты?»

Разглядванне цацкі заканчваецца ўзорам апавядання, у якім абагульнены выказванні дзяцей. Узор павінен быць вобразным, эмацыянальным, даступным па аб'ёму (7 – 10 сказаў), вытрыманы структурна. Напрыклад, «Гэта маленькая Алеся. У Алесі ружовыя шчочкі, сінія вочы і чорныя вейкі. Алеся вельмі прыгожая» На некаторых занятках узору можа папярэднічаць гульнявы момант («Мне вельмі падабаецца, – гаворыць лялька, – калі пра мяне расказваюць дзеці. З тым, хто лепш за ўсіх гэта зробіць сёння, я застануся пасля заняткаў пагуляць». Выхавальнік: «Дарагая госця! Я таксама хачу з табой пагуляць, таму зараз я пастараюся цікава расказаць пра цябе і твой убор».

У другім паўгоддзі старшай групы можна прапанаваць дзецям ад 5 да 6

гадоў план апавядання. Гэты прыём дапамагае малым асэнсаваць структуру расказу-апісання (спачатку скажы, як называецца гэтая цацка, затым раскажы, якая яна, а потым – як з ёй гуляць).

Пры навучанні дзяцей расказванню спецыяльная ўвага надаецца азнаямленню іх з магчымымі сувязямі паміж сказамі. Найбольш распаўсюджаным сродкам сувязі з'яўляецца паўтор ключавога слова. Каб дапамагчы дзецям асэнсаваць ролю паўтору як сродку міжфразавай сувязі, выкарыстоўвацца такі прыём, як замена ключавога слова пытаннем. Напрыклад: «Хто гэта?» — «Гэта лялька». – «Хто прыгожы?» – «Лялька прыгожая». – «У каго светлыя пушыстыя валасы? – «У лялькі светлыя пушыстыя валасы». Другі прыём – дагаворванне сказаў, якія пачынае выхавальнік: «Гэта дзяўчынка. У дзяўчынкі ...»; «На карціне намаляваны мішка. Мішка ў лапах нясе ...» (А. Зражэўская).

Эфектыўным прыёмам, які замацоўвае атрыманыя навыкі, з'яўляецца сумеснае з гульнявым персанажам апісанне («Скажы, як Піліпка»). Піліпка расказвае пра сваю цацку, дзіця паўтарае структуру апісання, тыпы сказаў, сувязь паміж імі, апісваючы сваю цацку.

У *трэцяй* частцы заняткаў выхавальнік прапануе дзецям самім расказаць пра цацку, дапамагае ім пытаннямі, падказкамі. Каб падтрымліваць цікавасць і ўвагу дзяцей да расказаў таварышаў, ім можна прапанаваць уважліва слухаць (раптам спатрэбіцца дапамога), прыцягваць да дапаўнення апісання (пра што яшчэ не расказалі?), выкарыстоўваць падказванне самім гульнявым персанажам («Ты забыўся расказаць пра маю кофтачку») і інш.

Пасля трох-чатырох расказаў дзяцей можна паўтарыць узор апісання або нагадаць яго часткова.

Ацэнка дзіцячага апісання даецца непасрэдна пасля кожнага расказу. Яна павінна быць змястоўнай і кароткай, у большай ступені заахвочваць, чым ганіць. («Ты расказаў сёння значна лепш, мне амаль не давялося табе падказваць»; «Ты некалькі разоў паўтарыў слова «вось», а расказ з-за гэтага стаў горшы. Паспрабуй расказаць яшчэ раз, не паўтараючы гэтага слова».)

У старшай групе для дзяцей ад 6 да 7 гадоў для апісання падбіраюцца больш складаныя прадметы і цацкі, такія, што патрабуюць вызначэння матэрыялу, прасторавага размяшчэння частак (тэлефон, цацачны гадзіннік, аўтобус і да т. п.).

З мэтай ускладнення выхаванцам старшай групы можна прапанаваць групу цацак. Даецца заданне не толькі апісаць цацкі, але і дакладна вызначыць, дзе яны стаяць (ззаду, спераду, злева ці справа). Навучанне апісанню часта праводзіцца ў форме дыдактычных гульняў. Напрыклад, у гульні «Гараж» машыну прапускаюць у гараж тады, калі дзіця назаве яе часткі, пакажа адрозненне ад іншых машын, скажа, для чаго яна патрэбна; у гульні «Магазін» дзіцяці прадаюць цацку, адзенне, агародніну толькі ў тым выпадку, калі яно апіша адпаведны прадмет (А. М. Бародзіч).

Пры навучанні дзяцей дашкольнага ўзросту апісальным расказам можна выкарыстоўваць мадэлі – спачатку прадметныя, затым прадметна-схематычныя і схематычныя (Н. Кандрацьева, А. Сомкава).

Эфектыўным спосабам развіцця звязнага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту з'яўляецца карціна. Выява прадмета ўзбуджае думку дзіцяці і выклікае выказванне гэтай думкі ў «самастойным слове» (К. Дз. Ушынскі)

Выхаванцам сярэдняй групы спачатку дэманструюцца карціны з выявамі асобных знаёмых прадметаў, цацак, хатніх жывёл. Паступова ўводзяцца простыя па кампазіцыі карціны з невялікай колькасцю персанажаў (1-2) У старшай групе можна прапанаваць для разгляду і наступнага апісання на беларускай мове карціны з трыма перасанажамі. Гэта перш за ўсё сюжэты з дзіцячага жыцця: «Таня на прагулцы», «Гуляем у цягнік», «Дзеці кормяць курыцу і куранят», «Таня не баіцца марозу», «Чыя лодачка?», «Сабака са шчанятамі», «Маці мые посуд» і інш. Адну і тую ж карціну можна выкарыстоўваць на працягу года некалькі разоў, але пры гэтым выхавальнік ставіць розныя задачы, паступова ўскладняючы іх.

Спачатку карціна выкарыстоўваецца з мэтай развіцця дыялагічнага маўлення дзяцей, узбагачэння і актывізацыі слоўніка, выхавання гукавой культуры маўлення. Асноўным метадам работы з карцінай з'яўляецца разглядванне яе ў спалучэнні з гутаркай, а таксама расказваннем выхавальніка.

Выхавальнік прапануе дзецям уважліва разгледзець, што намалявана на карціне, а пасля невялікай паўзы пачынае звяртацца з пытаннямі: што гэта? Хто гэта? Што робіць? Што нясе? Каго сустрэла? і да т. п. Пытанні ставяцца спачатку да асноўнага аб'екта карціны так, каб дзеці ўважліва разглядзелі яго, далі апісанне, указалі на яго дзеянні, а потым і да іншых аб'ектаў, дэталей, паслядоўна раскрываючы сувязі паміж імі. Пытанні ставяцца так, каб дзіця было вымушана адказваць звязнай фразай.

У ходзе заняткаў выхавальнік дае тлумачэнні, пашырае адказы дзяцей («Кошка Мурка любіць сваіх кацянят. Яна лагодна на іх глядзіць»). Разглядванне карціны педагог заканчвае невялікім (з 2-3 сказаў) апавяданнем па ёй. Выхаванцы расказваюць па ўзору дарослага. Пасля заняткаў карціна пакідаецца ў групе, каб дзеці маглі лепей яе разглядзець.

У час разглядвання карціны мэтазгодна выкарыстоўваць розны літаратурны матэрыял: вершы, забаўлянкі, невялікія апавяданні, якія актывізуюць увагу, памяць, мову дзяцей, уплываюць на іх эмоцыі. Калі дзеці ведаюць вершы адпаведнай тэматыкі, то можна прапанаваць ім успомніць і прачытаць іх.

З мэтай актывізацыі маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ўводзіцца "беларускамоўны персанаж": у госці да дзяцей «прыходзяць» лялька, кошка, сабачка і размаўляюць з імі. Выхавальнік прапануе дзецям паказаць гасцям цікавы малюнак і расказаць пра яго.

У старшым дашкольным узросце выхавальнік працягвае вучыць дзяцей разглядваць карціны, апісваць іх па пытаннях, паступова прыцягвае дзяцей да самастойнага расказвання.

Пры навучанні расказванню па карціне вядучым прыёмам з'яўляецца ўзор. Апісанне або апавяданне выхавальніка складаецца з 7-10 сказаў і адлюстроўвае канкрэтны змест карціны. Спачатку дзеці разглядваюць карціну, адказваючы на пытанні выхавальніка, затым той прапануе ім паслухаць сваё

апавяданне: «Паслухайце, спачатку я раскажу, а потым будзеце расказваць вы». Узор апавядання выхавальніка павінен быць з выразнай кампазіцыяй. Кароткія, простыя сказы, знаёмы слоўнік, звязнае выкладанне дапамогуць дзецям добра зразумець патрабаванні, якія выхавальнік прад'яўляе да іх апавяданняў. Апавяданні дзяцей на пачатковых этапах могуць мець характар пераймання. Але потым з дамамогай пытанняў, указанняў выхавальнік стымулюе дзяцей да апісання карціны па-свойму.

Выкарыстоўваецца і такі прыём: выхавальнік дае частковы ўзор, абапіраючыся на які дзеці працягваюць апісанне карціны. Напрыклад, пасля разгляду карціны «Кошка з кацянятамі» выхавальнік звяртаецца да групы: «Давайце ўважліва паглядзім на кошку і раскажам пра яе. Расказваць пачну я, а вы будзеце працягваць».

Далей можна выкарыстоўваць расказванне па аналогіі з узорам. Выхавальнік расказвае пра аднаго з трох кацянят, намаляваных на карціне, а дзеці, арыентуючыся на ўзор, апісваюць другое і трэцяе кацяня.

Падобным чынам складаецца і сюжэтнае апавяданне. Па адной частцы карціны апавяданне складае выхавальнік, а па іншых – дзеці. Апавяданне па змесце нескладанай карціны можа ажыццяўляцца і па плане: «Раскажыце калі гэта было, дзе, як гулялі дзеці, што здарылася».

Першыя самастойныя апавяданні дзяцей, як правіла, змяшчаюць два-тры сказы, к канцу навучання яны складаюцца з 5 – 6 сказаў.

У старшай групах выкарыстоўваецца і такі прыём – прыдумванне назвы карціне. Спачатку дзецям прапануецца ўважліва разглядзець карціну, прааналізаваць яе змест па пытаннях, а потым прыдумаць назву. Ад уменя прыдумваць дакладную назву апавядання ў многім залежыць правільнае разгортванне сюжэта, паколькі назва вызначае тэму расказвання.

Акрамя гульнявой, у старшым дашкольным узросце ўводзіцца «больш сур'ёзная», *сацыяльная матывацыя*: расказаць казку маленькім дзецям, каб яны вучыліся разумець беларускую мову і правільна на ёй размаўляць (для гэтага можна запісаць пераказ на дыск, што з'яўляецца вельмі эфектыўным сродкам удасканалення маўлення дзяцей), наладзіць выстаўку малюнкаў, вырабаў і правесці для выхаванцаў экскурсію на беларускай мове, скласці ліст дзецям, якія наведваюць беларускі дзіцячы сад і размаўляюць толькі па-беларуску і да т.п.

Як відаць з выкладзенага вышэй, методыка навучання дзяцей дашкольнага ўзросту пераказу і расказванню на беларускай мове абапіраецца на аналагічную методыку, што выкарыстоўваецца на занятках па развіцці рускага маўлення. Пры гэтым работа па развіцці рускага маўлення апярэджвае адпаведную работу на беларускай мове. Важна не прыспешваць дзяцей, падтрымліваць, заахвочваць да беларускага маўлення. Калі выхаванцы здолеюць скласці кароткае апавяданне па карціне або пра цацку, прадмет, пераказаць кароткую казку на беларускай мове, гэта будзе, гаворачы словамі А.П. Вусавай, вялікай узнагародай выхавальніку за яго працу.

ЕПОЗИТ

3. Развіццё выразнасці і вобразнасці маўлення у дзяцей дашкольнага ўзросту

Працэс развіцця ўмення правільна выказваць свае думкі на беларускай мове будзе няпоўным без фарміравання ў дзяцей выразнасці маўлення, пад якой разумеецца экспрэсія, вобразнасць, звязаная з выкарыстаннем эпітэтаў, метафар, параўнанняў і г.д. Як адзначае беларускі мовазнавец М. Абабурка, прырода стварыла дюдзей такімі, што ім недастаткова атрымліваць «голую» інфармацыю: яна, як і сам чалавек, павінна быць аздобленая, г.зн. прыгожая. Не апошнюю ролю, заўважае аўтар, выконвае выразнасць маўлення. Толькі ў выпадку авалодання дзецьмі разам з правільнасцю выразнасцю маўлення можна гаварыць аб сапраўдным развіцці ў іх «дара слова».

Найбольш значнымі крыніцамі развіцця выразнасці дзіцячага маўлення з'яўляюцца творы мастацкай літаратуры і вуснай народнай творчасці, у тым ліку і малыя фальклорныя формы, у якіх захавалася выразнае і вобразнае слова. З дапамогай мастацкай літаратуры і фальклору ў дзяцей дашкольнага ўзросту развіваюцца ўменні тонка адчуваць мастацкую форму, мелодыку і рытм роднай мовы. Азнаямленне дзяцей з мастацкімі творамі аказвае вялікі ўплыў на развіццё разумення ролі выразных сродкаў у мастацкім тэксце.

У сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя неабходна праводзіць і мэтанакіраваную работу па параўнанні выразных сродкаў рускіх і беларускіх фальклорных твораў, у мове якіх з найбольшай сілай праяўляецца нацыянальнае, індывідуальнае, уласцівае толькі пэўнаму народу.

Шляхі развіцця вобразнасці і выразнасці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя раскрыты Дз.М. Дубінінай. Паводле Дз.М. Дубінінай, гэтую работу трэба праводзіць па *наступных накірунках:*

- азнаямленне дзяцей дашкольнага ўзросту з творамі рускага і беларускага фальклору, параўнальнае супастаўленне сюжэтаў і вобразаў вуснай народнай творчасці, вылучэнне яе спецыфічных асаблівасцей;

- вызначэнне выразна-выяўленчых сродкаў у творах рускага і беларускага фальклору, іх параўнальнае супастаўленне; ужыванне сродкаў мастацкай выразнасці ў працэсе ўзнаўлення зместу фальклорнага твора, а таксама пры складанні самастойнага звязнага выказвання ў апісальнай, апавядальнай, разважальнай форме;

- забеспячэнне сістэматычнай і асэнсавай адпрацоўкі маўленчых навыкаў выразнасці ў розных сферах беларускамоўных зносін дзяцей дашкольнага ўзросту;

- паглыбленне ведаў пра ўласцівасці і асаблівасці функцыянальных стыляў мовы і выкарыстанне выхаванцамі сродкаў мастаўкай выразнасці ў залежнасці ад мэты, якую выконвае кожны з іх.

Такая работа ажыццяўляецца як у працэсе развіцця штодзённых беларускамоўных зносін, так і ў цеснай узаемасувязі паміж арганізаваным і самастойным азнаямленнем дзяцей з творамі фальклору і мастацкай літаратуры і спецыяльнымі маўленчымі заняткамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Знаёмства дзяцей са стылістычнымі сродкамі мастацкай выразнасці можа адбывацца з дапамогай наступных *практыкаванняў*: назаві слова, што робіць мастацкі твор прыгожым; назаві словы, якія сустракаюцца толькі ў казцы; знайдзі у казцы прыказкі, трапныя выразы; падбяры прыгожыя словы да той ці іншай рэчы ці з'явы; знайдзі якога прыгожага слова не хапае, знайдзі словы, якія надаюць твору пяшчотнасць, замілаванасць, знайдзі прыгожае параўнанне, знайдзі незвычайнае параўнанне.

Цэлы шэраг практыкаванняў накіраваны на высвятленне *ўспрымання і асэнсавання* дзецьмі дашкольнага ўзросту *сэнсавага значэння слова*. У працэсе работы з мастацкім тэкстам дзеці могуць выконваць такое задание, як знайсці ў творы словы падобныя (супрацьлеглыя) па значэнню.

Для гэтага з выхаванцамі праводзіцца гульня «Якія словы вы пачулі?». Калі ў творах фальклору сустракаюцца трапныя выразы, то знаёмства з імі адбываецца не толькі ў сувязі з разуменнем зместу гэтых мастацкіх сродкаў дзецьмі, але і тлумачэннем іх сэнсу словамі падобнымі па значэнню (гульня «Як сказаць інакш?»).

Значную цікавасць выклікаюць у выхаванцаў заданні, якія накіраваны на тое, каб расказаць пра казачную рэч, з'яву, персанаж словамі падобнымі па значэнню (гульня «Хто скажа інакш?»).

Вершаваная пабудова твораў літаратуры і фальклору дае магчымасць з найбольшай эфектыўнасцю праводзіць з дзецьмі практыкаванні, дзе неабходна падабраць і ўставіць у тэкст словы, якія падыходзяць па сэнсу (варыянты слоў аднаго сінанімічнага рада прапаноўваюцца дарослым). З гэтай мэтай проводзіцца гульня «Падбяры найбольш прыдатнае слова».

Дзецям раяць вызначыць, у якім варыянце сказ гучыць найбольш прыгожа. У гэтым выпадку рытм падказвае дзецям найбольш прыдатнае слова з пэўнага сінанімічнага рада, падкрэслівае значнасць яго выбару для прыгожай гукавой афарбоўкі.

Кампазіцыйныя сродкі мастацкай выразнасці літаратурных твораў дзеці дашкольнага ўзросту могуць засвоіць з дапамогай такіх заданняў і гульнявых практыкаванняў, як «Пачні, працягвай, закончы», «Вызнач пачатак твора», «Знайдзі ў казцы паўторы», «Назаві прыказкі, прымаўкі, песенькі, якія прагучалі ў творы». «Падбяры слова, падобнае па гучанню», «Закончы радок», «Знайдзі аднолькавыя хвосцікі ў словах» і г. д.

На матэрыяле літаратурных твораў у дзяцей адпрацоўваецца *інтанацыйная выразнасць маўлення*. Для вырашэння гэтай задачы выхавальнік можа выкарыстоўваць малыя формы беларускага фальклору, якія ў большай ступені насычаны мастацкімі сродкамі інтанацыйнай выразнасці. *Па-першае,* гэтыя невялікія па памеры творы дазваляюць пры мінімуме часу сканцэнтраваць максімум увагі на пэўных выразных сродках маўлення. *Па-другое*, выкарыстанне малых жанраў беларускага фальклору пашырае лексіку выхаванцаў, актывізуе слоўнікавы запас, знаёміць з лексічнымі выразнымі сродкамі, дапамагае авалодаць граматычным ладам беларускай мовы, яе інтанацыйнымі адценнямі. *Па-трэцяе,* знаёмства з прыказкамі і прымаўкамі, трапнымі выразамі набліжае дзіця да духоўных вытокаў беларускага маўлення,

яго вобразнасці. *Па-чацвёртае,* большасць твораў фальклору маюць вершаваную форму, між тым як менавіта вершаваны матэрыял успрымаецца дзецьмі з вялікім задавальненнем і дазваляе з найбольшай карысцю звярнуць увагу дзіцяці на выразнасць маўлення.

Інтанацыйныя якасці голасу можна адпрацоўваць з дапамогай фальклорных твораў, якія маюць розны тон гучання. Дзяцей знаёмяць з пяшчотным, замілаваным тонам калыханак, радасным – заклічак і забаўлянак, загадак і жартоўных песень. Пасля праслухоўвання ў выхаванцаў пажадана запытацца: «Як гучыць твор?» Паколькі асноўны тон гучання падкрэслівае сілу і вышыню голасу, то пасля азнаямлення з пэўнымі фальклорнымі жанрамі і завучвання іх на памяць выхаванцы павінны расказаць гэтыя творы з той гучнасцю, якая адпавядае іх прызначэнню.

Знаёмства дзяцей з тэмпам маўлення добра праводзіць на прыкладзе лічылак, скорагаворак, апавяданняў, казак. Адзначым, што пры гэтым выхаванцам неабходна падкрэсліваць, што тэмп у маўленні можа мяняцца ў залежнасці ад зместу твора, яго прызначэння. Так, тэмп маўлення ў калыханках – павольны, у скорагаворках – хуткі, у казках тэмп маўлення мяняецца ад змены сітуацый.

Замацаваць веды дзяцей пра тэмбр маўлення дапамогуць такія гульні і практыкаванні, як «Адгадай, хто гаворыць», «Пагуляем – адгадаем», «Хто жыве ў рукавічцы», «Пазнай па голасе».

Знаёмства дзяцей з рускімі варыянтамі казак пра жывёл адбываецца значна раней, чым з іх беларускімі паралелямі. Вызначальным прынцыпам гэтых заняткаў выступае правядзенне паралелей сюжэтаў і вобразаў, іх мастацкага апісання ў блізкароднасных творах двух блізкіх народаў. Увага звяртаецца на рысы падабенства і адрознення. Пры наяўнасці песенек, заклічак дзеці могуць узнаўляць іх і адзначаць, як расказваецца ў кожнай казцы пра пэўныя рэчы і дзеянні. Параўноўваюцца прыгожыя апісанні, мянушкі казачных персанажаў іх рэчаў, месцы дзеянняў, якія адбываюцца ў творы. Гэта спрыяе таму, што дзеці лепей заўважаюць нацыянальны каларыт казачнага твора, яго мастацкія моўныя асаблівасці.

Асаблівае месца займаюць гульні-драматызацыі па сюжэтах вершаў, беларускіх народных казак, твораў беларускіх пісменнікаў. Гульні па беларускіх творах садзейнічаюць, авалоданню «літаратурным мінімумам» роднай мовы.

У якасці літаратурнага матэрыялу для разгортвання гульні-драматызацыі выкарыстоўваюцца беларускія народныя казкі пра жывёл, якія лічацца сапраўднымі жамчужынамі ўсходнеславянскага казачнага эпасу. Па-першае, яны вызначаюцца невялікім об’ёмам і тыповымі казачнымі формуламі, па-другое, мова іх вельмі простая і дакладная. Самыя звычайныя па першы погляд словы ў тэксце казак набываюць яскравую выразнасць, трапнасць і прыгажосць. Па-трэцяе, гэтыя казкі маюць шматлікія паралелі ва ўсходнеславянскім фальклоры.

Улічваючы, што з рускай народнай творчасцю дзеці знаёмяца значна раней, Дз.М. Дубініна ў працэсе азнаямлення дзяцей з беларускім фальклорам

прапануе скіроўваць увагу выхаванцаў на падабенстве сюжэтаў і вобразаў казачных твораў беларускага і рускага фальклору. (Напрыклад, такія казкі, як “Дзедава рукавічка” і “Теремок”.) Гэта значна паглыбляе мастацкае ўспрыманне зместу казкі дзецьмі і станоўча адбіваецца на яго творчым узнаўленні ў працэсе гульні-драматызацыі.

На спецыяльных маўленчых занятках неабходна спалучаць работу па адпрацоўцы правільных нормаў маўлення дзяцей старшага дашкольнага ўзросту і па развіцці выразнасці ўсіх моўных адзінак. Ажыццяўляецца такое аб’яднанне пры дапамозе спецыяльна распрацаваных маўленчых сітуацый, якія нагадваюць, па словах А.Г Арушанавай, “сумесны дыялог” выхавальніка з дзецьмі. Гэты дыялог будуецца як імправізацыя, сумесная творчасць выхавальніка і дзіцячага калектыву, дзе камунікатыўныя задачы патрабуюць ад удзельнікаў асэнсаванага выбару маўленчых сродкаў мастацкай выразнасці.

Асновай для распрацоўкі такіх маўленчых сітуацый служаць творы беларускага фальклору, якія маюць адпаведныя рускія паралелі і якія з’яўляюцца найбольш лёгкімі для дзіцячага ўспрымання , найбольш цікавымі і захапляючымі па змесце. Гэта дае дзецям дашкольнага ўзросту магчымасць будаваць свае выказванні з улікам характарыстыкі героя фальклорнага твора, а таксама творча пераасэнсоўваць казачны вобраз. У якасці прыкладу можна прывесці наступныя сітуацыі: “Размова паміж казачнымі героямі”, дзе вызначаецца мэта размовы, яе змест, дзеючыя асобы; “У госці да казачнага героя”, калі прыдумваецца, да каго пайсці ў госці, з кім пайсці, што ўзяць з сабою ў падарунак, з кім сустрэцца і інш.

Навучанне дзяцей выразнасці і вобразнасці маўлення з дапамогай гульняў-драматызацый, казачных камунікатыўных сітуацый паглыбляе ўяўленні дзяцей пра выразныя магчымасці моўных адзінак, аказвае значны ўплыў на мастацкае аздабленне іх звязных выказванняў на беларускай мове.

Такая ж работа праводзіцца пры вызначэнні падабенства паміж прыказкамі. З гэтай мэтай дзецям спачатку расказваецца на рускай мове сітуацыя, якая заканчваецца адпаведнай прыказкай. Пасля чаго ў выхаванцаў пытаюцца, пра што гаворыцца ў прыказцы, як пра гэта расказваецца. Потым выхавальнік прапаноўвае ўзор прыказкі, падобнай па сваім сюжэце, і дзеці вызначаюць, як расказваецца ў ёй пра пэўную рэч ці з'яву. Такая работа спрыяе ўзбагачэнню вобразнага маўлення дзяцей як на беларускай, так і на рускай мове, знаёміць з мастацкасцю беларускіх народных прыказак. Такім чынам рэалізуецца такі накірунак лінгвакультуралагічнага падыходу, як развіццё беларускага маўлення ў дыялозе культур.

Элементарнае асэнсаванне выразных уласцівасцей лексікі, фразеалогіі рускай і беларускай моў дазваляе дзецям старшага дашкольнага ўзросту адвольна карыстацца ў маўленні на кожнай з моў выразна-выяўленчымі сродкамі.

Сінтаксічную выразнасць маўлення ў дзяцей можна адпрацоўваць з дапамогай практыкаванняў, якія накіраваны на вызначэнне структурнага месца слова у сказе, змянення і вар’іравання парадку слоў у ім. Да іх адносяцца: «Памяняй месцамі словы ў сказе, каб ён гучаў прыгожа», «Прыдумай пытанне

ИТОРИИ БГПУ

да казачнага героя і ўяўляемы адказ», «Скажы той жа сказ, але словы ў іншым парадку», «Перакажы тэкст сваімі словам!» (на матэрыяле прыказак), «Складзі сказ супрацьлеглы па сэнсу таму, што прагучаў» (на матэрыяле прыказак), «Скажы сказ з клічнай, апавядальнай, пытальнай інтанацыяй».

Асноўнай формай работы па развіццю выразнага і вобразнага маўлення ў працэсе тэатральна-мастацкай дзейнасці з'яўляецца гульня-драматызацыя, якая разам з гульнявой матывацыяй вызначаецца і сваей камунікатыўнай накіраванасцю. Яе выкарыстанне мае значэнне таму, што менавіта ў такой гульні з рэпрадуктыўным маўленнем (запазычанне моўных узораў літаратурнага тэксту) спалучаецца прадуктыўнае. Акрамя таго, у час яе правядзення з найбольшай дакладнасцю праяўляецца патэнцыял успрымання дзецьмі мастацкага твора, які потым пры ўзнаўленні яны раскрываюць з дапамогай прыёмаў літаратурнай тэхнікі і сродкаў мастацкай выразнасці. Пры гэтым неабходна улічваць, што варыятыўнасць маўленчых паводзін дзяцей у гульні-драматызацыі залежыць і ад іх індывідуальных магчымасцей, тым больш што сацыяльныя ролі, якія выконваюць маленькія ўдзельнікі гульні, патрабуюць ад іх пэўнай выразнасці і вобразнасці маўлення.

Такім чынам, развіццё выразнасці і вобразнасці з'яўляецца важнай характарыстыкай звязнага маўлення дзіцяці.

Састаўной часткай вобразнасці з'яўляецца лексічны склад маўлення, таму што работа над сэнсам слова дапамагае дзіцяці выкарыстоўваць дакладнае па сэнсу і выразнае слова ці словазлучэнне ў адпаведнасці з кантэкстам выказвання. Граматычны аспект развіцця вобразнасці таксама вельмі важны, таму што, выкарыстоўваючы сінтаксічныя сродкі (парадак слоў, пабудова розных тыпаў сказаў), дзіця афармляе свае выказванне граматычна правільна і адначасова выразна.

Фанетычны склад маўлення ўключае гукавое афармленне тэксту (інтанацыйная выразнасць, правільна выбраны тэмп, дыкцыя), гэта вызначае эмацыянальнае ўздзеянне маўлення на слухачоў.

Увогуле развіццё выразнасці дзіцячага маўлення аказвае значны ўплыу на развіццё самастойнай слоўнай творчасці, якая можа праяўляцца ў дзіцяці ў самых разнастайных жанрах — складанні казак, апавяданняў, вершаў, забаўлянак, загадак.

Тэма 4.7 Методыка азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа і развіццё маўлення (лекцыя – 2 гадзіны ксрс)

Пытанні для вывучэння

1. Нацыянальна-культурнае асяроддзе ўстановы дашкольнай адукацыі.
2. Методыка азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з беларускім фальклорам, нацыянальнымі традыцыямі і культурай беларускага народа.
3. Змест, этапы і метады азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з народнай цацкай

4. Методыка правядзення беларускіх народных свят ва ўстанове дашкольнай адукацыі

1. Нацыянальна-культурнае асяроддзе ўстановы дашкольнай адукацыі

Адначасова з развіццём беларускага маўлення і навучання беларускай мове ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання вядзецца работа па азнаямленні дзяцей з духоўнымі і матэрыяльнымі каштоўнасцямі нацыянальнай культуры. Як зазначалася раней, развіццё беларускага маўлення ў дзяцей ажыццяўляецца па фармуле “мова праз культуру – культура праз мову”.

Азнаямленне дзяцей дашкольнага ўзросту з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа, што вядзе да павышэння ў іх этнічнай дасведчанасці, фарміравання этнічнай ідэнтычнасці, каштоўнасных адносін да беларускай этнічнай культуры, ўяўляе сабой *этнакультурную адукацыю*.

Ідэнтыфікацыя дзяцей дашкольнага ўзросту ў этнакультурным асяроддзі і адначасовае авалодванне імі агульначалавечымі каштоўнасцямі ажыццяўляецца пры ўмове авалодання імі роднай (беларускай) мовай, якая вызначае сабой адначасова і змест, і сродкі духоўнага развіцця дзіцяці, яго дачынення да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей.

Абавязковай умовай авалодання выхаванцамі родным маўленнем з’яўляецца стварэнне ў дзіцячым садзе беларускамоўнай атмасферы, якую дзеці маглі б успрымаць як натуральную. Ва ўстанове дашкольнай адукацыі павінна праводзіцца штодзённая праца па засваенні звычаяў, традыцый, культуры беларускага народа, фарміраванні уяўленняў аб тэрыторыі, гісторыі краіны, яе нацыянальных колерах, сімвалах, вядомых людзях і героях дзяржавы.

Сродкамі арганізацыі прасторы этнакультурнага выхавання выступаюць вусная народная творчасць, народныя гульні і цацкі, музычны фальклор, святы, мастацтва, этнакультурна ўзбагачанае развіццёвае асяроддзе, якія з’яўляюцца неабходнай умовай стымулявання ў дзіцяці самастойных творчых праяўленняў у розных відах дзіцячай дзейнасці (А.В. Кахноўская).

Нацыянальна-культурнае развіццёвае асяроддзе ўключае ў сябе «цэнтры» этнічнай культуры, міні-музеі «Беларуская хатка», этнічна стылізаваныя залы, творчыя майстэрні і інш.

Да развіццёвага асяроддзя адносіцца і цэнтр маўленчай актыўнасці, які разглядаўся ў раздзеле “Мастацка-маўленчая дзейнасць як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту”.

2. Методыка азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з беларускім фальклорам, нацыянальнымі традыцыямі і культурай беларускага народа

Азнаямленне дзяцей з фальклорам – гэта практычная рэалізацыя формулы “мова праз культуру – культура праз мову”. Методыка азнаямлення з фальклорнымі творамі дзяцей рознага ўзросту разглядвалася ў раздзеле “Мастацка-маўленчая дзейнасць як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту”.

Адзін з галоўных шляхоў эстэтычнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту – гэта далучэнне іх да народнай музыкі, што неабходна пачынаць з

РЭПОЗІТОРЫЙ БГПУ

самага ранняга ўзросту. *Музычны фальклор* нясе ў сабе высокадухоўную мараль, эстэтыку, напоўнены народнай мудрасцю, высновамі народнай педагогікі. Таму засваенне роднай беларускай мовы павінна праходзіць адначасова з навучаннем нацыянальнай музычнай мове. Гэта адбываецца ўжо праз калыханкі і забаўлянкі для немаўлят. Цэлы пласт песень адлюстроўваюць традыцыі беларускага народа, яго нацыянальна-псіхалагічныя рысы. Шмат забаў, гульняў – гэта жартлівая імітацыя працоўнага працэсу дарослых (“Мак”, “Мікіта””, “Пасеялі дзеўкі лён”). Праз тэксты песень, іх лексіку дзеці ўзбагачаюць свой слоўнік назвамі прылад працы, беларускімі назвамі месяцаў, дзён тыдня, нацыянальных беларускіх страў і г.д.

Найбольш поўна адбываецца далучэнне дзяцей дашкольнага ўзросту да беларускай нацыянальнай культуры праз каляндарна-абрадавы цыкл фальклорных святаў (“Каляды”, “Масленіца”, “Гуканне вясны”, Купалле і інш.), дзяржаўныя і сямейныя святы. Выкарыстанне дзіцячага музычнага фальклору ў адукацыйным працэсе станоўча ўплывае на гарманічнае рознабаковае развіццё дзяцей. Універсальнасць фальклорнага музычнага матэрыялу, яго шырокія развіццёвыя магчымасці дазваляюць фарміраваць ў дзяцей дашкольнага ўзросту асновы музычна-эстэтычнай нацыянальнай культуры.

Важнае месца ў працэсе этнакультурнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту займае *азнаямленне іх з прадметамі хатняга ўжытку, нацыянальным строем, народнымі цацкамі, нацыянальнымі стравамі* і інш. Менавіта падчас знаёмства з нацыянальным рукатворным светам адбываецца і азнаямленне з нацыянальна маркіраванымі лексічнымі адзінкамі, што адпавядае другому накірунку лінгвакультуралагічнага падыходу да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту, а іменно спасціжэнню каштоўнасцей і рэалій нацыянальнай культуры.

Знаёмства выхаванцаў *з прадметамі хатняга ўжытку, хатнім інтэр’ерам, посудам, адзеннем* можа пачынацца з малодшай групы. Тэматыка адукацыйных сітуацый у гэтай групе можа быць наступнай: “Матулін (ці бабулін) пакой”, “З бабулінага куфэрка”, “На гародзе ў бабулі” і да т.п.

З дзецьмі сярэдняга дашкольнага ўзросту можа правесці цікавыя гутаркі па тэмах “Што ў бабулінай ў печы”, “Выстава посуду” і да т.п.

У старшай групе тэматыка адукацыйных сітуацый ускладняецца. Іх можна знаёміць у даступнай форме з пабудовамі, рэчамі хатняга ўжытку, посудам, адзеннем, нацыянальнымі стравамі. Арыентыровачныя тэмы адукацыйных сітуацый: “Дзядулява хата”, “Буслінае гняздо”, “Пра што нам скрыня раскажа?”, “Ходзіць сон каля вакон, а дрымота каля плота” і да т.п.

Пры падрыхтоўцы да адукацыйных сітуацый трэба падабраць неабходныя рэчы, ілюстрацыі, макеты. Добра, калі ў мясцовасці ёсць краязнаўчы музей, яго неабходна наведаць з дзецьмі некалькі разоў.

Да кожнай тэмы неабходна скласці тэматычны слоўнік. Напрыклад, падчас азнаямлення з беларускім строем (тэмы “З бабулінага куфэрка”, “Выстава беларускага адзення”), выхаванцы паступова знаёмяцца з назвамі: *кашуля, сукенка, спадніца, андарак, вышыванка, хустка, камізэлька, шкарпэткі, панчохі, чаравікі, нагавіцы, футра, кажух, аблавуха, каптур,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

капялюш і інш. Пры гэтым, як заўсёды, засвоіць тую ці іншую лексіку, дапамагаюць фальклорныя і літаратурныя творы, у якіх узгадваюцца тыя ці іншыя прадметы адзення (“Сядзіць мядзьведзь на калодзе, *каптур* вышывае…”; “Мяне і так пазнаюць: дзедаву дачку ў рваным *андарачку*”; “-- Чаму *шкарпэтка* – не шкарпятка? -- пытаецца ў бацькоў дзіцятка”. А. Хадановіч; “Лепш не кратай, лепш не руш мой дзіравы *капялюш*”. Васіль Вітка; “Пашануй *адзенне* ў хаце, а яно цябе пашануе ў людзях” і многія інш.).

Такім чынам адбываецца знаёмства дзяцей дашкольнага ўзросту з традыцыяй і сучасным наваколлем, з беларускім фальклорам і дзіцячай літаратурай, узбагачэнне лексікі ва ўзаемасувязі з правільным вымаўленнем слоў, развіццём граматычнага ладу маўлення.

Кожны народ, акрамя дзяржаўнай сімволікі (герб, флаг і гімн), мае сваю *народную сімволіку*, якая склалася гістарычна. Гэта сімволіка, звязаная з раслінным і жывёльным светам: сінія вочы параўноўваюцца з валошкай (васільком), ільняныя валасы – з мяккім льном; вярба – важны ахоўны сродак, увасабленне жыццёвай сілы; бусел – птушка, забіць якую вялікі грэх, зубр – сімвал магутнасці, прыгажосці, самой краіны Беларусь. І г.д.

Да народных сімвалаў адносіцца *беларускі арнамент*, якім упрыгожвалі ручнікі, кашулі, фартухі і інш. Арнамент называюць своеасаблівай кнігай народнай мудрасці.

Акрамя чырвона-белых ручнікоў, беларускія жанчыны вышывалі і іншыя, упрыгожаныя раслінным арнаментам (васількамі), выяваімі жывёл.

З беларускім арнаментам дзеці знаёмяцца на занятках па выяўленчым мастацтве.

Знаёмства дзяцей дашкольнага ўзросту з беларускай культурай не можа абысці такі яе від, як выяўленчае мастацтва. Выхаванцаў старшай групы далучаюць да разгляду і абмеркавання рэпрадукцый *мастацкіх карцін беларускіх мастакоў.*

Вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі вызначаны прыкладны пералік карцін беларускіх мастакоў для азнаямлення з імі дзяцей старшага дашкольнага ўзросту. Гэта, напрыклад, творы А. Бархаткава «Сонечны люты», «Першая песенька»; В. Бялыніцкага-Бірулі «Блакітнай вясной»; А. Гугеля «Блакітная вада»; В. Жолтак «Званочкі лясныя», «Святочны нацюрморт; І. Хруцкага «Хлопчык у саламяным капялюшы», «Дзяўчынка з садавінай», “Кветкі і садавіна”; В. Цвірка “Ля млына”.

Пад час азнаямлення дзяцей з рэпрадукцыямі карцін беларускіх мастакоў вырашаюцца наступныя задачы: фарміраванне здольнасці мастацкага бачання карціны, цэласнага ўспрымання яе зместу; выхавання цікавасці да творчасці беларускіх мастакоў, гонару за нацыянальнае мастацтва; узбагачэнне слоўніка дзяцей вобразнымі выразамі.

3 . Змест, этапы і метады азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з народнай цацкай

Сярод прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва асаблівае месца для дзяцей займаюць народныя цацкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сучасныя даследаванні беларускіх навукоўцаў у галіне педагогікі і мастацтвазнаўства даюць падставу сцвярджаць, што *беларуская народная цацка* з'яўляецца асаблівым тыпам мастацкай творчасці, якая інтэгруе розныя віды народнага мастацтва, аб'ядноўвае матэрыяльныя і духоўныя здабыткі беларускай культуры, пацвярджае таленавітасць нашага народа.

Выкарыстанне народнай цацкі ў дзейнасці ўстаноў дашкольнай адукацыі на занятках па выяўленчым мастацтве і мастацкай працы, падчас азнаямлення з беларускай вусна-паэтычнай народнай творчасцю і мастацкай літаратурай спрыяе фарміраванню творча актыўнай асобы, якая будзе прадаўжальнікам народных традыцый.

Першая сустрэча дзіцяці з народнай цацкай (у сучасным выкананні) можа адбыцца ўжо на *першым годзе жыцця.* Дарослы выкарыстоўвае у зносінах з дзіцём народныя цацкі, якія яно можа бачыць, чуць, да якіх можа дакранацца, абмацваць, стукаць, трэсці, качаць, перакладваць, падкідваць, нюхаць, што спрыяе як агульнаму развіццю немаўляці, так і развіццю яго органаў успрымання, руху і маўлення. Размяшчаць цацкі і прадметы (бразготкі, малаточкі, званочкі, пішчалкі) неабходна ў межах дасягнутасці дзіцяці з мэтай фарміравання здольнасці да каардынацыі і адвольнасці рухаў.

Ужо у гэтым узросце трэба заахвочваць дзяцей да актыўнага маніпулявання з цацкамі падчас знаходжання ў манежы: цягнуць да сябе бразготку ці іншую цацку, складваць цацкі ў кошык, абуваць ці разуваць ляльку, апранаць ці распранаць яе, катаць мячы ці драўляныя шары на падлозе (індывідуальна, парамі ці ў крузе разам з выхавальнікам).

У другой малодшай групе (ад 3 да 4 гадоў) у змест азнаямлення выхаванцаў з народным мастацтвам уваходзіць фарміраванне ў іх уяўленняў пра вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: тканыя і вышытыя рэчы (абрусы, ручнікі), прадметы побыту (міскі, вазы, дэкаратыўныя талеркі), вырабы з саломкі, лёну, лазы.

У гэтым рэчышчы адбываецца знаёмства дзяцей з цацкамі як творамі народнага мастацтва: цацачным посудам, глінянымі і драўлянымі фігуркамі жывёл і птушак (баран, конік, козлік, качка, певень, мядзведзь), лялькай з анучы і саламянай лялькай.

Задача выхавальніка — выкарыстоўваць народныя цацкі для развіцця ў малых пазнавальных інтарэсаў, пачуцця прыгажосці, колеру, мастацкага густу і жадання актыўна дзейнічаць з імі.

Трэба паказваць цацкі пры чытанні твораў вуснай народнай гворчасці, выкарыстоўваць у гульнях, на занятках па выяўленчай дзейнасці. Дзеці чацвёртага года жыцця з цікавасцю разглядваюць народныя цацкі, бавяцца свістулькамі, іграюць на дудачцы. Такія заняткі добра суправаджаць чытаннем твораў беларускага фальклору, народнымі карагоднымі гульнямі з ужываннем гэтых цацак.

У сярэдняй групе (ад 4 да 5 гадоў) педагог можа ўключыць у пазнавальны працэс вялікую колькасць цацак, прыцягваючы дзяцей да выкарыстання іх у гульні. Так, для творчых гульняў дзяцей можна прымяняць цацачны посуд (гаршчочкі, збаны, міскі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дзеці гэтага ўзросту ахвотна малююць нескладаныя ўзоры, якімі ўпрыгожаны беларускія народныя цацкі. Таму на занятках па выяўленчым мастацтве пажадана вучыць іх маляваць па матывах народных цацак, а таксама распісваць глячкі, збаны, гаршкі і іншыя рэчы на плоскіх папяровых формах, якія імітуюць прадметы побыту.

Выхаванцы з задавальненнем вучацца ляпіць посуд па матывах беларускіх народных промыслаў, аздабляць яго арнаментам, а ў аплікацыі ўпрыгожваць сілуэты посуду дэкаратыўнымі беларускімі элементамі.

Знаёмства з народнай цацкай педагог плануе і ў нерэгламентаванай дзейнасці, калі звяргае ўвагу дзяцей на тую ці іншую цацку, якая ёсць у групе установы дашкольнай адукацыі, прапануе уважліва яе разглядзець, распавядае сам і заахвочвае дзяцей да выказвання ўласных уражанняў і меркаванняў пра цацку.

У старшай групе (ад 5 да 7 гадоў) працягваецца знаёмства дзяцей з вырабамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: тканымі і вышытымі рэчамі (абрусы, ручнікі, адзенне), керамікай (міскі, вазы, гарлачыкі, спарышы і іншы градыцыйны беларускі посуд, цацкі), вырабамі з саломкі, лёну, лазы (лялькі, звяры, птушкі, дэкаратыўныя талеркі, кошыкі і т.д.), вырабамі з дрэва, упрыгожанымі разьбой, размалёўкай, саломкай (шкатулкі, пано і інш.), беларускім народным касцюмам.

Важна пашыраць веды дзяцей аб розных відах цацак: драўляных, гліняных (паліваных і непаліваных), саламяных, анучных; знаёміць з майстрамі дзіцячай народнай цацкі.

Педагог расказвае пра цацачны посуд (драўляныя і гліняныя гаршчочкі-спарышы, міскі, вядро, дзежачку і інш.), стол, лаву, ложак, куфар, заахвочваючы малых да выкарыстання іх у гульнях. Старэйшы дашкольны ўзрост спрыяльны для азнаямлення дзяцей з механічнымі драўлянымі цацкамі (напрыклад, цацкі «Пілавальшчыкі», «Кавалі» і да т.п.). Дзеці не толькі любяць гуляць з імі, але і цікавяцца спосабам прывядзення фігурак у рух.

Як і раней, важна выкарыстоўваць народныя цацкі для творчых гульняў.

Педагог ужывае у рабоце з выхаванцамі дзіцячыя музычныя цацкі-інструменты (цымбалы, барабан, гармонік) падчас забаў і святочных ранішнікаў, прывівае дапытлівасць і беражлівыя адносіны да цацак.

У гэтай групе працягваецца знаёмства дзяцей са спосабамі вырабу некаторых народных цацак, у прыватнасці лялек, паглыбляюцца навыкі працы з паперай і кардонам, навыкі вырабу разнастайных прадметаў, цацак з рухомымі часткамі (вазок, млынок) з далейшым іх выкарыстаннем у гульнявой дзейнасці. Неабходна выхоўваць у дзяцей жаданне сумесна з дарослымі вырабляць самыя простыя цацкі.

Выхаванцаў старшай групы можна навучыць складаць апавяданне або загадку пра народную цацку.

У дзіцячым садзе мэтазгодна арганізаваць цэнтр, дзе захоўваюцца калекцыі беларускіх народных цацак, праводзяцца выставы. У гэтым цэнтры зацікаўленыя выхаванцы могуць атрымаць навыкі вырабу народнай цацкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Можна вылучыць тры арганічна звязаныя паміж сабой этапы працэсу азнаямлення дзяцей з народнай (нацыянальнай) цацкай.

Першы (падрыхтоўчы) этап прадугледжвае азнаямленне дзяцей малодшай і сярэдняй груп з творамі беларускага народнага мастацтва, звычаямі беларускага народа, звязанымі з народнай цацкай, а таксама стымуляванне жадання займацца мастацкай творчасцю з перайманнем лепшых традыцый народных майстроў Беларусі.

Асноўнымі формамі работы на дадзеным этапе з'яуляюцца інтэграваныя заняткі, якія ўключаюць разглядванне цацкі і расказванне фальклорнага твора; заняткі па выяўленчай дзейнасці выхаванцаў (тэматычнае маляванне, стварэнне ілюстрацый да казак, замалёўкі старадаўніх цацак).

Для вырашэння пастаўленых задач у нерэгламентаванай мастацкай дзейнасці мэтазгодна праводзіць гутаркі пра стварэнне народнай цацкі, яе сімвалічны сэнс, ладзіць дыдактычныя гульні: «Спытай - даведаешся», «Закончы апавяданне пра цацку», «Загадай - адгадай».

Другі (практычна-дзейнасны) этап стварае ўмовы для мэтанакіраванага фарміравання творчай актыўнасці выхаванцаў сярэдняй і часткова старшай групы, авалодання традыцыйнымі прыёмамі вырабу беларускіх народных цацак з улікам іх этнічных асаблівасцей. З гэтай мэтай пранануюцца заняткі па выяўленчай дзейнасці адносна такіх тэм, як «Птушкі-прыгажуні», «Упрыгожваем калыскі», «Вучымся у майстроў-цацачнікаў», «Народныя лялькі з тканіны», «Цацкі-птушкі з цеста», «Прыгожая вопратка ў лялькі» і шш.

На дадзеным этапе ажыццяўляецца ўзаемасувязь метадаў і прыёмаў рэпрадуктыўнага і пошукавага характару. Асноўнымі метадамі работы выступаюць: мастацкія апавяданні пра жыццё народных майстроў і іх творчыя дасягненні; змястоўныя зносіны з майстрамі народнай цацкі, наведванне іх майстэрняў; навучанне традыцыйным прыёмам вырабу беларускіх народных цацак, азнаямленне з асноўнымі элементамі роспісу і да т.п.

Вельмі плённым з'яўляецца непасрэдны ўдзел дзяцей у стварэнні некаторых самаробных цацак з гліны, саломы і іншых прыродных матэрыялаў. Работа з гэтымі матэрыяламі развівае працоўныя навыкі і творчыя здольнасці дзяцей, абуджае фантазію і ініцыятыву, садзейнічае развіццю лагічнага і вобразнага мыслення, эстэтычных адносін да зместу сваёй дзейнасці, праяўленню цікавасці да народнай культуры (Я.М. Сахута).

Трэці (творчы) этап нацэлены на непасрэднае праяўленне творчай актыўнасці дзяцей старшай групы на аснове вывучэння мастацтва беларускай народнай цацкі. Ён заахвочвае да выбару адпаведных варыянтаў у ходзе творчага працэсу, патрабуе забеспячэння максімальнай самастойнасці дзяцей ва ўвасабленні мастацкай задумы.

Трэці этап можа складацца з цыкла заняткаў, накіраваных на стварэнне самастойных мастацкіх прац, і правядзення Свята беларускай народнай цацкі. Дзецям прапануецца самастойна заняцца вырабам цацак па матывах беларускіх народных цацак; скласці казкі, апавяданні пра асобныя мастацкія вобразы беларускіх народных цацак; пагуляць у гульню-інсцэніроўку з выкарыстаннем самастойна створаных цацак па матывах беларускіх народных казак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пашырыць уяўленні дзяцей пра вытокі, асаблівасці, творчыя дасягненні майстроў народнай цацкі дае магчымасць экскурсія ў музей або на выставу народнай цацкі - «Адкуль цацка да нас прыйшла», сустрэчы з народнымі майстрамі - «У гасцях у майстроў-цацачнікаў», прагляды адпаведных альбомаў, рэпрадукцый.

Такім чынам, па меркаванні даследчыкаў, эфектыўнае выкарыстанне народнай цацкі як сродку фарміравання ў выхаванцаў элементаў нацыянальнай культуры магчыма пры выкананні наступных умоў:

• папаўненне развіццёвага асяроддзя групы рознымі відамі народнай цацкі;

• практычная дзейнасць дзяцей па засваенні ведаў і навыкаў вырабу і ўпрыгожвання народнай цацкі;

• сумесная праца педагога з бацькамі індывідуальныя і грпавыя кансультацыі, правядзенне майстар-класу па вырабе і аздабленні народнай цацкі.

4. Методыка правядзення беларускіх народных свят ва ўстанове дашкольнай адукацыі

Асаблівую ролю ў далучэнні дзіцяці да народнай культуры маюць народныя святы як сродак адлюстравання нацыянальнага характару. Яны разглядваюцца ў якасці асноўнага сродку, комплекснай формы арганізацыі выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту на аснове духоўна-маральных каштоўнасцей беларусаў.

Народныя святы – гэта вялікі і цікавы пласт народнай культуры. Яны ствараюць гадавое кола, звязаны з працай, побытам, адпачынкам селяніна на працягу года. Народныя святы ва ўстанове дашкольнай адукацыі дапамагаюць дзецям пазнаваць традыцыі, культуру свайго народа.

Комплексны характар кожнага народнага свята пацвярджаецца наяўнасцю ў ім базавых складнікаў этнічнай культуры: песня, гульня, казка, загадка, мастацкая дзейнасць, праз якую дзеці дашкольнага ўзросту далучаюцца да культуратворчасці.

Народныя святы можна праводзіць як фальклорныя карнавалы (“Каляды”, “Купалле”), вольны адпачынак (“Масленка”) , фальклорны ранішнік (“Саракі”), канцэртную самадзейнасць (“Восеньскі кірмаш”), тэатралізаванае прадстаўленне (“Гуканне вясны”).

Наладжванню народных святаў папярэднічае крапатлівая праца як выхавальніка дашкольнай адукацыі, так і музычнага кіраўніка: чытанне мастацкай літаратуры па тэме, гутаркі, экскурсіі, разгляд фотаздымкаў, распрацоўка сцэнарыя і афармлення залы, падрыхтоўка касцюмаў – усе гэта максімальна праўдзіва даносіць сэнс народных традыцый.

Тэма 4.8. Дыягностыка работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя (матэрыял для самастойнага вывучэння)

Пытанні для вывучэння

1. Сутнасць дыягностыкі маўленчага развіцця дзяцей, яе задачы і значэнне.

2. Методыка абследавання розных бакоў беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя.

3. Улік вынікаў дыягностыкі ў адукацыйным працэсе ўстановы дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання.

1. Сутнасць дыягностыкі маўленчага развіцця дзяцей, яе задачы і значэнне

Дыягностыка розных аспектаў маўленчай дзейнасці неабходна для правільнай і дакладнай арганізацыі працы па развіцці маўлення ва ўстанове дашкольнай адукацыі, яе планавання і ў залежнасці ад трываласці авалодання дзецьмі матэрыялам – карэкціроўкі зместу заняткаў у групе.

Даследванні ў галіне дыягностыкі маўленчага развіцця дзяцей дашкольнага ўзроўню вядуцца па двух напрамках:

1. Дыягностыка маўленчага развіцця пры вывучэнні інтэлектуальнай дзейнасці дзіцяці як аднаго з паказчыкаў яго разумовага развіцця.

2. Даследванне ўласна маўлення ва ўсіх аспектах (фанетычным, лексічным, граматычным, семантычным).

У навукова-метадычнай літаратуры выдзяляюцца наступныя задачы дыягностыкі маўленчага развіцця:

- высвятленне стану маўленчага развіцця;
- вызначэнне дынамікі маўленчага развіцця;
- вызначэнне перспектыў развіцця таго ці іншага аспекту маўлення;
- вызначэнне адпаведнасці (неадпаведнасці) маўленчага развіцця норме.

Пры гэтым *пры праверцы слоўніка высвятляюць*:

колькасны і якасны склад слоўніка;

разуменне значэння слова, ступень яго абагульненасці;

уменне карыстацца выразнымі сродкамі мовы і ўжываць іх у звязным маўленні.

Пры абследаванні граматычнага ладу маўлення выяўляюць:

разуменне граматычных канструкцый;

уменне змяняць словы;

уменні складаць сказы.

Пры абследаванні гукавой (фанетычнай) правільнасці маўлення выяўляюць:

фанематычнае ўспрыманне;

гукавымаўленне;

інтанацыйную выразнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пры абследаванні звязнага маўлення выяўляюць:

валоданне навыкамі дыялагічнага маўлення;

асваенне маналагічнага маўлення (складанне расказа па карціне, пра цацку, па памяці, на зададзеную тэму, пераказ).

Дыягнаставанне праводзіцца праз назіранне, дыягнастычныя карты, дыягнастычныя заняткі, тэсты, апытванні, аналіз прадуктаў дзіцячай дзейнасці (дзіцячыя сачыненні).

Асноўнымі метадамі дыягностыкі маўленчага развіцця з'яўляюцца гульнявыя заданні ў слоўнай форме і з выкарыстаннем нагляднага матэрыялу.

Узровень развіцця звязнага маўлення ўстанаўліваецца на аснове пераказаў прапанаваных тэкстаў і самастойнага расказвання.

Важнае месца ў дыягностыцы маўленчага развіцця займае найпрасцейшы метад даследавання – *назіранне*. На аснове назіранняў за дзіцем у розных відах дзейнасці выхавальнік можа выявіць сфарміраванасць многіх маўленчых уменняў.

Сучаснымі прынцыпамі арганізацыі правядзення дыягностыкі развіцця маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту выступаюць: комплекснасць і сістэмнасць, што азначае: вывучэнне розных аспектаў маўлення ў адзінстве і ўзаемасувязях; разглядванне маўлення ў адзінстве з пазнаннем і зносінамі дзіцяці; адзінства задач дыягностыкі і крытэрыяў аналізу вынікаў з пазіцый маўленчых новаўтварэнняў для данага перыяду развіцця маўлення. (так, для сярэдняга дашкольнага ўзросту маўленчым новаўтварэннем выступае авалоданне вымаўленнем шыпячых гукаў, таму адной з задач дыягностыкі павінна стаць праверка гэтага ўмення); матываванасць дыягностыкі для дзіцяці, што дазваляе атрымаць больш высокі вынік; кампактнасць дыягностыкі.

Вынікі дыягнастычнага абследавання дапамогуць выхавальнікам пры складанні індывідуальных характарыстык маўленчага развіцця дзяцей пры адборы метадаў, прыёмаў і тэхналогій маўленчай работы, а таксама пры планаванні адукацыйнай і карэкцыйнай работы з дзецьмі.

2. Методыка абследавання розных бакоў беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя

Пры абследаванні асобных маўленчых уменняў дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове (вымаўленчых, граматычных, лексічных), акрамя назіранняў, можна карыстацца методыкамі, якія распрацаваны для абследавання аналагічных уменняў на рускай мове. Да іх адносяцца методыка, распрацаваная А.С. Ушаковай, Л.М. Струнінай і іх супрацоўнікамі. Напрыклад, з мэтай вызначэння лексічнага запасу дзяцей уводзіцца гульнявая сітуацыя тыпу: "Мішутка сабраўся ў госці, але ў яго няма люстэрка, ён вельмі перажывае, ці добра ён выглядае. Давай яму раскажам".

З мэтай комплекснага абследавання маўленчага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове (г.зн. узроўня валодання лексікай, правільным гукавымаўленнем, валодання граматычнымі навыкамі і камунікатыўнымі ўменнямі) неабходна загадзя вызначыць узроўні такога развіцця для кожнай ўзроставай групы. Падмуркам для вызначэння ўзроўняў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

служыць вучэбная праграма дашкольнай адукацыі, дзе прадстаўлены плануемыя вынікі засваення выхаванцамі пэўнага ўзросту праграмных патрабаванняў па кожнай адукацыйнай вобласці.

Н.С. Старжынскай з мэтай дыягнасціравання развіцця беларускага маўлення ў дзяцей старшага дашкольнага ўзросту распрацавана яго *шкаліраванне*. Умоўна выдзелены чатыры узроўні развіцця беларускага маўлення: высокі, дастатковы, сярэдні і нізкі.

1. *Высокі узровень* (адпавядае высокаму ўзроўню развіцця роднага маўлення на першай мове): дзіця можа падтрымаць размову на беларускай мове на знаёмую тэму, самостойна пераказаць добра знаёмы мастацкі твор, без дапамогі дарослага скласці расказ па карціне, расказаць аб падзеях з уласнага жыцця; лексічны запас у яго даволі высокі, рэдка сустракаюцца недакладнасці ва ўжыванні лексічных сродкаў, амаль не назіраецца лексічная інтэрференцыя; граматычныя памылкі ў словазмяненні дапускае толькі ў асобных складаных выпадках, можа утвараць назвы дзіцянят жывёл посуду, прафесій;выразна вымаўляе і дыферэнцуе на слых усе спецыфічныя беларускія гукі.

2. *Дастатковы* (адпавядае сярэдняму – у межах праграмы – узроўню развіцця роднага маўлення на першай мове). Адрозніваецца ад высокага тым, што дзіця часам адчувае цяжкасці пры падборы патрэбнага беларускага слова, заменяючы яго рускім, час аж часу дапускае граматычныя памылкі ў словазмяненні і словаўтварэнні, асабліва ў складаных выпадках, дапускае памылкі пры вымаўленні найбольш складаных для рускамоўных дзяцей гукаў [дз’] і [ц’].

3. *Сярэдні ўзровень:* дзіця можа ўдзельнічаць в зносінах на беларускай мове, самастойна пераказаць невялікую па аб'ёме казку, скласці з дапамогай дарослага кароткі расказ па карціне; лексічны запас некалькі ніжэй нормы, дзіця часта ўжывае ў маўленні рускія словы; граматычныя памылкі ў словазмяненні дапускае прыкладна ў палове выпадкаў, новыя словы ўтварае толькі з дапамогай выхавальніка; дапускае памылкі пры вымаўленні 3-4 беларускіх гукаў.

4. *Нізкі ўзровень*: дзіця з цяжкасцю ўдзельнічае ў размове на беларускай мове, пераказвае з дапамогай выхавальніка, лексічны запас нізкі, ужывае рускія і беларускія словы ўпярэмежку, дапускае граматычныя памылкі ў словазмяненні больш, чым у палове выпадкаў, не валодае правільным вымаўленнем 5-6 беларускіх гукаў.

Комплекснае абследаванне маўленчага развіцця дзяцей старшага дашкольнана ўзросту можна ажыццяўляць рознымі шляхамі. Напрыклад, у працэсе сумеснага з дарослым разглядвання ілюстраванай дзіцячай кніжкі на беларускай мове. (Беларуская мова выдання ў дадзеным выпадку хутчэй прызначана для дараслага, паколькі стварае ў яго псіхалагічную ўстаноўку на белорускую мову зносін. Аднак тое ж датычыцца і дзіцяці, якое ўмее чытаць.) Гутарка не павінна перавышаць 10 хвілін. Заданні трэба даваць у цікавай, інтанацыйна выразнай форме.

Пры сумесным разглядванні кніжкі ствараюцца ўмовы для дыялагічных выказванняў дзіцяці, разгортвання маналогу: пераказу ўрыўкаў з раней

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прачытанага твора, складання кароткага расказа па новым для дзіцяці малюнку. Гэта дазваляе высветліць стан звязнага прадуктыўнага маўлення дзяцей. Адначасова выхавальнік атрымлівае матэрыял для аналізу сінтаксічнага ладу беларускага маўлення дзіцяці.

У гутарку ўключаюцца пытанні, якія дазваляюць абследаваць стан слоўніка па пэўных тэмах. Да кожнай тэмы складаецца арыентыровачны слоўнік для абследавання. Выяўляюцца ўменні падбіраць сітуацыйные сінонімы, антонімы, параўнанні, ужываць абагульненыя словы (мэбля, адзенне, посуд, агародніна, садавіна).

Узровень засваення словазмянення выяўляецца на прыкладзе ўжывання назоўнікаў у давальным склоне (*Наташы, Аленцы, Мішу*), назоўнікаў мужчынскага роду першага скланення ў творным склоне (*з татам, Колям, сабакам*), назоўнікаў з асновай на *г, к, х* у месным склоне (*нага – на назе, гарох – у гаросе*).

Правяраецца ўменне дзяцей утвараць назвы дзіцянят жывёл (*у кошкі кацяня, у лісы лісяня, у арла – арляня)*, прадметаў посуду (*для хлеба хлебніца, для цукерак цукерніца)*, прафесій (*будуе будаўнік, прадае прадавец, працуе на трактары трактарыст)*.

Адзначаецца гукавымаўленне спецыфічна беларускіх гукаў.

Акрамя таго, правяраецца разуменне і ўжыванне некаторых прасторавых прыназоўнікаў: “каля”, “у”, “да”(*каля плота, у госці, да сяброўкі*).

За правільные адказы выхавальнік хваліць дзіця, падтрымлівае яго. У выпадку цяжкасці даросламу не варта паказваць дзіцяці, што той не справіўся з заданнем, а проста самому даць адказ (напрыклад, дарослы сам говорыць: “Дзіцяня лісы – лісяня”), але ў сваіх запісах адзначыць невыкананне.

На аснове вышэй пералічаных паказчыкаў вызначаецца агульны ўзровень беларускамоўнага развіцця выхаванцаў.

3. Улік вынікаў дыягностыкі ў адукацыйным працэсе ўстановы дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання

Найбольш цяжкімі ў дыягностыцы з’яўляюцца аналіз, інтэрпрэтацыя і ацэнка вынікаў. Неабходна ўлічваць асаблівасці асобы дзіцяці і характарныя формы зносін, якімі той валодае. (Як вядома з даследаванняў М.І. Лісінай, індывідуальныя адрозненні ў маўленчым развіцці дзяцей залежаць ад тыпа камунікатыўнай дзейнасці і настолькі моцна дэтэрмінуюцца ёю, што перакрываюць узроставыя асаблівасці.)

Таму пры правядзенні дыягностыкі важна правільна афарміць і затым інтэрпрэціраваць яе вынікі.

Вынікі, якія атрыманы ў ходзе абследавання, фіксуюцца. Спосабы фіксацыі могуць быць рознымі: дзённікавыя запісы, складанне пратаколаў назіранняў, гутарак, запаўленне табліц, запісы на дыктафон і інш. Выбар спосаба фіксацыі атрыманых вынікаў залежыць ад складанасці маўленчага матэрыялу, формы арганізацыі работы з дзецьмі, ступені сфарміраванасці уменняў выхавальніка хутка і дакладна выдзяляць факты маўлення, якія даследуюцца, і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ацэнка вынікаў дыягнастычнага абследавання можа праводзіцца рознымі спосабамі:

• аналіз праводзіцца ў адпаведнасці з крытэрыямі “дасягнута – не дасягнута”;

• дыферэнцыраванне ўзроўняў атрыманых вынікаў у адпаведнасці з вызначанымі крытэрыямі (высокі, дастатковы, сярэдні, нізкі ўзровень).

На аснове аналіза атрыманых фактаў складаецца характарыстыка маўлення дзяцей і намячаецца праграма далейшай педагагічнай работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання.

Тэма 4.9 Планаванне адукацыйнай дзейнасці па развіцці беларускага маўлення і культуры маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту (лекцыя – 2 гадзіны ксрс)

Пытанні для вывучэння

1. Сутнасць планавання як функцыі кіравання
2. Віды планавання.

1. Сутнасць планавання як функцыі кіравання

Планаванне работы ўстановы дашкольнай адукацыі па развіцці маўлення і навучанні роднай мове прадстаўляе сабой вызначаную скаардынаваную сістэму мерапрыемстваў, якая прадугледжвае парадак, паслядоўнасць і тэрміны выканання ўсіх накірункаў работы. Яно забяспечвае эфектыўную дзейнасць установы дашкольнай адукацыі па маўленчым развіцці дзіцяці і навучанні яго роднай мове на працягу пэўнага часу.

У сваіх даследаваннях вучоныя (В. І. Зверава, Л. В. Пазняк) вызначаюць тры ўзроўні планавання: *стратэгічны, тактычны, аператыўны.*

Першы ўзровень – стратэгічнае, ці доўгатэрміновае планаванне. Стратэгія ўяўляе сабой комплексны план, прызваны забяспечыць выкананне асноўных мэт ўстановы дашкольнай адукацыі. Часцей гэта праграма развіцця ўстановы дашкольнай адукацыі, якая вызначае яе дзейнасць на доўгі тэрмін. Што да маўленчага развіцця дзяцей, то стратэгічнае планаванне можа выглядаць як адукацыйная праграма дзіцячага сада на 3-5 гадоў па развіцці маўлення выхаванцаў і навучанні іх роднай мове.

Другі ўзровень -- тактычнае, ці кароткатэрміновае планаванне. Яно забяспечвае распрацоўку канкрэтных планаў для рэалізацыі стратэгічнай праграмы ўстановы дашкольнай адукацыі.

Трэці ўзровень – аператыўнае планаванне. Яно ўяўляе сабой распрацоўку канкрэтных дзеянняў па маўленчым развіцці дзіцяці з улікам усіх неабходных умоў. Аператыўны ўзровень планавання ўключае: план рэалізацыі адукацыйнай дзейнасці з дзецьмі па іх маўленчым развіцці; планы спецыялістаў, у прыватнасці планы работы лагапедаў. Усе дакументы распрацоўваюцца тэрмінам на месяц, тыдзень, дзень.

На кожным з трох вылучаемых ўзроўняў планаванне павінна быць рэалістычным і гнуткім, дакладна вызначаць прамежкавыя чакаемыя вынікі, якія неабходны для забеспячэння магчымасці карэкціроўкі яго мэтаў, задач і дзеянняў.

2. Віды планавання.

Гадавы план установы дашкольнай адукацыі складаецца з двух частак. *Першая частка* – аналіз вынікаў і задач на новы навучальны год год. У гэтай частцы плана аналізуюцца пытанні наконт ступені выканання пастаўленых задач, дасягненні і недахопы ў рабоце установы дашкольнай адукацыі, у тым ліку па лінгвістычным і маўленчым развіцці дзіцяці. *Другая частка* плана установы дашкольнай адукацыі ўключае яе асноўныя накірункі і дзеянні на год. План складаецца на ўвесь навучальны год і падзяляецца на месяцы і тыдні. Ён ўключае ад адной да трох гадавых задач, якія тычацца розных відаў дзейнасці. Адной з задач гадавога плана можа выступаць маўленчае развіццё выхаванцаў і навучанне іх роднай мове. У плане адлюстроўваюцца ўсе яго раздзелы работы: арганізацыйная, педагагічная, метадычная (*педагагічныя нарады, групавыя сходы, кансультацыі, семінары* і г.д.), работа з бацькамі і грамадскасцю, кантроль за адукацыйнай работай, адміністратыўна-гаспадарчая дзейнасць.

Пры гэтым пытанні маўленчага развіцця дзяцей уваходзяць у змест работы па кожным з раздзелаў гадавога плана з улікам спецыфікі гэтых раздзелаў і патрабуемага зместу.

Як правіла, змест вызначаецца папярэдняй дыягностыкай і ўлічвае патрабаванні дзяцей, бацькоў, выхавальнікаў. Часцей плануюцца пытанні, якія выклікаюць у выхавальнікаў найбольшыя цяжкасці ў рабоце; пытанні, якія на сёняшні дзень лічацца першаснымі і заслугоўваюць асаблівай увагі ці пытанні зусім новыя, што да гэтага часу не разглядаліся.

У гадавым плане вызначаюцца канкрэтныя шляхі паляпшэння работы:

- змест семінараў і кансультацый з мэтай павышэння кваліфікацыі выхавальнікаў, напрыклад, семінар- практыкум для выхавальнікаў “Навучанне дашкольнікаў спосабам словаўварэння”, кансультацыі: “Развіццё маўлення ў блізнят”, “ Гуляем з пальчыкамі і развіваем маўленне дзяцей”;
- змест педагагічнай нарады, на якой могуць заслухоўвацца матэрыялы з вопыту работы па развіцці маўлення дзяцей, напрыклад, тэма педагагічнай нарады “Фарміраванне навыкаў зносін у дашкольным узросце”. На нарадзе могуць абмяркоўвацца наступныя пытанні:

1. “Этапы развіцця зносін дзіцяці з дарослымі”(абмеркаванне тэарэтычнага дакладу);
2. “Асаблівасці зносін выхавальнікаў з аднагодкамі” (абмен меркаваннямі паміж выхавальнікамі);
3. “Прычыны непапулярнасці сярод аднагодкаў і накірункі карэкцыйнай работы” (паведамленне псіхолага);
4. “Асобасныя цяжкасці, якія уплываюць на характар зносін у дашкольнікаў” (паведамленні выхавальнікаў);

5. “Выкарыстанне дыягнастычных методык, якія накіраваны на вывучэнне асаблівасцей асобы і зносін дзяцей “ (вынікі тэматычнага кантролю).

- адкрытыя мерапрыемствы для выхавальнікаў і бацькоў, напрыклад, панарамны прагляд заняткаў па развіцці маўлення і культуры маўленчых зносін; азнаямлення з мастацкай літаратурай, навучанні грамаце;
- арганізацыя кантроля за засваеннем праграмы ў розных узроставых групах, напрыклад, тэматычны кантроль па фарміраванні беларускамоўных зносін ў дзяцей дашкольнага ўзросту;
- змест і формы сумеснай работы з бацькамі па развіцці маўлення і навучанні выхаванцаў беларускай мове, напрыклад, кансультацыя “ Беларуская народная казка як метад развіцця дыялагічнага маўлення дзяцей”,
- клуб па вывучэнні беларускай мовы “Роднае слова”,
- семінар-практыкум “Навучанне дзяцей навыкам беларускамоўных зносін” і г.д.

Найбольш зручнай формай планавання з’яўляюцца гадавыя планы, выкананыя ў выглядзе цыклаграм або графічна, так як яны з найбольшай нагляднасцю дэманструюць паслядоўнасць усіх запланаваных мерапрыемстваў па тэрмінам і выканаўцам.

Акрамя гадавога плана, існуе перспектыўны план, які не з’яўляецца абавязковым. Яго выхавальнік можа выкарыстоўваць для аптымізацыі зместу і спосабаў наладжвання адукацыйнага працэсу. Перспектыўны план лінгвістычнага і маўленчага развіцця выхаванцаў можа быць складзены адносна тактычнага або аператыўнага ўзроўняў. Адсюль і тэрміны на якія ён можа быць складзены: месяц, квартал або год. Перспектыўны план складаецца з мэтаю ўпарадкавання работы па развіцці маўлення і навучанні выхаванцаў роднай мове або раўнамернага падзелу матэрыялу на працягу пэўнага часу.

Так, перспектыўны план адносна тактычнага ўзроўню можа ўяўляць сабой:

- *пералік канкрэтных мерапрыемстваў для рэалізацыі раздзела праграмы.* Напрыклад, раздзел “Зносіны” (пералік камунікатыўных сітуацый па развіцці маўлення і навучанні роднай мове на год; дыдактычных гульняў па развіцці дыялагічнага маўлення па-за заняткамі на год);
- *змест маўленчай работы*. Напрыклад, на пяпярэдні месяц ці квартал можна намеціць пералік новых слоў для азнаямлення дзяцей з сезоннымі з’явамі; на год пазначыць паслядоўнасць работы над цяжкімі словаформамі або гукамі;
- *пералік задач па развіцці маўлення на квартал і змест для рэалізацыі гэтых маўленчых задач у такіх раздзелах праграмы, як “Дзіця і прырода”, “Дзіця і грамадства”, і інш*
- *пералік прыкладных тэм для вывучэння для пэўнай узроставай групы на год .*

Асноўным для выхавальніка дашкольнай адукацыі з’яўляецца *план рэалізацыі адукацыйнага працэсу ў групах ранняга і дашкольнага ўзросту.*

Спецыяльна арганізаваная дзейнасць адносна адукацыйнай галіны “Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін”, рэгламентаваная тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі (гульня, заняткі), плануецца на аснове раскладу гульняў, заняткаў на кожны дзень тыдня ў адпаведнасці з вучэбным планам установы дашкольнай адукацыі. Вызначаюцца тэма і мэта дзейнасці на працягу тыдня.

У змест планавання ўключаюцца: від заняткаў, тэма заняткаў, праграмныя задачы, крыніцы планавання. У адпаведнасці з задачамі развіцця маўлення выхавальнік самастойна выбірае змест і метады правядзення заняткаў, забяспечваючы іх планамернасць і разнастайнасць. Планаванне метадаў і прыёмаў работы з дзецьмі залежыць ад віду работы і мэты заняткаў *(сфарміраваць новыя уменні, замацаваць уменні, актывізаваць уяўленні)*.

У адпаведнасці з прынцыпам сістэматычнасці маўленчыя заняткі плануюцца на адзіным тэматычным змесце з комплексным вырашэннем некалькіх праграмных маўленчых задач і выкарыстаннем розных метадаў навучання.

Адзіны змест заняткаў забяспечваецца тым, што ў іх аснове ляжыць адзін з відаў маналагічнага маўлення. На аднатэмных занятках заданні па звязным маўленні арганічна спалучаюцца з фанетычнымі, лексічнымі і граматычнымі практыкаваннямі, пераход ад адной часткі заняткаў да другой адбываецца натуральна, жыва і эмацыянальна.

Адукацыйныя задачы ў праграмным змесце заняткаў фармулююцца як канкрэтныя патрабаванні да мовы дзяцей.

Плануючы ход заняткаў выхавальнік вызначае метадычныя прыёмы, якія ў большай ступені адпавядаюць узросту дзяцей, а таксама новы і знаёмы дзецям матэрыял. Дарослы ўлічвае цяжкасць выканання пэўнай задачы, чарговасць яе ўвядзення.

Састаўляючы план, неабходна улічваць, што заняткі па развіцці маўлення плануюцца першымі, як найбольш цяжкія. У пачатку года, як правіла, плануецца найбольш лёгкі матэрыял. Пры планаванні вельмі важна прадугледзець паўторнасць матэрыялу. Паўтарэнне аднаго і таго ж самага зместу можна арганізаваць па-рознаму. Найбольш каштоўны такі шлях арганізацыі заняткаў на паўтарэнне, калі пройдзены матэрыял не пераносіцца ў нязменным выглядзе з адных заняткаў на другія, а разумна ўскладняецца, дзякуючы ўвядзенню новых дадатковых задач.

Пры планаванні заняткі па развіцці маўлення ва ўстанове дашкольнай адукацыі можна размеркаваць наступным чынам: першы тыдзень – пераказ казкі або кароткага апавядання; другі тыдзень – расказванне па карціне; трэці тыдзень – апісаннне цацкі або прадмета, складанне апавядання пра цацку (цацкі); чацвёрты тыдзень – у залежнасці ад узросту дзяцей чаргуюцца складанне апавяданняў з калектыўнага (асабістага) вопыту, творчага апавядання.

На занятках вырашаюцца задачы, якія не могуць быць задавальняюча выкананы ў штодзённых зносінах. Іх вырашэнне падпарадкоўваецца адзінай мэце – развіццю звязнага маўлення. Комплекснаць – асноўны прынцып

планавання работы з дзецьмі па развіцці маўлення і маўленчых зносін. Прадугледжаныя для выканання маўленчыя задачы рэалізуюцца не ізалявана адна ад другой, а ў комплексе, у сувязі паміж сабой і ў сувязі з іншымі развіццёвымі і выхаваўчымі задачамі.

Для вырашэння маўленчых праграмных задач у адпаведнасці з агульнай тэмай планавання выхаваўча-адукацыйнай работы выхавальнік, акрамя спецыяльна арганізаванага навучання, плануе работу па развіцці маўлення і навучанні роднай мове у іншых відах сумеснай дзейнасці: *зносіны, пазнавальна-практычная дзейнасць, гульнявая дзейнасць, мастацкая і элементарная працоўная дзейнасць,* здзяйсняе ўзаемасувязь заняткаў па роднай мове з развіццём маўлення па-за заняткамі.

Планаванне пытанняў лінгвістычнага і маўленчага развіцця выхаванцаў прадугледжвае арганізацыю як сістэматычнай работы з усімі выхаванцамі, так і забеспячэнне індывідуальна-асобаснага падыходу да маўленчага развіцця кожнага з іх.

Планаванне работы па развіцці маўлення і навучання роднай мове дзяцей ажыццяўляецца на аснове ўліку ўзроставых і індывідуальных асаблівасцей дзіцяці і патрабуе ад выхавальнікаў дашкольнай адукацыі добрых ведаў зместу праграмы развіцця маўлення і навучання роднай мове выхаванцаў, пабудовы работы ў адпаведнасці з гэтым зместам. Разам з тым пры планаванні маўленчай дзейнасці дзяцей, выхавальнік улічвае ўзровень развіцця кожнага дзіцяці, прадугледжвае канкрэтную работу з кожным з іх. Пры гэтым планаванне работы па маўленчым развіцці ажыццяўляецца з улікам аператыўнага існуючага ўзроўню развіцця маўлення выхаванцаў.

Педагагічная карэкцыя ажыццяўляецца праз індывідуальную работу з дзіцём. Формамі дадзенай работы выступаюць практыкаванні, трэнінгі, работа з індывідуальным матэрыялам.

Пры састаўленні *плана рэалізацыі адукацыйнага працэсу ў групах ранняга і дашкольнага ўзросту па развіцці маўлення і культуры маўленчы' зносін дзяцей* неабходна прытрымлівацца наступных прынцыпаў: рэалізацыя ўсіх задач развіцця маўлення ва ўзаемасувязі; дзейнасны падыход да адбору зместа і метадаў навучання; паслядоўнае нарастанне патрабаванняў да маўлення дзяцей; ускладненне зместу, метадаў і прыёмаў навучання па меры засваення дзецьмі вучэбна-маўленчага матэрыялу; індывідуальны падыход да дзяцей; улік канкрэтных умоў; адпаведнасць праграме, выкананне ўсіх раздзелаў маўленчага развіцця дзяцей; сістэматычнае планаванне заняткаў (праграмны змест, дыдактычны матэрыял, спосаб арганізацыі дзяцей на занятках, ход заняткаў з указаннем асноўных метадаў і прыёмаў); узаемасувязь заняткаў па роднай мове з развіццём маўлення па-за заняткамі, рэалізацыя задач па развіцці маўлення на занятках па другіх раздзелах праграмы, у розных відах дзейнасці.

РЕПОЗ

Тэма 4.10 Метадычнае кіраўніцтва работай па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя

Пытанні для вывучэння

1. Арганізацыя метадычнай работы ва ўстановах дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання.
2. Кантроль за выкананнем стандартаў і рэалізацыя адукацыйнай праграмы адносна білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту.

1. Арганізацыя метадычнай работы ва ўстановах дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання: змест работы; стварэнне ўмоў для развіцця беларускага маўлення дзяцей

Метадычная работа ўстановы дашкольнай адукацыі з'яўляецца адным з найважнейшых аспектаў кіравання і выступае як дзейнасць, якая забяспечвае якасць адукацыйнага працэсу ва ўстанове дашкольнай адукацыі.

Галоўная задача метадычнай работы – аказанне канкрэтнай практычнай дапамогі выхавальнікам дашкольнай адукацыі ў арганізацыі і ўдасканаленні тэхналогій, формаў, метадаў працы з дзецьмі, у тым ліку і па развіцці беларускага маўлення і культуры маўленчых зносін у дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.

Асноўны змест метадычнай работы ў адпаведнасці з галіной "Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін" вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі ўключае наступныя напрамкі: *агульнакультурная падрыхтоўка педагагічных работнікаў ўстановы дашкольнай адукацы* (павышэнне кампетэнтнасці педагагічных работнікаў ўстановы дашкольнай адукацыі у галіне культуры маўлення і авалодання дзяржаўнымі мовамі); *дыдактычная падрыхтоўка педагагічных работнікаў ўстановы дашкольнай адукацыі* (валоданне тэхналогіяй маўленчага і лінвістычнага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах білінгвальнай адукацыі (Н. С. Старжынская); тэхналогіяй развіцця мастацка-маўленчай дзейнасці дзяцей (Д.М. Дубініна); *сацыяльна-псіхалагічная падрыхтоўка педагагічных работнікаў ўстановы дашкольнай адукацыі* (наяўнасць камунікатыўных кампетэнцый, педагагічнай эмпатыі, рэфлексіі і інш.); *этычная і прававая падрыхтоўка педагагічных работнікаў ўстановы дашкольнай адукацыі (*абарона правоў дзяцей дашкольнага ўзросту размаўляць на рускай і беларускай мовах); *выхаваўчая падрыхтоўка педагагічных работнікаў ўстановы дашкольнай адукацыі (*авалодванне моўна-культурнай спадчынай).

Галоўным прынцыпам арганізацыі метадычнай работы з'яўляецца сістэмны падыход да яе пабудовы. Вынікам метадычнай работы выступае станаўленне высокаарганізаванай, высокаэфектыўнай сістэмы педагагічнай дзейнасці па развіцці маўлення і навучання дзяцей дзвюм блізкароднасным мовам.

Ва ўстанове дашкольнай адукацыі выкарыстоўваюцца традыцыйна групавыя і франтальныя формы метадычнай работы: *семінары, семінары - практыкумы, калектыўныя прагляды педагагічнага працэсу, кансультацыі,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

педагагічныя нарады, праблемныя групы, майстар-класы, школы перадавога вопыту і інш., а таксама індывідуальныя формы метадычнай работы: *гутаркі, індывідуальныя кансультацыі, узаемныя наведванні, партфоліо, самаадукацыя і інш.*

Тэматыка семінараў па маўленчым развіцці і навучанні дзяцей роднай мове звязана з задачамі гадавога плана, з мэтамі праграмы развіцця ўстановы дашкольнай адукацыі. Яны могуць быць прысвечаны разгляданню такіх пытанняў, як: *білінгвальная кампетэнтнасць і камунікатыўная актыўнасць як асноўныя крытэрыі для вызначэння сутнасці білінгвізму; псіхолага-лінгвістычная характарыстыка білінгвізму; з'явы інтэрферэнцыі і транспазіцыі ў маўленні білінгва; мова як галоўная каштоўнасць народа, мова і культура народа; чалавек і яго культурнае моўнае асяроддзе, сацыялінгвістычная сітуацыя ў Беларусі, яе ўплыў на сферу дашкольнай адукацыі; статус беларускай мовы для рускамоўных дзяцей у Беларусі; уплыў білінгвізму на кагнітыўна-камунікатыўнае развіццё дзяцей дашкольнага ўзросту; лінгвакультаралагічны аспект ў навучанні дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове; дыдактычныя, выхаваўчыя, развіццёвыя і сацыялізуючая мэтавыя арыентацыі навучання беларускай мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя; стратэгія навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму; мэта і задачы навучання дзяцей беларускай мове ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання, іх псіхалагічнае і лінгвістычнае абгрунтаванне; інтэграваны падыход да білінгвальнага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту.*

Семінар, як правіла, складаецца з некалькіх заняткаў. Іх колькасць, парадак правядзення залежаць ад канкрэтнай тэмы. Кіраўніком семінара можа быць загадчык, намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці, спецыялісты. Магчыма запрашэнне для правядзення семінара выкладчыкаў адукацыйных устаноў, навуковых работнікаў. Пры выбары тэмы неабходна ўлічваць пажаданні і патрэбы выхавальнікаў канкрэтнай установы дашкольнай адукцыі. Неабходна прадугледзець і падрыхтоўку ўдзельнікаў семінара да заняткаў. Разам з планам работы семінара ў метадычным кабінеце вывешваецца спіс літаратуры, рэкамендаваны да пэўнага занятку, падбіраецца картатэка, рыхтуюцца выставы. Папярэдняя падрыхтоўка дае магчымасць кіраўніку семінара праводзіць заняткі з актыўным прыцягненнем усіх удзельнікаў. Семінар заканчваецца выпрацоўкай рэкамендацый аб магчымасці выкарыстання ва ўласнай педагагічнай дзейнасці шляхоў вырашэння разглядаемай праблемы або распрацоўкай плана далейшага вывучэння канкрэтных пытанняў дадзенай тэмы.

У практыцы ўстановы дашкольнай адукацыі выкарыстоўваюцца таксама *семінары-практыкумы***,** накіраваныя на павышэнне ўзроўню практычнай падрыхтоўкі выхавальніка дашкольнай адукацыі, удасканаленне практычных навыкаў, неабходных у працы з дзецьмі. Тэматыка семінараў-практыкумаў будуецца, зноў жа, з улікам пажаданняў выхавальнікаў дашкольнай адукацыі і звязана з задачамі гадавога плана. Так, тэмамі семінара-практыкума могуць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выступаць: *методыка азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з беларускім фальклорам, нацыянальнымі традыцыямі, побытам і культурай беларускага народа; методыка правядзення беларускіх народных свят ва ўстанове дашкольнай адукацыі і развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту; методыка абследавання розных бакоў беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя; камунікатыўная накіраванасць развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту; народныя гульні, іх роля ў развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту; нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове; арганізацыя пазасітуацыйна-пазнавальных і пазасітуацыйна-асобасных беларускамоўных зносін дзяцей дашкольнага ўзросту; мастацка-маўленчая дзейнаць як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту; методыка выкарыстання твораў беларускіх пісьменнікаў ва ўстанове дашкольнай адукацыі; развіццё беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту; методыка выхавання гукавой культуры беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту; навучанне звязнаму дыялагічнаму і маналагічнаму маўленню дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.*

Кіраўнікамі гэтай формы метадычнай работы могуць быць педагагічныя работнікі, якія добра валодаюць неабходнымі навыкамі. Можна наладзіць выставу работ выхавальнікаў дашкольнай адукацыі. Вынікам працы могуць быць таксама наглядныя матэрыялы, падрыхтаваныя рукамі выхавальнікаў дашкольнай адукацыі, рэкамендацыі да іх выкарыстання, якімі могуць карыстацца і іншыя педагагічныя работнікі дашкольнай адукацыі.

Важна, як адзначае Васільева А.І., каб рашэнні тэарэтычных семінараў і семінараў-практыкумаў афармляліся ў выглядзе канкрэтных рэкамендацый, якія рэальна выканаць, а іх рэалізацыя знаходзілася пад кантролем намесніка загадчыка па асноўнай дзейнасці і загадчыка ўстановы дашкольнай адукацыі.

Адной з самых эфектыўных форм метадычнай работы Л.М. Валабуева называе *калектыўныя прагляды педагагічнага працэсу***.** У кожнай ўстанове дашкольнай адукацыі ёсць педагагічныя работнікі, якія могуць падзяліцца з калегамі вопытам арганізацыі працы з дзецьмі па развіцці маўлення і навучанні роднай мове. Варта адрозніваць "адкрытыя мерапрыемствы і “калектыўныя прагляды".

У першым выпадку гэта дэманстрацыя ўзроўню прафесіяналізму педагагічных работнікаў установы дашкольнай адукацыі, і яны часта выкарыстоўваюцца як адна з формаў атэстацыі, творчых справаздач дэманстрацыі вынікаў эксперыментальнай працы ўстановы дашкольнай адукацыі, а ў другім – паказ канкрэтных, найбольш эфектыўных тэхналогій, формаў, метадаў арганізацыі педагагічнага працэсу для азнаямлення і навучання іншых выхавальнікаў дашкольнай адукацыі.

Для прагляду выбіраецца не толькі непасрэдна адукацыйная дзейнасць адносна галіны “Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін”, але і іншыя віды дзейнасці (гульня, праца і інш.), а таксама асобныя рэжымныя моманты

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(ранішняя гімнастыка, прагулка і інш. г. д.) з мэтай азнаямлення з метадамі і прыёмамі развіцця маўлення дзяцей.

Сур'ёзная ўвага надаецца падрыхтоўцы педагагічных работнікаў ўстановы дашкольнай адукацыі да паказу і прагляду. Абавязкова складаецца канспект або план пэўнай формы працы па развіцці маўлення дзяцей. Намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці кансультуе педагагічнага работніка ўстановы дашкольнай адукацыі; рыхтуе пытанні для назірання, якія кожны ўдзельнік атрымлівае перад калектыўным праглядам.

Важна правільна арганізаваць абмеркаванне калектыўнага прагляду, падчас якога першае слова прадастаўляецца выхавальніку дашкольнай адукацыі, які паказвае сваю працу. Ён знаёміць з мэтай, праграмнымі задачамі віду дзейнасці, праводзіць самааналіз. Далей удзельнікам калектыўнага прагляду прапануецца задаваць пытанні выхавальніку дашкольнай адукацыі, які дае неабходныя тлумачэнні.

Найбольш распаўсюджаны ў практыцы ўстановы дашкольнай адукацыі *кансультацыі* – такая форма метадычнай работы, для якой характэрная маналагічная аснова паднясення новай для выхавальнікаў дашкольнай адукацыі інфармацыі.

Тым не менш, неабходна прадугледзець элементы зваротнай сувязі, г. зн. забяспечыць актыўнае ўключэнне выхавальнікаў дашкольнай адукацыі у засваенні інфармацыі. Гэта магчыма пры выкарыстанні актыўных метадаў працы. Тут, найбольш удалым з’яўляецца правядзенне кансультацый у выглядзе ролевых гульняў, калі намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці не распавядае, як арганізаваць, напрыклад, маўленчую дзейнасць дзяцей, а паказвае яе, даўшы магчымасць выхавальнікам дашкольнай адукацыі прадставіць сябе дзецьмі малодшага або старшага ўзросту, з наступным аналізам дзеянняў удзельнікаў.

Варта памятаць, што з часам патрэба ў раней праведзенай кансультацыі можа паўстаць і ў іншых выхавальнікаў дашкольнай адукацыі. Таму яе змест або разгорнуты план з указаннем выкарыстанай літаратуры, трэба выкласці ў пісьмовым варыянце, які можна выкарыстоўваць і ў наступнай працы.

Цэнтральным звяном у арганізацыі метадычнай работы ва ўстанове дашкольнай адукацыі з'яўляецца *педагагічная нарада*.

Сярод асноўных метадычных функцый педагагічнай нарады вызначым – *інфармацыйную*. Пад час педагагічнай нарады абмяркоўваецца інфармацыя аб стане і прыярытэтах у развіцці дашкольнай білінгвальнай адукацыі, аб інавацыях у педагагічнай практыцы і г. д. *Абагульняюча-аналітычная* функцыя дае магчымасць на пасяджэннях педагагічнай нарады аналізаваць формы і метады арганізацыі педагагічнага працэсу па развіцці беларускага маўлення; ўзровень развіцця маўлення дзяцей; вынікі педагагічнай дзейнасці асобных педагагічных работнікаў установы дашкольнай адукацыі (напрыклад, у перыяд атэстацыі). *Развіваючая* функцыя спрыяе авалодванню педагагічнымі работнікамі ўстановы дашкольнай адукацыі новымі тэхналогіямі развіцця беларускага маўлення дзяцей, методыкамі навучання беларускай мове і выхавання нацыянальнай самасвядомасці дзяцей, вопытам педагогаў-наватараў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сярод *сацыяльна-педагагічных функцый* вызначым функцыю *камунікацыі,* функцыю *каардынацыі і інтэграцыі* намаганняў усіх суб'ектаў выхавання.

Адрозніваюць два асноўных віды педагагічных нарад:

1. Выніковыя, якія вызначаюць вынікі працы за паўгоддзе ці год;

2. Тэматычныя, прысвечаныя канкрэтнай тэме (напрыклад, гэта можа быць адна з задач педагагічнага калектыву).

Што да праблемы развіцця беларускага маўлення дзяцей, то яна больш падрабязна ў асноўным разглядаецца на тэматычных педагагічных нарадах Пры арганізацыі абмену вопытам паміж педагагічнымі работнікамі ўстановы дашкольнай адукацыі можна выкарыстоўваць эўрыстычную гутарку, падчас якой больш дэталёва раскрываюцца асобныя палажэнні вывучаемай метадычнай літаратуры, даюцца тлумачэнні па пытаннях, якія ў большай ступені цікавяць педагагічных работнікаў установы дашкольнай адукацыі, выяўляюцца памылкі ў меркаваннях, ступень разумення і засваення новай інфармацыі.

Апошнім часам у метадычнай рабоце ўсё больш выкарыстоўваецца *метад кейсаў* (ад лац. casus-заблытаны або незвычайны выпадак). Яго яшчэ можна назваць метадам аналізу сітуацый, сутнасць якога ў тым, што слухачам прапануюць асэнсаваць рэальную жыццёвую сітуацыю, апісанне якой адначасова адлюстроўвае не толькі практычную праблему адносна развіцця маўлення і навучання дзяцей беларускай мове, але і актуалізуе пэўны комплекс ведаў, які неабходна засвоіць пры вырашэнні дадзенай праблемы. Пры гэтым сама праблема не мае адназначных рашэнняў. Дадзены метад мае шмат агульнага з праблемным метадам навучання.

Цэнтрам метадычнай дзейнасці ва ўстанове дашкольнай адукацыі з'яўляецца *метадычны кабінет.* Прызначэнне метадычнага кабінета шматфункцыянальнае. Па першае, гэта павінна быць творчая майстэрня, дзе выхавальнік дашкольнай адукацыі можа атрымаць канкрэтную практычную дапамогу ў арганізацыі работы па развіцці маўлення і навучання дзяцей беларускай мове. Таксама гэта павінен быць цэнтр збору педагагічнай інфармацыі (дакументы, метадычная літаратура, перадавы вопыт і г. д.)

Для аптымізацыі работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей у метадычным кабінеце павінны быць прадстаўлены: *матэрыялы па заканадаўчай і нарматыўнай прававой базе, што служаць падмуркам білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту (Закон аб мовах, Кодэкс аб адукацыі, вучэбная праграма дашкольнай адукацыі);*

дапаможнікі па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту; метадычная літаратура па асобных раздзелах развіцця беларускага маўлення дзяцей; метадычныя матэрыялы з зыходнымі дадзенымі: назва, аўтар, месца, год выдання, кароткая анатацыя (лепш на картках);

падручнікі беларускай мове, дзіцячай літаратуры; арфаграфічныя слоўнікі;

розныя хрэстаматыі (як навуковых артыкулаў па праблеме развіцця маўлення дзяцей, так і твораў фальклору і мастацкай літаратуры для дзяцей);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

падборкі загадак, песенек, забаўлянак; дзіцячая мастацкая літаратура: яркія, маляўніча афармленыя зборнікі, рэдкія выданні; біяграфіі дзіцячых пісьменнікаў; партрэты любімых дзецьмі пісьменнікаў, метадычныя рэкамендацыі аб арганізацыі розных формаў працы з дзецьмі па творчасці гэтых пісьменнікаў; аўдыёкасеты або пласцінкі з запісамі дзіцячых твораў; ілюстрацыйны матэрыял па мастацкай літаратуры;

зборнікі гульняў па развіцці беларускага маўлення; картатэка дыдактычных гульняў па развіцці беларускага маўлення;

матэрыялы па азнаямленні з навакольным светам, падзеленыя па тэматыцы, з картатэкай;

сюжэтныя карціны з простым і складаным сюжэтамі; прадметныя карціны (з картатэкай); серыі карцін (павінна быць 5-7 розных серый, па 5 набораў кожнай серыі); падборка дзіцячых малюнкаў для расказвання: яны падбіраюцца на групу дзяцей;

дыдактычныя цацкі рознага прызначэння; раздатачныя цацкі, невялікія па памеры, 10-12 см; набор на групу не менш за 15 цацак (тэматыка: хатнія жывёлы, дзікія жывёлы, транспарт);

канспекты заняткаў з вопыту работы; серыі канспектаў па расказванні (па цацкі, па серыі карцін, па сюжэтнай карціне) і інш.;

прыклады розных формаў планавання работы па развіцці маўлення; памяткі па аналізе заняткаў па развіцці маўлення; высновы і рэкамендацыі па папаўненню і (або) найбольш рацыянальнай арганізацыі прадметна-развіццёвай маўленчай прасторы для педагічных работнікаў установы дашкольнай адукацыі.

Каб метадычны кабінет адказваў сучасным патрабаванням і запытам выхавальнікаў дашкольнай адукацыі, варта ўлічваць, што важнай умовай высокай выніковасці адукацыйнага працэсу з'яўляецца пастаяннае і своечасовае інфармаванне выхавальнікаў дашкольнай адукацыі пра новыя распрацоўкі ў псіхолага-педагагічнай, лінгвадыдактычнай навуцы і практыцы, пра нарматыўна-прававое і метадычнае забеспячэнне сістэмы дашкольнай адукацыі. Тут жа можа быць сканцэнтравана інфармацыя пра сваю ўстанову, аўтарскія распрацоўкі, прадстаўлена праграма развіцця ўстановы дашкольнай адукацыі, у тым ліку адносна білінгвальнага развіцця дзіцяці.

Усе педагагічныя работнікі ўстановы дашкольнай адукацыі павінны пастаянна працаваць над папаўненнем метадычнага кабінета дапаможнікамі, метадычнымі распрацоўкамі, педагагічнымі інавацыямі і г.д. Вопыт, прадстаўлены ў метадычным кабінеце, павінен матываваць педагагічных работнікаў установы дашкольнай адукацыі на творчасць, удасканаленне прафесінага майстэрства, кампетэнцый.

2. Кантроль за выкананнем стандартаў і рэалізацыя адукацыйнай праграмы адносна білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту

Кантроль – гэта кіраўнічая функцыя, накіраваная на канстатацыю ступені дасягнення мэты, параўнанне атрыманых вынікаў з вызначанымі ў планах установы дашкольнай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Галоўная задача кантролю – аказанне дапамогі выхавальнікам дашкольнай адукацыі у рабоце па развіцці маўлення і навучання беларускай мове дзяцей дашкольнага ўзросту.

Працэс кантролю адукацыйнай галіны “Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін” ва ўстанове дашкольнай адукацыі можа ажыццяўляцца адносна вызначэння стандартаў (эталонаў) дзейнасці, якая будзе кантраляваца. Стандарт устанаўлівае крытэрыі ацэнкі працы, колькасныя і якасныя паказчыкі, часовыя рамкі.

Кантроль таксама можа быць накіраваны на выяўленне і вымярэнне рэальнага становішча спраў і супастаўленне дасягнутых вынікаў з усталяванымі стандартамі. Для гэтага могуць выкарыстоўвацца такія метады, як: назіранне, гутарка, тэставанне, аналіз дакументацыі і гэтак далей.

Кантроль можа ўключаць аналіз і ацэнку сабранай інфармацыі, вызначэнне фактараў, якія абумовілі дасягнутыя вынікі (станоўчыя і адмоўныя). Калі фактычныя вынікі не супадуць з запланаванымі, то трэба альбо перагледзець стандарты дзейнасці, альбо ліквідаваць прычыны невыканання намечаных планаў.

Кантроль ва ўстанове дашкольнай адукацыі мае свой алгарытм дзейнасці, які складаецца з абгрунтавання кантролю; фармулёўкі мэты кантролю; распрацоўкі схемы маючага адбыцца назірання; збору і апрацоўкі інфармацыі, атрыманай у час назірання; фармулеўкі высноў і рэкамендацый.

Класіфікацыя відаў кантролю мае розныя падставы. Так па часе (этапах) ажыццяўлення кантролю вызначаюць яго *віды*, як:

- папярэдні (папераджальны) кантроль папярэднічае пачатку працы. Праводзіцца з мэтай вызначэння гатоўнасці ўстановы адукацыі да выканання задач і аказання пры неабходнасці дапамогі, каб забяспечыць гэтую гатоўнасць;

- бягучы (аператыўны) кантроль ажыццяўляецца падчас працы з мэтай вызначэння адпаведнасці дзейнасці педагагічных работнікаў пэўным крытэрыям. Вынікі, атрыманыя ў ходзе аператыўнага кантролю, патрабуюць маментальнага прыняцця рашэнняў, каб ліквідаваць тыя ці іншыя выяўленыя парушэнні і ўнесці неабходныя карэктывы;

- выніковы кантроль праводзіцца пасля завяршэння працы за пэўны перыяд (паўгоддзе, навучальны год) або ў канцы рэалізацыі нейкай праграмы (асобнага этапу), мерапрыемства. Ён накіраваны на выяўленне ступені выканання запланаваных вынікаў. Выніковы кантроль з'яўляецца падставай для складання будучых планаў і рэкамендацый, ацэнкі працы выхавальнікаў дашкольнай адукацыі.

Кантроль можа характарызавацца па ступені ахопленасці:

Адпаведна тут вызначаюць такія віды кантролю,як:

- суцэльны (франтальны, агульны), калі правяраецца ўвесь аб'ём выкананай працы, па ўсіх напрамках;

- лакальны (выбарачны, тэматычны), калі правяраецца нейкая частка, кірунак дзейнасці, раздзел адукацыйнай праграмы.

Тэматыка кантролю плануецца ў гадавым плане. Пры складанні плана тэматычнага кантролю часта выкарыстоўваецца універсальная форма, якая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

складаецца з 5 блокаў: выяўленне асаблівасцей развіцця дзяцей; ацэнка прафесійных уменняў выхавальніка, яго прафесійнага росту; ажыццяўленне планавання па тэме; ацэнка прадметна-развіццёвага асяроддзя, умоў для арганізацыі адукацыйнага працэсу па дадзеным кірунку, наяўнасць разнастайных дапаможнікаў; арганізацыя ўзаемадзеяння з бацькамі.

Сярод метадаў ажыццяўлення кантролю за арганізацыяй работы па маўленчым развіцці дзяцей ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму вызначым такія: назіранне за ходам педагагічнага працэсу, арганізацыяй маўленчай дзейнасці дзяцей, узаемадзеяннем з дзецьмі і бацькамі і г .д.; гутаркі з выхавальнікамі, дзецьмі, бацькамі; анкетаванне (бацькоў, выхавальнікаў); тэсціраванне дарослых; аналіз педагагічнай дакументацыі; аналіз дыдактычнага абсталявання, прадметна-развіццёвага асяроддзя.

Вынікі кантролю, аператыўнай і тэматычнай інфармацыі абавязкова падвяргаюцца педагагічнаму аналізу.

Складанасць педагагічнага аналізу ў тым, што яго аб'ектам з'яўляецца праца выхавальніка, якая ўяўляе сабой творчы працэс. Таму ў арганізацыі педагагічнага аналізу неабходныя карэктнасць, тактоўнасць, добрае веданне дзіцячай псіхалогіі, педагогікі, методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей.

У тэхналогіі педагагічнага аналізу ва ўстаное дашкольнай адукацыі зручна выкарыстоўваць рознага роду схемы, апытальнікі, памяткі, якія дапамагаюць у зборы, фіксацыі назіранняў і аналізе інфармацыі.

Літаратура асноўная.

1. Дубініна, Д. М. Выхаванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту цікавасці да беларускай мастацкай літаратуры і фальклору **:** дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі / Д. М. Дубініна. – Мінск: Новое знание, 2016. – 208 с.

2. Свірыдзенка, В. І. Фарміраванне маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў : тэорыя і практыка / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Беларус. дзярж. пед.ун-т, 2019. – 280 с.

3. Современные педагогические технологии в образовательном процессе учреждения дошкольного образования : учеб.-метод. пособие / под общ. ред. В. Н. Шашок ; сост. В. Н. Шашок [и др.]. – Минск : Акад. последиплом. образования, 2019. – 123 с.

4. Старжынская, Н. С. Развіцце беларускага маўлення дашкольнікаў ад 4 да 5 гадоў: вучэб. нагляд. дапам. для педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання / Н.С. Старжынская, Д.М. Дубініна. – Мінск : Аверсэв, 2017, 2018. – 28 с.

5. Старжынская, Н. С. Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў ад 5 да 7 гадоў**:** вучэб. нагляд. дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з рус. мовай навучання / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. – Мінск : Аверсэв, 2018. – 40 с.

6. Старжынская, Н.С. Развіцце беларускага маўлення і маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту ад 6 да 7 гадоў: вучэб. нагляд. дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з рус. мовай навучання / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. – Мінск : Аверсэв, 2017, 2018. – 60 с.

7. Старжынская, Н. С. Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў ад 4 да 7 гадоў : вучэб.-метад. дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з рус. мовай навучання / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – 184 с.

Літаратура дадатковая:

8. Дубініна, Дз.М. Развіццё вобразнага беларускага маўлення ў дзяцей старшага дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму / Дз.М. Дубініна // Весці Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 1. Педагогіка. Псіхалогія. Філасофія. – 2007. – № 3. – С. 15–18.

9. Дубініна, Д. М. Родная прырода ў вуснай народнай творчасці : дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі / Д. М. Дубініна, А. А. Страха, Д. У. Дубінін. – 2-е выд. – Мазыр : Белы Вецер, 2016. – 133 с.

10. Дубініна, Д.М. Культура Беларусі ў казках і паданнях / Д.М. Дубініна, Д.Ул. Дубінін. – Мінск, 2008.

11. Някрасава, Н.Д. Беларуская народнай казка ў дзіцячым садзе / Н.Д. Някрасава, Р.В. Маісеенка. – Мінск, 2000. – 125 с.

12. Старжынская, Н.С. Развіццё беларускамоўных зносін дашкольнікаў / Н.С. Старжынская. – Мінск : НМЦэнтр, 2001. – 144 с.

13. Старжынская, Н.С. Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў / Н.С. Старжынская. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 223 с.

14. Старжынская, Н.С. Методыка развіцця роднай мовы : вучэб. дапаможнік / Н.С. Старжынская, Дз.М. Дубініна. – Мінск : Выш. шк., 2008. – 301 с.

15. Старжынская, Н. С. Крылаў не мае, а хутка лятае. Лінгвістычныя гульні для дзяцей 4 – 7 гадоў / Н.С. Старжынская. – Мінск, 2007. – 160 с.

16. Старжынская, Н. С. Фарміраванне граматычнага ладу маўлення дзяцей / Н.С. Старжынская // Пралеска. – 2006. - № 8-9.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

Планаванне і заданні практычных і семінарскіх заняткаў

Тэма. Білінгвізм як сацыяльна-культурны і псіхолага-педагагічны феномен

Семінарскія заняткі (2 гадзіны)



Заданні для выканання

- Дайце азначэнне білінгвізма.
- Для сучаснай моўнай сітуацыі ў Беларусі характэрна суіснаванне і выкарыстанне беларускай і рускай моў (беларуска-рускае двухмоўе). Устаўце прапушчаныя словы і ахарактарызуйце як прадстаўлена нацыянальнае беларуска-рускае двухмоўе:_____.двухмоўем, калі побач з роднай беларускай мовай двухмоўны індывід выкарыстоўвае і рускую мову; _____двухмоўем, калі побач з рускай мовай двухмоўны індывід выкарыстоўвае беларускую мову; _____ беларускім ці рускім аднамоўем.
- Растлумачце, што такое білінгвальная кампетэнтнасць? Раскрыйце дынаміку гэтага крытэрыя білінгвізму.
- Раскрыйце як ацэньваецца камунікатыўная актыўнасць як крытэрый білінгвізму.
- Раскрыйце значэнне тэрмінаў інтэрферэнцыя і транспазіцыя ў маўленні дзіцяці-білінгва.
- Назавіце фактары, якія садзейнічаюць інтэрферэнцыі.
- Адзначце, у чым станоўчае значэнне з’явы транспазіцыі пры авалоданні другой мовай.
- Двухмоўе (білінгвізм) разглядаецца ў трох аспектах: псіхалагічным, педагагічным і сацыялінгвістычным. Дайце характарыстыку гэтых аспектаў двухмоўя.
- Беларускі даследчык Т.М. Мікуліч прапануе сваю класіфікацыю білінгвізму, у *аснове якой таксама ляжыць якасць засваення і ўжывання моў*. Яна выдзяляе *нарматыўнае, аднабакова-нарматыўнае і ненарматыўнае двухмоўе.* Раскрыйце змест кожнага з пералічачынах відаў двухмоўя.
- *Па спосабе сувязі маўлення з мысленнем* білінгвізм падзяляецца на *каардынацыйны і субардынацыйны*. Дайце вызначэнне *каардынацыйнага і субардынацыйнага* двухмоўя.
- Дайце класіфікацыю білінгваў ў кантэксце антагенезу.
- Пералічыце віды білінвізму па сацыялінгвістычным крытэрыі ступені роднасці дзвюх моў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма. Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму як навука (самастойнае вывучэнне)



Заданні для выканання

- Раскрыйце катэгорыі, міждысцыплінарныя сувязі методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.
- Раскрыйце, што азначае методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя як навука і як вучэбная дысцыпліна.
- Назавіце крыніцы стварэння методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.
- Акрэсліце тэарэтычныя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.
- Назавіце прадмет, аб'ект, мэты і задачы курса вучэбнай дысцыпліны «Развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту».
- Раскрыйце сутнасць паняццяў: «білінгвальная адукацыя», «білінгвальнае навучанне», «білінгвальнае выхаванне».
- Вызначыце статус беларускай мовы для рускамоўных дзяцей у Беларусі. Акрэсліце мэту моўнай адукацыі.
- Акрэсліце тры напрамкі лінгвакультуралагічнага падыходу да навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове.
- Раскрыйце мэтавыя арыентацыі навучання беларускай мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму і іх вызначэнне.

Тэма. Канцэптуальныя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму

Семінарскія заняткі (2 гадзіны)



Заданні для выканання

- Пералічыце сацыяльныя функцыі роднай мовы.
- Акрэсліце формулу расійскага даследчыка Я.І. Пасава, згодна з якой ажыццяўляецца сучасны падыход да развіцця маўлення і маўленчых зносін дзяцей.
- Састаўце сінквейн да выразу «беларуская мова».
- Раскрыйце сутнасць паняццяў «родная мова», «другая мова», «нацыянальная мова», «замежная мова».
- Растлумачце ў чым заключаецца асаблівасць сацыялінгвістычнай сітуацыі ў Беларусі.
- Абгрунтуйце статус беларускай мовы для рускамоўных дзяцей у Беларусі.
- Адзначце, якія *тэарэтычныя праблемы* ранняга двухмоўя даследчыкі ўключаюць у *кола асноўных.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

? Акрэсліце тры напрамкі лінгвакультуралагічнага падыходу да навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове.

? Назавіце мэтавыя арыентацыі навучання беларускай мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму, дайце іх вызначэнне.

Літаратура асноўная

1. Куфтяк, Е.В. Билингвизм у детей: влияние на когнитивно-коммуникативное развитие и инструменты измерения / Е.В. Куфтяк, А.М. Ханукова, Е.В. Пойманова // Современное дошкольное образование. – 2019. – № 2. – С. 30 – 39.

2. Свірыдзенка, В.І. Фарміраванне маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў : тэорыя і практыка / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : БДПУ, 2019. – С 8 -23.

3. Старжынская, Н.С. Сучасныя падыходы да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту / Н.С. Старжынская // Пралеска. – 2016. - № 10. – С. 3 – 8.

Літаратура дадатковая

4. Сопоставительный курс русского и белорусского языков : учеб. пособие / А.М. Бордович [и др.]. – Мінск : Універсітэцкае, 1999. – 223 с.

5. . Старжынская, Н.С. Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў / Н.С. Старжынская. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 223 с.

6. Старжынская, Н.С. Маўленчае і лінгвістычнае развіццѐ дашкольнікаў / Н.С. Старжынская. – Мінск, 2007.

Тэма.Этапы станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі

Семінарскія заняткі (2 гадзіны)

Заданні для выканання

? Назавіце этапы развіцця білінгвальнай дашкольнай адукацыі ў Беларусі (паводле Т.У. Паліевай) і вызначыце іх храналагічныя рамкі.

? Пералічыце фактары, якія аказваюць вызначальны ўплыў на станаўленне і развіццё білінгвальнай дашкольнай адукацыі ў Беларусі.

? Назавіце беларускіх даследчыкаў праблем білінгвальнай дашкольнай адукацыі.

Літаратура асноўная

1. Андрэева, Е.Г. Адукацыя і педагагічная думка Беларусі: старонкі гісторыі: перыяд беларусізацыі / Е.Г. Андрэева, Л.М. Лыч. // Пач. школа. – 2001. – № 8.

2. Паліева, Т.У. Развіццѐ білінгвальнай адукацыі дашкольнікаў у Беларусі (другая палова XX ст. – пачатак XI): манаграфія / Т.У. Паліева. – Мазыр, 2008.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Палиева, Т.В. Развитие дошкольного образования Беларуси в условиях билингвизма во второй половине XX века : пособие / Т.В. Палиева. – Мозырь : УО МГПУ им. И.П. Шамякина, 2008. – С. 8 -12.

Літаратура дадатковая

1. Бядуля, З. Справа стварэння новых падручнікаў і выдання дзіцячага часопіса / З. Бядуля // Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя крытычных матэрыялаў / склад.: В.А. Лашкевіч, Р.К. Літвінаў.– Мінск : Выш. шк., 1981. – 272 с.

2. Каменская, Н.В. Становление народного образования в Белоруссии (1917–1920 гг.) / Н.В. Каменская. – Мінск : Наука и техника, 1980. – 263 с.

3. Канцэпцыя развіцця дашкольнага выхавання ў БССР // Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства народнай адукацыі БССР / пад рэд. С.С. Харына. – Мінск : Нар. асвета, 1990. – № 12. – С. 19–39.

4. Концепция дошкольного образования РБ // Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства адукацыі РБ. – Мінск : Нар. асвета, 2000. – № 10.

5. Луйгас, Т. Роль журнала “Лучынка” на этапе формирования белоруской детской журналистики / Т. Луйгас // Матэрыялы 7-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Журналістыка – 2005”: Надзённыя праблемы. Перспектывы / рэдкал.: С.В. Дубовік [і інш.]. – Мінск : ААТ “Чырвоная зорка”, 2007. – Вып. 7. – С. 424.

6. Паліева, Т.У. Білінгвальная сістэма адукацыі: Аб развіцці айчыннай лінгвадыдактыкі білінгвізму / Т.У. Паліева // Пралеска. – 2006. – № 2. – С. 45–47.

7. Паліева, Т.У. Дзве мовы – дзве душы? Сацыяльна-палітычныя ўмовы развіцця білінгвальнай адукацыі ў Беларусі: другая палова XX – пачатак XXI стст. / Т.У. Паліева // Роднае слова. – 2005. – № 10. – С. 3–5.

8. Паліева, Т.У. Праблемы дзіцячага беларуска-рускага білінгвізму / Т.У. Паліева // Пач. навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа. – 2005. – № 3. – С. 8–16.

9. Старжынская, Н.С. Гісторык дашкольнай педагогікі / Н.С. Старжынская, Т.У. Паліева // Пралеска. – 2006. – № 12. – С. 31.

Тэма. Мэта, задачы і змест развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму

Практычныя заняткі (2 гадзіны)

Заданні для выканання

? Назавіце шляхі авалодання роднай і другой мовамі, паводле Л.С. Выгоцкага і прадстаўце тэхналагічную карту адукацыйнага працэсу.

? Раскрыйце, у чым заключаецца стратэгія навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

? Сфармулюйце мэту навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове? Як галоўная мэта звязана з другой мэтай навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове?

? Раскрыйце задачы навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

? Назавіце і ракрыйце тры асноўныя ўзаемазвязаныя паміж сабой накірункі развіцця маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

? Раскрыйце, што такое сінхранічная і дыяхранічная ўзаемасувязь усіх раздзелаў маўленчай работы ў розных узроставых групах.

? Прасачыце на прыкладзе задач навучання беларускай мове ў кожнай узроставай групе паступовае ўскладненне зместу гэтай работы (дыяхранічную сувязь) ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі.

Тэма. Метадычныя прынцыпы і сродкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму

Практычныя заняткі (1 гадзіна)

Заданні для выканання

? Назавіце метадычныя прынцыпы арганізацыі педагагічнага працэсу па развіцці маўлення дзяцей ва ўстанове дашкольнай адукацыі (паводле В.І. Яшынай).

? Раскрыйце сутнасць прыватных метадычных прынцыпаў арганізацыі педагагічнага працэсу па развіцці маўлення на другой мове: “адна асоба ў адной сітуацыі зносін – адна мова”; фарміравання моўных абагульненняў; уліку дасягненняў дзяцей у маўленні на рускай мове; апраксімацыі.

? Назавіце тры класы (тыпы) матываў, паводле П.Я. Гальперына.

? Назавіце гульні, якія выкарыстоўваюцца ў методыцы развіцця беларускага маўлення дзяцей. Дайце іх кароткую характарыстыку.

? Пералічыце сродкі навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

Тэма. Метады і прыёмы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя

Практычныя заняткі (1 гадзіна).

Заданні для выканання

? Назавіце спецыяльныя метады навучання другой мове.

? Раскрыйце, у чым заключаецца спецыфіка методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

? Развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ажыццяўляецца паэтапна. Вызначыце этапы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

Літаратура асноўная

1. Свірыдзенка, В. І. Фарміраванне маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў : тэорыя і практыка / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Беларус. дзярж. пед.ун-т, 2019. – 280 с.

2. Современные педагогические технологии в образовательном процессе учреждения дошкольного образования : учеб.-метод. пособие / под общ. ред. В. Н. Шашок ; сост. В. Н. Шашок [и др.]. – Минск : Акад. последиплом. образования, 2019. – 123 с.

Літаратура дадатковая

3. Старжынская, Н.С. Методыка развіцця роднай мовы : вучэб. дапаможнік / Н.С. Старжынская, Дз.М. Дубініна. – Мінск : Выш. шк., 2008. – 301 с.

4. Старжынская, Н.С. Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў / Н.С. Старжынская. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 223 с.

5. Старжынская, Н.С. Маўленчае і лінгвістычнае развіццѐ дашкольнікаў / Н.С. Старжынская. – Мінск, 2007.

Тэма. Камунікатыўная накіраванасць развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту

Практычныя заняткі (2 гадзіны)

Заданні для выканання.

? Дайце вызначэнне пачуцця мовы (моўнага чуцця).

? Распрацуйце сцэнарый выкарыстання народных рухомых гульняў з мастацкім словам для развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

? Вызначыце ролю дыдактычнай лялькі ў развіцці беларускага маўлення дзяцей.

? Назавіце асноўныя функцыі маўленчага этыкету

? Назавіце этапы фарміравання культуры маўленчых зносін дзяцей*:*

? Адзначце, у якой форме праводзяцца заняткі па фарміраванні пазасітуацыйных форм зносін на беларускай мове.

? Адзначце, у якой форме праводзяцца заняткі па фарміраванні пазасітуацыйна-асобаснай формы зносін на беларускай мове.

Тэма. Мастацка-маўленчая дзейнаць як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту

Практычныя заняткі (2 гадзіны).

Заданні для выканання.

? Прывядзіце прыклады выкарыстання беларускіх прыказак, прымавак у розных відах дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

? Прывядзіце прыклады выкарыстання беларускіх народных загадак у розных відах дзейнасці

? Акрэсліце шляхі выкарыстання беларускай народнай казкі ў рабоце па развіцці маўлення і культуры маўленчых зносін у дзяцей дашкольнага ўзросту

? Складзіце перспектыўны план выкарыстання твораў беларускай мастацкай літаратуры і фальклору для чытання і расказвання дзецям дашкольнага ўзросту на снежань-люты для адной з узроставых груп.

Месяц	Назва тэмы заняткаў	Задачы

? Састаўце план-канспект заняткаў па азнаямленні дзяцей дашкольнага ўзросту з мастацкім творам Васіля Хомчанка (па выбары ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі.

? Вам неабходна правесці заняткі па азнаямленні дзяцей з мастацкай літаратурай. Прачытайце твор. Вызначыце, для якога ўзросту дзяцей ён падыходзіць, сфармулюйце задачы (адукацыйныя, развіваючыя, выхаваўчыя) і складзіце пытанні для гутаркі па змесце твора.

А. Кобец-Філімонава “Сем мастакоў”

У адным горадзе жылі-былі сем мастакоў. Горад, у якім яны жылі, быў вельмі змрочны. Таму што над ім віселі шэрыя хмары. І ад іх на ўвесь горад падаў шэры цень. З-за хмараў не было відаць аранжавага сонца. Не было відаць зялёнай лістоты. Не было відаць блакітных нябёсаў. І ўсё, што малявалі мастакі, было шэрае і непрыгожае. Яны ж думалі, што неба можа быць толькі шэрага колеру. І лісце толькі шэрага колеру. І ўсё наўкола — толькі шэрага колеру. Таму і фарбы ў іх былі толькі шэрыя. Яны не маглі маляваць іначай. Аднойчы ў горад прыляцеў вецер і разагнаў хмары. Мастакі выбеглі на вуліцу — і не паверылі сваім вачам.

— Ой, якое прыгожае неба! — сказалі яны.

— Ой, якое прыгожае сонца! — сказалі яны.

— Ой, якое прыгожае лісце! — сказалі яны.

І адразу пачалі маляваць. Але атрымалася непрыгожа. Таму што ў іх была толькі шэрая фарба. Сем мастакоў цяжка ўздыхнулі. Што ж ім рабіць? Як навучыцца добра маляваць? Тады адзін з іх сказаў:

— Сябры! Хадзем фарбы шукаць. Узялі мастакі сем пэндзлікаў і сем вядзерцаў і пайшлі фарбы шукаць. Доўга вандравалі яны па белым свеце і ўсяму дзівіліся. А дзівіцца было чаму. Яны ж усё жыццё жылі ў змрочным горадзе і не ведалі, што ёсць на свеце пунсовы-пунсовы мак, які квітнее на зялёным лузе; што ёсць бялюткі рамонак з залацістай сярэдзінай; што сонца ўдзень аранжавае, а ўвечары — малінавае. Яны любаваліся прыродай, многае спазнавалі і ўсё запаміналі. Аднойчы мастакі падняліся на вяршыню самай высокай гары. Адтуль было відаць усё навокал: і рэкі, і лясы, і лугі — увесь шлях, які яны прайшлі. Залюбаваліся мастакі і пачалі марыць:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— Ах, як бы я хацеў намаляваць мак! — сказаў адзін.
— А я — сонца! — сказаў другі.
— А я — дзьмухавец! — сказаў трэці.
— А я — лісточак! — сказаў чацвёрты.
— А я — неба! — сказаў пяты.
— А я — званочак! — сказаў шосты.
— А я — фіялку! — сказаў сёмы.
І як толькі яны гэта сказалі — на небе ўзнікла вясёлка. Убачылі мастакі вясёлку — і вачам сваім не паверылі.
— Ах, якія фарбы! — уздыхнулі яны.
— Я бачу фарбу, як мак! — сказаў адзін.
— А я — як сонца! — сказаў другі.
— А я — як дзьмухавец! — сказаў трэці.
— А я — як лісточак! — сказаў чацвёрты.
— А я — як званочак! — сказаў шосты.
— А я — як фіялку! — сказаў сёмы.
І раптам адзін канец вясёлкі апусціўся каля самых ног мастакоў. І яны ўбачылі сем каляровых дарожак.
Чырвоную, як мак.
Аранжавую, як сонца.
Жоўтую, як дзьмухавец.
Зялёную, як лісточак.
Блакітную, як неба.
Сінюю, як званочак.
Фіялетавую, як фіялка.
— Ура! — закрычалі мастакі.
— Нарэшце мы знайшлі фарбы!
Кожны выбраў сабе любімую дарожку і пайшоў па ёй. Прайшлі мастакі па ўсёй вясёлцы. І адразу ж пачалі маляваць. Ім не цярпелася даведацца, якога колеру фарбы ў іхніх вядзерцах. Узялі мастакі вялікі ліст паперы, і кожны па чарзе правёў па ім лінію сваім пэндзлікам. Атрымалася яркая, сямі колераў вясёлка. Мастакі былі шчаслівыя. Цяпер яны маглі намаляваць усё, пра што марылі. А што сталася з вясёлкай? Яна знікла. Таму што аддала ўсе свае фарбы. А калі пойдуць яе шукаць іншыя мастакі, яна зноў з’явіцца і аддасць ім свае новыя фарбы.

? Вызначыце, якія задачы па развіцці маўлення можна вырашаць пры дапамозе наступнага верша? Якім чынам можна выкарыстоўваць дадзены верш у працы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

Ягады
З мамай я збіраў суніцы,
А з бабуляю – чарніцы
Ездзіў з татам у маліны,
А з дзядулем – у ажыны.
А сягоння мы з сястрыцай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пойдзем разам у брусніцы,
Запрасілі сябрукі
Нас назаўтра ў буякі.
З кожнай, кожнай ягадай
Павітацца рады я.
М.Пазнякоў

Тэма. Развіццё беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту Практычныя заняткі (2 гадзіны).

Заданні для выканання .

- Адзначце асаблівасці лексікі беларускай мовы (у параўнанні з рускай).
- Назавіце агульнапрынятыя і спецыфічныя задачы развіцця слоўніка дзяцей у сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

Агульнапрынятыя задачы развіцця слоўніка дзяцей у сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.	Спецыфічныя задачы развіцця слоўніка дзяцей у сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя

- Закончыце выказванне: асноўным крытэрыям для адбору слоў з'яўляецца іх ……, *практычная……..., а таксама адпаведнасць*
……

- Састаўце слоўнікі па асобных тэмах азнаямлення дзяцей з навакольлем.

Адзенне і абутак	Посуд і ежа	Садавіна і агародніна	Мэбля і бытавая тэхніка
		○	

- Пералічыце прыёмы ўвядзення новых слоў беларускай мовы.
- Прывядзіце прыклады лексічных гульняў і практыкаванняў на пасіўнае і актыўнае распазнаванне слова для развіцця слоўніка дзяцей ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму.
- Прывядзіце прыклады лексічных гульняў і практыкаванняў на ўзнаўленне слоў з падказкай і без падказкі для развіцця слоўніка дзяцей ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму
- Прачытайце план заняткаў па тэме "Лялькі з саломкі і лёну":

1. Разглядванне саломкі. 2. Разглядванне лялькі з саломкі. 3. Разглядванне лёну. 4. Разглядванне лялькі з лёну. 5. Апісанне лялек з саломкі і лёну, прадстаўленых на выставе. Вызначыце слоўнік (назвы прадметаў, з якімі знаёмяцца дзеці); пералічыце метады і прыёмы, якія можна выкарыстаць на занятках.

- Вызначыце, якія задачы па развіцці беларускага маўлення можна вырашаць пры дапамозе народнай гульні "Агароднік"? Якім чынам можна выкарыстоўваць дадзеную гульню ў працы з дзецьмі?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гульня “Агароднік”.

Выхавальнік (В.):

- Прыдумайце, якой агароднінай вы сябе назавеце (рэпа, цыбуля, морква, бульба, бурак…), і станьце ў круг.
- Я буду агароднікам.

Выходзіць на сярэдзіну круга і стукае палкай аб зямлю.

– Дзеці: Хто там?

– В.: Агароднік!

– Дзеці: Чаго прыйшоў?

– В.: Рэпку ўзяць!

Пасля гэтага ўсе вядуць карагод і спяваюць:

- Зверху рэпка зялёная, у сярэдзіне тоўстая, напрыканцы вострая. Хавае хвост пад сябе. Хто да яе падыдзе, усялякі за віхор возьме.

Агароднік спрабуе адгадаць, хто з дзяцей назваў сябе рэпкай. Адгадваць можа тры разы.Калі адгадае, рэпка займае яго месца. Калі не – выбіраюць іншага агародніка.

? Вырашыце метадычную задачу. Вызначыце з якой мэтай выкарыстоўваецца гульня “Якая фарба ў мяне ў руцэ?” Выхавальнік хавае ў руцэ “фарбу” (кавалак кардону пэўнага колеру) і прапануе дзецям адгадаць, якая яна: сіняя, чырвоная або жоўтая. Дзеці адгадваюць, называючы свае варыянты з трох названых, затым выхавальнік паказвае “фарбу”. Да якой групы гульняў адносіцца гэтая гульня? Прывядзіце прыклады падобных гульняў .

? Вырашыце метадычную задачу:У час гульні выхаванцы адказваюць на пытанні дарослага наступнага тыпу: “У мяне ёсць яблык, агрэст і парэчкі. Што ты будзеш есці?”; “На чым ты спіш: на ложку ці на канапе?”; “Які колер табе падабаецца: чырвоны, блакітны ці зялёны?” і да т.п. Кожны раз выхавальнік адначасова з пытаннем паказвае адпаведную нагляднасць. З якой мэтай наладжваецца гэтая гульня? Да якой групы гульняў яна адносіцца? Прывядзіце прыклады падобных гульняў .

? Вырашыце метадычную задачу. Выхавальнік наладжвае гульню “Што я дастала з кошыка?” Ён гаворыць: ”Гаспадыня прынесла з кірмаша розную агародніну. Паспрабую адгадаць, што яна купіла. Калі я назаву правільна, вы ўсе разам скажыце:”Так”. Калі няправільна, скажыце: “Не”. Выхавальнік завязвае сабе вочы, затым выцягвае з кошыка па адным прадмеце, паказвае дзецям і, нібы спрабуючы адгадаць, дае некалькі назваў: “Бульба?” – “Не.” – “Бурак?” – “ Не.” – Цыбуля?” – “Так.” З якой мэтай наладжваецца гэта гульня? Да якой групы гульняў яна адносіцца? Прывядзіце прыклады гульняў з падобнымі сітуацыямі.

? Вырашыце метадычную задачу. На занятках па тэме “Адзенне” выхавальнік выконвае ролю прадаўца. Ён, напрыклад, гаворыць: “У нашым магазіне прадаюцца капялюшы. Капялюш надзяваюць на галаву. Яго носяць і жанчыны, і мужчыны. Летам капялюш носяць, каб сонца не пякло ў галаву, а ўвосень ці ўвесну – каб было цяплей. Хто хоча купіць капялюш? Пакажы яго. Так, гэта капялюш. Што ты купіш?” Назавіце прыем, які выкарыстоўвае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выхавальнік пры увядзенні новага слова. Якую задачу развіцця беларускага маўлення дзяцей дапамагае вырашыць гэты прыём?

? Зрабіце пералік дыдактычнага абсталявання беларускамоўнай лялькі ў адпаведнасці з сучасным побытам па спісе: магчымыя віды лялек, імя лялькі, бялізна, абутак, побыт, мэбля, ежа. Якія гульні-заняткі можна праводзіць з дыдактычнай беларускамоўнай лялькай?

? Вызначыце, якія задачы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту можна вырашаць пры дапамозе наступнага верша?

Вясёлка

Чырвоны!
І блакітны!
І зялёны!
Фіялетавы!
І жоўты!
Ну а болей
Не знайшоў ты?
Пашукай,
Бо хутка згіне.
Вось яшчэ знайшоўся … (сіні).
Не шукайце больш дарма…

С. Грахоўскі

? Якім чынам можна выкарыстоўваць дадзены верш у працы з дзецьмі?

Тэма. Методыка фарміравання граматычнага ладу маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту

Практычныя заняткі (2 гадзіны).



Заданні для выканання

? Пералічыце задачы навучання дзяцей дашкольнага ўзросту граматыцы беларускай мовы.

? Назавіце этапы авалодання дзецьмі граматычнымі элементамі маўлення (паводле А.І. Негнявіцкай, А.М. Шахнаровіча).

? Вырашыце метадычную задачу: дзеці дапускаюць памылкі ва ўтварэнні давальнага склону назоўнікаў. Назавіце дыдактычныя гульні і практыкаванні, якія дапамогуць выхаванцам засвоіць спосабы ўтварэння давальнага склону назоўнікаў. На якім змесце вы будзеце праводзіць гэтую працу з дзецьмі? Складзіце сцэнарый правядзення дыдактычнай гульні ў сярэдняй групе. Дайце назву гульні, вызначыце дыдактычныя задачы (навучальная, развіваючая, выхаваўчая), матэрыял, гульнявыя правілы, гульнявыя дзеянні, пазіцыю выхавальніка дашкольнай адукацыі падчас гульні.

? Вызначыце, якую задачу па развіцці беларускага маўлення можна вырашыць пры дапамозе наступнай гульнявой сітуацыі: да дзяцей прыходзіць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вельмі цікаўны хлопчык, які хоча пра ўсё ведаць. Яго так нават завуць - Цікаўка. Цікаўка ўвесь час задае пытанні дзецям: «Ці ідзе ўзімку дождж? Ці плавае рыбка ў вадзе?» і да т.п. У рэшце рэшт Цікаўка «стамляецца»: «Ці … ці … пра што б мне яшчэ спытаць: Ці падабаецца вам у садзіку? Ці… ці… ці хочаце вы, каб я яшчэ прыйшоў да вас?» Дзеці запрашаюць Цікаўку прысці яшчэ. Той кажа: «Я прыйду, але мне хочацца, каб вы ў мяне таксама пра што-небудзь спыталі». Выхавальнік прапануе спытаць у Цікаўкі пра тое, што ён любіць. Дае прыклад: «Ці любіш ты малако?» Дзеці па ўзоры складаюць свае пытанні. Затым можна прапанаваць малым спытаць Цікаўку пра тое, што ён ведае, і даць узор: «Ці ведаеш ты казкі» і г.д.

? Назавіце, з дапамогай якой народнай гульні можна фарміраваць акрэсленае маўленчае ўменне.

? Вызначыце, якую задачу па развіцці беларускага маўлення можна вырашаць пры дапамозе дыдактычнай гульні “Каму даць мячык?” Выхавальнік прапануе падарыць хлопчыкам мячыкі. *Каму ж дадзім першы мячык? Мішу дадзім. Вось, Міша, твой мячык. Яшчэ каму? Сашу дадзім мячык. Далей каму? Дзіму трэба даць мячык. Яшчэ дадзім мячыкі Алёшу і Валеру. Спачатку дадзім … каму*? (Працягвае мячык аднаму з дзяцей.) *Так, Алёшу. А зараз каму*? (*Валеру*) і г.д.

? Прывядзіце прыклады дыдактычных гульняў, з дапамогай якіх фарміруецца акрэсленае ў прыкладзе ўменне.

? Вызначыце, якія задачы па развіцці маўлення можна вырашаць пры дапамозе наступнага верша? Якім чынам можна выкарыстоўваць дадзены верш у працы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

Яблык

Залацісты, спелы яблык
На маёй ляжыць далоні.
Залацісты, буйны яблык
Быццам сонейка малое.

А. Мясткоўскі

? Вызначыце, з якой мэтай пры навучанні беларускай мове можна выкарыстаць прыведзены ніжэй верш І. Муравейкі?

Клапатлівы бацька-слон
Для сябе зрабіў услон,
А для сына сланянятка
Зрабіў услончык – усланятка.

І.Муравейка

? Дадайце свае практыкаванні для замацавання ў дзяцей адпаведнага маўленчага навыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма. Методыка выхавання гукавой культуры беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту

Практычныя заняткі (2 гадзіны).



Заданні для выканання

? Назавіце, на якія групы можна падзяліць фанемы беларускай мовы ў залежнасці ад ступені падабенства з фанемамі рускай мовы.

? Назавіце задачы навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускаму вымаўленню.

? Раскрыйце сістэму фанемычных гульняў і практыкаванняў на вымаўленне новага спецыфічнага беларускага гука (паводле К.Ю. Пратасавай). Прывядзіце канкрэтны прыклад.

? Падбярыце гульні і практыкаванні для фарміравання ў дзяцей правільнага вымаўлення падвоеных зычных.

? Вырашыце метадычную задачу: дзеці адчуваюць цяжкасці ў вымаўленні спецыфічна беларускага гука *дж*. Вызначыце, у якой узроставай групе, хутчэй за ўсё, знаходзяцца дзеці. Якую працу па фарміраванні правільнага вымаўлення гэтага гука варта праводзіць з выхаванцамі? Назавіце рухомыя сюжэтныя гульні для замацавання і актывізацыі вымаўлення гука *дж*

? Пры фарміраванні навыкаў вымаўлення таго ці іншага гука ў гульні важна прытрымлівацца пэўнай паслядоўнасці дзеянняў. Прывядзіце прыклады гульнявых практыкаванняў для фарміравння правільнага вымаўлення гука *дз* у адпаведнасці з пералічанымі этапамі:1. Этап слыхавога ўспрымання, які ўключае знаёмства з новым гукам у слове і абстрагаванне гука ад слова. 2. Пастаноўка ізаляванага беларускага гука шляхам тлумачэння і па меры магчымасці дэманстрацыя яго артыкуляцыі. 3.Слыхавыя практыкаванні на распазнаванне новага гука. 4. Імітацыя дзецьмі гукавых адрозненняў у гульні. 5. Самастойнае вымаўленне новага гука ў гульні. 6. Уключэнне патрэбнага гука ў словы і сказы беларускага вуснага маўлення ў працэсе гульнявых дзенняў.

? Характэрнай асаблівасцю беларускай фанетыкі з'яўляецца наяўнасць падоўжаных зычных. З якой мэтай выхавальнік праводзіць з дзецьмі практыкаванні на распазнаванне слоў з падоўжанымі зычнымі? На якім матэрыяле лепш праводзіць вызначэнне дзецьмі слоў з падоўжанымі зычнымі?

? Вызначыце, з якой мэтай пры навучанні дзяцей беларускай мове можна выкарыстаць верш А. Жыгунова "Блытаніна"?

Гебемот разявіў рот
І глядзіць на масалёт.
- Ты мяне паслухай, братка,
Масалёт – не кашаладка.
А. Жыгуноў

? Якую гульню можна правесці для замацавання ўяўленняў дзяцей аб гэтай моўнай заканамернасці?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма. Методыка развіцця прадуктыўнага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту

Практычныя заняткі (2 гадзіны).



Заданні для выканання

- Назавіце, ад чаго залежыць выбар тэм для заняткаў па развіцці прадуктыўнага беларускага маўлення дзяцей лашкольнага ўзросту.
- Пералічыце асноўныя прынцыпы фарміравання звязнага (дыялагічнага і маналагічнага) беларускага маўлення выхаванцаў**.**
- Падбярыце гульні і практыкаванні для развіцця дыялагічнага і маналагічнага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму.
- Распрацуйце канспект заняткаў па навучанні дзяцей расказванню па карціне В.К. Бялыніцкага-Бірулі (у адпаведнасці з вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі)
- Распрацуйце канспект агульняючай гутаркі з дзецьмі ад 5 да 6 гадоў.
- Прачытайце фрагмент заняткаў па развіцці маўлення: на дошцы выстаўлена сюжэтная карціна на тэму “Зімнія забавы” з адлюстраваннем дзяцей, якія выконваюць розныя дзеянні на прагулцы ўзімку: катаюцца на санках, лепяць снегавіка. Выхавальнік прапануе разглядзець карціну і саставіць па ёй апавяданне. Вызначыце від апавядання *(фактычны, творчы, з уласнага вопыту, сюжэтны, апісальны*). Складзіце ўзор апавядання выхавальніка.
- Прачытайце фрагмент заняткаў па развіцці маўлення. Вызначыце від апавядання, прапанаванага на занятках (фактычны, творчы, з уласнага вопыту, на тэму, працяг апавядання выхавальніка; сюжэтны, апісальны). Складзіце пачатак расказу выхавальніка.

Ход заняткаў.

На дошцы выстаўлена сюжэтная карціна на тэму “У лесе” з адлюстраваннем дзяцей, якія выконваюць розныя дзеянні ў лесе: збіраюць ягады, грыбы, заблудзіліся, разглядваюць вожыка. Выхавальнік прапануе паслухаць пачатак апавядання “Прыгоды ў лесе” … .

- Вызначыце праграмныя задачы, узроставую групу, від апавядання і складзіце план заняткаў па прапанаваным ўзоры апавядання выхавальніка : “У нас дома жыве коцік Мурчык. Ён чорны, толькі кончык хваста белы. Поўсць у яго пушыстая, мяккая, цёплая. Ляжыць Мурчык на дыванчыку і спявае песеньку: “мур-мур-мур”.
- Вырашыце метадычную задачу: У старшай групе дзіцячага сада дзеці разглядаюць нацюрморт І. Хруцкага “Кветкі і плады”. .Прывядзіце прыклад узору апавядання выхавальніка па карціне беларускага мастака І.Хруцкага “Кветкі і плады”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ

Тэма. Методыка азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа і развіццё беларускага маўлення

Практычныя заняткі (2 гадзіны).



Заданні для выканання

? Састаўце прыкладны сцэнарый правядзення фальклорнага свята з дзецьмі дашкольнага ўзросту (па выбары).

? Вырашыце метадычную задачу. У сярэдзіне сакавіка і ў пачатку красавіка ва ўстанове дашкольнай адукацыі дзеці гукаюць вясну. Прывядзіце прыклады народных гульняў, у якія гуляюць дзеці ў час свята. Састаўце прыкладны план святкавання “Гукання вясны” ў дзіцячым садзе.

Тэма. Дыягностыка развіцця беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя. Планаванне адукацыйнай дзейнасці па развіцці беларускага маўлення і культуры маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту

Практычныя заняткі (2 гадзіны).



Заданні для выканання

1. Падабраць сучасную дыягнастычную методыку развіцця маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму і скласці план абследавання маўленчага развіцця дзіцяці.

2. Раскрыць, у чым заключаецца комплексны падыход да заняткаў па развіцці беларускага маўлення дзяцей.

3. Саставіць план-канспект заняткаў па тэме “Адзенне” для другой малодшай, сярэдняй, старшай груп установы дашкольнай адукацыі.

? Прачытайце запіс заняткаў па развіцці беларускага маўлення. Вызначыце, для якой ўзроставай групы гэтыя заняткі, маўленчыя задачы, від заняткаў, метады і прыёмы. Дадайце свае прыклады метадаў і прыёмаў правядзення заняткаў.

Ход заняткаў

На стале макет з сажалкай.

Выхавальнік:

- Якая прыгожая сажалка! Сюды вельмі часта прыходзяць гусі, качкі.
- Паслухайце, дзеці, і адгадайце, хто ідзе да сажалкі: кра-кра-кра! (з’яўляецца качка.)
- Качка прыйшла купацца. Што робіць качка?
- Выйшла з вады пайшла на кладачку на сонейку пагрэцца. Каго вы бачыце на кладачцы?
- Вось яшчэ хтосьці бяжыць да кладачкі. Хто гэта? Маленькае … качаня.
- Качаня села на кладачцы каля качкі. Хто цяпер сядзіць на кладачцы?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Колькі качак і колькі качанят?
- Хтосьці зноў ідзе да сажалкі. Так, яшчэ адна вялікая качка.
- Села качка на кладачку. Каго вы цяпер бачыце на кладачцы?
- Каго больш – качак ці качанят?
- Што трэба зрабіць, каб качак і качанят было пароўну? Паклічам яшчэ адно качаня. (Кра-кра!)
- Колькі цяпер качанят?
- А вось паблізу прабяжала лісіца. Качкі спужаліся і кінуліся ў ваду.”

? Да прыведзенага праграмнага зместу комплексных заняткаў падбярыце адпаведныя дыдактычныя практыкаванні і гульні, якія б спрыялі засваенню дзецьмі граматычных форм

Праграмны змест: развіваць уменне адказваць на пытанні пра знешні выгляд цацкі, складаць апісанне цацкі з 2-3 сказаў. Узбагачаць слоўнік сінонімамі, антонімамі, дзеясловамі, прыметнікамі. Практыкаваць ва ўтварэнні назоўнікаў з дапамогай памяншальных суфіксаў.

Тэма. Метадычнае кіраўніцтва работай па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя

Практычныя заняткі (2 гадзіны).

Заданні для выканання

1. Скласці схему-памятку кантролю за выкананнем стандартаў і рэалізацыяй адукацыйнай праграмы адносна білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту.

Літаратура асноўная.

1. Дубініна, Д. М. Выхаванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту цікавасці да беларускай мастацкай літаратуры і фальклору **:** дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі / Д. М. Дубініна. – Мінск: Новое знание, 2016. – 208 с.

2. Свірыдзенка, В. І. Фарміраванне маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў : тэорыя і практыка / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Беларус. дзярж. пед.ун-т, 2019. – 280 с.

3. Современные педагогические технологии в образовательном процессе учреждения дошкольного образования : учеб.-метод. пособие / под общ. ред. В. Н. Шашок ; сост. В. Н. Шашок [и др.]. – Минск : Акад. последиплом. образования, 2019. – 123 с.

Літаратура дадатковая:

4. Дубініна, Дз.М. Развіццё вобразнага беларускага маўлення ў дзяцей старшага дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму / Дз.М. Дубініна // Весці Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 1. Педагогіка. Псіхалогія. Філасофія. – 2007. – № 3. – С. 15–18.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Дубініна, Д. М. Родная прырода ў вуснай народнай творчасці : дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі / Д. М. Дубініна, А. А. Страха, Д. У. Дубінін. – 2-е выд. – Мазыр : Белы Вецер, 2016. – 133 с.

6. Дубініна, Д.М. Культура Беларусі ў казках і паданнях / Д.М. Дубініна, Д.Ул. Дубінін. – Мінск, 2008.

7. Някрасава, Н.Д. Беларуская народнай казка ў дзіцячым садзе / Н.Д. Някрасава, Р.В. Маісеенка. – Мінск, 2000. – 125 с.

8. Старжынская, Н.С. Заняткі па развіцці маўлення і маўленчых зносін у дзіцячым садзе / Н.С. Старжынская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2008. – 172 с.

9. Старжынская, Н.С. Методыка развіцця роднай мовы : вучэб. дапаможнік / Н.С. Старжынская, Дз.М. Дубініна. – Мінск : Выш. шк., 2008. – 301 с.

10. Старжынская, Н. С. Развіцце беларускага маўлення дашкольнікаў ад 4 да 5 гадоў: вучэб. нагляд. дапам. для педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання / Н.С. Старжынская, Д.М. Дубініна. – Мінск : Аверсэв, 2017, 2018. – 28 с.

11. Старжынская, Н. С. Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў ад 5 да 7 гадоў**:** вучэб. нагляд. дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з рус. мовай навучання / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. – Мінск : Аверсэв, 2018. – 40 с.

12. Старжынская, Н.С. Развіцце беларускага маўлення і маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту ад 6 да 7 гадоў: вучэб. нагляд. дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з рус. мовай навучання / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. – Мінск : Аверсэв, 2017, 2018. – 60 с.

13. Старжынская, Н. С. Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў ад 4 да 7 гадоў : вучэб.-метад. дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з рус. мовай навучання / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – 184 с.

14. Старжынская Н.С. Развіццё беларускага маўлення як сродку камунікацыі / Н.С. Старжынская, Дз.М. Дубініна. – Мінск, 2001. – 144 с.

15. Старжынская, Н. С. Крылаў не мае, а хутка лятае. Лінгвістычныя гульні для дзяцей 4 – 7 гадоў / Н.С. Старжынская. – Мінск, 2007. – 160 с.

16. Старжынская, Н. С. Фарміраванне граматычнага ладу маўлення дзяцей / Н.С. Старжынская // Пралеска. – 2006. - № 8-9.

17. Старжынская, Н.С. Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў / Н.С. Старжынская. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 223 с.

18. Старжынская, Н.С. Маўленчае і лінгвістычнае развіццѐ дашкольнікаў / Н.С. Старжынская. – Мінск, 2007.

19. Старжынская Н.С. Развіццё беларускага маўлення як сродку камунікацыі / Н.С. Старжынская, Дз.М. Дубініна. – Мінск, 2001. – 144 с.

Пералік заданняў і кантрольных мерапрыемстваў кіруемай самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту»

Кіруемая самастойная работа студэнтаў па вывучэнні дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» арыентавана на самастойнае набыццё імі неабходных для прафесіі ведаў і уменняў. Асобасна-арыентаваны падыход пры арганізацыі самастойнай працы спрыяе стварэнню неабходных умоў, якія забяспечваюць магчымасць самаадукацыі, самаразвіцця студэнтаў.

У ходзе вучэбнай дзейнасці па вывучэнні дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» студэнты ажыццяўляюць наступныя віды самастойнай працы.

Заданні, якія фарміруюць дастатковыя веды на ўзроўні пазнавання: чытанне тэксту (падручніка, дадатковай літаратуры); складанне плана тэксту; графічны малюнак структуры тэксту; праца з табліцамі і схемамі па дысцыпліне; праца са слоўнікам і даведнікамі; азнаямленне з нарматыўнымі дакументамі; выкарыстанне аўдыё-і відэазапісаў дзіцячага маўлення.

Заданні, якія фарміруюць кампетэнцыі на ўзроўні узнаўлення: аналітычная апрацоўка тэксту (анатаванне, рэцэнзаванне, рэферыраванне, кантэнт-аналіз і інш.); падрыхтоўка матэрыялу да калоквіуму; пісьмовы параўнальны аналіз асобных метадаў і прыёмаў працы па развіцці маўлення дзяцей, складанне пісьмовай характарыстыкі маўленчага развіцця дзяцей, складанне схемы алгарытму правядзення заняткаў і іншых форм работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей; складанне бібліяграфіі, тэматычных крыжаванак).

Заданні, якія фарміруюць кампетэнцыі на ўзроўні прымянення атрыманых ведаў: самастойны выбар сродкаў і метадаў вырашэння вучэбна-даследчых заданняў; праектаванне і мадэляванне розных відаў і кампанентаў прафесійнай дзейнасці; рэфлексіўны аналіз прафесійных уменняў.

№п/п	Назва тэмы раздзела	Колькасць гадзін на КСР	Заданні (па ўзроўням складанасці)	Форма выканання
	6 семестр			
1	Тэма 1.1 Білінгвізм як сацыяльна-культурны і псіхолага-педагагічны феномен	2л	*Узровень 1:* засвоіць асноўныя тэорыі развіцця білінгвальных маўленчых навыкаў дзецьмі дашкольнага ўзросту; скласці слоўнік тэрмінаў.	Тэсціраванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

			Узровень 2: скласці табліцу, якая адлюстроўвае вартасці і недахопы тэорый і канцэпцый развіцця маўлення дзяцей ва ўмовах білінгвізму; бібліяграфічны спіс літаратуры па праблеме развіцця маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.	Аналітыка-параўнальная табліца асноўных тэорый і канцэпцый развіцця маўлення дзяцей ва ўмовах білінгвізму Бібліяграфічны спіс літаратуры па праблеме развіцця маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.
			Узровень 3:: правесці рэфлексіўны аналіз уплыву білінгвізму на кагнітыўна-камунікатыўнае развіццё дзяцей дашкольнага ўзросту.	Пісьмовы рэфлексіўны аналіз уплыву білінгвізму на кагнітыўна-камунікатыўнае развіццё дзяцей дашкольнага ўзросту
2	Тэма 2.1 Этапы станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі	2л	*Узровень 1:*засвоіць вучэбны матэрыял па гісторыі развіцця і станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі; скласці графічны малюнак этапаў станаўлення.	Графічны малюнак этапаў станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі
			Узровень 2: аналітычна апрацаваць вучэбны матэрыял па праблеме гісторыі развіцця і станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі і скласці пісьмовы параўнальны аналіз станаўлення білінгвальнай адукацыі ў Беларусі ў другой палове XX-пачатку XXI стагоддзяў.	Пісьмовы параўнальны аналіз станаўлення і развіцця білінгвальнай адукацыі ў Беларусі ў другой палове XX-пачатку XXI стагоддзяў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

			Узровень 3: скласці эссэ «Роля беларускіх пісьменнікаў ў развіцці і станаўленні білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі»	Эссэ «Роля беларускіх пісьменнікаў ў развіцці і станаўленні білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі»
3	Тэма 4.7 Методыка азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа і развіццё беларускага маўлення	2л	*Узровень 1:*засвоіць змест, структуру і саставіць спіс народных, якія можна святкаваць ва ўстанове дашкольнай адукацыі; зрабіць кароткае апісанне народных святаў.	Спіс народных свят, якія можна святкаваць ва ўстанове дашкольнай адукацыі Кароткае апісанне народных святаў
			Узровень 2: скласці бібліяграфію і анатацыі вучэбна-метадычных дапаможнікаў па азнаямленні дзяцей дашкольнага ўзросту з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа.	Бібліяграфія і анатацыя вучэбна-метадычных дапаможнікаў па азнаямленні дзяцей дашкольнага ўзросту з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа
			Узровень 3: праектаваць і мадэляваць народнае свята для дзяцей дашкольнага ўзросту.	Сцэнар народнага свята для дзяцей дашкольнага ўзросту.
4	Тэма 4.9 Метадычнае кіраўніцтва работай па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя	2л	*Узровень 1:*: скласці графічны малюнак і апісанне прыцыпаў планавання работы па развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту; апісанне відаў планавання работы па развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.	Графічны малюнак і апісанне прыцыпаў планавання работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту Пісьмовае апісанне відаў планавання работы па развіцці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

				беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту
			Узровень 2:: аналітычна апрацаваць вучэбны матэрыял па праблеме і скласці табліцу форм метадычнай работы ва ўстанове дашкольнай адукацыі; скласці анатацыі методык дыягностыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту, бібліяграфія літаратуры па альтэрнатыўных і варыятыўных методыках развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.	Табліца форм метадычнай работы ва ўстанове дашкольнай адукацыі Анатацыі альтэрнатыўных і варыятыўных дыягнастычных методык развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Бібліяграфія літаратуры па методыках дыягностыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.
			Узровень 3: праектаваць і мадэляваць тэматычны кантроль па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.	Структурна-лагічная схема правядзення тэматычнага кантролю па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

Планаванне і заданні для лабараторных заняткаў па развіцці беларускага маўлення

Лабараторныя заняткі № 1, №-2 (4 гадзіны)

Тэма вучэбнай праграмы дысцыпліны.

Тэма 4.9 Метадычнае кіраўніцтва работай па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя

Пытанне: «Кантроль за выкананнем стандартаў і рэалізацыяй адукацыйнай праграмы адносна білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту**».**

Тэма заняткаў: «*Вызначэнне* моўных і кагнітыўных здольнасцей дзіцяці *шматмоўных дзяцей* (Gagarina N. I інш.) »..

Змест заданняў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Распрацаваць заданні для вывучэння наратыўных навыкаў выхаванцаў старшай групы ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі і прадумаць матываванасць выканання заданняў дзецьмі ў адпаведнасці з узростам.

2. Падабраць неабходны наглядны матэрыял для ацэнкі апавядальных навыкаў у дзяцей, якія авалодваюць адной або некалькімі мовамі ад нараджэння або з ранняга дашкольнага ўзросту.

3. Правесці абследаванне з адным дзіцем, выявіць асаблівасці маўленчага развіцця і скласці план індывідуальнай карэкцыйнай працы.

Вызначэнне паняцця.

Наратыў – гэта тэкст, пабудаваны па прынцыпе разгортвання апавядання. Дзіцячы наратыў з'яўляецца натуральнай і чыстай крыніцай як для даследвання моўных, так і кагнітыўных здольнасцей дзіцяці.

Методыка ўключае тры заданні для вызначэння наратыўных навыкаў дзяцей:

1) складанне апавядання па серыі малюнкаў;

2) пераказ праслуханай гісторыі з апорай на адпаведную серыю малюнкаў;

3) складанне апавядання па ўзоры.

Стымульны матэрыял уключае серыі сюжэтных малюнкаў (з 6 карцінак). Дзіцяці паслядоўна прад'яўляюць выяву з новай сцэнай развіцця, што дапамагае разумець і расказваць звязную гісторыю. Пасля выканання кожнага задання дзіцяці задаюць 10 стандартных пытанняў для ацэнкі разумення гісторыі.

Вынік працы

Пратакол абследавання наратыўных навыкаў, аналіз і план індывідуальна-карэкцыйнай работы з адным дзіцём.

План канспект гульняў і практыкаванняў для індывідуальнай карэкцыйнай працы з дзецьмі.

Лабараторныяе заняткі № 3 (2 гадзіны)

Тэма вучэбнай праграмы дысцыпліны.

Тэма 4.9 Метадычнае кіраўніцтва работай па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя

Пытанне: «Дыдактычнае абсталяванне метадычнага кабінета для арганізацыі білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту**».**

Змест заданняў.

1. Пазнаёміцца з наглядным дапаможнікамі па навучанні беларускаму маўленню дзяцей дашкольнага ўзросту і скласці іх бібліяграфічны спіс з кароткай анатацыяй.

2. Скласці план-канспект адукацыйнай сітуацыі з выкарыстаннем нагляднага дапаможніка па навучанні беларускаму маўленню дзяцей дашкольнага ўзросту і самастойна правесці адукацыйную сітуацыю ў адной з узроставых груп установы дашкольнай адукацыі.

Вынік працы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Бібліяграфічны спіс наглядных дапаможнікаў для навучання беларускаму маўленню дзяцей дашкольнага ўзросту і іх кароткая анатацыя .

2. План-канспект адукацыйнай сітуацыі з выкарыстаннем нагляднага дапаможніка па навучанні беларускаму маўленню дзяцей дашкольнага ўзросту».

Планаванне і заданні для выканання самастойнай работы студэнтаў

№ п/п	Назва тэмы, раздзела	Колькасць гадзін	Заданне	Форма выканання
1	**2**	3	**4**	**5**
	6 семестр			
1	**Раздел 1. Тэарэтычныя асновы тэхналогіі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму**	12	Самастойная работа ў выглядзе выкананняў індывідуальных практычных заданняў ў сістэме MOODLE.	Выкананне практычных заданняў. Тэсціраванне. Рабочы сшытак
	Білінгвізм як сацыяльна-культурны і псіхолага-педагагічны феномен.	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі, картатэку тэрмінаў.	Рабочы сшытак. Аналітычны агляд літаратуры па праблеме. Асацыятыўныя крыжаванкі Картатэка тэрмінаў. Рэйтынгавая кантрольная работа №1
	Тэхналогія развіцця беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму як частка педагагічнай навукі.	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; картатэку тэрмінаў.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Картатэка тэрмінаў
	Канцэптуальныя асновы тэхналогіі развіцця беларускага маўлення дзяцей	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Скласці аналітычны агляд літаратуры па	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму.		праблеме; картатэку тэрмінаў.	Картатэка тэрмінаў
	Раздзел 2. Станаўленне білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі	6	Самастойная работа ў выглядзе выкананняў індывідуальных практычных заданняў ў сістэме MOODLE.	Рабочы сшытак Выкананне практычных заданняў Тэсціраванне
	Этапы станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі.	6	Распрацаваць прэзентацыю «Этапы станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі».	Рабочы сшытак Прэзентацыя «Этапы станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі». Рэйтынгавая кантрольная работа №2
	Раздзел 3. Сістэма работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання	12	Самастойная работа ў выглядзе выкананняў індывідуальных практычных заданняў ў сістэме MOODLE.	Рабочы сшытак Выкананне практычных заданняў Тэсціраванне
	Мэта і задачы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму.	4	Прааналізаваць адукацыйную галіну «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі і скласці табліцу ўскладненняў праграмных патрабаванняў да розных бакоў маўлення дзяцей	Рабочы сшытак Табліца ўскладненняў праграмных патрабаванняў да розных бакоў маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

			дашкольнага ўзросту	
	Метадычныя прынцыпы і сродкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму.	4	Распрацаваць прэзентацыю «Метадычныя прынцыпы і сродкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму».	Рабочы сшытак Прэзентацыя «Метадычныя прынцыпы і сродкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму»
	Метады і прыёмы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.	4	Зрабіць пісьмовы аналіз **м**етадаў і прыёмаў развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.	Рабочы сшытак Пісьмовы аналіз **м**етадаў і прыёмаў развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя
	Раздзел 4. Асноўныя напрамкі работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму	36	Самастойная работа ў выглядзе выкананняў індывідуальных практычных заданняў ў сістэме MOODLE.	Рабочы сшытак Выкананне практычных заданняў Тэсціраванне
	Камунікатыўная накіраванасць развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.	4	Распрацаваць прэзентацыю «Нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове». Распрацаваць табліцу «Развіццё	Прэзентацыя «Нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове» Табліца «Развіццё

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

			маўлення як сродка камунікацыі ў дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту (форма камунікацыі, змест камунікацыі, прыкладныя тэмы камунікацыі)».	маўлення як сродка камунікацыі ў дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту (форма камунікацыі, змест камунікацыі, прыкладныя тэмы камунікацыі)»
	Мастацка-маўленчая дзейнаць як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі, картатэку тэрмінаў.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Асацыятыўныя крыжаванкі Картатэка тэрмінаў
	Развіццё беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі, картатэку тэрмінаў; перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Асацыятыўныя крыжаванкі Картатэка тэрмінаў Перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў
	Фарміраванне граматычнага ладу маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі, картатэку тэрмінаў; перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Асацыятыўныя крыжаванкі Картатэка тэрмінаў Перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў
	Выхаванне гукавой	4	Пісьмовая работа ў	Рабочы сшытак

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	культуры беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту		рабочым сшытку. Складсці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі, картатэку тэрмінаў; перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў.	Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Асацыятыўныя крыжаванкі Картатэка тэрмінаў Перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў
	Развіцце прадуктыўнага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Складсці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі, картатэку тэрмінаў; перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Асацыятыўныя крыжаванкі Картатэка тэрмінаў Перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў
	Азнаямленне дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа і развіццё беларускага маўлення	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Складсці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі, картатэку тэрмінаў; сцэнар правядзення народнага свята.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Асацыятыўныя крыжаванкі Картатэка тэрмінаў Сцэнар правядзення народнага свята Рэйтынгавая кантрольная работа №3
	Дыягностыка работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Складсці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі, картатэку тэрмінаў;	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Гульнявыя заданні для аператыўнай дыягностыкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

			гульнявыя заданні для аператыўнай дыягностыкі развіцця маўлення дзяцей для адной з узроставых груп.	развіцця беларускага маўлення дзяцей для адной з узроставых груп
	Метадычнае кіраўніцтва работай па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя	4	Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме. Распрацаваць план семінара-практыкума, план тэматычнага кантролю, гадавы план работы па адной з задач развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме План семінара-практыкума, план тэматычнага кантролю, гадавы план работы па адной з задач развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту
	Усяго	66		

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:

1. Вусная форма: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках; даклады на семінарах; вусныя экзамены.

2. Пісьмовая форма: тэсціраванне, кантрольныя апытванні; кантрольныя работы; пісьмовыя работы па аўдыторных практыкаваннях, рэфераты, эсэ; пісьмовыя справаздачы па лабараторных работах, пісьмовыя экзамены.

3. Вусна-пісьмовая форма: справаздачы па аўдыторных практычных практыкаваннях з іх вуснай абаронай; справаздачы па самастойных пазааўдыторных практычных практыкаваннях з іх вуснай абаронай; справаздачы па лабараторных работах з іх вуснай абаронай; экзамены.

Для бягучага кантролю якасці засваення ведаў студэнтамі выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментар:

вусныя апытванні;

пісьмовае выкананне практычных заданняў у рабочым сшытку ,

выкананне заданняў і практыкаванняў ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы) па тэмах курса;

пісьмовыя кантрольныя работы па асобных тэмах курса;

кампутарны тэставы кантроль: падбор каротках адказаў у адпаведнасці з заданнямі;

абарона заданняў пры выкананні студэнтамі лабараторных работ.

Прамежкавая атэстацыя праводзіцца ў форме вуснага або пісьмовага экзамена.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Рэйтынгавыя кантрольныя работы па вучэбнай дысцыпліне
«Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту»

<table>
<tr><th>Форма рэйтынгавай кантрольнай работы</th><th>Змест кантрольнай работы</th><th>Крытэрыі ацэнкі</th></tr>
<tr><td>Вусная</td><td>Абарона індывідуальнага праекта «Распрацоўка буктрэйлера па сюжэтах беларускіх народных казак і методыкі яго выкарыстання ў працы з дзецьмі дашкольнага ўзросту».
Праект прадугледжвае распрацоўку буктрэйлера “Беларуская народная казка —(назва казкі)” і методыкі яго выкарыстання ў працы з дзецьмі дашкольнага ўзросту.
Тэматыка і змест буктрэйлера павінны адпавядаць зместу адукацыйных галін «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін», «Мастацкая літаратура» вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі. Казка выбіраецца студэнтам ў адпаведнасці з прыкладным колам дзіцячага чытання вучэбнай праграмы дашкольнай адукацы для канкрэтнай узроставай групы ўстановы</td><td>
<table>
<tr><th>№ п/п</th><th>Крытэрыі ацэнкі абароны індывідуальнага праекта</th><th>Балы</th></tr>
<tr><td>1</td><td>Адпаведнасць тэмы і зместу буктрэйлера зместу адукацыйных галін «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін», «Мастацкая літаратура» вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі для пэўнай ўзроставай групы ўстановы дашкольнай адукацыі.</td><td>10</td></tr>
<tr><td>2</td><td>Інфармацыйнасць буктрэйлера</td><td>10</td></tr>
<tr><td>3</td><td>Візуалізацыя матэрыяла буктрэйлера</td><td>10</td></tr>
<tr><td>4</td><td>Эстэтычнае афармленне буктрэйлера</td><td>10</td></tr>
<tr><td>5</td><td>Суадносіны ілюстрацыйнага раду буктрэйлера з інфармацыяй(музыкай)</td><td>10</td></tr>
<tr><td>6</td><td>Граматычная правільнасць моўнага матэрыялу</td><td>10</td></tr>
<tr><td>7</td><td>Дакладная фармуліроўка задач выкарыстання буктрэйлера ў рабоце з дзецьмі.</td><td>10</td></tr>
<tr><td>8</td><td>Абгрунтаванасць методыкі выкарыстання</td><td>10</td></tr>
</table>
</td></tr>
</table>

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

<table>
<tr>
<td></td>
<td>дашкольнай адукацыі.
Падчас абароны праекта неабходна прэзентаваць буктрэйлер, абгрунтаваць выбар тэмы і зместу буктрэйлера, сфармуляваць задачы выкарыстання буктрэйлера, раскрыць методыку яго выкарыстання ў мастацка-маўленчай дзейнасці з дзецьмі.</td>
<td>
<table>
<tr><td></td><td>буктрэйлера ў рабоце з дзецьмі.</td><td></td></tr>
<tr><td>9</td><td>Змястоўнае, лагічнае і паслядоўнае выкарыстанне асноўных палажэнняў у час абароны праекта.</td><td>10</td></tr>
<tr><td>10</td><td>Свабоднае валоданне тэмай праекта, актыўная пазіцыя студэнта ў час абароны праекта.</td><td>10</td></tr>
</table>
10 (дзесяць) балаў, залічана: 100-95
9 (дзевяць) балаў, залічана: 94-90
8 (восем) балаў, залічана: 89-84
7 (сем) балаў залічана: 83-79
6 (шэсць) балаў, залічана: 78-72
5 (пяць) балаў, залічана: 71-65
4 (чатыры) бала, залічана: 64-60
Не залічана: менш за 60 балаў
</td>
</tr>
<tr>
<td>Пісьмовая</td>
<td>Напісанне тэрміналагічнай дыктоўкі па тэмах вучэбнай праграмы ў адпаведнасці з тэрмінамі, што асобна вызначаны ў вучэбным дапаможніку “Развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту”/ Н.С.Старжынская, Д.М. Дубініна. – Мінск : РІВШ,2022. –396 с.</td>
<td>
Крытэрыі ацэнкі тэрміналагічнай дыктоўкі
<table>
<tr><th>Працэнт карэктна раскрытых тэрмінаў</th><th>Балы</th></tr>
<tr><td>100 %</td><td>10</td></tr>
<tr><td>90%</td><td>9</td></tr>
<tr><td>80%</td><td>8</td></tr>
<tr><td>70%</td><td>7</td></tr>
</table>
</td>
</tr>
</table>

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

<table>
<tr>
<td></td>
<td></td>
<td>
<table>
<tr><td>60%</td><td>6</td></tr>
<tr><td>50%</td><td>5</td></tr>
<tr><td>40%</td><td>4</td></tr>
<tr><td>30%</td><td>3</td></tr>
<tr><td>20%</td><td>2</td></tr>
<tr><td>10%</td><td>1</td></tr>
</table>
Не залічана: менш за 4 бала
</td>
</tr>
<tr>
<td>Тэхнічная</td>
<td>Выкананне тэстаў у СДН Moodle па тэмах, якія разглядаюцца на лекцыях, семінарскіх і практычных занятках у сёмым семестры вывучэння вучэбнай дысцыпліны.
Кантрольная работа ўключае 30 тэстаў, якія выбіраюцца праграмай выпадковым чынам з банка тэстаў.</td>
<td>Налічэнне балаў за выкананне кантрольной работы праграма здзяйсняе аўтаматычна.</td>
</tr>
</table>

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэсты да тэхнічнай кантрольнай работы

Тэма “Білінгвізм с сацыя-культурны і псіхолага-педагагічны фенамен”

Змест.

Білінгвальная кампетэнтнасць і камунікатыўная актыўнасць як асноўныя крытэрыі для вызначэння сутнасці білінгвізму.

Псіхолага-лінгвістычная характарыстыка білінгвізму: рэцэптыўны, рэпрадуктыўны і прадуктыўны білінгвізм; нарматыўны, аднабакова-нарматыўны і ненарматыўны білінгвізм; каардынацыйны і субардынацыйны білінгвізм; натуральны і штучны білінгвізм. З’явы інтэрферэнцыі і транспазіцыі ў маўленні білінгва.

Класіфікацыя білінгваў у кантэксце антагенезу: паралельны (адначасовы) і паслядоўны білінгвізм.

Сацыялінгвістычны крытэрый ступені роднасці дзвюх моў: білінгвізм блізкароднасны і неблізкароднасны. Уплыў ступені роднасці дзвюх моў на ступень праяўлення інтэрферэнцыі ў маўленні білінгва.

1. Вызначыце, якое азначэнне тэрміну “білінгвізм” з’яўляецца карэктным:
1. білінгвізм – гэта двухмоўе
2. білінгвізм – адхіленні ў маўленні, выкліканыя ўплывам другой мовы
3. білінгвізм – папераменнае карыстанне дзвюма мовамі ў працэсе зносін
4. білінгвізм – выкарыстанне трох і больш моў у працэсе зносін
5. білінгвізм – гэта шматмоўе

2. Вызначыце, што азначае тэрмін “білінгвізм”:
1. білінгвізм – памылкі ў маўленні, выкліканыя ўплывам другой мовы
2. білінгвізм – адхіленні ў маўленні, выкліканыя ўплывам другой мовы
3. білінгвізм – здольнасць тых ці іншых груп насельніцтва размаўляць на абедзьвух мовах
4. білінгвізм – выкарыстанне трох і больш моў у працэсе зносін
5. білінгвізм – гэта шматмоўе

3. Вызначыце, як называецца разнавіднасць білінгвізму, калі дзвюма мовамі валодаюць асобныя людзі:
1. індывідуальны
2. групавы
3. поўны
4. нацыянальны
5. дзяржаўны

4. Вызначыце, як называецца разнавіднасць білінгвізму, калі двухмоўнымі з’яўляюцца цэлыя групы або сацыяльныя слаі:
1. індывідуальны
2. групавы
3. поўны
4. нацыянальны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. дзяржаўны

5. Вызначыце, як называецца разнавіднасць білінгвізму, калі ён характэрны для ўсіх сацыяльных груп народа:

1. індывідуальны
2. групавы
3. поўны
4. нацыянальны
5. дзяржаўны

6. Вызначыце, як называецца разнавіднасць білінгвізму, калі ён распаўсюджаны сярод прадстаўнікоў усёй нацыі:

1. індывідуальны
2. групавы
3. поўны
4. нацыянальны
5. дзяржаўны

7. Вызначыце, як называецца разнавіднасць білінгвізму, калі статус дзяржаўнай маюць дзве мовы:

1. індывідуальны
2. групавы
3. поўны
4. нацыянальны
5. дзяржаўны

8. Вызначыце, як называецца разнавіднасць білінгвізму, пры якім мае месца дамінантная мова (мова мыслення):

1. субарданацыйны
2. групавы
3. поўны
4. нацыянальны
5. дзяржаўны

9. Вызначыце, як называецца разнавіднасць білінгвізму, пры якім няма дамінуючай мовы і білінгв думае на той мове, на якой гаворыць:

1. каарданацыйны
2. групавы
3. поўны
4. нацыянальны
5. дзяржаўны

10. Вызначыце, як называецца разнавіднасць білінгвізму па засвоеных маўленчых дзеяннях:

1. рэцэптыўны, рэпрадуктыўны і прадуктыўны білінгвізм

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

2. субардынацыйны і каардынацыйны
3. штучны і натуральны
4. нарматыўны, аднабакова-нарматыўны і ненарматыўны білінгвізм
5. ранні і позні

11. Вызначыце, як называецца разнавіднасць білінгвізму па сувязі з мысленнем:
1. непасрэдны і апасродкаваны
2. субардынацыйны і каардынацыйны
3. штучны і натуральны
4. нарматыўны, аднабакова-нарматыўны і ненарматыўны білінгвізм
5. ранні і позні

12. Вызначыце, як называецца разнавіднасць білінгвізму па ўмовах узнікнення:
1. непасрэдны і апасродкаваны
2. субардынацыйны і каардынацыйны
3. штучны і натуральны
4. нарматыўны, аднабакова-нарматыўны і ненарматыўны білінгвізм
5. ранні і позні

13. Вызначыце, як называецца разнавіднасць білінгвізму па колькасці ўдзельнікаў у моўных зносінах:
1. непасрэдны і апасродкаваны
2. індывідуальны і калектыўны
3. штучны і натуральны
4. нарматыўны, аднабакова-нарматыўны і ненарматыўны білінгвізм
5. ранні і позні

14. Вызначыце, як называецца разнавіднасць білінгвізму паводле псіхалагічнага механізму асобных моўных дзеянняў:
1. непасрэдны і апасродкаваны
2. індывідуальны і калектыўны
3. штучны і натуральны
4. нарматыўны, аднабакова-нарматыўны і ненарматыўны білінгвізм
5. рэцэптыўны, рэпрадуктыўны,прадуктыўны

15. Вызначыце, як называецца разнавіднасць білінгвізму, у аснове якой ляжыць якасць засваення і ўжывання моў:
1. непасрэдны і апасродкаваны
2. індывідуальны і калектыўны.
3. штучны і натуральны
4. нарматыўны, аднабакова-нарматыўны і ненарматыўны білінгвізм
5. рэцэптыўны, рэпрадуктыўны,прадуктыўны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

16. Вызначыце, як называецца разнавіднасць білінгвізму па спосабе сувязі маўлення з мысленнем:

1. каардынацыйны і субардынацыйны
2. індывідуальны і калектыўны.
3. штучны і натуральны
4. нарматыўны, аднабакова-нарматыўны і ненарматыўны білінгвізм
5. рэцэптыўны, рэпрадуктыўны і прадуктыўны

17. Вызначыце правільнае тлумачэнне паняцця “транспазіцыя”:

1. маўленчыя памылкі ў выніку ўзаемаўплыва дзвюх моў
2. станоўчы перанос навыкаў і ўменняў ў маўленні на другой мове
3. узаемаўплыў дзвюх моў
4. міжвольнае несвядомае адхіленне ад нормаў мовы
5. памылкі маўлення ў выніку ўплыву любой з двух моў на іншую ва ўмовах білінгвізму

18. Вызначыце правільнае тлумачэнне паняцця “транспазіцыя”:

1. маўленчыя памылкі ў выніку ўзаемаўплыва дзвюх моў
2. станоўчы перанос навыкаў і ўменняў ў маўленні на другой мове
3. узаемаўплыў дзвюх моў
4. міжвольнае несвядомае адхіленне ад нормаў мовы
5. памылкі маўлення ў выніку ўплыву любой з двух моў на іншую ва ўмовах білінгвізму

19. Вызначыце правільнае тлумачэнне тэрміну “білінгв”:

1. білінгв (біглот) – асоба, якая актыўна карыстаецца дзвюма мовамі
2. білінгв – гэта асоба, якая разумее выказванні на дзвюх мовах
3. білінгв – асоба, якая змешвае ў сваім маўленні лексіку дзвюх моў
4. білінгв – асоба, якая змешвае ў сваім маўленні фанетыку дзвюх моў
5. білінгв (біглот) – асоба, якая актыўна карыстаецца некалькімі мовамі

20. Вызначыце разнавіднасць білінгвізму па блізкасці, радстве моў:

1. каардынацыйны і субардынацыйны
2. індывідуальны і калектыўны
3. штучны і натуральны
4. нарматыўны, аднабакова-нарматыўны і ненарматыўны білінгвізм
5. блізкароднасны і неблізкароднасны

21. Вызначыце, што азначае паняцце «білінгвальная адукацыя»:

1. засваенне асобай культурна-гістарычнага і сацыяльнага вопыту розных краін і народаў, каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры сродкамі беларускай і рускай моў
2. спецыяльна арганізаваны мэтанакіраваны працэс развіцця і ўдасканалення маўлення дзяцей на дзвюх мовах і далучэнне іх да нацыянальнай і сусветнай культуры сродкамі гэтых моў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. мэтанакіраваны свядома арганізаваны педагагічны працэс, які садзейнічае фарміраванню і развіццю асобы дзіцяці сродкамі беларускай і рускай моў і прадстаўленых імі культур.

4. далучэнне дзяцей да нацыянальнай і сусветнай культуры сродкамі сродкамі беларускай і рускай моў

5. развіццё асобы дзіцяці сродкамі беларускай і рускай моў і прадстаўленых імі культур.

22. Вызначыце, што азначае паняцце «білінгвальнае навучанне»:

1. засваенне асобай культурна-гістарычнага і сацыяльнага вопыту розных краін і народаў, каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры сродкамі беларускай і рускай моў

2. спецыяльна арганізаваны мэтанакіраваны працэс развіцця і ўдасканалення маўлення дзяцей на дзвюх мовах і далучэнне іх да нацыянальнай і сусветнай культуры сродкамі гэтых моў

3. мэтанакіраваны свядома арганізаваны педагагічны працэс, які садзейнічае фарміраванню і развіццю асобы дзіцяці сродкамі беларускай і рускай моў і прадстаўленых імі культур.

4. засваенне асобай культурна-гістарычнага і сацыяльнага вопыту розных краін і народаў

5. развіццё асобы дзіцяці сродкамі беларускай і рускай моў і прадстаўленых імі культур.

23. Вызначыце, што азначае паняцце «білінгвальнае выхаванне»:

1. засваенне асобай культурна-гістарычнага і сацыяльнага вопыту розных краін і народаў, каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры сродкамі беларускай і рускай моў

2. спецыяльна арганізаваны мэтанакіраваны працэс развіцця і ўдасканалення маўлення дзяцей на дзвюх мовах і далучэнне іх да нацыянальнай і сусветнай культуры сродкамі гэтых моў

3. мэтанакіраваны свядома арганізаваны педагагічны працэс, які садзейнічае фарміраванню і развіццю асобы дзіцяці сродкамі беларускай і рускай моў і прадстаўленых імі культур

4. засваенне асобай культурна-гістарычнага і сацыяльнага вопыту розных краін і народаў

5. спецыяльна арганізаваны мэтанакіраваны працэс развіцця і ўдасканалення маўлення дзяцей на дзвюх мовах

24. Вызначыце, што з’яўляецца галоўнай сацыяльнай, дыферэнцыяльнай прыкметай чалавека:

1. членараздзельная мова
2. верхнія і ніжнія канечнасці
3. язык і зубы
4. мозг
5. мысленне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

25. Вызначыце, да якога тыпу білінгвізму можна аднесці уменне не толькі разумець і ўзнаўляць, але і будаваць асэнсаваныя выказванні:

1. прадуктыўны
2. рэцэптыўны
3. рэпрадуктыўны
4. каардынатыўны
5. пасіўны

26. Вызначыце, да якога тыпу білінгвізму можна аднесці аднолькавае валоданне дзвюма мовамі:

1. прадуктыўны
2. рэцэптыўны
3. рэпрадуктыўны
4. каардынатыўны
5. пасіўны

27. Вызначыце, да якога тыпу білінгвізму можна аднесці разуменне маўлення, якое належыць другаснай маўленчай сістэме:

1. прадуктыўны
2. рэцэптыўны
3. рэпрадуктыўны
4. каардынатыўны
5. пасіўны

28. Вызначыце, да якога тыпу білінгвізму можна аднесці уменне ўзнавіць прачытанае і пачутае:

1. прадуктыўны
2. рэцэптыўны
3. рэпрадуктыўны
4. каардынатыўны
5. пасіўны

29. Вызначыце, пры якім тыпе білінгвізму другая мова засвойваецца пры ўжо сфарміраванай сістэме першай мовы:

1. прадуктыўны
2. рэцэптыўны
3. рэпрадуктыўны
4. каардынатыўны
5. змешаны

30. Вызначыце, пры якім тыпе білінгвізму сістэма роднай мовы выступае як дамінантная, адпраўная, перадае другой моўнай сістэме свае катэгорыі і формы:

1. прадуктыўны
2. рэцэптыўны

3. рэпрадуктыўны
4. каардынатыўны
5. пасіўны

31. Вызначыце, пры якім тыпе білінгвізму кожная з моў функцыянуе незалежна, самастойна:
1. прадуктыўны
2. рэцэптыўны
3. рэпрадуктыўны
4. актыўны
5. пасіўны

32. Вызначыце, як пры білінгвізме называецца з'ява, калі пры маўленні на адной мове ўжываюцца элементы іншай мовы:
1. субстытуцыя
2. метатэзіс
3. дыферэнцыяцыя
4. інтэрферэнцыя
5. транспазіцыя

33. Вызначыце, да якой адмоўнай з'явы прыводзіць ўзаемадзеянне моў, якія кантактуюць:
1. субстытуцыя
2. метатэзіс
3. дыферэнцыяцыя
4. інтэрферэнцыя
5. транспазіцыя

34. Вызначыце, якая моўная з'ява ў сітуацыі білінгвізму прыводзіць да парушэння нормаў суіснуючых моў:
1. субстытуцыя
2. метатэзіс
3. дыферэнцыяцыя
4. інтэрферэнцыя
5. транспазіцыя

35. Вызначыце, якое азначэнне паняцця "інтэрферэнцыя" з'яўляецца памылковым:
1. інтэрферэнцыя – маўленчыя памылкі ў выніку ўзаемаўплыва дзвюх моў
2. інтэрферэнцыя – станоўчае ўздзеянне на маўленне асобы другой мовы
3. інтэференцыя – узаемаўплыў дзвюх моў
4. інтэрферэнцыя – міжвольнае, адхіленне ад нормаў мовы
5. інтэрферэнцыя – адмоўнае ўздзеянне на маўленне асобы другой мовы

36. Вызначыце ўзрост найбольш спрыяльны для пачатку авалодвання беларускай мовай дзецьмі дашкольнага ўзросту:

1. 2-3
2. 3-4
3. 4-5
4. 5-6
5. 6-7

37. Вызначыце, якое азначэнне паняцця “інтэрферэнцыя” з’яўляецца правільным:

1. інтэрферэнцыя – маўленчыя памылкі ў выніку ўзаемаўплыва дзвюх моў
2. інтэрферэнцыя – неадвольнае змешванне сродкаў дзвюх моў у вонкавым маўленні, пранікненне элементаў адной мовы у іншую мову.
3. інтэрференцыя – узаемаўплыў дзвюх моў
4. інтэрферэнцыя – міжвольнае, адхіленне ад нормаў мовы
5. інтэрферэнцыя – адмоўнае ўздзеянне на маўленне асобы другой мовы

Тэма “Этапы станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі”

Змест

Перадумовы навучання дзяцей беларускай мове ў XIX стагоддзі. Вучэбныя дапаможнікі на беларускай мове ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX стагоддзя. Станаўленне білінгвальнага выхавання дзяцей у Беларусі. Білінгвальная дашкольная адукацыя ў другой палове XX стагоддзя, пачаткуXXI стагоддзя (Т.У. Паліева).

1. Вызначыце год выдання кнігі Якуба Коласа “Другое чытанне для дзяцей беларусаў»:

1. 1909
2. 1912
3. 1899
4. 1900
5. 1904

2. Вызначыце мовы, якія былі афіцыйнымі ў 20-я гады XX стагоддзя на Беларусі:

1. беларуская, руская, польская, украінская
2. беларуская і руская
3. беларуская, ідыш, польская, руская
4. беларуская, руская, польская
5. беларуская, ідыш

3. Вызначыце, які перыяд станаўлення развіцця білінгвальнай дашкольнай адукацыі на Беларусі (паводле Т.У. Паліевай) характарызуецца абгрунтаваннем значэння роднай мовы для выхавання асобы-дзіцяці:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. першы перыяд (другая палова XIX - пачатак XX ст)
2. другі перыяд(пачатак XXст. - 20-е гг. XXст.)
3. трэці перыяд (20-40-е гг. XX ст.)
4. чацвёрты перыяд (40-е — першая палова 80-х гг. XX ст.)
5. пяты перыяд (канец 80-х гг. XX ст. першая палова XXI ст)

4. Вызначыце, які перыяд станаўлення развіцця білінгвальнай дашкольнай адукацыі на Беларусі (паводле Т.У. Паліевай) характарызуецца стварэннем першых падручнікаў для дзяцей на беларускай мове, пошукам зместу моўнай адукацыі:

1. першы перыяд (другая палова XIX - пачатак XX ст)
2. другі перыяд(пачатак XXст. - 20-е гг. XXст.)
3. трэці перыяд (20-40-е гг. XX ст.)
4. чацвёрты перыяд (40-е — першая палова 80-х гг. XX ст.)
5. пяты перыяд (канец 80-х гг. XX ст. першая палова XXI ст)

5. Вызначыце, які перыяд станаўлення развіцця білінгвальнай дашкольнай адукацыі на Беларусі (паводле Т.У. Паліевай) характарызуецца першапачатковай распрацоўкай пытанняў зместу і метадаў навучання дзяцей мове, ўзнікненне методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту як асобнай галіны:

1. першы перыяд (другая палова XIX - пачатак XX ст)
2. другі перыяд(пачатак XXст. - 20-е гг. XXст.)
3. трэці перыяд (20-40-е гг. XX ст.)
4. чацвёрты перыяд (40-е — першая палова 80-х гг. XX ст.)
5. пяты перыяд (канец 80-х гг. XX ст. першая палова XXI ст)

6. Вызначыце, які перыяд станаўлення развіцця білінгвальнай дашкольнай адукацыі на Беларусі (паводле Т.У. Паліевай) характарызуецца змястоўным і метадычным забеспячэнні навучання дашкольнікаў мове як роднай , узнікненнем дашкольнай лінгвадыдактыкі білінгвізма:

1. першы перыяд (другая палова XIX - пачатак XX ст)
2. другі перыяд(пачатак XXст. - 20-е гг. XXст.)
3. трэці перыяд (20-40-е гг. XX ст.)
4. чацвёрты перыяд (40-е — першая палова 80-х гг. XX ст.)
5. пяты перыяд (канец 80-х гг. XX ст. першая палова XXI ст)

7. Вызначыце, які перыяд станаўлення развіцця білінгвальнай дашкольнай адукацыі на Беларусі (паводле Т.У. Паліевай) характарызуецца – распрацоўкай тэарэтычных асноў дашкольнай лінгвадыдактыкі ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя:

1. першы перыяд (другая палова XIX - пачатак XX ст)
2. другі перыяд(пачатак XXст. - 20-е гг. XXст.)
3. трэці перыяд (20-40-е гг. XX ст.)
4. чацвёрты перыяд (40-е — першая палова 80-х гг. XX ст.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. пяты перыяд (канец 80-х гг. XX ст. першая палова XXI ст)

8. Вызначыце,ў якім годзе пытанні маўленчага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту былі акрэслены ў Канцэпцыі развіцця дашкольнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь:

1. 1990
2. 1989
3. 2000
4. 2001
5. 1999.

9. Вызначыце, калі быў прыняты Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, дзе ў артыкуле 90 разглядалася пытанне вывучэння моў ва ўстановах адукацыі:

1. 2010.
2. 1989.
3. 2011
4. 2001.
5. 2009.

10. Вызначыце аўтара выдання кнігі “Гасцінец для маленькіх дзяцей”

1. Цетка
2. У. Луцэвіч
3. Я. Колас
4. Я. Лёсік
5. М. Багдановіч

11. Вызначыце, ў якім годзе быў напісаны дапаможнік Цёткі “Першае чытанне для дзетак беларусаў”

1. 1906
2. 1911
3. 1899
4. 1900
5. 1904

12. Вызначыце год выдання дапаможніка Канстанціна Міцкевіча “Методыка роднае мовы”

1. 1926
2. 1925
3. 1921
4. 1920
5. 1930

13. Вызначыце аўтара дапаможніка “Методыка роднае мовы” (1926г.)

1. Язэп Лёсік
2. Васіль Протчанка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Янка Купала
4. Браніслаў Тарашкевіч
5. Канстанцін Міцкевіч

14. Вызначыце аўтара дапаможніка “Першае чытанне для дзетак беларусаў” (1906г.)
1. Язэп Лёсік
2. Васіль Протчанка
3. Цётка
4. Браніслаў Тарашкевіч
5. Канстанцін Міцкевіч

15. Вызначыце аўтара дапаможніка “Лемантар” (1906г.)
1. Язэп Лёсік
2. Элаіза Пашкевіч
3. Карусь Каганец
4. Браніслаў Тарашкевіч
5. Канстанцін Міцкевіч

16. Вызначыце аўтара дапаможніка “Другое чытанне для дзяцей-беларусаў.(1909г.)
1. Язэп Лёсік
2. Васіль Протчанка
3. Максім Багдановіч
4. Браніслаў Тарашкевіч
5. Канстанцін Міцкевіч

17. Вызначыце, хто аўтар дапаможніка “Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў” (2001.)
1. Мікалай Яленскі
2. Васіль Протчанка
3. Наталля Старжынская
4. Браніслаў Тарашкевіч
5. Канстанцін Міцкевіч

18. Вызначыце, хто аўтар дапаможніка “Выхаванне цікавасці да мастацкай літаратуры ў дзяцей дашкольнага ўзросту” (2019 г.)
1. Ірына Жытко
2. Наталля Старжынская
3. Дзіна Дубініна
4. Алена Гарбатава
5. Алена Рублеўская

19. Назавіце даследчыкаў вывучэння пытанняў білінгвізму за межамі СНД

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. У. Вайнрайх, А. Мэйе, В. Матэзіус
2. Б. Ларын, Л. Якубінскі, У. Вінаградаў
3. А.М. Бардовіч, М.В. Бірыла, А.А. Гіруцкі,
4. Дз.М. Дубініна, А.І. Жураўскі, Н.І. Маскаленка
5. Т.У. Паліева, Н.С. Старжынская, А.Я. Супрун

20. Вызначыце, **ў** якіх нарматыўных дакументах упершыню была сфармулявана стратэгія білінгвальнай адукацыі на Беларусі?

1.“Канцэпцыя развіцця дашкольнага выхавання ў БССР” (1990).
2. “Закон аб адукацыі” (1992).
3. “Канцэпцыі адукацыі і выхавання ў Беларусі” (1993).
4. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі
5. Праграма “Пралеска”

21. Назавіце, каго з даследчыкаў руска-беларускага білінгвізму вы ведаеце?

1. Н.С. Старжынская, А.Я. Супрун, П.П. Шуба
2. Б. Ларын, Л. Якубінскі, У. Вінаградаў
3. Г. Вінакур, М. Сергіеўскі, В. Жырмунскі
4. Ф. Боас і Э. Сэпір. Л. Шчэрба
5. М. Сергіеўскі, В. Жырмунскі, Л. Шчэрба

22. Назавіце даследчыцу развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту

1. А.С. Ушакова
2. Н.С. Старжынская
3. Л.І. Ціхеева
4. А.М. Богуш
5. І.Ул. Жытко

23. Вызначыце, у якім артыкуле Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, разглядалася пытанне вывучэння моў ва ўстановах адукацыі:

1. 90 артыкул
2. 89 артыкул
3. 88 артыкул
4. 87 артыкул
5. 91 артыкул

24. Вызначыце, у якім годзе быў прыняты Закон аб мовах Беларускай ССР:

1. 1990.
2. 1989.
3. 1988
4. 1987
5. 1986

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

25. Вызначыце, у якім годзе была напісана вучэбная кніга для дзяцей і В. Ластоўскага. «Першая чытанка, кніжыца для беларускіх дзетак дзеля навукі чытання».

1. 1915
2. 1911
3. 1899
4. 1900
5. 1904

Тэма “Методыка азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа і развіццё беларускага маўлення”

Змест.

Нацыянальна-культурнае асяроддзе ўстановы дашкольнай адукацыі. Методыка азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з беларускім фальклорам,беларускай нацыянальнай цацкай, нацыянальнымі традыцыямі, побытам і культурай беларускага народа. Методыка правядзення беларускіх народных свят ва ўстанове дашкольнай адукацыі і развіцце беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

1. Вызначыце, па якой формуле адбываецца развіццё беларускага маўлення ў дзяцей дашкольнага узросту?

1. Мова праз культуру – культура праз мову
2. Мова праз азнаямленне з фальклорам
3. Мова праз азнаямленне з мастацкай літаратурай
4. Культура праз мову
5. Мова праз культуру

2. Вызначыце, што ўключае ў сябе этнакультурная адукацыя дзяцей дашкольнага ўзросту?

1. Фарміраванне ў выхаванцаў уяўленняў пра этнічную культуру
2. Фарміраванне ў выхаванцаў каштоўнасных адносін да энічнай культуры
3. Фарміраванне этнічнай ідэнтычнасці
4. Авалоданне беларускай мовай
5. Фарміраванне ў выхаванцаў уяўленняў пра этнічную культуру, каштоўнасных адносін да энічнай культуры, этнічнай ідэнтычнасці

3. Акрэсліце, што вызначае сабой родная (беларуская мова) для малога дзіцяці?

1. Адначасова і змест, і сродкі духоўнага развіцця дзіцяці
2. Дачыненне дзіцяці да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей
3. Змест духоўнага развіцця дзіцяці
4. Сродак духоўнага развіцця дзіцяці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Адначасова і змест, і сродкі духоўнага развіцця дзіцяці, яго дачыненне да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей

4. Вызначыце, на аснове якога зместу тэкстаў можна знаёміць дзяцей з культурным вопытам народа:

1. Тэкстаў пра прыроду роднай краіны
2. Беларускіх народных казак
3. Культуразнаўчых, мастацкіх тэкстаў
4. Тэкстаў пра сучасную грамадскую сітуацыю
5. Няма правільнага адказа

5.. Вызначыце, што адносіцца да другога пласту нацыянальна маркіраваных адзінак мовы, у якіх праяўляецца культуразнаўчая інфармацыя:

1. Устойлівыя параўнанні, заснаваныя на супастаўленні рыс характару, паводзін чалавека з жывёламі
2. Фразеялагізмы
3. Словы- сімвалы
4. Устойлівыя параўнанні, заснаваныя на супастаўленні рыс характару, паводзін чалавека з жывёламі, раслінамі
5. Усе пералічанае

6. Вызначыце, з якога ўзросту неабходна далучаць выхаванцаў да роднага слова шляхам акультурацыі – увядзення ў нацыяльна-культурны фон беларускай мовы :

1. Са старшага дашкольна ўзроста
2. З сярэдняга дашкольна ўзроста
3. З другой паловы другой малодшай групы
4. З моманту наведвання дзіцем дашкольнай установы
5. Няма правільнага адказа

7. Вызначыце, што з’яўляецца для дзяцей ад 4 да 5 гадоў, матывуючым фактарам маўленчай дзейнасці на беларускай мове:

1. Патрэба ў атрыманні новай інфармацыі пазнавальнага або асабовага характару
2. Маўленчая дзейнасць на беларускай мове ў якасці ўзору для малодшых дзяцей
3. Спаборніцкія‖ матывы
4. Патрэба ў зносінах з беларускамоўным дарослым для выражэння станоўчых эмоцый
5. Для дасягнення сумеснага з беларускамоўным равеснікам выніку ў практычнай або гульнявой дзейнасці

8. Вызначыце, што з’яўляецца для дзяцей ад 3 да 4 гадоў матывуючым фактарам маўленчай дзейнасці на беларускай мове:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Патрэба ў атрыманні новай інфармацыі пазнавальнага або асабовага характару

2. Маўленчая дзейнасць на беларускай мове ў якасці ўзору для малодшых дзяцей

3. Варыянты адказаў 4-5

4. Патрэба ў зносінах з беларускамоўным дарослым для выражэння станоўчых эмоцый

5. Патрэба ў зносінах з дарослым і равеснікамі для дасягнення сумеснага выніку ў практычнай або гульнявой дзейнасці

9. Вызначыце, што з’яўляецца для дзяцей ад 5 да 6 гадоў матывуючым фактарам маўленчай дзейнасці на беларускай мове:

1. Варыянты адказаў 2,3

2. Маўленчая дзейнасць на беларускай мове ў якасці ўзору для малодшых дзяцей

3. Спаборніцкія‖ матывы

4. Патрэба ў зносінах з беларускамоўным дарослым для выражэння станоўчых эмоцый

5. Патрэба ў зносінах з беларускамоўным дарослым і равеснікамі для дасягнення сумеснага выніку ў практычнай або гульнявой дзейнасці

10. Вызначыце, да якіх гульняў адносіцца гульня “Гарлачыкі”:

1. Рухомых

2. Карагодных

3. Гульняў-драматызацый

4. Ролевых з лялькамі-беларусамі

5. Няма правільнага адказу

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пытанні да экзамена па вучэбнай дысцыпліне

1. Білінгвальная кампетэнтнасць і камунікатыўная актыўнасць як асноўныя крытэрыі для вызначэння сутнасці білінгвізму.
2. З’явы інтэрферэнцыі і транспазіцыі ў маўленні білінгва.
3. Псіхолага-лінгвістычная характарыстыка білінгвізму: рэцэптыўны, рэпрадуктыўны і прадуктыўны білінгвізм; каардынацыйны і субардынацыйны білінгвізм; натуральны і штучны білінгвізм.
4. Класіфікацыя білінгваў ў кантэксце антагенезу: паралельны (адначасовы) і паслядоўны білінгвізм.
5. Сацыялінгвістычны крытэрый ступені роднасці дзвюх моў: білінгвізм блізкароднасны і неблізкароднасны.
6. Катэгорыі, міждысцыплінарныя сувязі методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.
7. Прадмет, аб’ект, мэты і задачы курса вучэбнай дысцыпліны «Тэхналогія развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту».
8. Сутнасць пацяццяў «білінгвальная адукацыя», «білінгвальнае навучанне», «білінгвальнае выхаванне».
9. Метады навуковага даследавання.
10. Мова як галоўная каштоўнасць народа. Мова і культура народа.
11. Сутнасць паняццяў «родная мова», «другая мова», «нацыянальная мова», «замежная мова».
12. Сацыялінгвістычная сітуацыя ў Беларусі, яе ўплыў на сферу дашкольнай адукацыі.
13. Статус беларускай мовы для рускамоўных дзяцей у Беларусі.
14. Асаблівасці руска-беларускага двухмоўя ў дзяцей дашкольнага ўзросту
15. Праблемы ранняга двухмоўя: узрост, спрыяльны для пачатку авалодання другой мовай; суадносіны роднай і другой моў у адукацыйным працэсе.
16. Праблемы ранняга двухмоўя:уплыў двухмоўя на разумовае развіццё дзяцей дашкольнага ўзросту, праблема засваення другой мовы як сродку камунікацыі.
17. Лінгвакультуралагічны аспект ў навучанні дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове.
18. Мэтавыя арыентацыі навучання беларускай мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму.
19. Грамадска-палітычныя перадумовы навучання дзяцей беларускай мове ў XIX стагоддзі.
20. Першыя вучэбныя дапаможнікі на беларускай мове ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX стагоддзя.
21. Грамадска-палітычныя перадумовы станаўлення білінгвальнага выхавання дзяцей у Беларусі.
22. Перыядызацыя білінгвальнай дашкольнай адукацыі ў другой палове XX стагоддзя, пачаткуXXI стагоддзя (паводле Т.У. Паліевай).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

23. Стратэгія навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

24. Мэта навучання беларускай мове. Задачы навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

25. Сістэматызацыя зместу развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі, адукацыйная галіна «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін».

26. Псіхолага-педагагічныя і лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

27. Сучасныя тэндэнцыі навучання другой мове.

28. Асноўныя метады навучання другой мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітацыі блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя.

29. Спецыфіка методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

30. Развіццё ў дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту чуццёвай асновы беларускай мовы.

31. Матывацыя маўленчых дзеянняў дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове.

32. Нацыянальна-культурнае асяроддзе ўстановы дашкольнай адукацыі.

33. Гульня як крыніца матыву маўленчай дзейнасці дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове.

34. Сродкі навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

35. Народныя гульні, іх роля ў развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

36. Роля дыдактычнай лялькі ў развіцці беларускага маўлення дзяцей.

37. Нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту.

38. Арганізацыя пазасітуацыйна-пазнавальных і пазасітуацыйна-асобасных беларускамоўных зносін дзяцей дашкольнага ўзросту.

39. Азнаямленне дзяцей з малымі формамі беларускага фальклору.

40. Методыка работы з беларускай народнай казкай ва ўстанове дашкольнай адукацыі.

41. Методыка выкарыстання твораў беларускіх пісьменнікаў ва ўстанове дашкольнай адукацыі

42. Рухавыя гульні з мастацкім словам, іх роля ў развіцці маўлення дзяцей .

43. Методыка правядзення літаратурных забаў і ранішнікаў.

44. Асаблівасці лексікі беларускай мовы (у параўнанні з рускай). Слоўнік роднай мовы як адлюстраванне нацыянальнага светапогляду.

45. Крытэрыі адбору лексікі для заняткаў з дзецьмі дашкольнага ўзросту.

46. Методыка ўвядзення новых слоў беларускай мовы.

47. Методыка замацавання слоўніка дзяцей дашкольнага ўзросту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГ

48. Работа над сэнсавым бокам слова з дзецьмі дашкольнага ўзросту.

49. Асаблівасці граматыкі беларускай мовы ў параўнанні з рускай.

50. Крытэрыі адбору граматычнага матэрыялу для развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў. Паслядоўнасць увядзення граматычных форм беларускай мовы.

51. Этапы авалодання дзецьмі граматычнымі элементамі маўлення (паводле А.І. Негнявіцкай, А.М. Шахнаровіча).

52. Фарміраванне ў дзяцей навыкаў пабудовы сказаў на беларускай мове, змянення слоў па формах, утварэння новых слоў.

53. Параўнальная характерыстыка фанемных сістэм рускай і беларускай моў. Задачы навучання беларускаму вымаўленню.

54. Крытэрыі адбору фанемных адзінак і паслядоўнасць іх увядзення.

55. Методыка фарміравання правільнага вымаўлення спецыфічных гукаў беларускай мовы.

56. Знаёмства дзяцей з арфаэпічнымі асаблівасцямі беларускага маўлення.

57. Асноўныя прынцыпы фарміравання звязнага (дыялагічнага і маналагічнага) беларускага маўлення дашкольнікаў.

58. Развіццё выразнасці і вобразнасці маўлення у дзяцей дашкольнага ўзросту.

59. Методыка азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з беларускім фальклорам, нацыянальнымі традыцыямі і культурай беларускага народа.

60. Змест, этапы і метады азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з народнай цацкай

61. Методыка правядзення беларускіх народных свят ва ўстанове дашкольнай адукацыі

62. Сутнасць дыягностыкі маўленчага развіцця дзяцей, яе задачы і значэнне.

63. Методыка абследавання розных бакоў беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя.

64. Улік вынікаў дыягностыкі ў адукацыйным працэсе ўстановы дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прыклалныя кампетэнтнастна-арыентаваныя заданні

1. Вырашыце метадычную задачу: Дзеці адчуваюць цяжкасці ў вымаўленні спецыфічна беларускага гука *дж*. Вызначыце, у якой узроставай групе, хутчэй за ўсё, знаходзяцца дзеці. Якую працу па фарміраванні правільнага вымаўлення гэтага гука варта праводзіць з выхаванцамі? Назавіце рухавыя сюжэтныя гульні для замацавання і актывізацыі вымаўлення гука *дж*

2. Вырашыце метадычную задачу: Дзеці дапускаюць памылкі ва ўтварэнні давальнага склону назоўнікаў. Назавіце дыдактычныя гульні і практыкаванні, якія дапамогуць выхаванцам засвоіць спосабы ўтварэння давальнага склону назоўнікаў. На якім змесце вы будзеце праводзіць гэтую працу з дзецьмі? Складзіце сцэнар правядзення дыдактычнай гульні ў сярэдняй групе. Дайце назву гульні, вызначыце дыдактычныя задачы (навучальная, развіваючая, выхаваўчая), матэрыял, гульнявыя правілы, гульнявыя дзеянні, пазіцыю выхавальніка дашкольнай адукацыі падчас гульні.

3. Вырашыце метадычную задачу. Прачытайце фрагмент заняткаў па развіцці маўлення: на дошцы выстаўлена сюжэтная карціна на тэму “Зімнія забавы” з адлюстраваннем дзяцей, якія выконваюць розныя дзеянні на прагулцы ўзімку: катаюцца на санках, лепяць снегавіка. Выхавальнік прапануе разглядзець карціну і саставіць па ёй апавяданне. Вызначыце від апавядання *(фактычны, творчы, з уласнага вопыту, сюжэтны, апісальны*). Складзіце ўзор апавядання выхавальніка.

4. Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, якія задачы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту можна вырашаць пры дапамозе наступнага верша (гл. дадатак)? Якім чынам можна выкарыстоўваць дадзены верш у працы з дзецьмі?

5. Вырашыце метадычную задачу: Вам неабходна правесці заняткі па азнаямленні дзяцей з мастацкай літаратурай. Прачытайце твор (гл.дадатак). Вызначыце, для якога ўзросту дзяцей ён падыходзіць, сфармулюйце задачы (адукацыйныя, развіваючыя, выхаваўчыя) і складзіце пытанні для гутаркі па змесце твора.

6. .Вырашыце метадычную задачу: Прачытайце запіс заняткаў па развіцці беларускага маўлення. Вызначыце, для якой ўзроставай групы даступныя заняткі, маўленчыя задачыі, від заняткаў, метады і прыёмы. Дадайце свае прыклады метадаў і прыёмаў (гл. дадатак).

7. Вырашыце метадычную задачу: Прачытайце план заняткаў па тэме “Лялькі з саломкі і лёну”: 1. Разглядванне саломкі. 2. Разглядванне лялькі з саломкі. 3. Разглядванне лёну. 4. Разглядванне лялькі з лёну. 5. Апісанне лялек з саломкі і лёну, прадстаўленых на выставе. Вызначыце слоўнік (назвы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прадметаў, з якімі знаёмяцца дзеці); пералічыце метады і прыёмы, якія можна выкарыстаць на занятках.

8. Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, якія задачы па развіцці маўлення можна вырашаць пры дапамозе прыведзенага ў дадатку верша (гл. дадатак)? Якім чынам можна выкарыстоўваць дадзены верш у працы па развіццм беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

9. Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, з якой мэтай пры навучанні дзяцей беларускаай мове можна выкарыстаць верш А. Жыгунова “Блытаніна”?(гл. дадатак) Якую гульню можна правесці для замацавання ўяўленняў дзяцей аб гэтай моўнай заканамернасці?

10. .Вырашыце метадычную задачу: Пазнаёмцеся з планам заняткаў на тэму “Нацыянальнае адзенне”: 1. Знаёмства з лялькамі і разглядванне іх нацыянальных строяў. 2. Разглядванне прадметаў адзення на малюнках і аплікацыях дзяцей (прадметы адзення упрыгожаны беларускімі ўзорамі). 3. Апісанне прадметаў беларускага нацыянальнага адзення, прадстаўленых на выставе. Вызначыце задачы заняткаў, слоўнік прадметаў, з якімі знаёмяцца дзеці; пералічыце метады і прыёмы, якія можна выкарыстаць на занятках.

11. .Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, якія задачы па развіцці беларускага маўлення можна вырашаць пры дапамозе народнай гульні “Агароднік”? Якім чынам можна выкарыстоўваць дадзеную гульню ў працы з дзецьмі?(гл. дадатак).

12. Вырашыце метадычную задачу: вызначыце у якім узросце і з якой мэтай праводзіцца на занятках па развіцці беларускага маўлення *сюжэтна-дыдактычная гульня* “Каго пакатаем на машыне?” (аўтар Э.П. Караткова) (гл. дадатак)

13. Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, якую задачу па развіцці беларускага маўлення можна вырашыць пры дапамозе наступнай гульнявой сітуацы: да дзяцей прыходзіць вельмі цікаўны хлопчык, які хоча пра ўсё ведаць. Яго так нават завуць - Цікаўка. Цікаўка ўвесь час задае пытанні дзецям: «Ці ідзе ўзімку дождж? Ці плавае рыбка ў вадзе?» і да т.п. У рэшце рэшт Цікаўка «стамляецца»: «Ці … ці … пра што б мне яшчэ спытаць: Ці падабаецца вам у садзіку? Ці… ці… ці хочаце вы, каб я яшчэ прыйшоў да вас?» Дзеці запрашаюць Цікаўку прысці яшчэ. Той кажа: «Я прыйду, але мне хочацца, каб вы мяне таксама пра што-небудзь спыталі». Выхавальнік прапануе спытаць у Цікаўкі пра тое, што ён любіць. Дае прыклад: «Ці любіш ты малако?» Дзеці па ўзоры складаюць свае пытанні. Затым можна прапанаваць малым спытаць Цікаўку пра тое, што ён ведае, і даць узор: «Ці ведаеш ты казкі» і г.д. Назавіце, з дапамогай якой народнай гульні можна фарміраваць акрэсленае маўленчае ўменне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

14. Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, якую задачу па развіцці беларускага маўлення можна вырашаць пры дапамозе дыдактычнай гульні “Каму даць мячык?” Выхавальнік прапануе падарыць хлопчыкам мячыкі. *Каму ж дадзім першы мячык? Мішу дадзім. Вось, Міша, твой мячык. Яшчэ каму? Сашу дадзім мячык. Далей каму? Дзіму трэба даць мячык. Яшчэ дадзім мячыкі Алёшу і Валеру. Спачатку дадзім … каму*? (Працягвае мячык аднаму з дзяцей.) *Так, Алёшу. А зараз каму*? (*Валеру*) і г.д. Прывядзіце прыклады дыдактычных гульняў, з дапамогай якіх фарміруецца акрэсленае у прыкладзе ўменне.

15. Вырашыце метадычную задачу: Прачытайце фрагмент заняткаў па развіцці маўлення. Ход заняткаў. На дошцы выстаўлена сюжэтная карціна на тэму “У лесе” з адлюстраваннем дзяцей, якія выконваюць розныя дзеянні ў лесе: збіраюць ягады, грыбы, заблудзіліся, таксама разглядваюць вожыка. Выхавальнік прапануе паслухаць пачатак расказу “Прыгоды ў лесе” … . Вызначыце від расказа, прапанаванага на занятках (фактычны, творчы, з уласнага вопыту, на тэму, працяг апавядання выхавальніка; сюжэтны, апісальны). Складзіце пачатак расказу выхавальніка.

16. Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, якія задачы па развіцці маўлення можна вырашаць пры дапамозе прыведзенага у дадатку верша? (гл. дадатак). Якім чынам можна выкарыстоўваць дадзены верш у працы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. (гл. дадатак)

17. Вырашыце метадычную задачу: Пры фарміраванні навыкаў вымаўлення таго ці іншага гука ў гульні важна прытрымлівацца пэўнай паслядоўнасці дзеянняў. Прывядзіце прыклады гульнявых практыкаванняў для фарміравння правільнага вымаўлення гука *дз* у адпаведнасці з пералічанымі этапамі:1. Этап слыхавога ўспрымання, які ўключае знаёмства з новым гукам у слове і абстрагаванне гука ад слова. 2. Пастаноўка ізаляванага беларускага гука шляхам тлумачэння і па меры магчымасці дэманстрацыя яго артыкуляцыі. 3.Слыхавыя практыкаванні на распазнаванне новага гука. 4. Імітацыя дзецьмі гукавых адрозненняў у гульні. 5. Самастойнае вымаўленне новага гука ў гульні. 6. Уключэнне патрэбнага гука ў словы і сказы беларускага вуснага маўлення ў працэсе гульнявых дзенняў.

18. Вырашыце метадычную задачу: З дапамогай гульнявога матэрыялу прадстаўленага ў дадатку, назавіце ў пэўнай паслядоўнасці этапы работы па фарміраванні правільнага вымаўлення беларускіх зычных гукаў [γ, γ'] .

19. Вырашыце метадычную задачу: Да прыведзенага праграмнага зместу і пачатку комплексных заняткаў падбярыце адпаведныя дыдактычныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

практыкаванні і гульні, якія б спрыялі засваенню дзецьмі граматычных форм (гл. дадатак).

20. Вырашыце метадычную задачу: Характэрнай асаблівасцю беларускай фанетыкі з'яўляецца наяўнасць падоўжаных зычных. З якой мэтай выхавальнік праводзіць з дзецьмі практыкаванні на распазнаванне слоў з падоўжанымі зычнымі? На якім матэрыяле лепш праводзіць вызначэнне дзецьмі слоў з падоўжанымі зычнымі?

21. Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце з якой мэтай выкарыстоўваецца гульня "Якая фарба ў мяне ў руцэ?" Выхавальнік хавае ў руцэ "фарбу" (кавалак кардону пэўнага колеру) і прапануе дзецям адгадаць, якая яна: сіняя, чырвоная або жоўтая. Дзеці адгадваюць, называючы свае варыянты з трох названых, затым выхавальнік паказвае "фарбу". Да якой групы гульняў адносіцца гэтая гульня? Прывядзіце прыкдады падобных гульняў .

22. Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце праграмныя задачы, узроставую групу, від расказа і складзіце план заняткаў па прапанаваным ўзоры расказа выхавальніка : "У нас дома жыве коцік Мурчык. Ён чорны, толькі кончык хваста белы. Поўсць у яго пушыстая, мяккая, цёплая. Спіць Мучык на дыванчыку. Калі ён галодны, то просіць есці: "Мяў-мяў!". Калі пад'есць, то ляжыць на дыванчыку і спявае песеньку: "мур-мур-мур".

23. Вырашыце метадычную задачу:У час гульні выхаванцы адказваюць на пытанні дарослага наступнага тыпу: "У мяне ёсць яблык, агрэст і парэчкі. Што ты будзеш есці?"; "На чым ты спіш, на ложку ці на канапе?"; "Які колер табе падабаецца: чырвоны, блакітны ці зялёны?" і да т.п. Кожны раз выхавальнік адначасова з пытаннем паказвае адпаведную нагляднасць. З якой мэтай наладжваецца гэта гульня? Да якой групы гульняў яна адносіцца? Прывядзіце прыклады падобных гульняў .

24. Вырашыце метадычную задачу: Прачытайце прыведзеныя фразеалагізмы : як мёд, так і лыжкаю; вушы вянуць; вухам не павёў; і смех, і грэх; ваўкоў баяцца - ў лес не хадзіць; маслам кашу не сапсуеш; матаць на вус; не ў сваёй талерцы; не паказваць вачэй; бачыць вока, ды зуб не ёме; кот еў бы рыбу, ды ў ваду не хоча. Якія з іх, на ваш погляд, даступны дзецям дашкольнага ўзросту? У якіх жыццёвых сітуацыях іх можна выкарыстоўваць? Як вы іх растлумачыце дзецям?

25. Вырашыце метадычную задачу: Пры азнаямленні з якой граматычнай з'явай беларускай мовы можна выкарыстаць прыведзены у дадатку верш Ул. Марука? Дадайце свае практыкаванні для замацавання ўяўленняў дзяцей аб гэтай моўнай з'яве?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

26. Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, з якой мэтай пры навучанні беларускай мове можна выкарыстаць прыведзены ніжэй верш І. Муравейкі?

Клапатлівы бацька-слон
Для сябе зрабіў услон,
А для сына сланянятка
Зрабіў услончык – усланятка. .. *І.Муравейка*

Дадайце свае практыкаванні для замацавання ў дзяцей адпаведнага маўленчага навыка.

27. Вырашыце метадычную задачу: Вывальнік наладжвае гульню “Што я дастала з кошыка?” Ён гаворыць: ”Гаспадыня прынесла з кірмаша розную агародніну. Паспрабую адгадаць, што яна купіла. Калі я назаву правільна, вы ўсе разам скажыце:”Так”. Калі няправільна, скажыце: “Не”. Выхавальнік завязвае сабе вочы, затым выцягвае з кошыка па адным прадмеце, паказвае дзецям і, нібы спрабуючы адгадаць, дае некалькі назваў: “Бульба?” – “Не.” – “Бурак?” – “ Не.” – Цыбуля?” – “Так.” З якой мэтай наладжваецца гэта гульня? Да якой групы гульняў яна адносіцца? Прывядзіце прыклады гульняў з падобнымі сітуацыямі.

28. Вырашыце метадычную задачу: На занятках па тэме “Адзенне” выхавальнік выконвае ролю прадаўца. Ён, напрыклад, гаворыць: “У нашым магазіне прадаюцца капялюшы. Капялюш надзяваюць на галаву. Яго носяць і жанчыны, і мужчыны. Летам капялюш носяць, каб сонца не пякло ў галаву, а ўвосень ці ўвесну – каб было цяплей. Хто хоча купіць капялюш? Пакажы яго. Так, гэта капялюш. Што ты купіш?” Назавіце прыем, які выкарыстоўвае выхавальнік пры увядзенні новага слова. Якую задачу развіцця беларускага маўлення дзяцей дапамагае вырашыць гэты прыём?

29. Вырашыце метадычную задачу: Зрабіце пералік дыдактычнага абсталявання беларускамоўнай лялькі ў адпаведнасці з сучасным побытам па спісе: магчымыя віды лялек, імя лялькі, бялізна, абутак, побыт, мэбля, ежа. Якія гульні-заняткі можна праводзіць з дыдактычнай беларускамоўнай лялькай?

30. Вырашыце метадычную задачу: Прачытайце прыведзеныя фразеалагізмы: пад гарачую руку, ні да чаго рукі не ляжаць, на ўсе рукі, сядзець склаўшы рукі, разводзіць рукамі, лёгкі на руку, як без рук, адбівацца рукамі і нагамі, не з рукі, з парожнімі рукамі, хуткі на руку. Якія з іх, на ваш погляд, даступны дзецям дашкольнага ўзросту? У якіх жыццёвых сітуацыях іх можна выкарыстоўваць? Як вы іх растлумачыце дзецям?

31. Вырашыце метадычную задачу: У старшай групе дзіцячага сада дзеці разглядаюць нацюрморт І. Хруцкага “Кветкі і плады” (гл дадатак)

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

.Прывядзіце прыклад узору апавядання выхавальніка па карціне беларускага мастака І.Хруцкага “Кветкі і плады”.

32. Вырашыце метадычную задачу. У сярэдзіне сакавіка і ў пачатку красавіка ва ўстанове дашкольнай адукацыі дзеці гукаюць вясну. Прывядзіце прыклады народных гульняў, у якія гуляюць дзеці ў час свята. Састаўце прыкладны план святкавання “Гукання вясны” ў дзіцячым садзе.

Дадатак
(білет 4)

Вясёлка

Чырвоны!
І блакітны!
І зялёны!
Фіялетавы!
І жоўты!
Ну а болей
Не знайшоў ты?
Пашукай,
Бо хутка згіне.
Вось яшчэ знайшоўся … (сіні).
Не шукайце больш дарма…

С. Грахоўскі

Дадатак
(білет 5)

А. Кобец-Філімонава “Сем мастакоў”

У адным горадзе жылі-былі сем мастакоў. Горад, у якім яны жылі, быў вельмі змрочны. Таму што над ім віселі шэрыя хмары. І ад іх на ўвесь горад падаў шэры цень. З-за хмараў не было відаць аранжавага сонца. Не было відаць зялёнай лістоты. Не было відаць блакітных нябёсаў. І ўсё, што малявалі мастакі, было шэрае і непрыгожае. Яны ж думалі, што неба можа быць толькі шэрага колеру. І лісце толькі шэрага колеру. І ўсё наўкола — толькі шэрага колеру. Таму і фарбы ў іх былі толькі шэрыя. Яны не маглі маляваць іначай. Аднойчы ў горад прыляцеў вецер і разагнаў хмары. Мастакі выбеглі на вуліцу — і не паверылі сваім вачам.

— Ой, якое прыгожае неба! — сказалі яны.

— Ой, якое прыгожае сонца! — сказалі яны.

— Ой, якое прыгожае лісце! — сказалі яны.

І адразу пачалі маляваць. Але атрымалася непрыгожа. Таму што ў іх была толькі шэрая фарба. Сем мастакоў цяжка ўздыхнулі. Што ж ім рабіць? Як навучыцца добра маляваць? Тады адзін з іх сказаў:

— Сябры! Хадзем фарбы шукаць. Узялі мастакі сем пэндзлікаў і сем вядзерцаў і пайшлі фарбы шукаць. Доўга вандравалі яны па белым свеце і ўсяму дзівіліся.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А дзівіцца было чаму. Яны ж усё жыццё жылі ў змрочным горадзе і не ведалі, што ёсць на свеце пунсовы-пунсовы мак, які квітнее на зялёным лузе; што ёсць бялюткі рамонак з залацістай сярэдзінай; што сонца ўдзень аранжавае, а ўвечары — малінавае. Яны любаваліся прыродай, многае спазнавалі і ўсё запаміналі. Аднойчы мастакі падняліся на вяршыню самай высокай гары. Адтуль было відаць усё навокал: і рэкі, і лясы, і лугі — увесь шлях, які яны прайшлі. Залюбаваліся мастакі і пачалі марыць:

— Ах, як бы я хацеў намаляваць мак! — сказаў адзін.

— А я — сонца! — сказаў другі.

— А я — дзьмухавец! — сказаў трэці.

— А я — лісточак! — сказаў чацвёрты.

— А я — неба! — сказаў пяты.

— А я — званочак! — сказаў шосты.

— А я — фіялку! — сказаў сёмы.

І як толькі яны гэта сказалі — на небе ўзнікла вясёлка. Убачылі мастакі вясёлку — і вачам сваім не паверылі.

— Ах, якія фарбы! — уздыхнулі яны.

— Я бачу фарбу, як мак! — сказаў адзін.

— А я — як сонца! — сказаў другі.

— А я — як дзьмухавец! — сказаў трэці.

— А я — як лісточак! — сказаў чацвёрты.

— А я — як званочак! — сказаў шосты.

— А я — як фіялку! — сказаў сёмы.

І раптам адзін канец вясёлкі апусціўся каля самых ног мастакоў. І яны ўбачылі сем каляровых дарожак.

Чырвоную, як мак.

Аранжавую, як сонца.

Жоўтую, як дзьмухавец.

Зялёную, як лісточак.

Блакітную, як неба.

Сінюю, як званочак.

Фіялетавую, як фіялка.

— Ура! — закрычалі мастакі.

— Нарэшце мы знайшлі фарбы!

Кожны выбраў сабе любімую дарожку і пайшоў па ёй. Прайшлі мастакі па ўсёй вясёлцы. І адразу ж пачалі маляваць. Ім не цярпелася даведацца, якога колеру фарбы ў іхніх вядзерцах. Узялі мастакі вялікі ліст паперы, і кожны па чарзе правёў па ім лінію сваім пэндзлікам. Атрымалася яркая, сямі колераў вясёлка. Мастакі былі шчаслівыя. Цяпер яны маглі намаляваць усё, пра што марылі. А што сталася з вясёлкай? Яна знікла. Таму што аддала ўсе свае фарбы. А калі пойдуць яе шукаць іншыя мастакі, яна зноў з’явіцца і аддасць ім свае новыя фарбы.

Дадатак
(білет 6)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ход заняткаў

На стале макет з сажалкай.

Выхавальнік:

- Якая прыгожая сажалка! Сюды вельмі часта прыходзяць гусі, качкі.
- Паслухайце, дзеці, і адгадайце, хто ідзе да сажалкі: кра-кра-кра! (з'яўляецца качка.)
- Качка прыйшла купацца. Што робіць качка?
- Выйшла з вады пайшла на кладачку на сонейку пагрэцца. Каго вы бачыце на кладачцы?
- Вось яшчэ хтосьці бяжыць да кладачкі. Хто гэта? Маленькае … качаня.
- Качаня села на кладачцы каля качкі. Хто цяпер сядзіць на кладачцы?
- Колькі качак і колькі качанят?
- Хтосьці зноў ідзе да сажалкі. Так, яшчэ адна вялікая качка.
- Села качка на кладачку. Каго вы цяпер бачыце на кладачцы?
- Каго больш – качак ці качанят?
- Што трэба зрабіць, каб качак і качанят было пароўну? Паклічам яшчэ адно качаня. (Кра-кра!)
- Колькі цяпер качанят?
- А вось паблізу прабяжала лісіца. Качкі спужаліся і кінуліся ў ваду."

Дадатак
(білет 8)

Ягады
З мамай я збіраў суніцы,
А з бабуляю – чарніцы
Ездзіў з татам у маліны,
А з дзядулем – у ажыны.
А сягоння мы з сястрыцай
Пойдзем разам у брусніцы,
Запрасілі сябрукі
Нас назаўтра ў буякі.
З кожнай, кожнай ягадай
Павітацца рады я.

М.Пазнякоў

Дадатак
(білет 9)

Гебемот разявіў рот
І глядзіць на масалёт.
- Ты мяне паслухай, братка,
Масалёт – не кашаладка.

А. Жыгуноў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дадатак
(білет 11)

Гульня “Агароднік”.

Выхавальнік (В.):

- Прыдумайце, якой агароднінай вы сябе назавеце (рэпа, цыбуля, морква, бульба, бурак…), і станьце ў круг.
- Я буду агароднікам.

Выходзіць на сярэдзіну круга і стукае палкай аб зямлю.

– Дзеці: Хто там?

– В.: Агароднік!

– Дзеці: Чаго прыйшоў?

– В.: Рэпку ўзяць!

Пасля гэтага ўсе вядуць карагод і спяваюць:

- Зверху рэпка зялёная, у сярэдзіне тоўстая, напрыканцы вострая. Хавае хвост пад сябе. Хто да яе падыдзе, усялякі за віхор возьме.

Агароднік спрабуе адгадаць, хто з дзяцей назваў сябе рэпкай. Адгадваць можа тры разы.Калі адгадае, рэпка займае яго месца. Калі не – выбіраюць іншага агародніка.

Дадатак
(білет 12)

Сюжэтна-дыдактычная гульня “Каго пакатаем на машыне?”
(аўтар Э.П. Караткова)

Адно дзіця саджае на машыну вавёрку, катае яе і прагаворвае свае дзеянне: “*Я катаю на машыне вавёрку*”

Выхавальнік пытаецца: “Каго яшчэ пакатаем на машыне?”

Дзеці прапануюць пакатаць вожыка. Саджаюць яго на машыну. Складаюць сказ: “*Віця катае на машыне вавёрку і вожыка*”. Колькасць цацак паступова павялічваецца,

Дадатак
(білет 16)

Яблык

Залацісты, спелы яблык
На маёй ляжыць далоні.
Залацісты, буйны яблык
Быццам сонейка малое.

А. Мясткоўскі

Дадатак

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(білет 18)

Ход гульні

Выхавальнік просіць дзяцей успомніць, як гавораць гусі. (“Га-га-га” – гукаперайманне *га-га-га* ў беларускай мове, як і ў рускай, вымаўляецца з выбухным [г].) А вось як гавораць галубы: “ггу-ггу-ггу”. На палянцы раздаюцца па чарзе галасы: *га-га-га, ггу-ггу-ггу, га-га-га-, ггу-ггу-ггу*. Гэта “гавораць” гусі і галубы.

Выхавальнік гаворыць: “Паглядзіце, што робіць язычок гуся, калі той вымаўляе гук *г* (вымаўляе як выбухны): ён апускае хвосцік уніз, выгінае сваю спінку і спінкай звонка-звонка стукае ў столь: *г – г - г*. Як стукае язычок? Ці можна пацягнуць, праспяваць гэты гук?А вось як робіць язычок голуба: ён таксама хвосцік апускае ўніз. Спінку выгінае, але да столі не дастае, ён выпускае з хаткі цёплае паветра, ціхенька пахропвае, і ў яго атрымліваецца працягла: *ггг – ггг – ггг*. Паспрабуйце і вы так вымавіць.

Выхавальнік расказвае, што гусі і галубы гуляюць на палянцы. Мы іх не бачым, але па голасе можна здагадацца, хто з іх гаворыць. Вымаўляе гукаперайманні некалькі разоў. Дзеці адгадваюць, гусь ці голуб гаворыць.

Выхавальнік прапануе дзецям падумаць, у каго кожны з іх хоча пераўвасобіцца і чыю песеньку праспяваць – гуся ці голуба. Выклікае дзяцей па аднаму, тыя вымаўляюць задуманыя гукаперайманні, а ўсе астатнія адгадваюць, у каго пераўвасобілася дзіця. Важна выклікаць як мага больш дзяцей, але так, каб гульня не надакучыла.

Група дзяцей дзеліцца на дзве каманды: “Гусей” і “Галубоў”. Выхавальнік – гаспадыня, якая корміць птушак. Калі яна кліча “гусі-гусі”, дзеці-“гусі” адказваюць “га-га-га”. Калі кажа “гулі-гулі”, дзеці-“галубы” адказваюць “ггу-ггу-ггу”. Праз некаторы час дзеці мяняюцца ролямі, гульня працягваецца.

А) Выхавальнік: “Паслухайце, як малыя парасяткі ядуць бацвінне: *гам-гам-гам*. А вось малыя конікі скачуць: *гоп-гоп-гоп*. А сабака брэша: *гаў-гаў-гаў*. Паспрабуем усе разам: як ядуць парсючкі? Як скачуць конікі? Як брэша сабака?

Адгадайце, дзе мы зараз ідзем – міма парсючкоў, конікаў ці сабакі (вымаўляе гукаперайманні).Той. хто хоча пабачыць гэтых жывёл, павінен паказаць, што ён ведае, як ядуць парсючкі, брэша сабака, скачуць конікі.

Б) Выхавальнік трымае ляльку, апранутую немаўляткам, і гаворыць: “Мама гуляе з малым дзіцем і кажа яму :”*Агу*”. І дзіця адказвае: “*Агу*”. Мама кажа: “*Ага*”. І дзіця адказвае: “*Ага*”. Дзеці па аднаму бяруць ляльку і гуляюць з ёй, “як мама”.

В) Гульня “Рэха”. Выхавальнік вымаўляе гучна: “*Ага*!” Дзеці ціха адказваюць: “*Га*”. Выхавальнік: “*Агу*!” Дзеці: “*Гу*”. І далей: “*Ого*!” – “*Го*”. Паўтараецца некалькі разоў.

Апошнія дзве гульні праводяцца на наступных занятках або пасля заняткаў.

Далей выхавальнік паведамляе, што ў беларускіх словах амаль заўсёды вымаўляецца гук [γ]: напрыклад, у слове *нага*, а як сказаць гэта слова па-руску? Па-беларуску *нага, гара, голуб, гусь*. (Супастаўленне гукавых эквівалентаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рускай і беларускай моў дазваляе папярэдзіць у свядомасці дзіцяці “фактар уяўнага падабенства” рускіх і беларускіх фанем, забяспечвае асэнсаванае засваенне іх акустыка-артыкуляцыйных прымет).

Развучваюцца з дзецьмі жарты-чыстагаворкі:

Га-га-га – хачу пірага,
гі-гі-гі – смачныя пірагі,
гу-гу-га – з’есці не магу,
гоў-гоў-гоў – няма пірагоў.

Дзеці завучваюць скорагаворкі, напрыклад. “*Даў Грыша Груні грушу, Груня Грышу шакалад*”. Вымаўляюць іх павольна, мерна, хутка; гучна, ціха, шэптам, без голасу. Увага дзяцей накіравана на спосаб вымаўлення скорагаворкі. Такім чынам, вымаўленне гука [γ] аўтаматызуецца.

Нарэшце, выхаванцы могуць выконваць заданні на падбор слоў з зададзеным гукам (гульня “Хто назаве больш слоў з гукам [γ]?”).

Дадатак
(білет 19)

Праграмны змест:

развіваць уменне адказваць на пытанні пра знешні выгляд цацкі, складаць апісанне цацкі з 2-3 сказаў. Узбагачаць слоўнік сінонімамі, антонімамі, дзеясловамі, прыметнікамі. Практыкаваць ва ўтварэнні назоўнікаў з дапамогай памяншальных суфіксаў.

Ход заняткаў

В.

- Хтосьці да нас прыйшоў у госці.
- Адгадайце, хто гэта: Даўгавухі і касы, скача без аглядкі ад ваўка і ад лісы.
- Хто знайшоў адгадку?”
- Паказвае цацку зайца і пытаецца:…

Дадатак
(білет 26)

Спрытна скачуць
Пад гару
Цыбатыя кенгуру.

Вунь смяюцца
На гары
Вяселыя кенгу-ры.

Не! Не так гавары,
І з гары,
І пад гару
Трэба мовіць –
Кенгуру.

Дадатак
(білет 31)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Х о д з а н я т к а ў

В.: Паглядзіце на рэпрадукцыю карціны вядомага бела рускага мастака Івана Хруцкага.

— Што намалявана на карціне?

— На карціне намаляваны букет кветак у вазе, пад якім ляжаць розныя плады. Якую назву можна даць нацюрморту?

Так, нацюрморт можна назваць «Кветкі і плады».

— У цэнтры нацюрморта — кветкі ў вазе. Назавіце гэтыя кветкі. Якога колеру півоні, ружы, рамонкі, касачы?

— Што стаіць побач з вазай? (Шклянка чыстай вады.)

— Каля шклянкі ляжыць долька лімона. Якога колеру лімон?

— Назавіце садавіну, што ляжыць побач з разрэзаным лімонам. (Побач з лімонам ляжыць пяць груш.)

— Якія грушы па колеры? (Жоўтыя.) Так, грушы цёплага жоўтага колеру. Адразу відаць, што яны спелыя.

— Ці заўважылі вы, што вісіць на адной з груш? (Маленькая галінка зялёнага вінограду.) Дзе яшчэ можна ўбачыць вінаград на карціне? Так, за грушамі мы бачым гарбуз, на якім таксама ляжыць вялікая гронка спелых і сакавітых ягад вінограду.

— Што стаіць злева ад вазы з кветкамі? (Стаіць невялікі кошык з абрыкосамі.) Якога колеру абрыкосы? Якія абрыкосы на смак? Ці сакавітыя абрыкосы? Каб паказаць сакавітасць пладоў, мастак намаляваў адзін абрыкос разрэзаным напалову.

— Што стаіць ззаду за абрыкосамі? (Ззаду за абрыкосамі стаіць кошык з ягадамі.)

— Што ляжыць зверху на ягадах? (На ягадах ляжыць некалькі каласоў пшаніцы.)

— Вы любіце лета? Якія колеры ў гэтай пары года?

— На карціне шмат колераў лета — гэта цёплы жоўты, пяшчотны ружовы, сціплы блакітны, яркі зялёны.

— Назавіце, на якіх кветках і пладах вы ўбачылі колеры лета.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— Цёплы жоўты колер — гэта якія плады і кветкі? …

— Пяшчотны ружовы? …

— Сціплы блакітны? …

— Яркі зялёны? …

Паслухайце апавяданне пра нацюрморт, які мы разглядалі…

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
_____ А.І.Жук
_____ 2024 г.
Рэгістрацыйны № УД-2903-0-2024/вуч.

МЕТОДЫКА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасці:
6-05-0112-01 Дашкольная адукацыя

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйнага стандарта агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0112-01 і вучэбнага плана па спецыяльнасці 6-05-0112-01 Дашкольная адукацыя (23.02.2023 г., № 001-2023/у).

СКЛАДАЛЬНІКІ:

Н.С. Старжынская, прафесар кафедры методык дашкольнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», доктар педагагічных навук, прафесар;

Д.М. Дубініна, дацэнт кафедры методык дашкольнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

Т.М. Сацэнка, загадчык лабараторыі дашкольнай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, кандыдат псіхалагічных навук;

Я.І. Варанецкая-Лосік, дацэнт кафедры агульнай і дашкольнай педагогікі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт.

УЗГОДНЕНА:

Загадчык дзяржаўнай установы адукацыі
«Дзіцячы сад №138 г. Мінска» А.С.Ярмашук
27.03.2024

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай методык дашкольнай адукацыі установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол №9 ад 29.03.2024)

Загадчык кафедры М.С.Мельнікава

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка» (пратакол №6 ад 16.04.2024)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў адпавядае дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела БДПУ Г.В.Вінаградава

Дырэктар бібліятэкі БДПУ Н.П.Сяткоўская

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» прадугледжана вучэбным стандартам і вучэбным планам падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 6-05-0112-01 «Дашкольная адукацыя».

Актуальнасць зместу вучэбнай праграмы «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» вызначаецца тым, што ў ім адлюстраваны комплексны падыход да вырашэння задач развіцця беларускага маўлення і беларускамоўных зносін ва ўстанове дашкольнай адукацыі ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму.

Тэарэтычны падыход да праблемы развіцця маўлення ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму, што рэалізаваны ў праграме, грунтуецца на ўяўленнях пра заканамернасці маўленчага развіцця дзяцей, сфармуляваных ў даследаваннях Л.С. Выготскага, Ф.А. Сахіна, Н.В. Імедадзэ, Н.С. Старжынскай, Д.М. Дубінінай. Навучанне мове і маўленню разглядаюцца як ў лінгвістычнай сферы (авалодванне дзецьмі моўнымі навыкамі), так і ў сферы беларускамоўных зносін дзяцей паміж сабой (авалоданне камунікатыўна-маўленчымі ўменнямі).

Мэта вучэбнай дысцыпліны: фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці здзяйсняць працэс маўленчага развіцця дзяцей на беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага руска- беларускага білінгвізму.

Задачы вучэбнай дысцыпліны:

1. фарміраваць навуковыя веды пра сутнасць сучасных канцэпцый і тэхналогій навучання другой мове, развіцця беларускага маўлення і навучання нацыянальнай роднай мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму;
2. садзейнічаць асэнсаванню ролі беларускай мовы як аднаго з фундаментальных і універсальных аспектаў нацыянальнай культуры, спрыяць авалодванню працэсам беларускамоўнага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту як сродку інкультурацыі;
3. садзейнічаць разуменню і асэнсаванню таго, што навукова абгрунтаваная методыка навучання беларускай мове і развіцця беларускага маўлення павінна абапірацца на разуменне сутнасці механізмаў авалодання роднай і другой мовамі, асаблівасці руска-беларускага двухмоўя дзяцей дашкольнага ўзросту;
4. фарміраваць ўменне дыягнаставаць, праектаваць і канструяваць працэс развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя;
5. садзейнічаць авалоданню студэнтамі эфектыўнымі метадамі і прыёмамі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту, улічваць спецыфіку зместу і метадаў дашкольнай дыдактыкі;

Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вучэбная дысцыпліна «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» адносіцца да модуля «Стварэнне адукацыйнага асяроддзя ва ўстанове дашкольнай адукацыі» кампаненту ўстановы адукацыі.

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» абапіраецца на раней праслуханыя студэнтамі вучэбныя дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)», «Айчынная дзіцячая літаратура», «Дзіцячая псіхалогія», «Дашкольная педагогіка», «Тэарэтычныя асновы развіцця маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту», «Методыка развіцця маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» студэнт павінен

ведаць:

заканамернасці засваення дзецьмі беларускай мовы як другой роднай мовы ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму;

мэту, задачы і змест развіцця вуснага беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўстановах дашкольнай адукацыі, якія рэалізуюць вучэбную праграму дашкольнай адукацыі на рускай мове навучання;

метадычныя і спецыфічныя прынцыпы пабудовы адукацыйнага працэсу навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове ў сітуацыі руска-беларускага білінгвізму;

канкрэтныя спосабы (метады і прыёмы) беларускамоўнага развіцця дзяцей, азнаямлення іх з беларускай нацыянальнай культурай;

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» студэнт павінен

умець:

выбіраць найбольш эфектыўныя метады і прыёмы навучання дзяцей беларускай мове ва ўстанове дашкольнай адукацыі, якая рэалізуе вучэбную праграму дашкольнай адукацыі на рускай мове навучання;

мадэліраваць, арганізоўваць і кіраваць працэсам дыдактычных беларускамоўных зносін дзяцей дашкольнага ўзросту;

састаўляць план-канспект мерапрыемстваў па развіцці беларускага маўлення, планаваць асобны камунікатыўны акт, аналізаваць яго эфектыўнасць;

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» студэнт павінен

валодаць:

метадамі развіцця і ўдасканалення маўлення дзяцей на беларускай мове і далучэння іх да нацыянальнай і сусветнай культур сродкамі гэтай мовы;

навыкамі беларускамоўных зносін з дзецьмі, бацькамі, педагагічнымі работнікамі ўстановы дашкольнай адукацыі;

спосабамі арганізацыі работы па павышэнні культуры маўлення і ўзроўню лінгвакультурнай і народазнаўчай кампэтэнцый педагагічных работнікаў ўстановы дашкольнай адукацыі і бацькоў.

Патрабаванні да кампетэнцый

СК.11. Здзяйсняць працэс маўленчага развіцця дзяцей на беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага руска- беларускага білінгвізму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» адведзена :

для дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі адводзіцца 108 гадзін, з іх 52 аўдыторныя гадзіны. Размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі –14 гадзін, практычныя заняткі – 20 гадзін, семінарскія заняткі – 4 гадзіны, лабараторныя заняткі – 6 гадзін, кіруемая самастойная работа – 8 гадзін (8 гадзін – лекцыі);

для завочнай формы атрымання вышэйшай адукацыі (поўны тэрмін навучання) адводзіцца 12 аўдыторных гадзін, з іх лекцыі – 6 гадзін, практычныя заняткі– 6 гадзін;

для завочнай формы атрымання вышэйшай адукацыі (скарочаны тэрмін навучання) адводзіцца 12 аўдыторных гадзін, з іх лекцыі – 6 гадзін, практычныя заняткі– 6 гадзін.

Працаемкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

Прамежкавая атэстацыя праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам па спецыяльнасці ў форме экзамена ў 6 семестры (дзенная форма атрымання адукацыі) і ў 5 (завочная форма атрымання адукацыі, скарочаны тэрмін) і 7 (завочная форма атрымання адукацыі, поўны тэрмін) семестрах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РАЗМЕРКАВАННЕ БЮДЖЭТУ ВУЧЭБНАГА ЧАСУ

Назва вучэбнай дысцыпліны	Семестр	Усяго	Колькасць гадзін вучэбных заняткаў					Самастойная (пазаўдыторная) работа	Форма прамежкавай атэстацыі
			З іх						
			аўдыторныя	лекцыі	практычныя	семінарскія	лабараторныя		
Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту	6	108	52	22	20	4	6	56	Экзамен.
Усяго гадзін	6	108	52	22	20	4	6	56	Экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Раздел 1. Тэарэтычныя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму

Тэма 1.1 Білінгвізм як сацыяльна-культурны і псіхолага-педагагічны феномен

Білінгвальная кампетэнтнасць і камунікатыўная актыўнасць як асноўныя крытэрыі для вызначэння сутнасці білінгвізму.

Псіхолага-лінгвістычная характарыстыка білінгвізму: рэцэптыўны, рэпрадуктыўны і прадуктыўны білінгвізм; нарматыўны, аднабакова-нарматыўны і ненарматыўны білінгвізм; каардынацыйны і субардынацыйны білінгвізм; натуральны і штучны білінгвізм. З'явы інтэрферэнцыі і транспазіцыі ў маўленні білінгва.

Класіфікацыя білінгваў у кантэксце антагенезу: паралельны (адначасовы) і паслядоўны білінгвізм.

Сацыялінгвістычны крытэрый ступені роднасці дзвюх моў: білінгвізм блізкароднасны і неблізкароднасны. Уплыў ступені роднасці дзвюх моў на ступень праяўлення інтэрферэнцыі ў маўленні білінгва.

Тэма 1.2 Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму як навука

Катэгорыі, міждысцыплінарныя сувязі методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму.

Прадмет, аб'ект, мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту». Сутнасць пацяццяў «білінгвальная адукацыя», «білінгвальнае навучанне», «білінгвальнае выхаванне».

Метады навуковага даследавання ў методыцы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму (тэст на вызначэнне нараціўных навыкаў шматмоўных дзяцей, методыка свабоднага асацыявання і інш.).

Тэма 1.3 Навуковыя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму

Метадалагічныя асновы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму. Мова як галоўная каштоўнасць народа. Мова і культура народа. Чалавек і яго культурнае моўнае асяроддзе.

Сутнасць паняццяў: «родная мова», «нацыянальная мова», «другая мова», «замежная мова». Сацыялінгвістычная сітуацыя ў Беларусі, яе ўплыў на сферу дашкольнай адукацыі. Закон аб мовах Беларускай ССР (1990 г). Пытанні маўленчага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту у Канцэпцыі развіцця дашкольнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь (2000 г.). Пытанне вывучэння моў ва ўстановах адукацыі ў артыкуле 82 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(2022 г.). Статус беларускай мовы для рускамоўных дзяцей у Беларусі. Уздзеянне сацыяльна-эканамічных ўмоў на фарміраванне білінгвізму.

Псіхалагічныя і псіхалінгвістычныя асновы руска-беларускага блізкароднаснага білінгвізму. Асаблівасці руска-беларускага білінгвізму ў дзяцей дашкольнага ўзросту. Памылкі інтэрферэнцыі ў маўленні дзяцей дашкольнага ўзросту.

Праблемы ранняга білінгвізму. Узрост, найбольш спрыяльны для пачатку авалодвання другой мовай дзецьмі дашкольнага ўзросту. Усведамленне дзецьмі двухмоўнай рэчаіснасці, іх стаўленне да яе. Уплыў білінгвізму на разумовае развіццѐ дзяцей. Праблема засваення другой мовы як сродку камунікацыі. Уплыў білінгвізму на кагнітыўна-камунікатыўнае развіццё дзяцей дашкольнага ўзросту.

Лінгвакультаралагічны аспект ў навучанні дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове. Суадносіны рускай і беларускай моў у адукацыйным працэсе ўстановы дашкольнай адукацыі, якая рэалізуе вучэбную праграму з рускай мовай навучання.

Дыдактычныя, выхаваўчыя, развіццѐвыя і сацыялізуючая мэтавыя арыентацыі навучання беларускай мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

Раздзел 2. Станаўленне білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі

Тэма 2.1 Этапы станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі

Грамадска-палітычныя перадумовы навучання дзяцей беларускай мове ў XIX стагоддзі.

Першыя вучэбныя дапаможнікі на беларускай мове ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX стагоддзя.

Грамадска-палітычныя перадумовы станаўлення білінгвальнага выхавання дзяцей у Беларусі.

Перыядызацыя білінгвальнай дашкольнай адукацыі ў другой палове XX стагоддзя, пачаткуXXI стагоддзя (Т.У. Паліева).

Раздзел 3. Сістэма работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання

Тэма 3.1 Мэта і задачы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму

Стратэгія навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму. Л.С. Выготскі пра шляхі авалодання роднай і другой мовамі.

Мэта і задачы навучання дзяцей беларускай мове ва ўстанове дашкольнай адукацыі, якая рэалізуе вучэбную праграму з рускай мовай навучання, іх псіхалагічнае і лінгвістычнае абгрунтаванне.

Сістэматызацыя зместу развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі руска-беларускага блізкароднаснага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

білінгвізму. Сінхранічная і дыяхранічная пераемнасць моўнага і маўленчага матэрыялу.

Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі, адукацыйная галіна «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін».

Тэма 3.2 Метадычныя прынцыпы і сродкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму

Псіхолога-педагагічныя і лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму: прынцып «адна асоба ў адной сітуацыі зносін – адна мова»; фарміраванне моўных абагульненняў – асноўны прынцып навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове; прынцып уліку роднай мовы; прынцып апраксімацыі.

Узроставыя магчымасці дзяцей у засваенні моўнага матэрыялу. Маўленчая установка.

Матывацыя маўленчых дзеянняў дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове.Тры класы матываў паводле П.Я. Гальперына. Гульня як крыніца матыву маўленчай дзейнасці ў дзяцей дашкольнага ўзросту. Матывацыя маўленчай, вучэбна-маўленчай, мастацка-маўленчай і моўна-пазнавальнай дзейнасці.

Сродкі навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя: натуральная беларускамоўная атмасфера ва ўстанове дашкольнай адукацыі як умова авалодання дзецьмі дашкольнага ўзросту маўленнем на беларускай мове; мастацкая літаратура; спантанная, вучэбна-маўленчая, мастацка-маўленчая і моўна-пазнавальная дзейнасці дзяцей дашкольнага ўзросту ў працэсе авалодання беларускай мовай; навучанне беларускай мове на спецыяльных занятках; розныя віды мастацтва.

Тэма 3.3 Метады і прыёмы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя

Асноўныя метады навучання другой мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя, іх класіфікацыя. Месца кожнага метаду ў сістэме работы па развіцці беларускага маўлення ва ўстанове дашкольнай адукацыі, якая рэалізуе праграму з рускай мовай навучання. Спецыфіка методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

Раздзел 4. Асноўныя напрамкі работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму

Тэма 4.1 Камунікатыўная накіраванасць развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту

Культурна – псіхалагічная спецыфіка засваення другой мовы як сродку камунікацыі. Уплыў білінгвізму на камунікатыўна-кагнітыўнае развіццё дзяцей дашкольнага ўзросту.

Развіццѐ ў дзяцей чуцця беларускай мовы.

Выкарыстанне фальклорных твораў для развіцця рэцэптыўнага і рэпрадуктыўнага двухмоўя, увядзення дзяцей у беларускую мову.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Народныя гульні, іх роля ў развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

Роля дыдактычнай лялькі ў развіцці беларускага маўлення дзяцей.

Нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове.

Арганізацыя пазасітуацыйна-пазнавальных і пазасітуацыйна-асобасных беларускамоўных зносін дзяцей дашкольнага ўзросту. Фальклорныя творы як аснова для пазнавальных і асобасных гутарак. Правядзенне заняткаў з арганізацыяй маўленчых зносін на вывучаемай мове.

Тэма 4.2 Мастацка-маўленчая дзейнаць як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту

Азнаямленне дзяцей з малымі формамі беларускага фальклору (забаўлянкі, песенькі, прыказкі, прымаўкі і загадкі). Методыка работы з беларускай народнай казкай.

Задачы і змест азнаямлення дзяцей з творамі беларускіх пісьменнікаў. Методыка выкарыстання твораў беларускіх пісьменнікаў ва ўстанове дашкольнай адукацыі.

Рухавыя гульні з мастацкім словам, іх роля ў развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Драматызацыя і інсцэніраванне твораў мастацкай літаратуры.

Методыка правядзення літаратурных забаў і ранішнікаў; кніжкіных тыдняў ва ўстанове дашкольнай адукацыі.

Тэма 4.3 Развіццё беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту

Слоўнік роднай мовы як адлюстраванне нацыянальнага светапогляду. Асаблівасці лексікі беларускай мовы ў параўнанні з рускай. Значэнне слоўнікавай работы. Крытэрыі адбору лексікі для заняткаў па развіцці беларускага маўлення дзяцей. Методыка ўвядзення і замацавання слоўніка. Работа над сэнсавым бокам слова.

Тэма 4.4 Методыка фарміравання граматычнага ладу маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту

Асаблівасці граматыкі беларускай мовы ў параўнанні з рускай. Крытэрыі адбору граматычнага матэрыялу для развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Паслядоўнасць увядзення граматычных форм беларускай мовы. Этапы авалодання дзецьмі граматычнымі формамі (паводле А.І. Негнявіцкай, А.М. Шахнаровіча). Фарміраванне ў дзяцей навыкаў пабудовы сказаў на беларускай мове, змянення слоў па формах, утварэння новых слоў.

Тэма 4.5 Методыка выхавання гукавой культуры беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту

Параўнальная характарыстыка фанемных сістэм рускай і беларускай моў. Задачы навучання беларускаму вымаўленню. Крытэрыі адбору фанемных адзінак і паслядоўнасць іх увядзення. Методыка фарміравання правільнага вымаўлення спецыфічных гукаў беларускай мовы. Знаёмства дзяцей з арфаэпічнымі асаблівасцямі беларускага маўлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма 4.6 Методыка развіцця прадуктыўнага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту

Асаблівасці выбару тэм для заняткаў па развіцці прадуктыўнага беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Асноўныя прынцыпы фарміравання звязнага (дыялагічнага і маналагічнага) беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

Развіццѐ выразнасці і вобразнасці маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту.

Інтэграваны падыход да білінгвальнага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту. Навучанне звязнаму дыялагічнаму і маналагічнаму маўленню дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.

Тэма 4.7 Методыка азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа і развіццё беларускага маўлення

Нацыянальна-культурнае асяроддзе ўстановы дашкольнай адукацыі. Методыка азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з беларускім фальклорам, нацыянальнымі традыцыямі, побытам і культурай беларускага народа.

Методыка правядзення беларускіх народных свят ва ўстанове дашкольнай адукацыі і развіцце беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

Тэма 4.8 Дыягностыка развіцця беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя

Сутнасць дыягностыкі маўленчага развіцця дзяцей, яе задачы і значэнне. Аналіз сучасных дыягнастычных методык развіцця маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага маўлення; метады дыягностыкі. Дыягностыка маўленчага развіцця пры вывучэнні інтэлектуальнай дзейнасці. Методыка абследавання розных бакоў беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя.

Спосабы афармлення і інтэрпрэтацыі вынікаў дыягностыкі. Улік вынікаў дыягностыкі ў адукацыйным працэсе ўстановы дашкольнай адукацыі , якая рэалізуе вучэбную праграму дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання. Дыягнастычна-карэцыйная праграма маўленчага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя.

Тэма 4.9 Метадычнае кіраўніцтва работай па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя

Арганізацыя метадычнай работы ва ўстановах дашкольнай адукацыі, якія рэалізуюць вучэбную праграму дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання: змест работы; стварэнне ўмоў для развіцця беларускага маўлення дзяцей. Кантроль за выкананнем стандартаў і рэалізацыяй адукацыйнай праграмы адносна білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту. Праэктаванне білінгвальнай адукацыйнай дзейнасці ва ўстанове дашкольнай адукацыі, якая рэалізуе вучэбную праграму дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання. Дыдактычнае абсталяванне метадычнага кабінета для арганізацыі білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту. Работа

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўстановы дашкольнай адукацыі з бацькамі ў кірунку білінгвальнага развіцця дзяцей, яе змест і формы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вучэбна–метадычная карта вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» дзённая форма атрымання адукацыі

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела, тэмы	Колькасць аўдыторных гадзін					Самастойнаня (пазааўдыторная)	Метадычныя сродкі дапаможнікі, навучання	Літаратура	Формы кантролю
		Лекцыі	Практычныя заняткі	Семінарскія заняткі	Лабараторныя заняткі	Кіруемая самастойная				
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11
	6 семестр									
1	**Раздел 1. Тэарэтычныя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму**	**2**		**4**		**2л**	**12**			
1.1	**Тэма 1.1 Білінгвізм як сацыяльна-культурны і псіхолага-педагагічны феномен** Білінгвальная кампетэнтнасць і камунікатыўная актыўнасць як асноўныя крытэрыі для вызначэння сутнасці білінгвізму. Псіхолага-лінгвістычная характарыстыка білінгвізму. З'явы інтэрферэнцыі і транспазіцыі ў маўленні білінгва. Класіфікацыя білінгваў у кантэксце антагенезу. Сацыялінгвістычны крытэрый ступені роднасці дзвюх моў. Уплыў ступені роднасці дзвюх моў на			1		2 л	2	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4]	**Рэйтынгавая кантрольная работа №1.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	ступень праяўлення інтэрферэнцыі ў маўленні білінгва.									
1.2.	**Тэма 1.2 Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму як навука** Катэгорыі, міждысцыплінарныя сувязі методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму. Прадмет, аб'ект, мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны . Сутнасць пацяццяў «білінгвальная адукацыя», «білінгвальнае навучанне», «білінгвальнае выхаванне». Метады навуковага даследавання ў методыцы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.	2		1			2	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4]	Вуснае апытванне Тэсціраванне Экспрэс-апытванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы).
1.3	**Тэма 1.3 Навуковыя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму** Метадалагічныя асновы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму. Псіхалагічныя і псіхалінгвістычныя асновы руска-беларускага блізкароднаснага білінгвізму. Лінгвакультаралагічны аспект ў навучанні дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове.			1			2	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4]	Вуснае апытванне Тэсціраванне Экспрэс-апытванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	Дыдактычныя, выхаваўчыя, развіццёвыя і сацыялізуючая мэтавыя арыентацыі навучання беларускай мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.									
2	**Раздзел 2. Станаўленне білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі**					**2л**	**4**			
2.1	**Тэма 2.1 Этапы станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі** Грамадска-палітычныя перадумовы навучання дзяцей беларускай мове ў XIX стагоддзі. Першыя вучэбныя дапаможнікі на беларускай мове ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX стагоддзя. Грамадска-палітычныя перадумовы станаўлення білінгвальнага выхавання дзяцей у Беларусі. Перыядызацыя білінгвальнай дашкольнай адукацыі ў другой палове XX стагоддзя, пачаткуXXI стагоддзя (Т.У. Паліева).			1		2 л	4	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[2] [3] [4]	**Рэйтынгавая кантрольная работа №2.**
3	**Раздзел 3. Сістэма работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання**	**6**	**2**				**10**			
3.1	**Тэма 3.1 Мэта і задачы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму** Стратэгія навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове **ў** сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму.	2					2	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[2] [3] [4]	Вуснае апытванне Тэсціраванне Экспрэс-апытванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	Мэта і задачы навучання дзяцей беларускай мове ва ўстанове дашкольнай адукацыі сітуацыі, якая рэалізуе вучэбную праграму дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання, іх псіхалагічнае і лінгвістычнае абгрунтаванне. Сістэматызацыя зместу развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі руска-беларускага блізкароднаснага білінгвізму. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі, адукацыйная галіна «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін».									табліцы, граф. схемы).
3.2	**Тэма 3.2 Метадычныя прынцыпы і сродкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму** Псіхолога-педагагічныя, лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму. Матывацыя маўленчых дзеянняў дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове.Тры класы матываў паводле П.Я. Гальперына. Гульня як крыніца матыву маўленчай дзейнасці ў дзяцей дашкольнага ўзросту. Матывацыя маўленчай, вучэбна-маўленчай, мастацка-маўленчай і моўна-пазнавальнай дзейнасці. Сродкі навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.	2	1				4	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[2] [3] [4] [1]	Вуснае апытванне Тэсціраванне Экспрэс-апытванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы).
3.3	**Тэма 3.3 Метады і прыёмы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага**	2	1				4	Рабочы сшытак, мультымедыйныя	[2] [3]	Вуснае апытванне Тэсціраванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя Сучасныя тендэнцыі навучання другой блізкароднаснай мове. Асноўныя метады навучання другой мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя, іх класіфікацыя. Месца кожнага метаду ў сістэме работы па развіцці беларускага маўлення ва ўстанове дашкольнай адукацыі, якая рэалізуе вучэбную праграму дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання.							прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[4] [1]	Экспрэс-апытванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы).
4	**Раздзел 4. Асноўныя напрамкі работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму**	**6**	**18**		**6**	**4л**	**36**			
4.1	**Тэма 4.1 Камунікатыўная накіраванасць развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту** Культурна – псіхалагічная спецыфіка засваення другой мовы як сродку камунікацыі. Развіццѐ ў дзяцей чуцця беларускай мовы. Выкарыстанне фальклорных твораў для развіцця рэцэптыўнага і рэпрадуктыўнага двухмоўя. Роля дыдактычнай лялькі ў развіцці беларускага маўлення дзяцей. Нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове. Арганізацыя пазасітуацыйна-пазнавальных і пазасітуацыйна-асобасных беларускамоўных		2				4	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4]	Вуснае апытванне Тэсціраванне Экспрэс-апытванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Абарона заданняў пры выкананні студэнтамі лабараторных работ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	зносін дзяцей дашкольнага ўзросту.									
4.2	**Тэма 4.2 Мастацка-маўленчая дзейнасць як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту** Азнаямленне дзяцей з малымі формамі беларускага фальклору. Методыка работы з беларускай народнай казкай. Задачы і змест азнаямлення дзяцей з творамі беларускіх пісьменнікаў. Методыка выкарыстання твораў беларускіх пісьменнікаў ва ўстанове дашкольнай адукацыі. Драматызацыя і інсцэніраванне твораў мастацкай літаратуры. Методыка правядзення літаратурных забаў і ранішнікаў; кніжкіных тыдняў ва ўстанове дашкольнай адукацыі.		2				4	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Вуснае апытванне Тэсціраванне Экспрэс-апытванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы).
4.3.	**Тэма 4.3 Развіццё беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту** Слоўнік роднай мовы як адлюстраванне нацыянальнага светапогляду. Асаблівасці лексікі беларускай мовы ў параўнанні з рускай. Значэнне слоўнікавай работы. Крытэрыі адбору лексікі для заняткаў па развіцці беларускага маўлення дзяцей. Методыка ўвядзення і замацавання слоўніка. Работа над сэнсавым бокам слова.	2	2				4	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Вуснае апытванне Тэсціраванне Экспрэс-апытванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы).
4.4	**Тэма 4.4 Методыка фарміравання граматычнага ладу маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту** Асаблівасці граматыкі беларускай мовы ў параўнанні з рускай. Крытэрыі адбору граматычнага матэрыялу	2	2				4	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Вуснае апытванне Тэсціраванне Экспрэс-апытванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	для развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Паслядоўнасць увядзення граматычных форм беларускай мовы. Этапы авалодання дзецьмі граматычнымі формамі (паводле А.І. Негнявіцкай, А.М. Шахнаровіча). Фарміраванне ў дзяцей навыкаў пабудовы сказаў на беларускай мове, змянення слоў па формах, утварэння новых слоў.									Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы).
4.5.	**Тэма 4.5 Методыка выхавання гукавой культуры беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту** Параўнальная характарыстыка фанемных сістэм рускай і беларускай моў. Задачы навучання беларускаму вымаўленню. Крытэрыі адбору фанемных адзінак і паслядоўнасць іх увядзення. Методыка фарміравання правільнага вымаўлення спецыфічных гукаў беларускай мовы. Знаёмства дзяцей з арфаэпічнымі асаблівасцямі беларускага маўлення.	2	2				4	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Вуснае апытванне Тэсціраванне Экспрэс-апытванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы).
4.6.	**Тэма 4.6 Методыка развіцця прадуктыўнага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту** Асаблівасці выбару тэм для заняткаў па развіцці прадуктыўнага беларускага маўлення дзяцей лашкольнага ўзросту. Асноўныя прынцыпы фарміравання звязнага (дыялагічнага і маналагічнага) беларускага маўлення дзяцей. Развіццѐ выразнасці і вобразнасці маўлення		2				4	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Вуснае апытванне Тэсціраванне Экспрэс-апытванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	ў дзяцей дашкольнага ўзросту. Інтэграваны падыход да білінгвальнага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту. Навучанне звязнаму дыялагічнаму і маналагічнаму маўленню дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.									
4.7	**Тэма 4.7 Методыка азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа і развіццё беларускага маўлення** Нацыянальна-культурнае асяроддзе ўстановы дашкольнай адукацыі. Методыка азнаямлення дзяцей з беларускім фальклорам,беларускай нацыянальнай цацкай, нацыянальнымі традыцыямі, побытам і культурай беларускага народа. Методыка правядзення беларускіх народных свят ва ўстанове дашкольнай адукацыі і развіцце беларускага маўлення дзяцей.		2			2 л	4	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	**Рэйтынгавая кантрольная работа №3.**
4.8.	**Тэма 4.8 Дыягностыка развіцця беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя** Сутнасць дыягностыкі маўленчага развіцця дзяцей, яе задачы і значэнне. Аналіз сучасных дыягнастычных методык развіцця маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага маўлення; метады дыягностыкі. Методыка абследавання розных бакоў беларускага маўлення дзяцей. Спосабы афармлення і інтэрпрэтацыі вынікаў дыягностыкі. Улік вынікаў дыягностыкі ў адукацыйным		2				4	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Вуснае апытванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры

ЗИТОРИЙ БГПУ

	працэсе ўстановы дашкольнай адукацыі.									
16.	**Тэма 4.9 Метадычнае кіраўніцтва работай па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя** Арганізацыя метадычнай работы ва ўстановах дашкольнай адукацыі. Кантроль за выкананнем стандартаў і рэалізацыяй адукацыйнай праграмы адносна білінгвальнай адукацыі дзяцей. Праэктаванне білінгвальнай адукацыйнай дзейнасці ва ўстанове дашкольнай адукацыі. Дыдактычнае абсталяванне метадычнага кабінета для арганізацыі білінгвальнай адукацыі дзяцей. Работа ўстановы дашкольнай адукацыі з бацькамі у кірунку білінгвальнага развіцця дзяцей, яе змест і формы.		2		6	2л	4	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
	Усяго	**14**	**20**	**4**	**6**	**8л**	**56**			**Экзамен**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вучэбна–метадычная карта вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту»
Завочная форма атрымання адукацыі
3.6 гадоў навучання

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела, тэмы	Колькасць аўдыторных гадзін		Метадычныя дапаможнікі, сродкі навучання	Літаратура	Формы кантролю ведаў
		Лекцыі	Практычныя заняткі			
1	2	3	4	5	6	7
	3 семестр					
1	**Раздел 1. Тэарэтычныя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму**	**1**				
1.1	**Тэма 1.1 Білінгвізм як сацыяльна-культурны і псіхолага-педагагічны феномен** Білінгвальная кампетэнтнасць і камунікатыўная актыўнасць як асноўныя крытэрыі для вызначэння сутнасці білінгвізму. Псіхолага-лінгвістычная характарыстыка білінгвізму. З'явы інтэрферэнцыі і транспазіцыі ў маўленні білінгва. Класіфікацыя білінгваў у кантэксце антагенезу. Сацыялінгвістычны крытэрый ступені роднасці дзвюх моў. Уплыў ступені роднасці дзвюх моў на ступень праяўлення інтэрферэнцыі ў маўленні білінгва.	0,5		Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4]	Тэсціраванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1.2.-1.3	**Тэма 1.2 - 1.3 Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму як навука Навуковыя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму** Катэгорыі, міждысцыплінарныя сувязі методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Прадмет, аб'ект, мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны «Развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту». Сутнасць пацяццяў «білінгвальная адукацыя», «білінгвальнае навучанне», «білінгвальнае выхаванне». Метадалагічныя асновы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Псіхалагічныя і псіхалінгвістычныя асновы руска-беларускага блізкароднаснага білінгвізму. Лінгвакультаралагічны аспект ў навучанні дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове. Дыдактычныя, выхаваўчыя, развіццёвыя і сацыялізуючая мэтавыя арыентацыі навучання беларускай мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.	0,5			[1] [2] [3] [4]	Тэсціраванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
2	**Раздзел 2. Станаўленне білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі**	**0,5**				
2.1	**Тэма 2.1 Этапы станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі** Грамадска-палітычныя перадумовы навучання дзяцей беларускай мове ў XIX стагоддзі. Першыя вучэбныя дапаможнікі на беларускай мове ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX стагоддзя. Грамадска-палітычныя перадумовы станаўлення білінгвальнага выхавання дзяцей у Беларусі. Перыядызацыя білінгвальнай дашкольнай адукацыі ў	0,5		Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4]	Тэсціраванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	другой палове XX стагоддзя, пачаткуXXI стагоддзя (Т.У. Паліева).					табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
3	**Раздзел 3. Сістэма работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання**	**1.5**				
3.1	**Тэма 3.1 Мэта і задачы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму** Стратэгія навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму. Мэта і задачы навучання дзяцей беларускай мове ва ўстанове дашкольнай адукацыі сітуацыі. Сістэматызацыя зместу развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі, адукацыйная галіна «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін».	0.5		Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
3.2	**Тэма 3.2 Метадычныя прынцыпы і сродкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму** Псіхолога-педагагічныя, лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму. Сродкі навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.	0.5		Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы).
3.3	**Тэма 3.3 Метады і прыёмы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя** Сучасныя тэндэнцыі навучання другой блізкароднаснай мове. Асноўныя метады навучання другой мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-	0.5.		Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	беларускага двухмоўя, іх класіфікацыя. Месца кожнага метаду ў сістэме работы па развіцці беларускага маўлення ва ўстанове дашкольнай адукацыі.					сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
4	**Раздзел 4. Асноўныя напрамкі работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму**	**1**				
4.1	**Тэма 4.1 Камунікатыўная накіраванасць развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту** Культурна – псіхалагічная спецыфіка засваення другой мовы як сродку камунікацыі. Развіццё ў дзяцей чуцця беларускай мовы. Выкарыстанне фальклорных твораў для развіцця рэцэптыўнага і рэпрадуктыўнага двухмоўя. Роля дыдактычнай лялькі ў развіцці беларускага маўлення дзяцей. Нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове. Арганізацыя пазасітуацыйна-пазнавальных, пазасітуацыйна-асобасных беларускамоўных зносін дзяцей. у. Правядзенне заняткаў з арганізацыяй маўленчых зносін на вывучаемай мове.	0.5	1	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
4.2	**Тэма 4.2 Мастацка-маўленчая дзейнаць як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту** Азнаямленне дзяцей з малымі формамі беларускага фальклору. Методыка работы з беларускай народнай казкай. Методыка выкарыстання твораў беларускіх пісьменнікаў ва ўстанове дашкольнай адукацыі. Народныя гульні, рухавыя гульні з мастацкім словам, іх	0.5	1	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	роля ў развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Методыка правядзення літаратурных забаў і ранішнікаў ва ўстанове дашкольнай адукацыі.					MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
	Усяго	**4**				
	4 семестр					
4	**Раздзел 4. Асноўныя напрамкі работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму**	**2**	**6**			
4.3	**Тэма 4.3 Развіццё беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту** Слоўнік роднай мовы як адлюстраванне нацыянальнага светапогляду. Асаблівасці лексікі беларускай мовы ў параўнанні з рускай. Значэнне слоўнікавай работы. Крытэрыі адбору лексікі для заняткаў па развіцці беларускага маўлення дзяцей. Методыка ўвядзення і замацавання слоўніка. Работа над сэнсавым бокам слова.	0.5	0,5	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы).
4.4	**Тэма 4.4 Методыка фарміравання граматычнага ладу маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту** Асаблівасці граматыкі беларускай мовы ў параўнанні з рускай. Крытэрыі адбору граматычнага матэрыялу для развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Паслядоўнасць увядзення граматычных форм беларускай мовы. Этапы авалодання дзецьмі граматычнымі формамі. Фарміраванне ў дзяцей навыкаў пабудовы сказаў на беларускай мове, змянення слоў па формах, утварэння	0.5	0.5	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	новых слоў.					Бібліяграфічны спіс літаратуры
4.5	**Тэма 4.5 Методыка выхавання гукавой культуры беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту** Параўнальная характарыстыка фанемных сістэм рускай і беларускай моў. Задачы навучання беларускаму вымаўленню. Крытэрыі адбору фанемных адзінак і паслядоўнасць іх увядзення. Методыка фарміравання правільнага вымаўлення спецыфічных гукаў беларускай мовы. Знаёмства дзяцей з арфаэпічнымі асаблівасцямі беларускага маўлення.	0.5	1	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
4.6	**Тэма 4.6 Методыка развіцця прадуктыўнага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту** Асноўныя прынцыпы фарміравання звязнага беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Развіццѐ выразнасці і вобразнасці маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту. Навучанне звязнаму дыялагічнаму і маналагічнаму маўленню дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.	0.5	1	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
4.7.	**Тэма 4.7 Методыка азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа і развіццё беларускага маўлення** Нацыянальна-культурнае асяроддзе ўстановы дашкольнай адукацыі. Методыка азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з		1	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	беларускім фальклорам, нацыянальнымі традыцыямі, побытам і культурай беларускага народа. Методыка правядзення беларускіх народных свят ва ўстанове дашкольнай адукацыі і развіцце беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.					Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
	Усяго	**2**	**6**			
	5 семестр					
						Экзамен

Вучэбна–метадычная карта вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту»
Завочная форма атрымання адукацыі
5 гадоў навучання

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела, тэмы	Колькасць аўдыторных гадзін		Метадычныя сродкі дапаможнікі, навучання	Літаратура	Формы кантролю ведаў
		Лекцыі	Практычныя заняткі			
1	2	3	4	5	6	7
	5 семестр					
1.	**Раздел 1. Тэарэтычныя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму**	**1.5**				

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1.1	**Тэма 1.1 Білінгвізм як сацыяльна-культурны і псіхолага-педагагічны феномен** Білінгвальная кампетэнтнасць і камунікатыўная актыўнасць як асноўныя крытэрыі для вызначэння сутнасці білінгвізму. Псіхолага-лінгвістычная характарыстыка білінгвізму. З'явы інтэрферэнцыі і транспазіцыі ў маўленні білінгва. Класіфікацыя білінгваў у кантэксце антагенезу. Сацыялінгвістычны крытэрый ступені роднасці дзвюх моў. Уплыў ступені роднасці дзвюх моў на ступень праяўлення інтэрферэнцыі ў маўленні білінгва.	0,5		Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
1.2	**Тэма 1.2 Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму як навука** Катэгорыі, міждысцыплінарныя сувязі методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму. Прадмет, аб'ект, мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны «Развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту». Сутнасць пацяццяў «білінгвальная адукацыя», «білінгвальнае навучанне», «білінгвальнае выхаванне». Метады навуковага даследавання ў методыцы развіцця беларускага маўлення	0,5		Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.					
1.3.	**Тэма 1.3 Навуковыя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму** Метадалагічныя асновы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму. Псіхалагічныя і псіхалінгвістычныя асновы руска-беларускага блізкароднаснага білінгвізму. Лінгвакультаралагічны аспект ў навучанні дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове. Дыдактычныя, выхаваўчыя, развіццёвыя і сацыялізуючая мэтавыя арыентацыі навучання беларускай мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.	0,5		Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
2	**Раздзел 2. Станаўленне білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі**	**0,5**				
2.1	**Тэма 2.1 Этапы станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі** Грамадска-палітычныя перадумовы навучання дзяцей беларускай мове ў XIX стагоддзі. Першыя вучэбныя дапаможнікі на беларускай мове ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX стагоддзя. Грамадска-палітычныя перадумовы станаўлення білінгвальнага выхавання дзяцей	0,5		Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	у Беларусі. Перыядызацыя білінгвальнай дашкольнай адукацыі ў другой палове XX стагоддзя, пачаткуXXI стагоддзя (Т.У. Паліева).					літаратуры
	Усяго	**2**				
	6 семестр					
3	**Раздзел 3. Сістэма работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання**	**0.5**	**2**			
3.1	**Тэма 3.1 Мэта і задачы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму** Стратэгія навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму. Мэта і задачы навучання дзяцей беларускай мове ва ўстанове дашкольнай адукацыі сітуацыі з рускай мовай навучання і выхавання. Сістэматызацыя зместу развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі руска-беларускага блізкароднаснага білінгвізму. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі, адукацыйная галіна «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін».	0,5	0.5	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
3.2	**Тэма 3.2 Метадычныя прынцыпы і сродкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага**		1	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	білінгвізму Псіхолога-педагагічныя, лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму. Сродкі навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.					сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
3.3	**Тэма 3.3 Метады і прыёмы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя** Сучасныя тэндэнцыі навучання другой блізкароднаснай мове. Асноўныя метады навучання другой мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя, іх класіфікацыя. Месца кожнага метаду ў сістэме работы па развіцці беларускага маўлення ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання.		0.5	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
4	**Раздзел 4. Асноўныя напрамкі работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму**	**3.5**	**4**			
4.1	**Тэма 4.1 Камунікатыўная накіраванасць развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту** Культурна – псіхалагічная спецыфіка засваення другой мовы як сродку камунікацыі. Развіццѐ ў дзяцей чуцця беларускай мовы. Выкарыстанне фальклорных твораў для	0.5	0.5	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	развіцця рэцэптыўнага і рэпрадуктыўнага двухмоўя. Роля дыдактычнай лялькі ў развіцці беларускага маўлення дзяцей. Нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове. Арганізацыя пазасітуацыйна-пазнавальных, пазасітуацыйна-асобасных беларускамоўных зносін дзяцей дашкольнага ўзросту. Правядзенне заняткаў з арганізацыяй маўленчых зносін на вывучаемай мове.					ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
4.2	**Тэма 4.2 Мастацка-маўленчая дзейнаць як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту** Азнаямленне дзяцей з малымі формамі беларускага фальклору. Методыка работы з беларускай народнай казкай. Методыка выкарыстання твораў беларускіх пісьменнікаў ва ўстанове дашкольнай адукацыі. Літаратурны мінімум дзяцей дашкольнага ўзросту. Народныя гульні, рухавыя гульні з мастацкім словам, іх роля ў развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Методыка правядзення літаратурных забаў і ранішнікаў ва ўстанове дашкольнай адукацыі.	0.5	0.5	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
4.3	**Тэма 4.3 Развіццё беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту** Слоўнік роднай мовы як адлюстраванне нацыянальнага светапогляду.	0.5	0,5	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	Асаблівасці лексікі беларускай мовы ў параўнанні з рускай. Значэнне слоўнікавай работы. Крытэрыі адбору лексікі для заняткаў па развіцці беларускага маўлення дзяцей. Методыка ўвядзення і замацавання слоўніка. Работа над сэнсавым бокам слова.				[5]	сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
4.4.	**Тэма 4.4 Методыка фарміравання граматычнага ладу маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту** Асаблівасці граматыкі беларускай мовы ў параўнанні з рускай. Крытэрыі адбору граматычнага матэрыялу для развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Паслядоўнасць увядзення граматычных форм беларускай мовы. Этапы авалодання дзецьмі граматычнымі формамі. Фарміраванне ў дзяцей навыкаў пабудовы сказаў на беларускай мове, змянення слоў па формах, утварэння новых слоў.	0.5	0.5	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
4.5.	**Тэма 4.5 Методыка выхавання гукавой культуры беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту** Параўнальная характарыстыка фанемных сістэм рускай і беларускай моў. Задачы навучання беларускаму вымаўленню. Крытэрыі адбору фанемных адзінак і паслядоўнасць іх увядзення. Методыка фарміравання правільнага вымаўлення спецыфічных гукаў беларускай	0.5	0.5	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	мовы. Знаёмства дзяцей з арфаэпічнымі асаблівасцямі беларускага маўлення.					літаратуры
4.6.	**Тэма 4.6 Методыка развіцця прадуктыўнага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту** Асноўныя прынцыпы фарміравання звязнага беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Развіццѐ выразнасці і вобразнасці маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту. Навучанне звязнаму дыялагічнаму і маналагічнаму маўленню дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.	0.5	0,5	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
4.7.	**Тэма 4.7 Методыка азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа і развіццё беларускага маўлення** Нацыянальна-культурнае асяроддзе ўстановы дашкольнай адукацыі. Методыка азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з беларускім фальклорам, нацыянальнымі традыцыямі, побытам і культурай беларускага народа. Методыка правядзення беларускіх народных свят ва ўстанове дашкольнай адукацыі і развіцце беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.	0.5	1	Рабочы сшытак, мультымедыйныя прэзентацыі, заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE	[1] [2] [3] [4] [5]	Тэсціраванне Экспрэс-апытанне Пісьмовая работа ў рабочым сшытку(канспекты, табліцы, граф. схемы). Заданні і практыкаванні ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы). Бібліяграфічны спіс літаратуры
	Усяго	**4**	**6**			
	7 семестр					
						Экзамен

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

ЛІТАРАТУРА

Асноўная літаратура

1. Свірыдзенка, В. І. Фарміраванне маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў: тэорыя і практыка / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Беларус. дзярж. пед.ун-т, 2019. – 280 с.

2. Современные педагогические технологии в образовательном процессе учреждения дошкольного образования : учеб.-метод. пособие / под общ. ред. В. Н. Шашок ; сост.: В. Н. Шашок [и др.]. – Минск : Акад. последиплом. образования, 2019. – 123 с.

3. Старжынская, Н. С. Развіцце беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту : вучэбны дапаможнік / Н.С. Старжынская, Д.М. Дубініна. – Мінск : РІВШ, 2022. – 396 с.

4. Старжынская, Н. С. Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў ад 4 да 7 гадоў : вучэб.-метад. дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з рус. мовай навучання / Н. С. Старжынская, Д. М.Дубініна. – Мінск : Аверсэв, 2020. – 184 с.

5. Старжинская, Н. С. Развитие инновационного дошкольного образования в Республике Беларусь : пособие / Н. С. Старжинская, В. П. Тукач. – Минск : Белорус. гос. пед. ун-т, 2020. – 128 с.

Дадатковая літаратура

1. Дубинина, Д. Н. Игры с картинками для малышей (от 2 до 3 лет) : учеб. нагляд. пособие для учреждений дошк. образования с рус. яз. обучения = Гульні з карцінкамі для малых (ад 2 да 3 гадоў) : вучэб. нагляд. дапам. для ўстаноў дашк. адукацыі з беларус. мовай навучання / Д. Н. Дубинина. – Минск : Сэр-Вит, 2019. – 26 с.

2. Старжынская, Н. С. Развіцце беларускага маўлення дашкольнікаў ад 4 да 5 гадоў : вучэб. нагляд. дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з рус. мовай навучання / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. – Мінск : Аверсэв, 2018. – 28 с.

3. Дубініна, Д. М. Родная мова. Крок за крокам : вучэб.-метад. дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з рус. мовай навучання / Д.М. Дубініна, Н. С. Старжынская. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020. - 134 с.

4. Старжынская, Н.С. Падрыхтоўка да навучання грамаце : вучэбна-метадычны дапаможнік для педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі з беларускай мовай навучання / Н. С. Старжынская. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020. – 174 с.

і

Пералік заданняў і кантрольных мерапрыемстваў кіруемай самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту»

№п/п	Назва тэмы раздзела	Колькасць гадзін на КСР	Заданні (па ўзроўням складанасці)	Форма выканання
	6 семестр			
1	Тэма 1.1 Білінгвізм як сацыяльна-культурны і псіхолага-педагагічны феномен	2л	*Узровень 1:* засвоіць асноўныя тэорыі развіцця білінгвальных маўленчых навыкаў дзецьмі дашкольнага ўзросту; скласці слоўнік тэрмінаў.	Тэсціраванне
			Узровень 2: скласці табліцу, якая адлюстроўвае вартасці і недахопы тэорый і канцэпцый развіцця маўлення дзяцей ва ўмовах білінгвізму; бібліяграфічны спіс літаратуры па праблеме развіцця маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.	Аналітыка-параўнальная табліца асноўных тэорый і канцэпцый развіцця маўлення дзяцей ва ўмовах білінгвізму Бібліяграфічны спіс літаратуры па праблеме развіцця маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.
			Узровень 3:: правесці рэфлексіўны аналіз уплыву білінгвізму на кагнітыўна-камунікатыўнае развіццё дзяцей дашкольнага ўзросту.	Пісьмовы рэфлексіўны аналіз уплыву білінгвізму на кагнітыўна-камунікатыўнае развіццё дзяцей дашкольнага ўзросту
2	Тэма 2.1 Этапы станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі	2л	*Узровень 1:*засвоіць вучэбны матэрыял па гісторыі развіцця і станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі; скласці графічны малюнак этапаў станаўлення.	Графічны малюнак этапаў станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

			Узровень 2: аналітычна апрацаваць вучэбны матэрыял па праблеме гісторыі развіцця і станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі і скласці пісьмовы параўнальны аналіз станаўлення білінгвальнай адукацыі ў Беларусі ў другой палове XX-пачатку XXI стагоддзяў.	Пісьмовы параўнальны аналіз станаўлення і развіцця білінгвальнай адукацыі ў Беларусі ў другой палове XX-пачатку XXI стагоддзяў
			Узровень 3: скласці эссэ «Роля беларускіх пісьменнікаў ў развіцці і станаўленні білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі»	Эссэ «Роля беларускіх пісьменнікаў ў развіцці і станаўленні білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі»
3	Тэма 4.7 Методыка азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа і развіццё беларускага маўлення	2л	*Узровень 1:*засвоіць змест, структуру і саставіць спіс народных, якія можна святкаваць ва ўстанове дашкольнай адукацыі; зрабіць кароткае апісанне народных святаў.	Спіс народных свят, якія можна святкаваць ва ўстанове дашкольнай адукацыі Кароткае апісанне народных святаў
			Узровень 2: скласці бібліяграфію і анатацыі вучэбна-метадычных дапаможнікаў па азнаямленні дзяцей дашкольнага ўзросту з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа.	Бібліяграфія і анатацыя вучэбна-метадычных дапаможнікаў па азнаямленні дзяцей дашкольнага ўзросту з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа
			Узровень 3: праектаваць і мадэляваць народнае свята для дзяцей дашкольнага ўзросту.	Сцэнар народнага свята для дзяцей дашкольнага ўзросту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4	Тэма 4.9 Метадычнае кіраўніцтва работай па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя	2л	*Узровень 1.*: складці графічны малюнак і апісанне прыцыпаў планавання работы па развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту; апісанне відаў планавання работы па развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.	Графічны малюнак і апісанне прыцыпаў планавання работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту Пісьмовае апісанне відаў планавання работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту
			Узровень 2.: аналітычна апрацаваць вучэбны матэрыял па праблеме і скласці табліцу форм метадычнай работы ва ўстанове дашкольнай адукацыі; скласці анатацыі методык дыягностыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту, бібліяграфія літаратуры па альтэрнатыўных і варыятыўных методыках развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.	Табліца форм метадычнай работы ва ўстанове дашкольнай адукацыі Анатацыі альтэрнатыўных і варыятыўных дыягнастычных методык развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Бібліяграфія літаратуры па методыках дыягностыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.
			Узровень 3: праектаваць і мадэляваць тэматычны кантроль па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.	Структурна-лагічная схема правядзення тэматычнага кантролю па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнсці

Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:

1. Вусная форма: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках; даклады на семінарах; вусныя экзамены.

2. Пісьмовая форма: тэсціраванне, кантрольныя апытванні; кантрольныя работы; пісьмовыя работы па аўдыторных практыкаваннях, рэфераты, эсэ; пісьмовыя справаздачы па лабараторных работах, пісьмовыя экзамены.

3. Вусна-пісьмовая форма: справаздачы па аўдыторных практычных практыкаваннях з іх вуснай абаронай; справаздачы па самастойных пазааўдыторных практычных практыкаваннях з іх вуснай абаронай; справаздачы па лабараторных работах з іх вуснай абаронай; экзамены.

Для бягучага кантролю якасці засваення ведаў студэнтамі выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментар:

вусныя апытванні;

пісьмовае выкананне практычных заданняў у рабочым сшытку ,

выкананне заданняў і практыкаванняў ў сістэме MODLE(канспекты, табліцы, граф. схемы) па тэмах курса;

пісьмовыя кантрольныя работы па асобных тэмах курса;

кампутарны тэставы кантроль: падбор кароткіх адказаў у адпаведнасці з заданнямі;

абарона заданняў пры выкананні студэнтамі лабараторных работ.

Прамежкавая атэстацыя праводзіцца ў форме вуснага або пісьмовага экзамена.

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне

10 (дзесяць) балаў, залічана:

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

выяўленая здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі;

поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне вольна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку,

выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін;

творчая самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

9 (дзевяць) балаў, залічана:

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

сістэматычная, актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

8 (восем) балаў, залічана:

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

7 (сем) балаў, залічана:

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

вольнае валоданне тыпавымі рашэннямі ў рамках вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

6 (шэсць) балаў, залічана:

дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

5 (пяць) балаў, залічана:

дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў.

4 (чатыры) балы, залічана:

дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы без істотных памылак;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя (тыпавыя) задачы;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім ацэнку;

праца пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў.

3 (тры) балы, незалічана:

недастаткова поўны аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выклад адказу на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;

слабае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

2 (два) балы, незалічана:

фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веды асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

1 (адзін) бал, незалічана:

адсутнасць ведаў (і кампетэнцый) у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, адмова ад адказу, адсутнасць на атэстацыі без уважлівай прычыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Патрабаванні да выканання самастойнай (пазааўдыторнай)работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту»

Дзённая форма атрымання адукацыі

№п/п	Назва тэмы, раздзела	Колькасць гадзін на самастойную работу	Заданне	Форма выканання
1	**2**	3	**4**	**5**
	6 семестр			
1	**Раздел 1. Тэарэтычныя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму**	**6**	Самастойная работа ў выглядзе выкананняў індывідуальных практычных заданняў ў сістэме MOODLE.	Выкананне практычных заданняў. Тэсціраванне. Рабочы сшытак
1.1	Тэма 1.1 Білінгвізм як сацыяльна-культурны і псіхолага-педагагічны феномен.	2	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі, картатэку тэрмінаў.	Рабочы сшытак. Аналітычны агляд літаратуры па праблеме. Асацыятыўныя крыжаванкі Картатэка тэрмінаў. Рэйтынгавая кантрольная работа №1
1.2	Тэма 1.2 Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму як навука.	2	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; картатэку тэрмінаў.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Картатэка тэрмінаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1.3	Тэма 1.3 Навуковыя асновы методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму.	2	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; картатэку тэрмінаў.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Картатэка тэрмінаў
2	**Раздзел 2. Станаўленне білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі**	**6**	Самастойная работа ў выглядзе выкананняў індывідуальных практычных заданняў ў сістэме MOODLE.	Рабочы сшытак Выкананне практычных заданняў Тэсціраванне
2.1	Тэма 2.1 Этапы станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі.	6	Распрацаваць прэзентацыю «Этапы станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі».	Рабочы сшытак Прэзентацыя «Этапы станаўлення білінгвальнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту ў Беларусі». Рэйтынгавая кантрольная работа №2
3	**Раздзел 3. Сістэма работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання**	**8**	Самастойная работа ў выглядзе выкананняў індывідуальных практычных заданняў ў сістэме MOODLE.	Рабочы сшытак Выкананне практычных заданняў Тэсціраванне
3.1	Тэма 3.1 Мэта і задачы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму.	2	Прааналізаваць адукацыйную галіну «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі, і скласці табліцу ўскладненняў праграмных патрабаванняў да розных бакоў маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту	Рабочы сшытак Табліца ўскладненняў праграмных патрабаванняў да розных бакоў маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту
3.2	Тэма 3.2 Метадычныя прынцыпы і сродкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі	4	Распрацаваць прэзентацыю «Метадычныя прынцыпы і сродкі развіцця беларускага маўлення	Рабочы сшытак Прэзентацыя «Метадычныя прынцыпы і сродкі

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

	блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму.		дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму»	развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму»
3.3	Тэма 3.3 Метады і прыёмы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.	4	Зрабіць пісьмовы аналіз **м**етадаў і прыёмаў развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.	Рабочы сшытак Пісьмовы аналіз **м**етадаў і прыёмаў развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя
4	**Раздзел 4. Асноўныя напрамкі работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму**	**36**	Самастойная работа ў выглядзе выкананняў індывідуальных практычных заданняў ў сістэме MOODLE.	Рабочы сшытак Выкананне практычных заданняў Тэсціраванне
4.1	Тэма 4.1 Камунікатыўная накіраванасць развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.	4	Распрацаваць прэзентацыю «Нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове» Распрацаваць табліцу «Развіццё маўлення як сродка камунікацыі ў дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту (форма камунікацыі, змест камунікацыі, прыкладныя тэмы камунікацыі)»	Прэзентацыя «Нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове» Табліца «Развіццё маўлення як сродка камунікацыі ў дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту (форма камунікацыі, змест камунікацыі, прыкладныя тэмы камунікацыі)»
4.2	Тэма 4.2 Мастацка-маўленчая дзейнаць як сродак развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі,	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Асацыятыўныя крыжаванкі Картатэка тэрмінаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

			картатэку тэрмінаў.	
4.3	Тэма 4.3 Развіццё беларускага слоўніка ў дзяцей дашкольнага ўзросту	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі, картатэку тэрмінаў; перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Асацыятыўныя крыжаванкі Картатэка тэрмінаў Перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў
а.	Тэма 4.4. Методыка фарміравання граматычнага ладу маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі, картатэку тэрмінаў; перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Асацыятыўныя крыжаванкі Картатэка тэрмінаў Перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў
4.5	Тэма 4.5 Методыка выхавання гукавой культуры беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі, картатэку тэрмінаў; перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Асацыятыўныя крыжаванкі Картатэка тэрмінаў Перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў
4.6	Тэма 4.6 Методыка развіцця прадуктыўнага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі, картатэку тэрмінаў; перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Асацыятыўныя крыжаванкі Картатэка тэрмінаў Перспектыўны план правядзення дыдактычных гульняў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4.7	Тэма 4.7 Методыка азнаямлення дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі, культурай беларускага народа і развіццё беларускага маўлення	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі, картатэку тэрмінаў; сцэнар правядзення народнага свята.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Картатэка тэрмінаў Сцэнар правядзення народнага свята Рэйтынгавая кантрольная работа №3
4.8	Тэма 4.8 Дыягностыка работы па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя	4	Пісьмовая работа ў рабочым сшытку. Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме; асацыятыўныя крыжаванкі, картатэку тэрмінаў; гульнявыя заданні для аператыўнай дыягностыкі развіцця маўлення дзяцей для адной з узроставых груп.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме Гульнявыя заданні для аператыўнай дыягностыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей для адной з узроставых груп
4.9	Тэма 4.9 Метадычнае кіраўніцтва работай па развіцці беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя	4	Скласці аналітычны агляд літаратуры па праблеме. Распрацаваць план семінара-практыкума, план тэматычнага кантролю, гадавы план работы па адной з задач развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.	Рабочы сшытак Аналітычны агляд літаратуры па праблеме План семінара-практыкума, план тэматычнага кантролю, гадавы план работы па адной з задач развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту
	Усяго	56		

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прыкладныя пытанні да экзамену па вучэбнай дысцыпліне «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту»

1. Білінгвальная кампетэнтнасць і камунікатыўная актыўнасць як асноўныя крытэрыі для вызначэння сутнасці білінгвізму.
2. З'явы інтэрферэнцыі і транспазіцыі ў маўленні білінгва.
3. Псіхолага-лінгвістычная характарыстыка білінгвізму: рэцэптыўны, рэпрадуктыўны і прадуктыўны білінгвізм; каардынацыйны і субардынацыйны білінгвізм; натуральны і штучны білінгвізм.
4. Класіфікацыя білінгваў ў кантэксце антагенезу: паралельны (адначасовы) і паслядоўны білінгвізм.
5. Сацыялінгвістычны крытэрый ступені роднасці дзвюх моў: білінгвізм блізкароднасны і неблізкароднасны.
6. Катэгорыі, міждысцыплінарныя сувязі методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.
7. Прадмет, аб'ект, мэты і задачы курса вучэбнай дысцыпліны «Развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту».
8. Сутнасць пацяццяў «білінгвальная адукацыя», «білінгвальнае навучанне», «білінгвальнае выхаванне».
9. Метады навуковага даследавання ў методыцы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.
10. Мова як галоўная каштоўнасць народа. Мова і культура народа.
11. Сутнасць паняццяў «родная мова», «другая мова», «нацыянальная мова», «замежная мова».
12. Сацыялінгвістычная сітуацыя ў Беларусі, яе ўплыў на сферу дашкольнай адукацыі.
13. Статус беларускай мовы для рускамоўных дзяцей у Беларусі.
14. Асаблівасці руска-беларускага двухмоўя ў дзяцей дашкольнага ўзросту.
15. Праблемы ранняга двухмоўя: узрост, спрыяльны для пачатку авалодання другой мовай; суадносіны роднай і другой моў у адукацыйным працэсе.
16. Праблемы ранняга двухмоўя:уплыў двухмоўя на разумовае развіццё дзяцей дашкольнага ўзросту, праблема засваення другой мовы як сродку камунікацыі.
17. Лінгвакультуралагічны аспект ў навучанні дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове.
18. Мэтавыя арыентацыі навучання беларускай мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму.
19. Грамадска-палітычныя перадумовы навучання дзяцей беларускай мове ў XIX стагоддзі.
20. Першыя вучэбныя дапаможнікі на беларускай мове ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX стагоддзя.
21. Грамадска-палітычныя перадумовы станаўлення білінгвальнага выхавання дзяцей у Беларусі.
22. Перыядызацыя білінгвальнай дашкольнай адукацыі ў другой палове XX стагоддзя, пачаткуXXI стагоддзя (паводле Т.У. Паліевай).
23. Стратэгія навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.
24. Мэта навучання беларускай мове. Задачы навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

25. Сістэматызацыя зместу развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі, адукацыйная галіна «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін».

26. Псіхолага-педагагічныя і лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

27. Сучасныя тэндэнцыі навучання другой мове.

28. Асноўныя метады навучання другой мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя.

29. Спецыфіка методыкі развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

30. Развіццё ў дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту чуццёвай асновы беларускай мовы.

31. Матывацыя маўленчых дзеянняў дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове.

32. Нацыянальна-культурнае асяроддзе ўстановы дашкольнай адукацыі.

33. Гульня як крыніца матыву маўленчай дзейнасці дзяцей дашкольнага ўзросту на беларускай мове.

34. Сродкі навучання дзяцей беларускай мове ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя.

35. Народныя гульні, іх роля ў развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

36. Роля дыдактычнай лялькі ў развіцці беларускага маўлення дзяцей.

37. Нацыянальны маўленчы этыкет як кампанент культуры маўленчых зносін дзяцей дашкольнага ўзросту.

38. Арганізацыя пазасітуацыйна-пазнавальных і пазасітуацыйна-асобасных беларускамоўных зносін дзяцей дашкольнага ўзросту.

39. Азнаямленне дзяцей з малымі формамі беларускага фальклору.

40. Методыка работы з беларускай народнай казкай ва ўстанове дашкольнай адукацыі.

41. Методыка выкарыстання твораў беларускіх пісьменнікаў ва ўстанове дашкольнай адукацыі.

42. Рухавыя гульні з мастацкім словам, іх роля ў развіцці маўлення дзяцей.

43. Методыка правядзення літаратурных забаў і ранішнікаў.

44. Асаблівасці лексікі беларускай мовы (у параўнанні з рускай). Слоўнік роднай мовы як адлюстраванне нацыянальнага светапогляду.

45. Крытэрыі адбору лексікі для заняткаў з дзецьмі дашкольнага ўзросту.

46. Методыка ўвядзення новых слоў беларускай мовы.

47. Методыка замацавання слоўніка дзяцей дашкольнага ўзросту.

48. Работа над сэнсавым бокам слова з дзецьмі дашкольнага ўзросту.

49. Асаблівасці граматыкі беларускай мовы ў параўнанні з рускай.

50. Крытэрыі адбору граматычнага матэрыялу для развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў. Паслядоўнасць увядзення граматычных форм беларускай мовы.

51. Этапы авалодання дзецьмі граматычнымі элементамі маўлення (паводле А.І. Негнявіцкай, А.М. Шахнаровіча).

52. Фарміраванне ў дзяцей навыкаў пабудовы сказаў на беларускай мове, змянення слоў па формах, утварэння новых слоў.

53. Параўнальная характарыстыка фанемных сістэм рускай і беларускай моў. Задачы навучання беларускаму вымаўленню.

54. Крытэрыі адбору фанемных адзінак і паслядоўнасць іх увядзення.

55. Методыка фарміравання правільнага вымаўлення спецыфічных гукаў беларускай мовы.

56. Знаёмства дзяцей з арфаэпічнымі асаблівасцямі беларускага маўлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

57. Асноўныя прынцыпы фарміравання звязнага (дыялагічнага і маналагічнага) беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

58. Развіццё выразнасці і вобразнасці маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту.

59. Методыка азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з беларускім фальклорам, нацыянальнымі традыцыямі і культурай беларускага народа.

60. Змест, этапы і метады азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з народнай цацкай.

61. Методыка правядзення беларускіх народных свят ва ўстанове дашкольнай адукацыі.

62. Сутнасць дыягностыкі маўленчага развіцця дзяцей, яе задачы і значэнне.

63. Методыка абследавання розных бакоў беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя.

64. Улік вынікаў дыягностыкі ў адукацыйным працэсе ўстановы дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прыклады кампетэнтнастна-арыентаваных заданняў па вучэбнай дысцыпліне «Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту»

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №1

Вырашыце метадычную задачу: Дзеці адчуваюць цяжкасці ў вымаўленні спецыфічна беларускага гука *дж*. Вызначыце, у якой узроставай групе, хутчэй за ўсё, знаходзяцца дзеці. Якую працу па фарміраванні правільнага вымаўлення гэтага гука варта праводзіць з выхаванцамі? Назавіце рухавыя сюжэтныя гульні для замацавання і актывізацыі вымаўлення гука *дж*

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне № 2

Вырашыце метадычную задачу: Дзеці дапускаюць памылкі ва ўтварэнні давальнага склону назоўнікаў. Назавіце дыдактычныя гульні і практыкаванні, якія дапамогуць выхаванцам засвоіць спосабы ўтварэння давальнага склону назоўнікаў. На якім змесце вы будзеце праводзіць гэтую працу з дзецьмі? Складзіце сцэнар правядзення дыдактычнай гульні ў сярэдняй групе. Дайце назву гульні, вызначыце дыдактычныя задачы (навучальная, развіваючая, выхаваўчая), матэрыял, гульнявыя правілы, гульнявыя дзеянні, пазіцыю выхавальніка дашкольнай адукацыі падчас гульні.

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне № 3

Вырашыце метадычную задачу. Прачытайце фрагмент заняткаў па развіцці маўлення: на дошцы выстаўлена сюжэтная карціна на тэму «Зімнія забавы» з адлюстраваннем дзяцей, якія выконваюць розныя дзеянні на прагулцы ўзімку: катаюцца на санках, лепяць снегавіка. Выхавальнік прапануе разглядзець карціну і саставіць па ёй апавяданне. Вызначыце від апавядання *(фактычны, творчы, з уласнага вопыту, сюжэтны, апісальны*). Складзіце ўзор апавядання выхавальніка.

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне № 4

Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, якія задачы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту можна вырашаць пры дапамозе наступнага верша.

Вясёлка

Чырвоны!
І блакітны!
І зялёны!
Фіялетавы!
І жоўты!
Ну а болей
Не знайшоў ты?
Пашукай,
Бо хутка згіне.
Вось яшчэ знайшоўся … (сіні).
Не шукайце больш дарма…

С. Грахоўскі

Якім чынам можна выкарыстоўваць дадзены верш у працы з дзецьмі?.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне № 5

Вырашыце метадычную задачу: Дзеці адчуваюць цяжкасці ў вымаўленні спецыфічна беларускага гука *дз*. Вызначыце, у якой узроставай групе, хутчэй за ўсё, знаходзяцца дзеці. Якую працу па фарміраванні правільнага вымаўлення гэтага гука варта праводзіць з выхаванцамі? Назавіце рухавыя сюжэтныя гульні для замацавання і актывізацыі вымаўлення гука *дз.*

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне № 6

Вырашыце метадычную задачу: Дзеці адчуваюць цяжкасці ў вымаўленні спецыфічна беларускага гука *ў*. Вызначыце, у якой узроставай групе, хутчэй за ўсё, знаходзяцца дзеці. Якую працу па фарміраванні правільнага вымаўлення гэтага гука варта праводзіць з выхаванцамі? Назавіце рухавыя сюжэтныя гульні для замацавання і актывізацыі вымаўлення гука *ў.*

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне № 7

Вырашыце метадычную задачу: Прачытайце план заняткаў па тэме «Лялькі з саломкі і лёну» : 1. Разглядванне саломкі. 2. Разглядванне лялькі з саломкі. 3. Разглядванне лёну. 4. Разглядванне лялькі з лёну. 5. Апісанне лялек з саломкі і лёну, прадстаўленых на выставе. Вызначыце слоўнік (назвы прадметаў, з якімі знаёмяцца дзеці); пералічыце метады і прыёмы, якія можна выкарыстаць на занятках.

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне № 8

Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, якія задачы па развіцці маўлення можна вырашаць пры дапамозе прыведзенага ў дадатку верша? Якім чынам можна выкарыстоўваць дадзены верш у працы па развіццм беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

Ягады
З мамай я збіраў суніцы,
А з бабуляю – чарніцы
Ездзіў з татам у маліны,
А з дзядулем – у ажыны.
А сягоння мы з сястрыцай
Пойдзем разам у брусніцы,
Запрасілі сяброўкі
Нас назаўтра ў буякі.
З кожнай, кожнай ягадай
Павітацца рады я.
М.Пазнякоў

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне № 9

Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, з якой мэтай пры навучанні дзяцей беларускаай мове можна выкарыстаць верш А. Жыгунова «Блытаніна»? Якую гульню можна правесці для замацавання ўяўленняў дзяцей аб гэтай моўнай заканамернасці?

Гебемот разявіў рот
І глядзіць на масалёт.
- Ты мяне паслухай, братка,
Масалёт – не кашаладка.
А. Жыгуноў

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №10

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вырашыце метадычную задачу: Пазнаёмцеся з планам заняткаў на тэму «Нацыянальнае адзенне»: 1. Знаёмства з лялькамі і разглядванне іх нацыянальных строяў. 2. Разглядванне прадметаў адзення на малюнках і аплікацыях дзяцей (прадметы адзення упрыгожаны беларускімі ўзорамі). 3. Апісанне прадметаў беларускага нацыянальнага адзення, прадстаўленых на выставе. Вызначыце задачы заняткаў, слоўнік прадметаў, з якімі знаёмяцца дзеці; пералічыце метады і прыёмы, якія можна выкарыстаць на занятках.

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №11

Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, якія задачы па развіцці беларускага маўлення можна вырашаць пры дапамозе народнай гульні «Агароднік» ? Якім чынам можна выкарыстоўваць дадзеную гульню ў працы з дзецьмі?

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №12

Вырашыце метадычную задачу: вызначыце у якім узросце і з якой мэтай праводзіцца на занятках па развіцці беларускага маўлення *сюжэтна-дыдактычная гульня* «Каго пакатаем на машыне?» (аўтар Э.П. Караткова).

Сюжэтна-дыдактычная гульня «Каго пакатаем на машыне?» (аўтар Э.П. Караткова)

Адно дзіця саджае на машыну вавёрку, катае яе і прагаворвае свае дзеянне: «*Я катаю на машыне вавёрку*».

Выхавальнік пытаецца: «Каго пакатаем на машыне?»

Дзеці прапануюць пакатаць вожыка. Саджаюць яго на машыну. Складаюць сказ: «*Віця катае на машыне вавёрку і вожыка*». Колькасць цацак паступова павялічваецца.

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №13

Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, якую задачу па развіцці беларускага маўлення можна вырашыць пры дапамозе наступнай гульнявой сітуацыі: да дзяцей прыходзіць вельмі цікаўны хлопчык, які хоча пра ўсё ведаць. Яго так нават завуць - Цікаўка. Цікаўка ўвесь час задае пытанні дзецям: «Ці ідзе ўзімку дождж? Ці плавае рыбка ў вадзе?» і да т.п. У рэшце рэшт Цікаўка «стамляецца»: «Ці … ці … пра што б мне яшчэ спытаць: Ці падабаецца вам у садзіку? Ці… ці… ці хочаце вы, каб я яшчэ прыйшоў да вас?» Дзеці запрашаюць Цікаўку прысці яшчэ. Той кажа: «Я прыйду, але мне хочацца, каб вы мяне таксама пра што-небудзь спыталі». Выхавальнік прапануе спытаць у Цікаўкі пра тое, што ён любіць. Дае прыклад: «Ці любіш ты малако?» Дзеці па ўзоры складаюць свае пытанні. Затым можна прапанаваць малым спытаць Цікаўку пра тое, што ён ведае, і даць узор: «Ці ведаеш ты казкі» і г.д. Назавіце, з дапамогай якой народнай гульні можна фарміраваць акрэсленае маўленчае ўменне.

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №14

Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, якую задачу па развіцці беларускага маўлення можна вырашаць пры дапамозе дыдактычнай гульні «Каму даць мячык?» Выхавальнік прапануе падарыць хлопчыкам мячыкі. *Каму ж дадзім першы мячык? Мішу дадзім. Вось, Міша, твой мячык. Яшчэ каму? Сашу дадзім мячык. Далей каму? Дзіму трэба даць мячык. Яшчэ дадзім мячыкі Алёшу і Валеру. Спачатку дадзім ... каму*? (Працягвае мячык аднаму з дзяцей.) *Так, Алёшу. А зараз каму*? (*Валеру*) і г.д. Прывядзіце прыклады дыдактычных гульняў, з дапамогай якіх фарміруецца акрэсленае у прыкладзе ўменне.

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №15

Вырашыце метадычную задачу: Прачытайце фрагмент заняткаў па развіцці маўлення. Ход заняткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На дошцы выстаўлена сюжэтная карціна на тэму «У лесе» з адлюстраваннем дзяцей, якія выконваюць розныя дзеянні ў лесе: збіраюць ягады, грыбы, заблудзіліся, таксама разглядваюць вожыка. Выхавальнік прапануе паслухаць пачатак расказу «Прыгоды ў лесе» . Вызначыце від расказа, прапанаванага на занятках (фактычны, творчы, з уласнага вопыту, на тэму, працяг апавядання выхавальніка; сюжэтны, апісальны). Складзіце пачатак расказу выхавальніка.

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №16

Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, якія задачы па развіцці маўлення можна вырашаць пры дапамозе прыведзенага у дадатку верша? (гл. дадатак). Якім чынам можна выкарыстоўваць дадзены верш у працы па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

Яблык

Залацісты, спелы яблык
На маёй ляжыць далоні.
Залацісты, буйны яблык
Быццам сонейка малое.

А. Мясткоўскі

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №17

Вырашыце метадычную задачу: Пры фарміраванні навыкаў вымаўлення таго ці іншага гука ў гульні важна прытрымлівацца пэўнай паслядоўнасці дзеянняў. Прывядзіце прыклады гульнявых практыкаванняў для фарміравння правільнага вымаўлення гука *дз* у адпаведнасці з пералічанымі этапамі:1. Этап слыхавога ўспрымання, які ўключае знаёмства з новым гукам у слове і абстрагаванне гука ад слова. 2. Пастаноўка ізаляванага беларускага гука шляхам тлумачэння і па меры магчымасці дэманстрацыя яго артыкуляцыі. 3.Слыхавыя практыкаванні на распазнаванне новага гука. 4. Імітацыя дзецьмі гукавых адрозненняў у гульні. 5. Самастойнае вымаўленне новага гука ў гульні. 6. Уключэнне патрэбнага гука ў словы і сказы беларускага вуснага маўлення ў працэсе гульнявых дзенняў.

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне № 18

Вырашыце метадычную задачу: Дзеці адчуваюць цяжкасці ў вымаўленні спецыфічна беларускага гука *г.* Вызначыце, у якой узроставай групе, хутчэй за ўсё, знаходзяцца дзеці. Якую працу па фарміраванні правільнага вымаўлення гэтага гука варта праводзіць з выхаванцамі? Назавіце рухавыя сюжэтныя гульні для замацавання і актывізацыі вымаўлення гука *г.*

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №19

Вырашыце метадычную задачу: Да прыведзеных задач і пачатку комплексных заняткаў падбярыце адпаведныя дыдактычныя практыкаванні і гульні, якія б спрыялі засваенню дзецьмі граматычных форм (гл. дадатак).

Задачы:

развіваць уменне адказваць на пытанні пра знешні выгляд цацкі, складаць апісанне цацкі з 2-3 сказаў. Узбагачаць слоўнік сінонімамі, антонімамі, дзеясловамі, прыметнікамі. Практыкаваць ва ўтварэнні назоўнікаў з дапамогай памяншальных суфіксаў.

Ход заняткаў

В.

- Хтосьці да нас прыйшоў у госці.
- Адгадайце, хто гэта: Даўгавухі і касы, скача без аглядкі ад ваўка і ад лісы.
- Хто знайшоў адгадку?”
- Паказвае цацку зайца і пытаецца:…

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №20

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вырашыце метадычную задачу: Характэрнай асаблівасцю беларускай фанетыкі з’яўляецца наяўнасць падоўжаных зычных. З якой мэтай выхавальнік праводзіць з дзецьмі практыкаванні на распазнаванне слоў з падоўжанымі зычнымі? На якім матэрыяле лепш праводзіць вызначэнне дзецьмі слоў з падоўжанымі зычнымі?

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №21

Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце з якой мэтай выкарыстоўваецца гульня «Якая фарба ў мяне ў руцэ?» Выхавальнік хавае ў руцэ «фарбу» (кавалак кардону пэўнага колеру) і прапануе дзецям адгадаць, якая яна: сіняя, чырвоная або жоўтая. Дзеці адгадваюць, называючы свае варыянты з трох названых, затым выхавальнік паказвае «фарбу». Да якой групы гульняў адносіцца гэтая гульня? Прывядзіце прыкдады падобных гульняў .

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №22

Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце праграмныя задачы, узроставую групу, від расказа і складзіце план заняткаў па прапанаваным ўзоры расказа выхавальніка : «У нас дома жыве коцік Мурчык. Ён чорны, толькі кончык хваста белы. Поўсць у яго пушыстая, мяккая, цёплая. Спіць Мучык на дыванчыку. Калі ён галодны, то просіць есці: «Мяў-мяў!». Калі пад’есць, то ляжыць на дыванчыку і спявае песеньку: «мур-мур-мур».

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне № 23

Вырашыце метадычную задачу:У час гульні выхаванцы адказваюць на пытанні дарослага наступнага тыпу: «У мяне ёсць яблык, агрэст і парэчкі. Што ты будзеш есці? »; «На чым ты спіш, на ложку ці на канапе?»; «Які колер табе падабаецца: чырвоны, блакітны ці зялёны?» і да т.п. Кожны раз выхавальнік адначасова з пытаннем паказвае адпаведную нагляднасць. З якой мэтай наладжваецца гэта гульня? Да якой групы гульняў яна адносіцца? Прывядзіце прыклады падобных гульняў.

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №24

Вырашыце метадычную задачу: Прачытайце прыведзеныя фразеалагізмы : *вухам не павёў; і смех, і грэх; маслам кашу не сапсуеш; не ў сваёй талерцы; не паказваць вачэйкот еў бы рыбу, ды ў ваду не хоча.* Якія з іх, на ваш погляд, даступны дзецям дашкольнага ўзросту? У якіх жыццёвых сітуацыях іх можна выкарыстоўваць? Як вы іх растлумачыце дзецям?

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №25

Вырашыце метадычную задачу: Пры азнаямленні з якой граматычнай з’явай беларускай мовы можна выкарыстаць прыведзены у дадатку верш Ул. Марука? Дадайце свае практыкаванні для замацавання ўяўленняў дзяцей аб гэтай моўнай з’яве?

Спрытна скачуць Вунь смяюцца
Пад гару На гары
Цыбатыя кенгуру. Вяселыя кенгу-ры.
Не! Не так гавары,
І з гары,
І пад гару
Трэба мовіць –
Кенгуру.

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №26

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вырашыце метадычную задачу: Вызначыце, з якой мэтай пры навучанні беларускай мове можна выкарыстаць прыведзены ніжэй верш І. Муравейкі?

Клапатлівы бацька-слон
Для сябе зрабіў услон,
А для сына сланянятка
Зрабіў услончык – усланятка. ..
І.Муравейка

Дадайце свае практыкаванні для замацавання ў дзяцей адпаведнага маўленчага навыка.

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №27

Вырашыце метадычную задачу: Вывальнік наладжвае гульню «Што я дастала з кошыка?» Ён гаворыць: «Гаспадыня прынесла з кірмаша розную агародніну. Паспрабую адгадаць, што яна купіла. Калі я назаву правільна, вы ўсе разам скажыце: «Так». Калі няправільна, скажыце: «Не». Выхавальнік завязвае сабе вочы, затым выцягвае з кошыка па адным прадмеце, паказвае дзецям і, нібы спрабуючы адгадаць, дае некалькі назваў: «Бульба?» – «Не. » – «Бурак? » – « Не. » – Цыбуля? » – «Так.” З якой мэтай наладжваецца гэта гульня? Да якой групы гульняў яна адносіцца? Прывядзіце прыклады гульняў з падобнымі сітуацыямі.

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №28

Вырашыце метадычную задачу: На занятках па тэме «Адзенне» выхавальнік выконвае ролю прадаўца. Ён, напрыклад, гаворыць: «У нашым магазіне прадаюцца капялюшы. Капялюш надзяваюць на галаву. Яго носяць і жанчыны, і мужчыны. Летам капялюш носяць, каб сонца не пякло ў галаву, а ўвосень ці ўвесну – каб было цяплей. Хто хоча купіць капялюш? Пакажы яго. Так, гэта капялюш. Што ты купіш? ». Назавіце прыем, які выкарыстоўвае выхавальнік пры увядзенні новага слова. Якую задачу развіцця беларускага маўлення дзяцей дапамагае вырашыць гэты прыём?

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №29

Вырашыце метадычную задачу: Зрабіце пералік дыдактычнага абсталявання беларускамоўнай лялькі ў адпаведнасці з сучасным побытам па спісе: магчымыя віды лялек, імя лялькі, бялізна, абутак, побыт, мэбля, ежа. Якія гульні-заняткі можна праводзіць з дыдактычнай беларускамоўнай лялькай?

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №30

Вырашыце метадычную задачу: Прачытайце прыведзеныя фразеалагізмы: пад гарачую руку, ні да чаго рукі не ляжаць, на ўсе рукі, сядзець склаўшы рукі, разводзіць рукамі, лёгкі на руку, як без рук, адбівацца рукамі і нагамі, не з рукі, з парожнімі рукамі, хуткі на руку. Якія з іх, на ваш погляд, даступны дзецям дашкольнага ўзросту? У якіх жыццёвых сітуацыях іх можна выкарыстоўваць? Як вы іх растлумачыце дзецям?

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №31

Вырашыце метадычную задачу: Дзеці адчуваюць цяжкасці ў вымаўленні спецыфічна беларускага гука *р*. Вызначыце, у якой узроставай групе, хутчэй за ўсё, знаходзяцца дзеці. Якую працу па фарміраванні правільнага вымаўлення гэтага гука варта праводзіць з выхаванцамі? Назавіце рухавыя сюжэтныя гульні для замацавання і актывізацыі вымаўлення гука *р.*

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Кампетэнтнастна-арыентаванае заданне №32

Вырашыце метадычную задачу. У сярэдзіне сакавіка і ў пачатку красавіка ва ўстанове дашкольнай адукацыі дзеці гукаюць вясну. Прывядзіце прыклады народных гульняў, у якія гуляюць дзеці ў час свята. Састаўце прыкладны план святкавання«Гукання вясны» ў дзіцячым садзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэрміналагічны слоўнік (гласарый)

Білінгвізм (=двухмоўе) – валоданне і папераменнае выкарыстанне адной і **Білінгвізм збалансаваны (абсалютна поўны)** - валоданне абедзвюма мовамі аднолькава добра і здольнасць карыстацца імі ва ўсіх жыццёвых сітуацыях.той жа асобай дзвюх розных моў.

Білінгвізм актыўны - актыўнае ўключэнне індывіда ў зносіны на другой мове. (Можа назіравацца і ў людзей з недастаткова высокім ўзроўнем кампетэнцыі ў адной або нават дзвюх мовах.)

Білінгвізм пасіўны - нерэгулярнае карыстанне другой мовай у зносінах (як правіла, не з'яўляецца пастаяннай характерыстыкай індывіда).

Білінгвізм рэцэптыўны (пасіўнае двухмоўе) - частковае выкарыстанне ў маўленні дзвюх моўных сістэм, калі чалавек разумее, але не размаўляе на іншай мове.

Білінгвізм рэпрадуктыўны - здольнасць білінгва не толькі разумець, але і ўзнаўляць асобныя фрагменты або ўвесь тэкст на другой мове.

Білінгвізм прадуктыўны - поўнае, актыўнае двухмоўе, здольна сць білінгва і разумець, і гаварыць на другой мове, выкарыстоўваць другую мову як зродак зносін, дасягнення ўзаемаразумення.

Білінгвізм дамінуючы - праяўленне білінгвам большай дасведчанасці ў адной з дзвюх моў (гл.: *мова "слабая" і мова "моцная*".)

Білінгвізм ненарматыўны - практычнае невалоданне індывідам літаратурнымі нормамі ніводнай мовы (найбольш распаўсюджаны тып у Беларусі)

Білінгвізм нарматыўны - паслядоўна-правільнае выкарыстанне дзвюх моўных сістэм. (Тое ж, што *білінгвізм збалансаваны*)

Білінгвізм аднабакова-нарматыўны - дасканалае валоданне літаратурнымі нормамі адной мовы, але недастатковае захоўванне нормаў другой мовы альбо валоданне ёю толькі на ўзроўні ўспрымання і разумення.

Білінгвізм каардынацыйны (каардынаваны, непасрэдны) - функцыянаванне кожнай моўнай сістэмы незалежна і самастойна (ўсе ўнутраныя мысліцельныя працэсы ў білінгва праходзяць на другой мове без прымянення перакладу). Для білінгва характэрна аўтаномная мадэль стварэння тэксту на кожнай з моў і ўласціва поўнае адрозненне дзвюх моўных сістэм пры дыферэнцыраванні ўстаноўкі на іх выкарыстанне. . (Пар.: *білінгвізм субардынацыйны*.)

Білінгвізм субардынацыйны (няпоўны, апасродкаваны, залежны, неўраўнаважаны) - недакладнае проціпастаўленне білінгвам сістэмы абедзвюх моў (ўсе мысліцельныя аперацыі праходзяць на першай засвоенай і асноўнай мове, а пераход на акустычны альбо графічны код другой мовы адбываецца пры прымяненні перакладчыцкага метаду). Першая засвоеная мова выступае як дамінантная.

Білінгвізм натуральны – натуральнае, не заснаванае на спецыяльна арганізаваным навучанні выкарыстанне ў маўленні дзвюх моў, узнікае найчасцей у раннім дзяцінстве, у шматмоўных сем'ях.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

Білінгвізм штучны – двухмоўе, узнікшае ў выніку навучання.

Білінгв (=біглот) – індывід, які валодае дзвюма мовамі.

Білінгвізм паслядоўны - засвойванне дзіцем другой мовы пасля засваення роднай – з 3 гадоў і пазней**.**

Білінгвізм паралельны (сінхронны, адначасовы) - засваенне дзіцем з нараджэння адразу дзвюх моў.

Білінгвальная адукацыя, як працэс і вынік, – гэта засваенне асобай культурна-гістарычнага і сацыяльнага вопыту розных краін і народаў, каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры сродкамі беларускай і рускай моў.

Білінгвальнае навучанне – спецыяльна арганізаваны мэтанакіраваны працэс развіцця і ўдасканалення маўлення дзяцей на дзвюх мовах і далучэнне іх да нацыянальнай і сусветнай культуры сродкамі гэтых моў. Білінгвальнае навучанне трактуецца як сродак білінгвальнага выхавання.

Білінгвальнае выхаванне – гэта мэтанакіраваны свядома арганізаваны педагагічны працэс, які садзейнічае фарміраванню і развіццю асобы дзіцяці сродкамі беларускай і рускай моў і прадстаўленых імі культур.

Грамонта прынцып – ажыццяўленне навучання дзвюм мовам у сітуацыі «адна асоба – адна мова». Ва ўмовах грамадскага выхавання мадыфіцыруецца ў прынцып: *кожная мова павінна выкарыстоўвацца ў залежнасці ад умоў або акалічнасцей*.

Інтэрферэнцыя – узаемадзеянне моўных сістэм у сітуацыі двухмоўя; **І.** міжмоўная праяўляецца ў фактах адхілення ад сістэмы і нормаў другой (вывучаемай) мовы пад уплывам роднай (першай) мовы. (Інакш кажучы: неўсвядомленае змешванне білінгвам сістэм дзвюх моў. Напрыклад, словаўтваральная інтэрферэнцыя ў дзяцей узнікае як вынік недастатковага засваення словаўтваральнай структуры слоў другой мовы і выкарыстання ўзамен мадэлі роднай мовы (*вумны, пярчаткі, здзесь*).

Камунікатыўная актыўнасць (як крытэрый размежаванасці розных тыпаў білінгвізму) - ступень рэгулярнасці карыстання мовай у зносінах і розных сферах прымянення кожнай мовы ў маўленчай дзейнасці індывіда (у побыце, на вытворчасці, у школе і г.д.).

Лінгвакультуралагічны падыход да навучання мове - забяспячэнне, з аднаго боку, уваходжання ў нацыянальную і сусветную культуру ў працэсе авалодання маўленнем на нацыянальнай мове, а з другога – авалоданне нацыянальнай мовай на аснове спасціжэння нацыянальнай культуры .

Метад даследавання – гэта шлях вядзення даследавання, сукупнасць прыёмаў і аперацый, якія накіраваны на вывучэнне педагагічных з’яў і вырашэнне навукова-даследніцкіх задач.

Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя як навука вызначае мэту, змест, задачы, прынцыпы, метады і прыёмы навучання беларускай мове як другой, вывучае заканамернасці засваення дзецьмі другой блізкароднаснай мовы, раскрывае тэарэтычныя і практычныя пытанні выкладання беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мовы, даследуе ўмовы і шляхі фарміравання маўленчых ўменняў у дзяцей, культуры беларускага маўлення.**Мова “моцная”** – дамінуючая мова, як правіла, мова сям’і.

Методыка развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя як вучэбная дысцыпліна ўзбройвае педагагічных работнікаў установ дашкольнай адукацыі сістэмай навукова-метадычных ідэй, знаёміць з апошнімі навуковымі лінгвадыдактычнымі даследаваннямі, педагагічным вопытам.

Мова “слабая” – мова, у якой білінгвы меней дасведчаныя, адчуваюць цяжкасці з пошукам правільных слоў, часцей выкарыстоўваюць змешванне або пераключэнне кода, чым на “моцнай” мове.

Мова – сістэма матэрыяльных адзінак, якія служаць зносінам людзей і адлюстроўваюцца ў свядомасці калектыву ў абстракцыі ад канкрэтных думак, пачуццяў, жаданняў (пар. *маўленне*).

Нарматыўная мова – мова, якая адпавядае літаратурным нормам.

Нацыянальная (этнічная) мова – мова, характэрная для дадзенага этнасу, якая з’яўляецца яго прыкметай (Т.М. Мікуліч). У дадзеным вызначэнні на першы план выходзіць *крытэрый ідэнтыфікацыі*.

Нацыянальна-моўная адукацыя - уваходжанне дзіцяці ў родную нацыянальную моўную культуру, у яе прастору, якая складаецца падчас змястоўнага суразмоўніцтва на нацыянальнай мове.

Родная мова, згодна з вызначэннем А.А. Лявонцьева, – гэта мова, якую чалавек спасцігае адначасова з узнікненнем і развіццём здольнасці мысліць. Да роднай мовы далучаюцца з маленства, яе засвойваюць у сітуацыі натуральных зносін дзіцяці з дарослымі.

Транспазіцыя – станоўчы перанос уменняў і навыкаў маўлення на роднай мове ў маўленне на другой мове

Спіс літаратуры

Асноўная літаратура

1. Свірыдзенка, В. І. Фарміраванне маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў: тэорыя і практыка / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Беларус. дзярж. пед.ун-т, 2019. – 280 с.

2. Современные педагогические технологии в образовательном процессе учреждения дошкольного образования : учеб.-метод. пособие / под общ. ред. В. Н. Шашок ; сост.: В. Н. Шашок [и др.]. – Минск : Акад. последиплом. образования, 2019. – 123 с.

3. Старжынская, Н. С. Развіцце беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту : вучэбны дапаможнік / Н.С. Старжынская, Д.М. Дубініна. – Мінск : РІВШ, 2022. – 396 с.

4. Старжынская, Н. С. Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў ад 4 да 7 гадоў : вучэб.-метад. дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з рус. мовай навучання / Н. С. Старжынская, Д. М.Дубініна. – Мінск : Аверсэв, 2020. – 184 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Старжинская, Н. С. Развитие инновационного дошкольного образования в Республике Беларусь : пособие / Н. С. Старжинская, В. П. Тукач. – Минск : Белорус. гос. пед. ун-т, 2020. – 128 с.

6. Дадатковая літаратура

7. Дубинина, Д. Н. Игры с картинками для малышей (от 2 до 3 лет) : учеб. нагляд. пособие для учреждений дошк. образования с рус. яз. обучения = Гульні з карцінкамі для малых (ад 2 да 3 гадоў) : вучэб. нагляд. дапам. для ўстаноў дашк. адукацыі з беларус. мовай навучання / Д. Н. Дубинина. – Минск : Сэр-Вит, 2019. – 26 с.

8. Старжынская, Н. С. Развіцце беларускага маўлення дашкольнікаў ад 4 да 5 гадоў : вучэб. нагляд. дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з рус. мовай навучання / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. – Мінск : Аверсэв, 2018. – 28 с.

9. Дубініна, Д. М. Родная мова. Крок за крокам : вучэб.-метад. дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з рус. мовай навучання / Д.М. Дубініна, Н. С. Старжынская. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020. - 134 с.

10. Старжынская, Н.С. Падрыхтоўка да навучання грамаце : вучэбна-метадычны дапаможнік для педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі з беларускай мовай навучання / Н. С. Старжынская. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020. – 174 с.

РЕПОЗИТОРИЙ

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Ахутина, Т.В. Проблема строения индивидуального лексикона человека в свете идей Л. С. Выготского // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 14, Психология / Т.В. Ахутина. - М. ; 1994. С. 44-51.
2. Базжина, Т.В. Психолингвистический анализ некоторых этапов доречевого развития // Становление речи и усвоение языка ребенком: Сб. научн. тр. / Т.В. Базжина. Изд-во Моск. Ун-та, 1986. С.6-20.
3. Баламакова, М.В. Вариативность явлений картины мира у носителей языка и билингвов // Фонетическая вариантность: билингвизм и диглоссия / М.В. Балмакова. – Иваново. : 2000. С. 27-31
4. Бейн, Б. Билингвистическое воспитание детей (вновь обращаясь к Л. Выготскому и А. Лурия) // Вопр. Психологии / Б. Бейн, А.Ю Панарин, И.А.Панарин.- М. : 1994. N 3. С. 68-81
5. Береснева, Н.И. Доминанты образа мира современного русского ребенка // Антропоцентрический подход к языку / Н.И. Береснева.- Пермь. : 1998. Ч. 2. С. 161-172
6. Богуш А.М. Методика обучения русскому языку в дошкольных учреждениях / А.М. Богуш – К. : Вища школа, 1990. – 221 с.
7. Бушс, О. Реальное двуязычие // Родник / О.Бушс. – Рига. : 1988. N 8. С. 57-63
8. Вайнрайх, У. Одноязычие и многоязычие // Новое в лингвистике. Вып. 6, / У Вайнрах. – М. : Прогресс, 1972 с.25-60.
9. Верещагин, Е.М., Язык и культура: Лингвострановедение в преподавании русского языка как иностранного / Е.М. Верещагин, В.Г.Костомаров. 4-е изд., перераб. и доп. - М. : 1990.
10. Верещагин, Е.М. Психологическая и методическая характеристика двуязычия. (билингвизма) / Е.М. Верещагин. - М. : Изд-во МГУ, 1969.
11. Виноградов, В.А. Интерференция // Лингвистический энциклопедический словарь / Гл. ред. В.Н.Ярцева./ В.А. Виноградов. - М. : Сов. Энциклопедия, 1990 - 685с.
12. Выготский, Л.С. Вопросы детской психологии / В.С. Выготский. - СПб: Союз. : 1997.
13. Выготский, Л.С. Мышление и речь // Собр.соч.: в 8 т. / Л.С. Выготский. - М. : 1982. Т.2.
14. Выготский, Л.С. К вопросу о многоязычии в детском возрасте // Хрестоматия по возрастной и педагогической психологии / Под ред. И.И.Ильясова, В.Я.Ляудис / Л.С. Выготский. – М. : 1980. – С. 67 - 72.
15. Выготский Л.С. Воображение и его развитие в детском возрасте // Собр.соч.: В 6 т. / Л.С. Выготский. – М. : Педагогика, 1982 - Т.2. – 504 с.
16. Емельянова, Я.Б. Различные подходы к оценке влияния билингвизма на интеллектуальное развитие личности // Вестник Челябинского государственного педагогического университета / Я.Б. Емельнова. 2010. №2. С.91-102.

17. Жинкин, Н.И. Речь как проводник информации / Н.И. Жинкин.- М.: Наука, 1982. 157 с. 19.

18. Жлуктенко, Ю.А. Лингвистические аспекты двуязычия / Ю.А. Жлуктенко.- Киев. : Вища школа, 1974. 176 с.

19. Залевская, А.А. Вопросы теории овладения вторым языком в психолингвистическом аспекте / А.А. Залевская. – Тверь. : Изд-во Твер. гос. ун-та, 1996. 195с.

20. Захарова, А.З. Опыт лингвистического анализа словаря детской речи: Дис. канд. филол. наук./ А.З. Захарова. – Новосибирск. : 1975. 158 с.

21. Зимняя, И.А. Психологические аспекты обучения говорению на иностранном языке / И.А. Зимняя.- М. : 1978.

22. Зимняя, И.А. Речевой механизм в схеме порождения речи. // Психологические и Психолингвистические проблемы владения и овладения языком / И.А. Зимняя.- М. : 1969.

23. Имедадзе, Н.В. Управление процессом овладения вторым языком // Хрестоматия по возрастной и педагогической психологии / Под ред. И.И. Ильясова, В.Я. Ляудис / Н.В. Имедадзе. - М. : 1984. С. 235-239.

24. Леонтьев, А.А. Основы теории речевой деятельности // Под ред. А.А. Леонтьева / А.А. Леонтьев. - М. : 1974.

25. Леонтьев, А.А. Раннее обучение иностранным языкам: что нас всех объединяет // Русский язык за рубежом. / А.А. Леонтьев. -1985, № 4. – С. 50 – 53.

26. Лурия, А.Р. Язык и сознание / А.Р. Лурия. - М. : Изд-во МГУ,1979.319 с.

27. Негневицкая, Е.И. Рекомендации по обучению русскому языку в многонациональном детском саду // Дошкольное воспитание, 1990. № 10. - С. 21 –24.

28. Пиаже, Ж. Избранные психологические труды / Ж. Пиаже. - М. : 1969.

29. Пиаже, Ж. Психогенез знании и его эпистемологическое значение, Схемы действия и усвоения языка. // Семиотика // Под ред. Ю.С. Степанова /Ж. Пиаже.- М. : 1983.

30. Протасова, Е.Ю. Особенности русской речи билингвов // Рус. яз. за рубежом / Е.Ю. Протасова. - М. : 2000. - N 3/4. С. 42-48

31. Пассов, Е.И. Основы коммуникативной методики обучения иноязычному общению / Е.И. Пассов. – М., 1989. – 208 с.

32. Супрун, А.Е. Содержание обучения русскому языку в белорусской школе / А.Е. Супрун . - Минск, 1987. – 230 с.

33. Сигуан, М. Образование и двуязычие.// Пер.с фр.Н.А.Садовского / М. Сигуан, У.Ф. Макки.-М. :Педагогика, 1990.

34. Терепинг, А.-Р. Раннее двуязычие: хорошо это или плохо // Радуга. - Таллинн, 1989. N 4. С. 32-40

35. Тульвисте, П. Существует ли специфически детское вербальное мышление ? / П. Тульвисте. - Вопросы психологии, 1981, N 5.

36. Тухарели, Н.Л. Детская языковая картина мира как предмет лингвистического изучения // Язык, сознание, коммуникация / Н.Л. Тухарели.- М., 2001. Вып. 17. С. 5-10

37. Футерман, З.Я. Иностранный язык в детском саду / З.Я. Футерман.- К., 1984.

38. Хауген, Э. Языковой контакт // Новое в лингвистике. Вып. 6, М.: Прогресс, 1972. С. 61-80.

39. Щерба, Л.В. Языковая система и речевая деятельность /Л.В. Щерба. - . Л. : 1974. С. 313-318

40. Язык, сознание, коммуникация : Сб. ст. - М.: МАКС Пресс, 2002 Вып. 22 : / Отв.ред.: Красных В.В., Изотов А.И. 135 с. , табл.

41. Яценко Н.А. Пути методической интеграции развития речи и обучения иностранному языку в условиях детского сада: Автореф. дис. … канд. пед. наук. – М., 1994. - 16 с.

42. Aellen C. & Lambert W. E. Ethnic identification and personality adjustments of Canadian adolescents of mixed English-French parentage. Canadian Journal of Behavioral Science, 1969, 1, 69-86.

43. Bloomfield L. Language. New York, 1933

44. Ervin S. &. Osgood C. Second Language learning and bilingualism. Journal of Abnormal & Social psychology, Suppl. 49, 1954.

45. Grosjean F. Life with two languages: An introduction to bilingualism. Cambridge (Mass.), L.: Harvard Univ. Press, 1982.

46. Harris B., Sherwood B. Translating as an Innate scill // Language Interpretation and Communication. New-York & London: Plenum Press, 1 978. P. 1 55-1 70.

47. Haugen E. Language Contact // Reports for the Eighth International Congress of Linguists. Oslo, 1957. P. 253-261.

48. Hockett C.F.. A course in modern linguistics. New York, 1958.

49. Lambert, W. & Tucker, C.R. (1972), Bilingual Education of Children: The St Lambert Experiment. Rowley, Mass.: Newbury

50. Leopold, W. A child's learning of two languages. Fifth Annual Georgetown University Round Table on Languages and Linguistics. Washington, DC: Georgetown University Press, 1954 pp.19-30.

51. Rivers W.M. Communicating Naturally in a Second Language. Theory and Practice in Language Teaching. Cambridge, 1983.

52. Slama-Cazacu T.. Dialogue in children. The Hague 1977 (Rom. ed. 1961).

53. Slama-Cazacu T.. Dialogue in children. The Hague 1977 (Rom. ed. 1961).

54. Volterra, V. & Taeschner, T. 1978. The acquisition and development of language by bilingual children. Journal of Child Language 5: 311-326

55. Wexler F. Diglossia, language standardization and purism. Parameters for a typology of literary languages // Lingua. 1971. Vol. 27. № 4. P. 330-354.